Рыгор Семашкевіч

# Лічыла дні зязюля





Рыгор Семашкевіч, 1972 г.

РЫГОР СЕМАШКЕВІЧ

# ЛІЧЫЛА ДНІ ЗЯЗЮЛЯ

*Вершы,*
*аповесці,*
*эсэ*

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1987

ББК 84 Бел 7
С30

*Прадмова*
*Дзм. Я. Бугаёва*

С $\frac{4702120200—011}{М 302(05)—87}$ 132—86

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1987.

# ЗРОБЛЕНАЕ ЗАСТАЕЦЦА

Рыгор Міхайлавіч Семашкевіч пражыў няпоўных трыццаць сем гадоў. Яго нядоўгае па сучасных мерках жыццё знешне выглядае даволі звычайна і сціпла. Але яно было напоўнена напружанай унутранай, духоўнай працай, якая дала свой прыкметны плён. І ён, трэба думаць, застанецца надоўга.

Нарадзіўся Рыгор Семашкевіч у хуткім часе пасля заканчэння Айчыннай вайны — 12 верасня 1945 года. У вёсцы Дамашы каля Маладзечна. «Вайны не бачыў. А чуў, што туляецца па завуголлях»,— такія штрыхі свайго дзяцінства падае паэт у вершы з празаічнай назвай «Аўтабіяграфія».

Вайна ў тыя гады і праўда нагадвала пра сябе на кожным кроку. Жылося нялёгка ўсім — і дарослым, і дзецям. Ды яны, дзеці, раслі і мужнелі, асветленыя сонцам вялікай перамогі над фашызмам. І не скардзіліся на цяжкасці. Пра гэта ў Рыгора Семашкевіча ёсць такія шчырыя радкі:

Не наракаю на цябе, мой лёс,
За тое, што не раз пад родным небам
Гарэлі ногі ад сцюдзёных рос,
Што ў хаце часам не хапала хлеба.

Вучыўся Семашкевіч у Лебядзёўскай сярэдняй школе, потым на філалагічным факультэце БДУ імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта працаваў дырэктарам васьмігодкі ў Смаргонскім раёне, а затым зноў вярнуўся ў БДУ. Тут ён займаўся ў аспірантуры, абараніў кандыдацкую дысертацыю, быў выкладчыкам. Чытаў гісторыю беларускай дакастрычніцкай літаратуры, вёў спецсемінар па

сучаснай беларускай паэзіі, кіраваў падрыхтоўкай студэнцкіх курсавых і дыпломных работ, выконваў шматлікія іншыя абавязкі, звязаныя з выкладчыцкай працай. А яшчэ знаходзіў нейкі час і на паэзію, і на мастацкую прозу, і на крытычныя выступленні, і на літаратуразнаўчыя даследаванні.

Я памятаю Рыгора Семашкевіча з яго студэнцкіх гадоў. Але знаёмства спачатку было, можна сказаць, запраграміраванае. Яно прадугледжвалася штатным філфакаўскім раскладам. Бо я чытаў лекцыі таму студэнцкаму набору, у якім быў і Семашкевіч. Праўда, асабліва прыкладным, узорным ва ўсіх адносінах студэнтам яго назваць нельга было. Ва ўсякім разе, самая першая наша сустрэча, насуперак таму штатнаму раскладу, адбылася не на лекцыі, а ў кніжным магазіне. І абодва мы апынуліся там, вядома ж, не па абавязку службы. Потым ён бываў і на лекцыях, далёка не на ўсіх, займаўся ў студэнцкім навуковым гуртку, якім мне ў той час таксама даводзілася кіраваць. Я прымаў у Семашкевіча некалькі залікаў, экзамен па беларускай савецкай літаратуры на пятым курсе, быў адным з экзаменатараў на яго ўступным аспіранцкім экзамене па спецыяльнасці, чытаў яго самыя першыя навуковыя працы яшчэ да іх публікацыі. І ўжо тады пераканаўся ў яго markdownаковай таленавітасці, чалавечай шчырасці і сумленнасці. А яшчэ вабілі да яго дасціпнасць, глыбокая павага да літаратуры, у якой ягонымі кумірамі з сучаснікаў былі А. Твардоўскі і В. Шукшын, выразна выяўленая цікавасць да гісторыі роднага народа, відавочныя даследчыцкія схільнасці. Яны заўважаліся ў Семашкевіча яшчэ тады, калі ён быў студэнтам. Нездарма ж яго першая літаратуразнаўчая кніга, а потым і кандыдацкая дысертацыя выраслі з ягонай жа студэнцкай дыпломнай работы. Словам, ён звычайна не траціў марна часу і тады, калі прапускаў вучэбныя заняткі. Відаць, проста спяшаўся рабіць тую справу, да якой адчуваў прызванне.

Зразумела, Рыгор Семашкевіч далёка не поўнасцю

здзейсніў тое, на што ён наважваўся, што дазваляў ажыццявіць яго талент. Але і зрабіў ён нямала. Ён выдаў два зборнікі вершаў — «Леснічоўка» (1968) і «Субота» (1973). Дачакаўся ён і кніжкі ў перакладзе на рускую мову. Гэтая кніжка пад загалоўкам «Золата саломы» выйшла ў 1974 годзе ў выдавецтве «Молодая гвардия». Усе пераклады Семашкевічавых вершаў зрабіў цяпер ужо таксама нябожчык Дзмітрый Кавалёў. Ён жа напісаў да той кніжкі і невялікую прадмову, у якой вельмі прыхільна ацаніў паэзію Рыгора Семашкевіча, падкрэсліўшы яе натуральнасць, дакладнасць паэта ў адлюстраванні жыццёвых рэалій, яго апору на ўласна перажытае, яго ўменне зберагчы і перадаць «і песенныя інтанацыі, і парывістасць танца, і плаўнасць апавядання».

Сапраўды, Семашкевічава паэзія пры ўсёй яе някідкасці, знешняй праставатасці і часам пэўнай прыземленасці валодае немалымі вартасцямі. Галоўныя з іх, як слушна заўважыла крытыка яшчэ пры жыцці паэта,— нявымучаная, нявыдуманая жыццёвасць верша, яго добрая змястоўная ёмістасць, сапраўднасць аўтарскага пачуцця, натуральнасць паэтычных інтанацый, рэалістычная дакладнасць і ў цэлым грунтоўная выверанасць пераважна канкрэтнай вобразнай фактуры. У лепшых вершах Рыгора Семашкевіча ёсць значная думка, выразна адчуваецца чалавечная душа аўтара, яго спагадлівасць да людзей, яго жыццялюбства, хораша выяўленае, напрыклад, у такіх строфах:

На перазменцы пакаленняў
Падкажа дзіўнае чуццё
Шаптаць сабе, нібы маленне:
— Ты ўсё ж цудоўнае, жыццё.
(«Здзівіся, друг мой...»)

Бачу родную зямлю
У святле і рыштаваннях,
А найбольш за ўсё люблю
Вокнаў сонечнае ззянне.
(«Шкляр»)

Ужо згадваная зацікаўленасць нашай нацыянальнай гісторыяй нарадзіла такія творы, як «Вайсковыя могілкі Мінска», «Кастусь Каліноўскі», «Трэба было б прайсці навальніцай», «Вяртанне кніг», «Верш, напісаны ў архіве», «Францішак Багушэвіч». У апошнім з гэтых вершаў пра глыбінны дэмакратызм выдатнага паэта XIX стагоддзя гаворыцца з афарыстычнай трапнасцю:

На ўсю Беларусь мільён пракурораў
І толькі адзін, толькі ён адвакат.

Шчырасцю і замілаванасцю пачуцця вызначаюцца вершы паэта пра маці, якая заўсёды суцешыць, абароніць і «на любых зямных шляхах усё да простай самай праўды зверне», пра сціплую красу беларускай прыроды і з'яднанасць чалавека з роднай зямлёю. Вось як паэтычна сказана ў аднайменным вершы пра бярозу: «Нявестачкай яшчэ нявенчанай бяроза пад акном стаіць». Стаіць не проста так, а ў якасці партызанскай дазорніцы. Такім чынам, думка паэта сягае да часоў вайны. І яна, гэтая думка, аказваецца змястоўнай і глыбокай:

Пярэстасцю сваёю зорнаю
(З засады — нібы светлячок)
Ты, партызанская дазорніца,
Не раз высвечвала здалёк.

Не, не змыліцца ім, здарожаным.
Начныя стукі ў родны дом
Лятуць ціхутка, як гарошынкі,
Але і ў іх ужо закладзены
Салютны пераможны гром.

Ты грэйся, сувязны, да золаку
Пад небам дарагіх вачэй.
Расстайны голас шэпча:
— Золатка,
Прыходзь хутчэй, прыходзь хутчэй.

А на бяросце у дазорніцы —
Жалобны тон і светлы тон.

. . . . . . . . . . . . .

Адных вярнула хваля вольніцы,
Другія — ў плыні даўніх дзён.

Гэта ўжо прыклад даволі трапнай асацыятыўнасці, нечаканага і шматзначнага асэнсавання белага і чорнага колераў бяросты, бо гаворка ідзе ўжо пра жывых і мёртвых, пра тых, што вярнуліся з перамогай, і тых, што аддалі за яе жыццё.

Умеў Рыгор Семашкевіч добра, захоплена пісаць і пра далікатнасць інтымных пачуццяў. Можа, найбольш перакаканальна сведчыць пра гэта верш з выразным песеннатанцавальным рытмам «Полька ў вёсцы Пяціхатка». Тут сялянскі хлопец, усхваляваны віхурыстым, імпэтным танцам, прачула звяртаецца да каханай:

Каснічок куплю чырвоны —
Лёгкім бантам завяжы.
Будзе вёска біць у звоны —
Ты не бойся, не дрыжы.

Як палюбіш, як пачубіш
І заціхнеш на руках,
Стане лёгка — і пачуеш —
Тчэ зіма снягі ў пасаг.

Зоры я ў кішэнь кідаю
Разамлелаю рукой.
Калышу і абдымаю —
Вось як будзе ў нас з табой.

І ў вершах інтымнага плану, і ў творах іншай тэматычнай скіраванасці эмацыянальная насычанасць мастацкай тканіны нярэдка ўзбагачаецца за кошт гумарыстычнай падсветкі, якую надае ўсмешка паэта. Яна часта спадарожнічала Рыгору Семашкевічу ў самім жыцці і настойліва прабівала сабе дарогу ў яго творах, не толькі паэтычных, але і празаічных. Сярод іх перш за ўсё трэба згадаць сатырычную аповесць «Бацька ў калаўроце» (1976), твор, напісаны ярка, таленавіта, з дасціпнай выдумкай і гратэскнымі перабольшаннямі, з выразнай арыентацыяй на традыцыі народнага смеху. Гэтыя традыцыі вельмі плённыя

ў многіх літаратурах. У нас яны таксама выкарыстоўваліся яшчэ са старажытных часоў, потым у літаратуры XIX стагоддзя і ў пазнейшай творчасці многіх выдатных пісьменнікаў ад Якуба Коласа і Кандрата Крапівы да Міхася Лынькова і Янкі Брыля. Але Семашкевіч, працягваючы трывалую, устойлівую нацыянальную традыцыю, застаўся арыгінальным мастаком. Ён даў сатырычнае асэнсаванне новаму жыццёваму матэрыялу, народжанаму ўжо нашым часам. Пісьменнік паклаў у аснову твора факты, здарэнні, падзеі, вельмі добра вядомыя яму асабіста, і ўвогуле ў шматлікіх выпадках ішоў ад рэальных канкрэтных прататыпаў, якія лёгка, часам, магчыма, і залішне лёгка ўгадваюцца, пазнаюцца дасведчанымі людзьмі за мастацкімі вобразамі, створанымі ў аповесці.

Бясспрэчную таленавітасць праявіў Семашкевіч у нарысах «Лічыла дні зязюля» і «Світка Буйніцкага» (апошні твор нясе ў сабе і прыкметы эсэ), а таксама ў нязконча-най аповесці «Ясень», апублікаванай пасмяротна. Гэтая аповесць прываблівае глыбокай аўтарскай перажытасцю ўсяго, пра што ў ёй ідзе гаворка, тонкай настраёвасцю малюнка, ёмістай псіхалагічнай насычанасцю пісьма.

Самага прыхільнага слова заслугоўвае праца Рыгора Семашкевіча ў якасці крытыка і літаратуразнаўца. Яе вынікам сталі публікацыі ў розных выданнях, кнігі «Браніслаў Эпімах-Шыпіла» (1968), «Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе» (1971), зборнік «Выпрабаванне любоўю» (1982). Друкаванае выданне гэтага зборніка аўтар ужо не ўбачыў, а яго карэктуру яшчэ чытаў перад самай смерцю, якая зусім нечакана, па трагічнай выпадковасці напаткала яго 11 чэрвеня 1982 года.

Кнігі пра Эпімаха-Шыпілу і беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе канца XIX — пачатку XX стагоддзяў напісаны з шырокім выкарыстаннем невядомых раней ці маладаследаваных матэрыялаў, з якімі вучоны знаёміўся ў розных архіўных сховішчах Ленінграда і Вільнюса, Масквы і Мінска. І ўжо гэта абумоўлівае іх немалую наву-

ковую каштоўнасць. Такі ж характар мае і праца «Не загаснуць зоркі ў небе...» з кнігі «Выпрабаванне любоўю», прысвечаная ўзаемаадносінам Янкі Купалы з газетай «Наша ніва».

Ва ўсіх літаратуразнаўчых працах Семашкевіча выяўляецца эрудзіраванасць аўтара, яго даследчыцкая праніклівасць, павага да фактаў, часам прамая ці скрытая палемічнасць, уменне пісаць не толькі доказна, але і цікава, з такой любасцю да слова, якую далёка не заўсёды сустрэнеш у даследчыкаў літаратуры.

Рыгора Семашкевіча-крытыка прываблівала пераважна паэзія. Пра яе ён таксама ўмеў сказаць шчыра і пранікнёна, добразычліва, але разам з тым і патрабавальна. Вядома, і ў яго зрэдку можна спатыкнуцца на асобных залішне суб'ектыўных выказваннях або спрэчных ацэнках. Жывому чалавеку ўсё гэта так ці іначай уласціва амаль заўсёды. Затое беспадстаўная кампліментарнасць, знарочыстая дагодлівасць, беспрынцыпная кан'юнктурнасць, што яшчэ і цяпер моцна б'юць па аўтарытэту нашай крытыкі, Семашкевіча ніяк не спакушалі. Таму і сёння з цікавасцю перачытваюцца ў розны час напісаныя яго артыкулы пра паэзію Рыгора Барадуліна («Ганчарны круг паэта»), Алега Лойкі («Спазнанне»), Яўгеніі Янішчыц («Выпрабаванне любоўю»), Ніны Мацяш («Адчуванне шляху»), агляды маладой паэзіі 70-х гадоў («Дзейнасць думкі і пачуцця», «Зашчымела слова, зашчымела...»), лепшыя рэцэнзіі на паэтычныя, празаічныя і літаратуразнаўчыя кнігі, рэцэнзіі, у якіх ёсць і жывая думка, і тая ж патрабавальная прынцыповасць, і проста добрае веданне справы. Яно дазваляла Семашкевічу не толькі дакладна называць сваімі імёнамі як вартасці, так і недахопы, але і давала яму магчымасць упэўнена гаварыць пра вытокі, першапрычыны і таго, і другога. Згадаю толькі адзін прыклад такой дакладнасці крытычнага дыягназу, узяты з рэцэнзіі Рыгора Семашкевіча на выдадзеную ў 1970 годзе калектыўную навуковую працу «Сучасная беларуская паэзія». Размова

ў крытыка ідзе пра бяссілле і немач сучаснай байкі, пра безнадзейнае слізганне па паверхні жыццёвых з'яў, характэрнае для некаторых нашых літаратараў, што лічаць сябе «чыстымі» сатырыкамі, але не маюць сапраўднай грамадзянскай мужнасці, без якой у літаратуры ўвогуле, а ў сатырычных жанрах у асаблівасці няма чаго рабіць. «Пасля К. Крапівы,— пісаў Семашкевіч,— іменна лірыкі М. Танк, П. Панчанка, а таксама і С. Дзяргай здолелі па-сапраўднаму загаварыць як сатырыкі і гумарысты. Гэта яшчэ раз пацвердзіла старую ісціну пра тое, што неабходнай умовай сатыры з'яўляецца зноў жа высокая грамадзянскасць. Усе тыя ракі, бабры, жукі, якія вандруюць з адной байкі ў другую і быццам бы змагаюцца то супроць гультаёў, то супроць нізкай прадукцыйнасці працы, даўно сталі такімі прымітыўнымі са сваімі дапатопнымі мудрасцямі, што хочацца смяяцца не з гультаёў, а з іх». Сказана не без з'едлівасці, прыкметнай у апошніх радках, але пераконана і зусім слушна. У гэткай пераконанасці, вынашанай праўдзе крытычных артыкулаў Рыгора Семашкевіча таксама заключаецца іх немалая вартасць, іх здольнасць супрацьстаяць разбуральнаму ўплыву няўмольнага часу, які калі не спісвае у нябыт, дык толькі тое, што зроблена сапраўды таленавіта, усур'ёз, з поўнай аддачай, з чалавечай шчырасцю і грамадзянскай сумленнасцю. Так імкнуўся рабіць, працаваць і Рыгор Семашкевіч. І яго лепшыя творы ў розных жанрах маюць свой запас трываласці.

*Дзмітрый Бугаёў*

# ПАЭЗІЯ



## РАБОТНІК

Выйдзе з касою — гудзе сенажаць.
У кузні працуе — сцены дрыжаць.
Выйдзе з сякераю — стогне ўвесь бор,
Рэха абудзіць бяскрайні простор.

Рукі ў мазолях, абветраны твар —
Вось ён — асілак, зямлі гаспадар.
Шчасце яго: бачыць новенькі дом
З першым над комінам сінім дымком.

Бачыць абшар залатой збажыны,
Колас у колас, спелы, буйны.
Ён, працаўнік, будаваў гэты дом,
Ён жа над кожным пацеў бервяном.

Ён у спякотны чэрвеньскі дзень
На неба глядзеў: можа, хмара ідзе.
Можа, напоіць пшаніцу вадой...
Ён і не ведае, што значыць пакой.
У дружбе з зямлёю, працаю век
Гэты асілак, дуб-чалавек.

1960

## ЖУРАВЕЛЬ

Па дарозе, з гоманам і крыкам,
У сяло сырым асеннім днём
Неслі дзеці грамадой вялікай
Жураўля з параненым крылом.

Жыў у хаце ён зімою белай.
Добра з дзецьмі жораву было!
А сагнала снег — пацыбаў смела
Аглядаць нязнанае сяло.

Неспакойны быў палоннік хворы.
Шмат было з ім клопатаў і спраў.
Навучылі дзеці — шэры жораў
Пад губны гармонік танцаваў.

Пахла у вясеннім наваколлі
Почкамі таполяў і рабін.
Раптам ён убачыў: па-над полем
Пралятае жураўліны клін.

Страпянуўся. А з-за небасхіла
Вылятаў другі касяк здаля.
Нейкая нябачаная сіла
Падняла у неба жураўля.
На зямлі крычалі дзеці хорам —
Зычылі шчаслівых пуцявін.

. . . . . . . . . . . . .

Круг зрабіў над ціхай вёскай жораў
І дагнаў свой жураўліны клін.

1960

## РОДНЫЯ НАЗВЫ

Азёры і рэкі, лясы і дзічына.
Як гэтым багат беларускі наш край!
Шмат вёсак завецца — і ёсць жа прычына —
Зарэчча, Барсучае, Гай.

Сялянам пры паншчыне цяжка жылося.
Чакалі, што, можа, ўсміхнецца ім лёс,
Што жыць палягчэе. Мо чуць давялося —
Надзея, Гарынь, Гаркаслёз?

Жылі у галечы, працуючы ў згодзе.
Сябрам памагалі зрубіць новы зруб;
Дзяліліся хлебам. Ці чулі ў народзе —
Дабрынічы, Мір, Усялюб?

Ніякай яны не цураліся працы,
Да спраў усялякіх была ў іх любоў.
Прыйшлося мо з назвамі вам сустракацца —
Ткачы, Агароднікі, Шклоў?

А шчасце народу прыйшло не адразу.
У жорсткіх баях вызваляўся наш край
Ад гора, няволі.
З'яўляліся назвы
Камуна, Маяк, Першамай.

Шчасліва, высока сцяг волі віецца,
І мы не забудзем, як продкі жылі,
Бо кожная назва цяпер астаецца
Старонкай гісторыі роднай зямлі.

1961

* * *

На беразе рэчкі заціхлі бярозы.
Заціхлі старыя да светлага дня.
Туман асядае — і бліскаюць росы
На грыве майго маладога каня.
Ім роіцца: гэта у дзіўнай вуздэчцы
Прыбег сюды з казкі канёк-гарбунок.
Сплывае апошні туманец на рэчцы:
Іскрыцца начлежніцкі мой аганёк...
А месяц плыве... Ён такі залацісты...
Сцяжынка вузкая віецца ў гай...
Які над табою спакой
урачысты,
Мой родны і любы, зялёны мой край.
З старымі гасцінцамі і шляхамі,
Дзе столькі ўзнікае імкненняў і мар,
З крыніцамі чыстымі і садамі,
Дзе кожны «антон» нібы сонечны шар;
З магіламі ў кожным бары і ў гаі,
Магіламі тых, хто суровай парой
Палёг, каб сягонняшняй ноччу над краем
Быў гэткі харошы, ўрачысты спакой.

1961

# ЛЮДЗІ ВІТАЮЦЦА

Чую знаёмае ў поўдзень і раніцай,
Гэта карціць, да народа вядзе.
Людзі на вуліцах, плошчах вітаюцца
Проста і шчыра так:
«Добры дзень!»
Жыта красуе, і хаты будуюцца,
Нашыя кузні грымяць, як нідзе.
Песні ўсюды вясёлыя чуюцца.
Добры, таварышы, слаўны наш дзень!
Не задаёмся багаццем і сілаю,
Не пакідаем другіх у бядзе.
Цяжка — паможам, каб гора асілілі,
Каб збудавалі сабе добры дзень.
Сёння вітаюцца людзі сардэчна,
Проста і шчыра так:
«Добры дзень!»

1961

## ДЗІВАСІЛ

Зліжуць снег срабрыстыя туманы,
Пазбівае сонца з рэк замкі.
Першымі з зямлі каля парканаў
Вынырнуць ружовыя расткі.

Калі лета нас цяплом атуліць,
Грымнуць перуны, сабраўшы сіл,
Рупяцца знайсці усе бабулі
Той гаючы корань — дзівасіл.

Зробяць бабкі душным ліпнем лекі,
Моцны дзівасілавы настой,
І паставяць у свае «аптэкі»
З цветам і гаючаю травой.

Будзеш мучыцца ў пасцелі хворы,
Будзе белы свет табе не міл,
Як заўсёды у такім вось горы
Дапаможа корань дзівасіл.

Або змерзлы, змучаны зімою
Ты з дарогі вернешся дамоў,
Вып'еш зноўку ты таго ж настою —
Сіла прыйдзе і зайграе кроў.

Ад настою водар летні ў хаце —
Пахнуць кветкі, срэбраны туман.
Сам убачыш, што той корань, браце,
Дзіва-сілай нездарма назван.

1961

## ЛЕСНІЧОЎКА

Лясны, прыгожы кут,
Звініць сасновы хорам.
І леснічоўка тут —
Старая казка бору.

А ў ёй жыве ляснік.
Шумяць лясныя шаты.
Ён, лесу чараўнік,
Заходзіць рэдка ў хату.

Прапахла ўся як ёсць
Жывіцай і зуброўкай.
Які загляне госць
У гэту леснічоўку?

Хіба бацян з сасны
На комін узаб'ецца
Ці лось, рагач лясны,
У шыбу пысай ткнецца.

Ледзь задрыжыць зямля —
Падоўгу шыбы звоняць,
Нібы ляцяць здаля
Байцы на яўку сёння.

Не йдуць у дом лясны,
Як калісь, партызаны,
Дзядулю сняцца сны,
Старыя ныюць раны.

Зязюля будзіць свет,
На зоры не займае.
Шум бору чуе дзед
І ў студзені і ў маі.

Сабраўшыся удвух
Для новае вандроўкі,
Давай мы сходзім, друг,
Пяшком да леснічоўкі.

Кляліся — звычай быў,—
Кляліся мы краіне
Ля сосен. Не астыў
Той звычай. Хай не згіне!

Не пашкадуе, друг,
Нам бор аддаць для вёсен
Свой бессмяротны дух
Вечназялёных сосен.

1961

## ДЗЕНЬ

Я адрываю ліст календара.
Яшчэ адзін вясенні дзень — бывай!
Што ён прынёс? Пачата ледзь зара
Сяўба ў палях пад будучы ўраджай.
Калгас свой парк на пустыры заклаў
З маленькіх клёнаў, ясеняў, рабін.
Сусед будоўлю хаты распачаў,
У цёткі Насты нарадзіўся сын.
Малыя дрэўцы будуць за сялом
Зіхцець вясеннім ранкам у расе,
Закончыць будаваць прыгожы дом
І справіць наваселле мой сусед.
А цёткін сын — прыйдзе яго пара —
Ўзмужнее, выйдзе у шырокі свет.
Я адрываю ліст календара.
І рады: дзень ў жыцці пакінуў след.

1961

* * *

За ліўнямі, за аркамі вясёлак,
У краі песень і юначых мар
Юпітэр — на Дзяржыншчыне пасёлак,
На ціхай Жлобіншчыне — вёска Марс.

Там да упаду вечарамі polькі,
Не спіцца там удовам па начах.
А цішыні празрыстай, звонкай колькі,
Блакіту ціхага ў даверлівых вачах.

А недзе на вялікіх касмадромах
Стаяць на старце выраі ракет,
А недзе днём і ноччу астраномы
Цікуюць за арбітамі планет.

Прайсціся б ім,
спакойным, мудрым, грозным,
Каля сваіх бяроз, сваіх буслоў
Да вёскі Марс на сініх-сініх росах,
Да таямніцы — рэк, лесавікоў.

Турысты на праспектах, па вакзалах...
Планета Марс загадкаю маўчыць...
А ў вёсцы Марс іграюць на цымбалах
І немаўляты вучацца хадзіць.

Ўзлятаем, людзі, рвёмся мы за хмары.
Няхай стартуюць нашы караблі!
Не забывайце ж пра зямныя Марсы
І незямныя цуды на Зямлі!

1962

* * *

Прынеслі вяскоўцы з Іспаніі
Боль незагоеных ран
І слаўную мужную песню
З прыпевам: «No pasaran!»
Песню, якая пахне
Ветрам і голлем Гранады,
Якая грыміць,
Як грымелі
Мадрыдскія барыкады.
А я з сорак пятага,
А я з сорак пятага,
Равеснік Дня Перамогі
І выбуху першага атамнага.
Сёння вісіць
Над зямлёю нашай
Гэтая бомба —
Мая равесніца страшная.
Устанем жа, аднагодкі,
І крыкнем туды, дзе спадман,
Людзям хіжым і здрадным:
«No pasaran!»

1962

## МАГІЛА ЛЁТЧЫКАЎ

Зіхаціць абеліск. Няма агароджы —
Іх аддаляць не трэба, няможна
Ад песень і сонца.

Ім, як жывым, усё гэта трэба,
Над імі ціха сінее неба
І зорныя ліўні.

І сэрцу верыцца, верыцца зноўку,
Што поле — стартавая пляцоўка
Для непакорных.

Іх сон часовы... Квітнее поплаў.
Устануць хлопцы з усмешкай цёплай
Насустрач сонцу.

Тады абеліск адсюль ракетай
Сарвецца, пойдзе над белым светам
Да новых зорак.

1962

## САКАВІК

Калі зіма здалёку едзе
Са світай сіверных вятроў,
Тады ў бярлогах ўсе мядзведзі
Хаваюцца ад маразоў.

Там мякка, цёпла на галінах.
Як рай... Засуне лапу ў рот
Ды сніць пра спелыя маліны
І пра салодкі дзікі мёд.

Худыя, злосныя, нядужыя,
Пад лёгкі пошум баравы
Брыдзеце па вясновых лужынах,
Мядзведзі, вы або не вы?

У Налібоках, Белавежы
Вясною ранняй кожны год
Вас хіліць вецер моцны, свежы
І аглушае крыгаход.

А зайцы у вясновым хораме
Гаспадарамі ў гэты час.
Вялікія! О як жа сорамна
Бяссільнымі мне бачыць вас.

1962

* * *

Ажыўшых сосен чуцен звон  
Каля ракі.  
Не дзеці ў санках мчацца з гор,  
А ручайкі.  
З галубкай голуб буркаваў  
Днём на страсе.  
Як многа кожны новы дзень  
Навін нясе!  
Не спіцца... Сон мой, пэўна,  
збег  
У чараты.  
Хтось ноччу стукаў у акно...  
Вясна ці ты?

1962

## ПАЧАТАК

А сонца зноў зайграла, засвяціла,
І грымнулі аркестры капяжоў.
Хай веснавы агонь цячэ па жылах
І будзе на пачатку добрых слоў.

З раллі цяплом павеяла салодкім,
Да раніцы хвалююся, не сплю.
Ну як ты там, чаканая паводка?
У вокнах зоры цёплыя лаўлю.

Мне студзіць вусны мокры крык птушыны,
На рэках гул трывожны і густы.
Дрыжаць вам заўтра, шумныя плаціны!
Трашчаць вам заўтра, вузкія масты!

1963

* * *

Людзі крадуцца па роднай зямлі крок за крокам.
Так вось было ў нас у тым сорак трэцім
далёкім.
Я ў Беларусі жыву. Між лясоў мая вёска.
Добра нам з соснамі жыць. У суседзях
і зімы і вёсны.

Лес партызанскі. Ледзь ступіш —
з варонкі снарада
Вырвецца птушка ды ў неба нясе сваю радасць.
Сосны падбітыя ў сэрцах асколкі трымаюць.
Лес на вяршынях суровую казку люляе.
Дзе ж вы, ў далінах ці ў горах,
кроўю сыходзіце, людзі?
Вёсачка наша спакойнаю сёння не будзе.
Усталі б, пайшлі на падмогу лугамі, палямі.
Толькі пасталі кардоны, заслоны між намі.

Лес мой! Ідзі. Памажы саламянай хаціне.
Лес мой! Ты дужы. Цябе ніхто не запыніць.
Войскам, магутным і волатным войскам
Рынься туды цераз рэкі, балоты і вёскі.
Сосны ля вокнаў шумяць непакорныя, гордыя.
Пэўна, збіраюцца ўдалеч чародамі.
Вырушаць зараз... Сосны, ідзіце.
Людзі! Сустрэнеце,— шлях пакажыце.

1963

* * *

Ноч туманная вясной.
Сеяў век у нашым лесе
Міны даўняю вайной,
Жалуды цяжкія летась.
Ціха адтае зямля,
Парна ў лесе, як у лазні.
Гэтай ноччу, знаю я,
Парасткі з зямлі вылазяць.
І зялёнае жыццё
Вырастае ў нетрах сонных.
Будзе ажываць усё...
Спі... Я папільную сёння
Свет, які знайшоў спакой
І зусім, відаць, не знае,
Што пагодаю такой
Нават міны прарастаюць,
Што ў сасонніку густым,
Па-над гнёздамі, над гліцай,
Як купчастыя кусты,
Могуць выбухі узвіцца.

1963

# НАЧЛЕЖНЫЯ ВЕРШЫ

## I

У партызанскім краі цішыня.
Бярозы... Сонца... Поезд прастукоча.
І толькі у лугах маіх да дня
Начлежныя кастры гарацъ штоночы.

Дарогі сціхлі, вёскі нашы спяць,
Адно хлапцы ў сваё ідуць прыволле —
Не толькі коней пасвіць, а спяваць,
Кастры паліць і жартаваць уволю.

Туман стаіць да самае зары.
Не раз агні ўжо сонца сустракалі.
Гарэлі Каліноўскага кастры
І дзеда Талаша кастры палалі.

Гарачы век... Не спяць хлапцы ў траве.
Пяюць пра зоры, шчасце, пра паходы.
Кастры не гаснуць. Гэта ў нас жыве
Вялікі дух вялікага народа.

## II

Мне ў век нейлону, атаму, ракетаў
Прыйшлося коней у начлег ганяць.
А ведаеце — слаўна добрым летам
Кастры начныя ў росах раскладаць.

І дружна пасвіліся нашы коні
У муражынах цёплых, маладых.
Іржалі звонка — і па ціхіх гонях
Ляцела сіла маладая іх.

Нас гэта сіла часта выручала...
Скрыпелі дні, нібы даўгі абоз.
«Но, родная!» — імперыя крычала.
Паволі конь цягнуў планеты воз.

Міналі дні... Пасля каня змянілі.
Куды яму, старому. Смех і грэх.
...Здзіўляюць і мяне аўтамабілі,
А ўсё ж такі люблю і я начлег.

І вось нядаўна кінулася ў вочы:
Сівы вазак, падняўшы галаву,
Глядзеў трывожна ліпеньскаю ноччу
Ў нябесную густую сіняву.

А там гудзелі самалёты ціха
І поўня плавала у светлым сне.
Ён вушы натапырыў... Што за ліха?
Здалося, ўверх ён зараз сігане.

Але стаяў, таптаў траву на месцы
Былы вазак вялікае зямлі.
Начныя самалёты, спелы месяц
Ў вачах вялікіх таялі, плылі.

Стаяў... Пасля світанне занялося.
І будзе шмат хто жыць і паміраць.
Але шкада — не ўсім нам давялося
Ў апошнія начлегі коней гнаць.

1963

* * *

Сад вартую, і не спіцца мне.
Дзіўнае начное наваселле.
У маім прасторным будане
Смачна пахнуць яблыні і сена.

Цішыня у садзе шмат начэй...
Мо чакае хто гадзіны лепшай?
І сабака мой зусім здзічэў —
Як на зоры, на ранеты брэша.

Спяць дарогі, вербы ля ракі.
Я не сплю. І ціхі сум і змора.
Хай бы ў сад залезлі хлапчукі,
Абтраслі і яблыкі і зоры.

Хай бы кожны тут мурог таптаў,
Страх свой пасылаючы да д'ябла.
Я ж бы і сабаку патрымаў —
Свету не шкада ім, што там яблык.

Мо з сукоў хто б пляснуўся далоў —
І гурмой шумлівай уцякалі,
І з усіх сабак, вартаўнікоў
Мы на ўсё ваколле рагаталі.

1963

* * *

Не наракаю на цябе, мой лёс,
За тое, што не раз пад родным небам
Гарэлі ногі ад сцюдзёных рос,
Што ў хаце часам не хапала хлеба.

Як запаветнае ў душы нясу
І шчасце свету, і ўсю бездань болю,
І матчыну гарачую слязу,
І ціхі шэпт параненай таполі.

Ніколі мне ад тых трывог і бед
Не уцячы, нідзе мне не падзецца.
На сто часцін расколваецца свет,
А трэшчыны усе ідуць праз сэрца.

1964

* * *

Можа, ёсць дзе барана старая
Або колы з дзедаўскіх калёсаў?
Не кідайце так іх, я вам раю
Усцягнуць на дуб або бярозу,
Што шумяць у вас ля самых вокан.
Дужыя галіны утрымаюць.
Там прыгожа, вольна і высока.
Там буслы паселяцца да мая.
А буслы — каб шчасцем дом быў повен,
Каб жылося ў згодзе і ў дастатку.
Ну, спярша гаспадарам праз комін
Кожны год укінуць па дзіцятку.
Будуць клекатаць яны шчасліва
І купацца у праменнях сонца,
Клікаць нас усіх за нашы нівы
Ў незнаёмыя лугі і сосны.

1964

## САЛДАТ

А потым ён заснуў. І доўга спаў.
Ён так не спаў яшчэ ў жыцці ніколі.
Удзень атрад сапёраў міны рваў,
Што засталіся ў быльняговым полі.

А ён не чуў. Дрыжалі хаты, гай.
Спаў чалавек спакойна, без трывогі.
І поўначчу таксама ў гэты май
Вярнуўся салавей з цяжкой дарогі.

Успырхнуў на галінку над акном,
Запеў на ўсе лады — ну проста дзіва! —
Пра шаляваны, ў цёмных грушах дом
І надвіллянскую сваю радзіму.

Нібы хацеў сказаць: «Ну вось і я.
У любы край свой з песняю вярнуўся.
Ты слухай, свеце, песню салаўя».
Ён доўга пеў. І чалавек прачнуўся.

1964

* * *

Хай будзе май пагодны і росны,
Каб жыта добра гнала у колас.
Хай чэрвеньскі дзень
будзе з ветрам ад рання,
Бо пачынаецца красаванне.

А ліпень — сонцам увесь наліты,
Каб добра трубіла жыта.
Клёны лісцяў хай многа маюць,
Іх дзеці на першы бохан збіраюць.

Гэту малітву пра хлеб шапчу я без ліку
З часу, калі быў малы я,
А слёзы ў людзей — буйныя.
О як яны паляць яшчэ і цяпер
Вусны мае...
Рукі мае...
Сэрца маё...

1964

* * *

Урокі малявання я любіў
Найбольш усіх урокаў. І вазьму
Усе рознакалёрныя алоўкі.
І буду маляваць да забыцця.
Вось нарысую маму я сваю
І размалюю ў ясна-сіні колер
Яе сукенку, а пасля жакетку
Зраблю малінавай.
О, як прыгожа, людзі!
Сястрычцы на малюнку ў рукі дам,
Напэўна, ляльку ці медзведзяня.

А хату, хату намалюю я,
Да неба хату.
З вокнамі — як дзверы.
А ў вокнах — фікусаў зялёны лес.
Як добра маляваць! Але пара,
Канец урока настае так хутка.
Адзнакі я чакаю нецярпліва.
Глядзіць настаўнік сумна на мяне
І кажа: «Дзе ты бачыў
Такую хату, з вокнамі такімі?
Ну, а жакетка ёсць такая ў свеце?
Табе сягоння двойка, недарэка».
І праўда, гэткай хаты не было.
Была зямлянка, змрочная, сырая.
І ў мамы не было тады жакеткі.
Сястрычка толькі сніла тыя лялькі,
Бо так нядаўна адышла вайна.
Урокі малявання! Добры дзень!
Я часцяком успамінаю вас.
Мы хату новую пабудавалі,
Вазонаў паліваем цэлы лес.
Урокі малявання! Вас люблю,

Люблю да гэтых дзён.
І ведаю, што будуць хлапчукі
Заўсёды над папераю схіляцца,
Няўмелаю рукой вастрыць алоўкі.
І цуды-дзівы будуць маляваць:
Дарогі і машыны, касманаўтаў,
Ракеты, што падобны на жырафаў...
Няхай малююць, хоць няўмела, можа.
Я толькі, людзі, пра адно прашу:
Не стаўце, калі ласка, двоек ім.

1964

* * *

Спакойныя далёкія дубы,
Крыніца разам з птушкамі шчабеча.
Асенні кліч ласінае трубы
Заве углыб на баравое веча.

У гулкі рай, дзе бог адзін — ляснік,
Я уцяку, нібыта ў партызаны.
І будзе раніца. І першы крык,
І росныя туманныя паляны.

Зямля, ты гэта загадаеш мне
І завірухаю, і спелым ліўнем.
А папрашу ласкава — па вясне
Пяро на шчасце добры бусел скіне.

О бацькаўшчына наша! Зноў і зноў
Ідзём ад спрэчак, радасці і працы,
Каб грэцца ля рабінавых агнёў
І чысціні снягоў тваіх схіляцца.

1964

* * *

Пыл з плячэй дарожны абтрасай,
Сядзь каля парога дарагога.
Хай даруе нам бацькоўскі край,
Што парой мы не прыходзім доўга.

Свежы подых тумапоў начных...
Траў буянне... Дальні бляск зарніцаў.
Сэрца! Ты гатова ў гэты міг
Веснавой пупышкай распусціцца.

1964

* * *

Удар! — і мяч ля сонца ля высокага,
Ты слаўна можаш з ім гуляць, хлапчук.
Скачок! — праз плот высокі пераскокваеш.
Ты спрытна лазіш у сады, хлапчук.

Звінеў мне звонкі смех твой несціхана
І бляск вачэй свяціў трывожна мне,
Калі гадзінамі,
з цямна да рана,
Вар'ят далёкі трызніў аб вайне.

Яшчэ чытаеш казкі ты да поўначы,
Адданы ўладзе падарожных мар.
Гарыць, гарыць па-над табой, трывожачы,
Таемнасці нясказаны ліхтар.

І як працяг бадзёрага, задорнага,
Тваіх цікавых хлапчуковых спраў
Наш новы век такое непаўторнае,
Цудоўнае табе наканаваў.

Не мяч — зямлю, што злом яшчэ засеяна,
Да сонечнага, чыстага каціць.
Не ў сад чужы — ў Галактыку суседнюю
Залезці — і яе там патрасці.

1964

# МАЙ

І быў, нібы дзіця, шчаслівы гаспадар,
Той, што прынёс перадсвяточным днём
Цяжкую вязанку бярозавага вецця,
Якое ў старане той называюць маем.
Умаіць дом! Прынесці гаю пошум,
Звон салаўёў-разбойнікаў і сонца.
Галінкі ўсюды — ў гладышах, у кубках.
Як добра засынаць і бачыць зоркі
Там, за акном, таксама у галінах,
І адчуваць сябе калі не зоркай,
То нечым добрым. Соладка і родна.

Лясы мае! Вы ветразі над светам,
Як слаўна вас любіць і гадаваць,
А потым гнаць удаль па сініх рэках.
А ўслухайцеся ў музыку імёнаў
Калысак нашых самых запаветных —
Бярэсце, Ельск, Калінкавічы, Гай.
Я мог бы напісаць даўно трактат
Пра лес, але я лепей раскажу,
Што хлопчыкі з бярозы сок спускаюць
І сёлета. А потым п'юць. Як п'юць!
Рунеюць шчасцем поўні-вачаняты,
Збанкі ўгару. А той — нагбом. Ямчэй.
П'юць доўга. Кожны год.
Напэўна, вечнасць.
Чакай, хлапчук! Яшчэ не раз пасля
Успомніцца табе вось гэты самы
Ласкотны, далікатны халадок,
Які ты здабываеш сам з бярозы,
З грудзей зямлі. І ён пакліча ўладна
Да першых сцежак і да першай песні
У час любові, радасці і гора.
Ці пройдзеш нават ты

Праз д'ябальскае пекла,
Хай гэта быль паўторыцца заўсёды —
Адзін, другі шчаслівы гаспадар
Прынёс дамоў перадсвяточным днём
Цяжкую вязанку бярозавага вецця,
Якое ў старане той называюць маем.
Май на плячах,
Май у руках,
У хаце,
У гладышах і кубках,
І на зямлі маёй —
Таксама Май...

1965

* * *

Чырвонае лета!
Колькі песень спета.
Маліны спяліла,
Па сцежках вадзіла,
Блудзіла...
Позна спаць нас клала,
Рана падымала.
А мне, маладому,
Хоць не йдзі дадому.
Прастаяў да ранку
Ля зялёнай брамкі.
Чырвонае лета.
Твая ноч каротка,
Але і салодка.
А зімняя злая,
Хаця і даўгая,
Чырвонае лета.
Ты мала бываеш,
А моцна буяеш...
Колькі там гуляння,
Колькі расцвітання,
Чырвонае лета.
А мы ўсё чакаем,
Цябе выглядаем
І зімой успомнім
Сакавіцкім промнем,
Чырвонае лета!

1965

## КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ

### 1

Вочы на свет закрываць не трэба —
Ёсць у прыроды туманныя дні.
Вось і завешчаны далеч і неба.
Як праз ваду — вечарамі агні.

Што вы, туманы, ў сваім вар'яценні
Так замуцілі вякі і гады
І на прастор наш барвова-асенні
Зноў нацягнулі далёкай бяды?

Зноў я адкінуты вамі, туманы,
У перабыты бязлітасны час.
Стук?
Гэта быццам бы бой барабанны.
Крык?
Перад сконам, паўстанцы, да нас!

Скончана ўсё. Так паспешна у лёхах
Світку мужыцкую здзёрлі з плячэй.
Гэтыя ж тут, недзе блізка, патроху
Гаснуць без жалю любімых вачэй.

Воды сцюдзёныя, гнуткія кладкі —
Трэба палотны бяліць.
Я не кравец, не шавец аніякі,
Трэба кашулі смяротныя шыць.

Голас ад гора дрыжыць і нямее —
Трэба ісці галасіць.
Я і магілы капаць не умею —
Мёртвых жа трэба у дол апусціць.

Толькі ідзі, ідзі і не падай.
Доўга туман над зямлёю стаіць.

. . . . . . . . . . . . .

Сходзяць туманныя дні з лістападам.
Сонца праглянула...
Жыць!

## 2

Вось далакоп, і шавец я, і столяр...
Доўга стаялі туманныя дні,
Твар мой збялеў ад жалобных застолляў,
І зледзянелі пагляду агні.

Столяр, калыскі на шчасце майструю
Для немаўлятаў усіх.
Я і шавец, і абнову любую
Шыю для святаў зямных.

Вось я рыдлёўкаю грунт наш капаю —
Дрэўца, хлапчук, пасадзі.
Вось я і сумную песню спяваю
Там, дзе нядаўна блудзіў.

1966

## ВЯЛІКІ РАСЦІ

Хлапчук! Ты можаш нават падысці
Да берагоў той рэчкі несціханай,
Але маёй там рэчкі не знайсці.
Маленства воды! Сталі вы ў жыцці
Здабыткам цёмнай прорвы акіяна,
Снягоў, дажджоў, вячэрняга туману.

Вялікі будзь і пад дажджом расці,
Хлапчук, ля той рачулкі несціханай.

1966

* * *

І гэты вечар. Дождж і гром.
І бор з абпаленым галлём.
Зноў, як тады, грымотны май.
Любоў і боль душы — праз край.
Хоць час, прызнацца, не такі —
Такуюць зноў цецерукі.

Іх гергетанне я пачуў,
Хоць лес шумеў, вяршыні гнуў,
А потым сполах бліскавіц,
Нібыта рэпарцёрскі бліц,
У цокаце дажджу заззяў
І ў памяць мне зафільмаваў
Салодкі міг... Цудоўны міг...

На чараду ялін старых
Адны ўзнімаліся і зноў
На дол зляталі да кустоў.
Другія даганялі іх.
Зноў цемень. Толькі ловіць слых
Шчаслівы звон цецерукоў,
Як водгук зразумелых слоў.
Успышка. Дзе канец трывог?
Іх пер'е падае на мох.
А бура, вецер, страшны дождж.
Ну, дык і што ж? Ну, дык і што ж?
Дрыжаць і дрэвы і кусты.

А ці не так, зямлянін, ты?
Было і ёсць. Свінцовы дождж.
Чыгунны крок. І ўсё ж, і ўсё ж,
Пакуль кароткі перадых,
Адтае сэрца. Губ тваіх
Не згасне спёка. Сціхне бой —

І крык над гэтаю зямлёй:
«Адзіны мой! Каханы мой!»

Няпраўда, ён не вечны бой,
А вечны крык: «Каханы мой!»

Харошы ў буру час такі.
Такуюць зноў цецерукі.

1966

## ЗЯЗЮЛЯ

На кліч зязюлі расквітнее сад.
Ку-ку! Нібы па залатой драбінцы,
Па гуках тых як хораша назад
Спусціцца мне, у далечы прабіцца.

Адзін бясплатны на зямлі прарок
Ты, шэрая, як часам шчасце наша.
Бяздомніца. І толькі галасок
У сэрцы гнездзіцца. А мне не страшна.

Дзень добры! Кліча... Ледзь зара дрыжыць.
І ноччу кліча. Мы даўно паснулі.
Лягчэй вясну без хлеба пражыць,
Чым без зязюлі.

1966

## КАЛЯРОВЫЯ СНЫ

Ці снілі вы сны каляровыя?
Салома валасоў каханай...
Рабінавыя навальніцы,
Сойкавыя світанні,
Варажбітныя травы.
Ці, як у штодзённым кіно,
Тон вашых сноў шэра-белы?
Фільмам даруем.
Яны ствараюцца па сцэнарыях.
Большасць сцэнарыяў — шэрасць.
Шэрае афармленне пасуе шэрай задуме.
Іх правал выратоўвае музыка і рэклама,
Яшчэ — канстытуцыя модных актарак.
Але жыццё не сцэнарый, напісаны некім.
Таму і павінен на кожным праглядзе,
У кожным дыханні,
Нават заплюшчыўшы вочы, і ноччу
Бачыць жыццё ну хаця б такім:
Пунсовыя вусны хлопчыка Лёнькі
З блакітнага з абводкамі кубачка
Смокчуць малако.
Потым рукі, колеру ранняга золата саломы,
Ставяць кубак на стол, і над вуснамі
Адну хвіліну — белая пасачка малака.
Мне здаецца, што свет — гэта фарбы.
Згушчэнне, бег фарбаў.
Нават гісторыя афарбавана ў калёры:
«Чорная ноч рэакцыі...»,
«Пунсавее зара рэвалюцыі...»
Шэрасці фільмаў даруем.
Яны напісаны па сцэнарыях.
І большасць з нейкай мараллю
Або закругляюцца гладка.
Але жыццё не сцэнарый.

Кожны сцэнарый жыцця, напісаны некім,
Страціў усё. Гінуць калёры, знікае жыццё.

Шэры попел Асвенціма, Арадура, Майданака.
Але праз попел прабілася вечная кроў,
сінія вочы
І, між іншым, чырвоны сцяг над рэйхстагам.
Не актор на экране, а мы задыхаемся
ў лабірынтах
Сюжэтных схемаў жыцця, без нас
накрэсленых.
І часам мы плацім жыццём за іх знішчэнне.
У фарбах свет вольны.

Я люблю каляровы свет.
Хата з сінімі аканіцамі
І півонямі пад акном.
А вось і Лёнька з рыжым Барсікам.
Вы ніколі не станеце попелам?
Вы свет ніколі не ўбачыце шэрым?
Добра, тады пабачу, сасню вас такімі —
Блакітнавокага Лёньку,
Хату з сінімі аканіцамі...

1966

* * *

Так, некалі на модны чамадан
Мне начапляюць турыстычных бірак.
Паеду я за блізкі свет сустрэць
У зале старажытнага мастацтва
Дзівосную усмешку Монны Лізы,
Якая, пэўна, шостае стагоддзе —
Загадка і манаху і міністру.
Няхай і мне эпоха Адраджэння
Пасвеціць. Можа, нават усміхнецца.

Але і гора мне! На землях тых,
Дзе будзе мчацца мой экспрэс вясёлы,
Крычыць трагедыя майго сяла.

Дваццаць магіл землякоў,
Магіл, раскіданых па ўсёй Еўропе,
Дваццаць год чакаюць
Прывету, слова над пагорачкам.

Кажучы шчыра, яны не чакаюць нічога.
Яны не чакаюць.
Але, жывыя, мы думаем гэтак,
Хочам бачыць іх ля сябе.
Ці не таму пакідаем
У свята дзядоў
Глухой лістападаўскай ноччу
Розныя стравы на нашых сталах,
Каб тыя прыйшлі і па-людску пад'елі.
Імчыць экспрэс... Яго ты не прыпыніш.
Ды і ці знойдзеш дзе павадыра,
Які правёў бы па чужых дарогах
І быў бы, нейкім цудам, звышвідушчы,
Каб змытыя дажджом і сцёртыя пяском
Мог адшукаць сярод усіх магіл

Там, на таблічках, прозвішчы сяла,
Знаёмыя, як вуліца сяла?
Імчыць экспрэс. Хоць пасівей ад болю.
А дваццаць крыкаў, нібы дваццаць
бомбаў,
Між гарадамі ў цемрадзі палёў
Ірвуць чыгунку.
А цеплавоз, купэ і рэстаран —
Ніхто аварыі не бачыць гэтай,
Што дваццаць раз ляжаў я пад адхонам,
Што дваццаць раз крывёю я зышоў.
Пасля ізноў стаяў каля акна.
Так, зловіш неўміручую усмешку
У зале старажытнага мастацтва,
Але ніколі і ніяк не зможаш
Аддаць паклон, слязу альбо букецік
Сваім вяскоўцам ад пагодкаў іхніх.

О Монна Ліза...
Эпоха Адраджэння...

1966

## ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ Ў ЧАЦВЕР

Прыязджайце ў будучы чацвер.
Я сам рыхтуюся усе закончыць справы,
Бо ў будучы чацвер у нашым доме
Цікава будзе вельмі. Ціхі дом
Зноў ажыве, нібы ўздыхне вальней.
Да нас прыедуць пагуляць на лета
Пляменніцы мае. Цікавы адпачынак!
Звон галасоў штодзень да ночы будзе
Ад сцен адскакваць мячыкам тугім.
Або ідзі за імі ў луг і растлумач,
Што тыя вунь расліны,
Якія толькі квятамі завуць,
Займелі назвы: іван-чай, румянак...
Ды адкажы на мудрае пытанне:
Чаму, адкуль і як цячэ рака?
Народ цікаўны — гэтыя блізняты.
У будучы чацвер яны прыедуць.
На сцежцы ў жыце глянуць па баках
І скажуць ціха: «Вось расце саломка».
(Наш аграном і той, відаць, згадзіўся б,
Што часам сее жыта — жне салому!)
Я думаю, што ў гэтым свеце мы
Не бачылі яшчэ цікавай сваркі.
Я пакажу паціху праз акно,
Як тузаюцца, мокрыя, на ранку.
Каму з іх выціраццa кветкай той,
Што вышыта адна на ручніку?
Ну дзеці, што з іх возьмеш.
Усе прадметы ў свеце стануць раптам
У іншым распарадку.
Паслухаем. Даруем іх грахі.
Навучацца яшчэ...
Дык прыязджайце ў будучы чацвер.
Абавязкова!

1966

## ПРА ЗЯМЛЮ

Колькі вас ад роднага парога
Ў свет пайшло? Прыпомняць караблі...
Што на развітанне, на дарогу?
Жменьку незабыўнае зямлі.

Людзі ехалі у край прыгожы.
Жорсткія віткі дарог чужых.
Шчасця! Ўсе Амерыкі трывожна,
Непрыветна сустракалі іх.

Толькі нібыта другое сэрца
Быў грудок зямлі, што ўзялі ў шлях.

. . . . . . . . . . . . .

Як табе, зямля мая, жывецца
На усіх шасці мацерыках?

Над Віллёй, над Бугам ноч лунае,
Чую я у прадсвітальны час:
— Я зямля, я вечная, я тая,
Што ў далёкай далечы ад вас.

Спяць палі, і неба спіць чужое.
Месяц думу думае сваю.
Толькі я не ведаю спакою,
Я — зямля. Я землякам пяю:

— А-а, а-а, спіце, людзі, спіце,
На радзіме веснавы размах.
Вы зямлю сваю, зямлю любіце.
Я не паміраю у вяках.

1966

* * *

Не! не з нас пачалося,
Не пры нас прападзе
Той саюз — сугалоссе
Дарог і людзей.

Ты, зязюля, накажаш
Пра дарогу ізноў.
А дарога раскажа
Боль вякоў. Боль гадоў.

...Мчалі коннікі ноччу,
Падганяла іх злосць,
Не туманяцца вочы,
Шлях прапаў. Мэта ёсць.

Хто паўстанцаў, іх, вызнаў,
Вывеў боль на расу?
Коні цуглі пагрызлі.
Глядзі — разнясуць!

Леглі хлопцы на грывы,
Рукі ў жорны зубоў
Конскіх! Толькі маўкліва
З пальцаў капала кроў.

Ціха іскаркі кветкі
З кропель тых прараслі,
Безгалосыя сведкі
Ля дарог узышлі.

Крыкам лебедзяў раннім,
Сосен стогнам сухім,
Курганом безымянным,
Нават ценем начным.

Ты, дарога, нам вернеш
Іх дыханне і дзень,
Хоць адзінае зерне
З жыта іхніх надзей.

І за тым летуценнем,
Што так хочам знайсці,
Як за светлым натхненнем,
Мы гатовы ісці...

...Зноў зязюля кукуе.
Дыхаць стала лягчэй.
Хлопцы, пэўна, пачуюць:
Сабяруцца хутчэй.

1966

* * *

Мые вадой дажджавой валасы.
Мала таго — у запас набірае.
Быццам і праўда, для гэтай красы
З рэчкі вада — зусім не такая.
Лівень. Яна яго ў вёдры злівае.
Лёгкія рукі уверх ускідае.
З ганка праз дождж мяне моўчкі пытае:
«Я не зайздросная, я не скупая.
Хіба, што рэчка, таго я не маю?
Хіба не пахнуць вясной і зімою
Косы без рэчкі мятай рачною?
Ці пазычаць жа, скажы, у ракі той
Мне для вачэй маладога блакіту?
Я танцавала, смяялася, пела,
А затужылася — неба не мела.
Вось я і мокну. І лівень зліваю.
Я не зайздросная, я не скупая».

1966

* * *

Вар'яцелі цёплыя дажджы,
І крычала маці: «Ну, бяжы,
Ну, бяжы, сынок, бяжыце, дзеці,
Пад вясновы дожджык — падрасцеце».
Ліў струмень на плечы, валасы
Кожны год так весела і колка.
Рос ты хутка, як растуць аўсы,
Дрэвы, травы, росная вясёлка.
Трэба й мне пусціцца басанож.
Ростані, глядзі, дажджы звязалі.
Дзе ж вы, пабрацімы? Грае дождж.
Мне залевы сёння падказалі
Шмат чаго, што можа дождж сказаць,
Робячы вялікую паверку.
Гэта проста дождж — ні даць ні ўзяць,
Гэта шчасце нам — такою меркай.

1966

* * *

Ты яшчэ не хмеліш галавы,
Лёгкі чад купальскае травы.
Ты яшчэ смяешся, ты пяеш
І дыхнуць свабодна не даеш.
Гэта ўсё нібы трывожны сон.

На нябёсах — зор таемны звон.
Ну, а тут за ціхія сады
Беглі лугам, кладкамі сляды.
Ценем галубінага крыла —
Вось якой ты лёгкаю была.
Што мы мелі? Толькі боль разлук,
Вечны холад неспакойных рук,
Бег трывожных думак па начах.
Радасць. Ростань, смутак і адчай.
Не сустрэнецца гара з гарой.

Толькі мы сустрэліся з табой.

1966

## ЗОЛАТА САЛОМЫ

Як зорка жнівеня ляціць — лаві, рука! —
То зерне першае злятае з каласка.

Дні на сыход. Адбіў найдоўгі час.
Дзень золата саломы сёння ў нас.

Прыйшлі камбайны людзям памагчы,
Хадзілі ціхім ходам да начы.

Паплыў жытнёвы саладкавы дух,
А з гнёздаў перапёлак — шэры пух.

Хадзем, малы! Глядзі, усе пайшлі,
Зямнога шчасця вязкі паняслі.

Так! Кожны руніцца, даўно прывык
Набіць саломай свежаю сяннік.

Як добра спіцца... Спаць куды лягчэй,
Ну, не расплюшчыць раніцай вачэй.

Салома жытам толькі што была,
Яна яшчэ расце, не дарасла.

Яна пахуча сонцам аддае,
І волкасць адчуваецца яе.

Ляж, хлопчык, на святую чысціню —
Ты ж сам, як чысціня яе агню.

І кожнаму сваё — які тут здзіў? —
Я ж золата такое палюбіў.

Агонь кастра, ваду, удар вясла.
Салома сёння да мяне прыйшла.

І покуль водар гэты не ачах,
Пакаюся ва ўсіх сваіх грахах.

А потым буду блаславёна спаць.
Як дзіўна! Золата, а не купляць.

І толькі залатыя сны адны,
Прысняцца людзям залатыя сны.

1966

## МАЁНТАК

Хада падзей магла ісці інакшай,
Зусім паціху, проста дзень за днём.
Але быў ліпень, сонца, лес і дача,
Стары вялікі мураваны дом.
  Струхлелая раскоша балюстрады.
  Іл:жэкласічнасць... Ціша... Забыццё...
  На вузкіх лесвічках, калісь парадных,
  Не размінуцца нам было з жыццём.
Скрозь вежы заімшэлі. Смерць эпохі
Той, што сюды не вернецца назад.
Спачатку быў напад чартапалоху
На ўвесь падворак, кветнікі і сад.
  Чартапалох рос жорстка і ўрачыста,
  І сэнсу не было яго касіць.
  Няхай буяе справядліва-чысты:
  Тут столькі год закон быў — добра жыць.
Так, пажылі. А што ад тога раю?
Агонь, і меч, і посвіст бізуноў.
Сялянкі ў песнях сумных праклінаюць
І сёння на жніве усіх паноў.
  Палац... Ён з часам не хацеў мірыцца.
  Але дарма. Ужо струхлеў паркет.
  Калі я нёс у гэты дом суніцы,
  Здавалася — нясу іх на той свет.
Пануе цішыня. Зусім звяліся
Пяшчотныя калісьці галубы.
Яны здзічэлі, узняліся ў высі
І паляцелі ў пушчу на дубы.
  І я, хлапчук, дарма свістаў услед ім,
  Дарма і сонцу я махаў рукой
  Хавацца нанач не за лесам гэтым,
  А ў галубятні, назаўжды пустой.

1967

# АПОШНЯЯ НОЧ КАЛІНОЎСКАГА

Заўтра ўсё... Заўтра смерць.
Мяне выведуць каты.
Сакавік на двары... Яшчэ тыдзень —
і птушкі дамоў,
О буслы, дзеці сонца!
Летучы, адшукайце вы хату,
Дзе жыве маё шчасце, якога ў жыцці не знайшоў.

У вясновай красе! Ясна-чыстая, нібы бяроза.
Вуснаў не цалаваў і яе не насіў на руках.
Птушкі! Людзі казалі... Прашу вас праз слёзы —
Ўкіньце вы ёй праз комін маленькага хлапчука.

Хай ён будзе маім! Тую дзеўчыну вы папрасіце.
У краіне цяпер будуць вісельні, здзекі і жах.
Будзе слухаць ён жаль перапёлкі
у стоптаным жыце,
Песні ціхія з прызбаў па вечарах.

Веру — кроў мая ў сэрца яго застукоча.
І калі прыйдзе час новай гнеўнай касьбы,
то ізноў,—
Хай жа пільнымі будуць і ноччу
і днём яго вочы.
І пажары палацам! За мову, за слёзы, за кроў!..

Хлопчык мой! Я цябе, дарагі, абдымаю.
На радзіме маёй здратаванай павінен ты быць.
Крокі ў лёхах! Ужо і світаць пачынае!
Беларусь, мая маці! Ты будзеш, адзіная, жыць!

1967

* * *

Бывала, святам поўны дом гасцей
Да нас заўсёды прыйдзе і наедзе.
І так было заўсёды найчасцей,
Што за сталамі месціліся ледзьве.

Збіраліся ўсе бацькавы сябры,
З якімі ён не раз дзяліўся хлебам,
І саграваўся пры адным кастры,
І ў бой хадзіў, і разам спаў пад небам.

Спявалі госці, і пілі да дна,
І яблыні у садзе абтрасалі,
Крычалі, ўспаміналі давідна
І зноў пілі, і спаць нам не давалі.

Я спадцішка не раз тады злаваў,
Што загуляліся, што ўжо віднее.
А бацька мне з усмешкаю казаў:
«Нічога, хлопчык, ты паразумнееш».

1967

## ЭЛЕГІЯ БЕЗ ХЛУСНІ

Па вулцы, дзе яшчэ дагэтуль
Трывае польскі брук
З акцэнтам нашых камянёў.

Між дробнабуржуазнай сутнасці
Шыкоўных ух-планетаў
Асабнякоў.

Не па каменнях — па вішнёвым цвеце,
Ліповым цвеце, па апалым лісці,
А можа, па уласным пругкім свісце
Паходкай ветранай ва ўласным свеце.

У лёгкім плашчыку і шэрай кепцы.

. . . . . . . . . . . . . .

Як выстрал, вуліца прамая, і здалёк
Ён бачыць, што яна як матылёк,
А гэта ўжо зусім, зусім някепска.

І матылёк баіцца, а ідзе
З тым дэманам раённага маштабу.
Вароты ўжо закладзены на штабы.
Яна ідзе. А што, як прападзе?

О боязь юных, боязь і адвага.
І асабліва — страхі матылька.
Але яго упартая рука
Дае і напавер хмялёнай раўнавагі.

Як гэта толькі свет і змог заснуць?
Ён кажа матыльку: «Ты хочаш, свісну?»
І — раз! Матыў разбойніцкі павісне.
Аж коні у зарэччы путы рвуць.

3 Зак. 2194

І местачковыя сабакі енчаць,
І матылёк не знае, што рабіць.
А ён смяецца: «Свет магу перакруціць».
І матылёк ад радасці трапеча.

На даляглядзе незнаёмы свет,
У промнях незвычайнага інтыму
Яны ідуць. Клубы рачнога дыму
Астуджваюць гарачы першы след.

Правінцыяльна і фенаменальна
Пасля сабак абрэша вулка іх раман.
А покуль у вачах яго туман,
Сціх матылёк каля вачэй перадсвітальна.

Ну што, насмешлівы рамантык-ветрагон?
Ты сам баішся страціць гэты сон?
Трывожна?
Ноч, нібы кароценькі гудок.
— Не адлятай, мой лёгкі матылёк.

1967

# ЗЯЛЁНЫ КЛЁН
# І СІНІ ЛЁН

## 1

І сіні лён, і сіні лён
Пад ветрыкам дрыжыць.
Зялёны клён, зялёны клён
Над быльнягом мяжы.

Дзе густаклённы халадок,
Там босыя сляды.
Жанкі паставілі збанок
Сцюдзёнае вады.

Глыні — і ў галаве гудуць
Халодныя званы.
Як ветах, залаціць ваду
Акрайчык аржаны.

Арэшыну сагнуўшы ў лук
Ля пошуму ракіт,
Прыгонны пастушок-хлапчук
Цікуе — дзе жанкі?

Там, дзе прыгонныя ільны
З пламенным летнім днём.
А промні — горш, чым цівуны
З раменным бізуном.

А ўжо галодны пастушок,
Забыўшыся на свет,
Акрайчык — мокры веташок —
Жуе ў духмян-траве.

Ляціць з акрайчыка вада
Па зрэб'і ручайком.
Ах, смачны хлеб... Вось угадаў...
І чысты, не з быллём.

Не з-за сінь-морскае смугі,
А стуль, з-за сінь-ільну,
Маўклівы крык нямой тугі
Да хлопчыка прыльнуў.

Пустыя сцежкі на вяку,
Пусты, як вецер, лёс.
Вада пустая у збанку,
Ды вочы поўны слёз.

І тут, і ля рып-скрып красён.
Ды што яшчэ казаць?
Зялёны клён і сіні лён.
Празрыстая сляза.

2

Лепш палівацъ палын-траву,
Чым дні перабіраць.
Ды я пабыў на рандэву
Надоечы ў цара.

Масты пашырай разгарні
У ленінградскі май,
Дзе на зацугленым кані
Фельдфебель Мікалай.

Яго не тузае рука
Ў забранзавелых снах.
Рука худога пастушка,
Ў якога хлеб ён цяг.

Тырадай помнік не праймеш,
І цар маўчыць, як смерць.
Пайду я плытагоніць лепш,
Плыты вязаць і пець.

Зара агністым каснiком
Мой плыт перапляце.
А Нёман зыбкі ўсё бягом
Праз лета,
па цяпле.

Ля Стоўбцаў лён, бы сіні дзень,
І позірк не міне,
Як ветразікам, дзе-нідзе
Хусцінка мільгане.

Хмель загуляе ў галаве,
Хоць якар кінь на дно.
Ды плыт за Горадню плыве —
Там лён адцвіў даўно.

Яго ўрачыстую красу
Не крыў жаночы жах.
Ён пад халодную расу
Пасланы на лугах.

А на ўзбярэжжы хлапчукі,
Гайсаючы ля хваль,
Махаюць мне у дзве рукі,
І я ім памахаў.

Зліліся галасы ў масты
Над сінню буйных вод.
Гарацъ кляновыя лісты
На новы умалот,

На першы бохан залаты,
Што сонца наліваў,
Сабралі золата-лісты
Шчаслівай долі вам!

Калыша.
Сніцца добры сон.
І цяжка разгадаць,
Тут клён і дзеці, хлеб і лён,
І плыт мой, і вада.

1967

* * *

Нявольнік розуму свайго,
Ён часта каецца употай,
Нашто гарыць яго агонь
Сярод маркоты і дрымоты.

Але пагляну — ты ідзеш
Так незалежна і бязбожна.
Ну не паходка — проста верш
Пра рух свяціл неасцярожных.

Над сінякрылаю ракой
Застынеш раптам ля парэнчаў.
Вада варушыцца з вадой,
А думка з думкай супярэчнай.

Ты сілішся сабе сказаць:
Мужчынам плакаць не пасуе.
І ўсё ж чыя, чыя сляза
Маўчання ноч распаласуе?

1967

* * *

Ніколі не любіў рашаць задачкі!
Падручнік арыфметыкі ляжыць.
Там свет не мой! Там так усё іначай.
Там трэба мучыць свет. Драбіць, дзяліць.

Той самалётам. Той пайшоў дарогай.
Той больш, той менш. Ну праўда ж. Не крыві.
Але баяцца ўспомніць педагогі
Там пра слязу ці кропельку крыві.

Чытаю так: ляцела птушак восем,
Двух паляўнічы вострай цэллю ўзяў,
Замест адказу: колькі засталося?
Так хочацца пісаць: нашто ён іх страляў?

1967

* * *

Як закаціўся ў стагоддзі гул Залатой Арды,
Так гул летніх дзён адкаціўся
ў шумныя гарады.
Мы знаем, ужо не лета, але і не восень яшчэ.
І, можа, без гулу тога стане трохі лягчэй?
Калі надвячоркам выйсці
і ля прысадаў хадзіць,
Адчуеш — кнігаўкі напіліся,
болей не просяць піць.
Хоць урачыстых таполяў
па-летняму велічны стан,
Ужо над скупой атавай
крышталыіа-халодны туман.
Зачынена ўсё і ціха. Цень прадчування мільгне,
Што ты да вясны зашчапіла
фортачку ў сінім акне?
Пругкім і чыстым голасам,
што да нябёс даставаў,
Ты не пяеш. Твой голас, як і ў зязюлі, прапаў.

Шляхаў у слаўны наш чэрвень
адгэтуль мне не відно,
Але на расставанні з летам
хачу прыпомніць адно:
Як у садзе апоўначы бэз для цябе ламаў,
Апякаўся аб кіпень цвіцення,
нагінаючы, край.
Ты знаеш... Бярэцца на восень.
Гуляць халоднай журбе.
Пра бэз, пра вясну і шчасце
хачу расказаць табе.
Вогнішчам бэзу азначаны тыя ночы і дні.
Малюся на твае вокны... Апошні раз адчыні!
1967

# ІРАНІЧНАЯ ВОСЕНЬ

## I

А вы дзе былі? А вы дзе былі?
Позна цяпер гадаць.
Журавы журавіны выдзеўблі,
Што ў капусту будзем кідаць?

## II

Наш клён гарыць ясней зары,
Ідзі ад клёна прыкуры,
А калі ты не курыш —
Зграбай апалыя лісты,
Грабі ў шырокія пласты —
Зіма табе не рай,
А злая маладзіца.
Лісты агністыя зграбай,
І будзе чым укрыцца.

1967

# ГІМН РУЦЭ

## I

Пейзаж рукі нагадвае аповесць.
Скульптура строгая
З кавалкаў вуглю, солі.
Там цёмны дуб крыві,
Як волавам, напоўнен,
Бо першае імя яе завецца —
Болем.

Туга вясла,
Металу,
Кветак вясніх
І плёну мускулаў святое прадчуванне.
Лагоднасць палатна,
Што знята з кроснаў песні,
Бо ёсць імя другое —
Ў дотыку кахання.

Зямля, ты ў ранах пульсаносных веку,
З рубцоў тых ран —
Малюнку слова праясняецца.
Рука пчалой залоціць подых кветак.
Праводзь вятры усіх краёў далёкіх,
Рука —
Фрэгат пяці бунтоўных пальцаў.

## II

Хто бляск начыння аздабляў рукою?
Хто з дрэва выклікаў аблокаў лодкі?
І хто знайшоў пульс сталі пад зямлёю?
Хлеб удыхнуў у зерне?
У мармур — здзіў палёгкі?

Ты,
Што выкрэсвала з камення
Зародак і агню і промня.
А кожны ўздрыг — нібы натхненне.
Ты,
Што завеш і помніш.
Над эрай вуглю,
Вапны,
Медзі
Прадспевам мовы—быццам зорны россвіт.
Птах безымяннае далоні свеціць,
Як першае струны акордны росквіт.

## III

А калі ў гневе — панцыр кулака,
Калі ў пяшчоце — ліст святла таючы.
Але найбліжай, калі мёртвая рука
Крычыць
Апошнім бунтам на дратах калючых.

Птах падае тады,
Знямеў палёў абшар.
Вапнёва-мёртвая займаецца дзянніца.
І босыя адходзім у пажар,
Каб дакрануцца зноў да мін
І адрадзіцца.

* * *

Такія харошыя ночы!
На свеце сады зацвілі.
Натрапіў бы любы на вочы,—
Пад месяцам мая пайшлі
   Да першых, вясновых, зялёных,
   Глыбокіх, як мора, гаёў,
   Дзе голас у нетрах стаёных
   Мацуе арда салаўёў.
Ды шмат недарэчнасцей розных.
І нельга нічым памагчы.
Выскаквае ноччу марозік —
Трава пад нагамі трашчыць.
   А ў садзе такая ўжо квецень,
   Што аж рассыпаецца сад.
   Дыханне зімовае смерці
   Якія ўжо ночы падрад.
Я голле сухое цягаю,
Касцёр на узмежку палю.
І цёплы дымок абвівае
Галіны, ствалы і зямлю.
   А сэрца ірвецца на часткі —
   Ты будзеш ізноў дакараць,
   Што я безуважлівы часта,
   А мне — уздыхаць і маўчаць.
Даруй мне, мая ненагляда,
Касцёр не пакіну я тлець,
Бо як жа ў час яблыкападу
На свет гэты буду глядзець?
   Я полымя ўзношу святое
   І мару ў халоднай траве,
   Што гэта цяпло дарагое
   Да вокнаў тваіх даплыве.

1967

* * *

Ходзяць, цалуюцца аж да ранку,
А чулі ж некалі калыханку:
— Тры зоркі загарэліся —
Спаць малым пара,
Шэсць зорак загарэлася —
Спаць і старым пара.
Астатнія загарацца —
Спаць маладым пара.
Надта добрая калыханка,
А яшчэ лепшая пагулянка.

1967

## ЖНІВЕНЬСКІЯ ЗОРЫ

Дазорцамі станем.
Пастой — дзе спакой?
Пярыны засмоктваюць багнай ганебнай.
Глядзі, як кідаюцца ўніз галавой
Зоры
З самага сёмага неба.

1967

* * *

Сонца зайшло. Туман клубіцца. Сціхла дарога.
Рукі раскінь, лёгшы на сене. Ды адпачні,
нябога.

Жарам зялёным і ласкай лугоў мурожных
Вее ад вечнасці стрэх. Ты не сумуй, падарожны.

Будзе другі вандроўнік музыку далечы слухаць,
Счэзне тваё, настане другое. Мацуйся духам.

Трубой палатна, лубкаю жыта, конаўкай мёду —
Не адкупіцца табе ад гэтай прыгоды.

Скроні кране сівізна — ну што ж, ты не бойся.
Бывае нават, што зацвітаюць яблыні
ў цёплую восень.

Голас твой стане ў бездані часу
вячыстым шумам,
Бору паможа ткаць свае ціхія думы.

Аддай палатно, каб дзецям пашылі абновы.
Мёд — мядзведзям, а жыта — нівам вясновым.

Сонца зайшло. Туман клубіцца. Сціхла дарога.
Сон спавівае. Будзь жа шчаслівы.
Не бойся нічога.

1967

* * *

Недзе на Свірскім возеры
Дзікія гусі крычаць.
Скора ўжо, скора возьмецца
Неба іх калыхаць.

А можа, яны і бліжай?
Ды гэтага не відаць.
Цёмнач. І толькі праз цішу
Дзікія гусі крычаць.

Крычаць не таму, што дзікія.
Тут кожны пачаў бы крычаць,
Калі дарогі цяжкія, вялікія,
А даўно пара адлятаць.

1967

* * *

Прыгажуня, добры вечар!
Я ў дарозе прытаміўся,
Гарызонт натрудзіў плечы,
Піць хачу і запыліўся.

Ужо сонца на заходзе,
Як пацягненае дымам...
Ну, не бойся, падыходзь жа!
Я з вясёлых пілігрымаў.

А у нас ля Маладзечна,
Адкуль буду сам я родам,
Любяць розныя сустрэчы,
Нечаканыя прыходы.

А яшчэ у нас надзвычай
Далікатныя дзяўчаты
І навыперадкі клічуць
Падарожнага у хату.

А я веру пагалосцы,
Бо даўно ужо гудзелі,
Што ніколі вашы хлопцы
Цалавацца не умелі.

На губах палае звонка
Жар агню, што з-пад аблокаў
Настрасаў вярхушкай гонкай
Ваш прырэчны лес высокі.

Вось і сеў я на парозе.
Сонца падае за пуню.
Прытаміўся я ў дарозе.
Добры вечар, прыгажуня!

1967

## ВЯСНОВЫ ВЕЦЕР

А гэта толькі калыханне
І голых, і сухіх галін,
І лёгкіх зорак трапятанне.
Дзьме, як у трубы.
Ты — адзін.

Але хай сэрца адчувае
Не адзінотны горкі лёс,
Бо гэты вецер давяршае
Вялікі, смелы перанос

Цяпла, і журавоў, і песень,
І лёгкага насення траў.
Для новай позелені весняй
Палёт адчайны ён аддаў.

Бо гэты вецер выганяе,
Зганяе ў соль балтыйскіх вод
Крылом магутнасці адчаі
На той чаканы крыгаход.

Не будзем скнарамі на сушы.
У гэтым ветры — глянь-паглядзь,
З таго, што легла ў нашы душы,
Знайдзі і ветру што аддаць.

Пакуль ёсць веснія надзеі,
Што хутка выпадзе раса,
Пакуль трава не зелянее,
Не разгулялася каса...

1967

* * *

Лёгкім крокам ідзеш да мяне між дрэў.
Так здавалася мне праз сон.
А гэта летні дождж прашумеў
За шыбінамі акон.

Стук. Нехта кліча. Падумаў так.
А гэта яблык з галіны зляцеў.
І, як далёкая зорка, маяк
Раўнадушна глядзеў.

Горкая радасць прыйшла да нас.
Дзіўная сувязь знаёмых разлук —
Святло маяка ў дажджлівы час,
Шум ветру і яблыкаў стук.

1967

## ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

Ніякія годы,
Паходы,
Нягоды
Ад нас не адрынуць той час.
І світка мужыцкая днее пагодна —
Ашмянскага крою якраз.

Якія дакоры
Бываюць у гора?
Імжыць праз гады сіратлівы пагляд.
На ўсю Беларусь мільён пракурораў
І толькі адзін, толькі ён адвакат.

1967

## СУБОТА

У вечаровай стыні звонкай
Мігціць марозны даўкі дым.
Стары нагнуўся над палонкай
З каромыслам — набраць вады.

Як пушча, заінелі шчокі,
Але якая там бяда:
Унукаў гоняць у начоўкі
Субота, вечар і вада.

Купанне крыкам дом надзеліць,
Унукі-ластаўкі — віць-віць.
Усходзіць, як зара, нядзеля,
А сёння прысвятку свяціць.

Малых раздзелі і разулі,
Віхрыць з-пад матчынай рукі.
Лянок іх чубікаў разумных,
Вачэй даверлівы блакіт.

Стары спакойна і усцешна
Два сонцы — два вядры нясе,
Рыпіць заснежаная сцежка,
Злуецца нетрывалы снег.

Нядаўна выпаў, сыдзе скора,
Зайграюць вербы і трава,
Але ёсць снег, што лёг на скроні,
І ён не ўмее раставаць.

А там, за вечным ціхім снегам,
Які не сходзіць з галавы,
Дарожкі-сцежкі, што абегаў,
Калі чарнявую лавіў.

Далёкі гром маёвы грукнуў,
Дзяўчо ляціць на перавоз.
Што перавоз, калі ёсць рукі?
І ён узяў дый перанёс.

На гнуткай кладачцы стаяла,
Дрыжала, нібы матылёк,
Калі бяліла-паласкала
Сарочку ў шлюбны васілёк.

Куды ты, рэчка-быстрацечка,
Сагнала тыя воды, дні?..
Б'е, нібы ў звон, у бераг рэчка.
Той звон па некім зазваніў.

Не разгарнуць старому рукі,
Гняздом — глыбокая далонь.
Гняздо плыло... Гняздо было —
Віць-віць — і выпырхнуць унукі.

Але цяпло — ў азімым кліне,
Сам засяваў... Дакор? Дазор!
Каб роду сотая галінка
Кранулася дрыжання зор.

Сяўбы спагадная пагода
Радню і род не спадмане.
Малеюць дні, ўнікаюць годы,
Яна ж — як сонца у акне.

Стары не думае, прызнацца,
Аб звоне ў рэчцы і бядзе,
А ўнукі мусяць гадавацца —
Нясе два сонцы ў хату дзед.

1968

## ЧАТЫРОХРАДКОЎІ

* * *

Шмат год назад сказаў выдатна Маркс:
Жыццё для чалавека — барацьба.
Відаць, праблема першая якраз
Перамагчы ў самім сабе раба.

* * *

Гісторыя Еўропы і без грыма
Трагічная па сутнасці сваёй.
А казкі Сержпутоўскага і Грымаў
Не болей чым экзотыка прад ёй.

* * *

Нідзе маё не дзенецца,
Само у сэрцы выбаліць,
А мной не перамелецца,
Дык зноў жа мне бяды хапіць.

* * *

Восені змрочныя цені,
Месяц за хмары залёг.
Дні заінеюць, лясы апусцеюць.
Охці мне, ох.

1968

## ВЕРШ, НАПІСАНЫ Ў АРХІВЕ

Пылу на дзесяць стагоддзяў паднялі.
Выпушчу з клеткі чыжа.
Тут, у сенацкай расквечанай зале,
Людзі з гісторыяй на нажах.

Да немагчымасці горкая чыннасць
Ў сенатарскім крэсле сядзець.
Ты незаслужаных судзіш злачынцаў,
Судзіш, а іх пахавала ўжо смерць.

Гэтая боль не заныла б у жылах,
Ды расчыняюцца дзверы эпох.
А як расчыняцца, то сцеражыся —
Хто ў партызаны, хто ў чартапалох.

І не трызненне мёртвай паперы,
Што, рассякаючы дні,
Дзікім дэсантам старыя хімеры
Рвуцца з далечыні.

Так, ім заўсёды хапала адвагі
Хітра наперад зайсці.
Царскія шпагі...
Саксонскія крагі...
Совы у хатах і людзі ў трысці.

Тыя паслеплі, а тыя паглохлі,
Тыя здранцвелі, хаваючы жах.
Нават запозненых аналогій
Нам дастаткова, на жаль.

Так і жывуць на паперы прыстойна
Складныя акты і факты тупіц.

Што ж, пагаворым, і, можа, прасторней
Будзе сягоння дыхнуць і ступіць.

Бо як пакрыўджаны пагалосак,
Што начаваў цэлы век на двары,
Крык надвіллянскіх, надвісленскіх вёсак
Хоча па-сённяшняму гаварыць.

Гэта, напэўна, складаныя штукі.
Ды не залічыцца марны прастой.
І не бяда, што ахрысцяць навукай,
Акадэмічнай нудой.

1968

* * *

Вось ён узняўся, мужык-крутадух,
Так, што аж сані завылі палоззем.
Тоўчанай цэглай нацёрты кажух.
Дзядзька — як слуп агню на марозе.
— Жонка, пасцілку-кітайку давай,
Бач во, цугляю каня маладога!
Торбу на тыдзень ці болей збірай,
Пляшку гарэлкі давай на дарогу!
Зжыўся, дайшоў да пустога канца.
Сейце адны тут і ладзьце дажынкі.
Я не бяруся — не абяцаў —
Ані за сінь-парушынку.
Я з малатком і з далатом.
Стукну-прыстукну — і помнік гатовы.
З каменем-крэмнем, іскрой-аганьком
Хлеб мой, а думае вёска — дармовы.
Новасасновая вёска не спіць,
Корміць дзяцей, набівае пярыны,
А на гарышчы сінеч сініць —
Лётае пух галубіны.
Дзядзька тузнуў лейчыну, і, як дым,
Снег завіхрыў яго крыўду і словы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Не вінаватыя ж людзі, што ім
Жыць так хацелася ў хатах у новых.

1968

* * *

Ноччу абложная бура была,
Жыта ў полі палегла, як мост,
Нямым дакорам каля сяла
Зялёна-зелены мост-пагост.
Што ж, гаспадару, збірайся ісці
Па мосце гэтым лес церабіць,
Або ў возеры буч трасці,
Ці проста ў мястэчка гарэлку піць.

Сам нават з рунню, здаецца, ты рос.
Чуў, як жыта трубіла ўначы.

Ідзі, не бойся, твой гэта мост.
Што ж ты, як з крыжа зняты, маўчыш?

1968

* * *

То быў разумны хлопчык.
Яго дзяцінства стаяла ў зеніце.
Цыбаты, бялявы,
Худы, як бусел вясной.
Яму, гарадскому, добра было
Жыць у кварталах сосен,
На вуліцах дзятлаў, завулках зязюль.
Быў ветрагонны, дражніўся з зязюлямі.
Выціраў валасы і тварык,
Прыбегшы спацелы з футбола,
Кудлатым сваім ручніком, і ў пакоі
Цэлымі днямі сонцам пахнуў ручнік.

У кішэнях звінелі старыя манеты,
Медалі «За службу царю и отечеству»,
«За оборону Порт-Артура».
Абломкі гісторыі —
Дзецям заўсёды забаўка.

Мы вечарамі ўцякалі да рэчкі.
Я збіраю зоркі, нават імёны зорак.
І ў люстры цёмнай ракі
Доўгай арэшынай краталі мы
Нават сузор'і цэлыя.
Рэчка падобна была на разбуджаны вулей,
Казаў, што хоча быць капітанам.
Тады прывязе з далёкага мора
Замежных зорак.

Цікава было —
Ён не знаў, што зоркі жывуць без граніц.
Калі сёння пайсці на бераг,
То ля раскрыленых ветразяў сосен
Можна убачыць на мокрым пяску

Сляды дзіцячыя і падумаць,
Што гэта ён далёка-далёка пабег.
Але вяртання ў сляды даўнейшыя не бывае.
Лепей хай будзе так:
Не капітан, а пакуль што юнга
Прынёс аднойчы
Кішэні далёкіх-далёкіх зорак
Ці проста ў вуснах збярог
Імёны далёкіх-далёкіх зорак.
Трапечуць яны ў далонях маіх.

Гэта нялёгка — зоркі збіраць.
Чакаць кагосьці з далёкіх дарог.
Але ручнік пахнуў сонцам...
Але былі глыбокімі
Сляды на мокрым пяску
Ля раскрыленых ветразяў сосен.

1968

* * *

О раскрылле белых рук!
Ты знікала пакрыёма.
Сэрца ціхі перастук
Адазваўся гулкім громам.
Прыбярэжны лес ізноў
Нам світанняў не надточыць.
Паляўнічы дурня корчыць
На праспекце салаўёў.
Ціха горбяцца масты
Над панураю вадою.
Пласкадонкі за сабою
Цягнуць белыя хвасты.
Хай плывуць — ім уваччу
Сто Варшаваў, сто Парыжаў.
Сініх, жоўтых, чорных, рыжых
Падарожжаў не хачу.
Памаўчы, душа, як дол,
Пахаджу з туманам босым.

. . . . . . . . . . .

Самы дзіўны чорт — анёл,
Колісь выгнаны з нябёсаў.

1968

* * *

І раптам сыдуцца дарогі
Да той сцяжынкі пад акном,
Дзе дрыжыкі начной чаромхі
Дыхнуць срабрыстым халадком.

Як стыне раптам задуменна.
Зімы ці лета нам чакаць?
На лёд-расу заве гадаць
Чаромхавы той холад зменны.

Той летуценны халадочак,
Амаль начны празрысты свет
Паклікаў маладых аднойчы,
Граніц нябачных сцёршы след.

А там, за гэтаю граніцай,
Чаромха з дзеўчынкай дрыжыць,
І можна на ўвесь свет забыць,
І можна моцна прытуліцца.

Два словы без канца шаптаць.
Нібы заснежаным аблокам,
Галінкам ціха праплываць,
...Далёка голас той, далёка.

Кранай чаромхі белы дым
У хоры ночы велічальнай,
Рука ў пярсцёнку залатым,
Рука ў пярсцёнку заручальным.

1968

* * *

З захмялёнаю галавой
Карту нашых шляхоў, карту неба
На далоні чытаю тваёй,
І нічога мне болей не трэба.

І сплывае, як едкі дымок,
Час, калі, не знаходзячы месца,
Так хацелася, сцішыўшы крок,
Абаперціся проста на Месяц.

Калі ноччу блукаў даўдна
Ля засыпаных снегам аселіц,
Калі выпіў да самага дна
Снежны кубак самотных мяцеліц.

1968

## ВЯРБА

То не кляцьба, не варажба,
Прымхі альбо забабоны —
Цудам вясновым цвіце вярба,
Агнём залацістa-зялёным.

Хаця ставок, малы, як глыток,
Плыткія хмары гайдае,
Але каляны зладзей-халадок
Вярбу ўпацёмку пужае.

А з нашай вярбой, з яе журбой,
З яе маладым калыханнем
Злучаны песні радзімы маёй,
Як лёгкія два дыханні.

І сум там ёсць, ён спрадвечны госць.
Помняць жа родныя вербы,
Як налятала чужая злосць
На нашу вялікую веру.

Ды ўсё ж цвіце, а летам расце
Вярба, развінуўшы голле.
А песні з намі — па сіняй расе,
Па сцежках, лясах, па полі.

Цвіці, вярба, развейся, журба!
Цябе атуляе сонца.
Нашыя песні — для нас барацьба.
Нашае заўтра і сёння.

1968

# МОЙ РОДНЫ ДОМ

## 1

Пад палыном, пад быльнягом
Мой родны дом, сасновы дом.

Чырвонай крыты чарапіцай,
Такою крохкай і жывой.
Асколкі — дробныя брусніцы —
Зіхцяць і глушацца травой.

Страха...
Яна спадае толькі
Бруснічкай да палын-травы.
Тых дзён далёкае застолле
Не хмеліць болей галавы.

З якою горыччу зацятай
Глядзеў з былых панарскіх стром
Народ,
Як дагарае хата,
Наш родны дом, сасновы дом.

А партызанскае разводдзе
Дарог падпольных і трывог
Па шляху простаму не водзіць.
І не зашыецца пад мох.
А вогненная чарапіца
Датлее ў жорсткім быльнягу,
Дзе толькі дзічка караніцца,
Дзе глухне слова,
Песня,
Гул.

Пад палыном, пад быльнягом
Мой родны дом, сасновы дом.

## 2

Калі на панскія палацы
Чырвоны певень — скок ды скок,
«Пагляньце,— золата, пагляньце»,—
Крычаў назаўтра мужычок.

Сузор'е ў друзе і вуголлі
Дзяржаўнай важнасцю сваёй
Не заплаціла за пастой
Ні пану, ні агню, ні голі.

Тут прывід вечнасці, бо крыўдна —
Хоць не згарэла, ды ўсягды
З тым золатам на чортаў рынак
Вялі маркотныя сляды.

А дом — вось гэта бессмяротнасць.
Не дзынкаў залатым рублём,
Але не быльнягом гаротным
Застаўся жыць мой родны дом.

. . . . . . . . . . . .

Сучок з патрэсканае бэлькі
Так хітра вокам падмігне.
А песенька пра канапелькі
Зімою з дзедам дугі гне.

І гулкі брук, што гоніць коней,
Аж іскры ў шыбы з-пад падкоў.
Світае зырка на далонях
Ручнік святочны ў сем нітоў.

Далёкіх дзён ясняцца кадры...
О нескароны тым агнём
Мой родны дом, сасновы дом!
А золата прайгралі ў карты.

1968-1969

## АЎТАБІЯГРАФІЯ

Люблю пакланенні вячэрнім агням на лузе.
Касцёр гарыць. З агнём размаўляю.

### 1

Нарадзіўся ў сорак пятым. Беларус.
Ахрысціла вайна. Гадавала маці.
Жыве вайна. Жыве і маці.
Вайны не бачыў.
А чуў, што туляецца па завуголлях.
Дома куплялі соль на запас і сухары сушылі.
Дарма куплялі, сушылі,
Бо калі пачалася б трэцяя драма стагоддзя,
То праз многа гадоў госці з далёкіх планет
Знайшлі б на знямелай Зямлі
На 120-м кіламетры ля аўтастрады
Мінск — Вільня
Усю правізію гэту цэлай і некранутай.
Запісалі б так:
«Тут жылі гаспадарлівыя тубыльцы...»
Што гаспадарлівыя, то праўда.
Хату збудуюць — звініць, як шклянка.
Жыта жнуць — у сярпе заначуюць.

### 2

Хацеў усё знаць. Настаўніку безліч пытанняў:
«Чаму павесілі тых паўстанцаў?»
«Чаму хаваліся людзі ў лесе?»
Стаў студэнтам, хадзіў хоць калі на лекцыі.
Слухаў такое: «У цэнтры творчасці класіка эн,
У яго геніяльных паэмах і вершах стаіць мужык».
Пяць год у цэнтры стаяў і стаяў той мужык.
Хоць бы прысеў ці прылёг.

Даўно ўжо знаю,
за што павесілі тых паўстанцаў.
Мне ад таго зусім не стала лягчэй.

### 3

Найбольш сябрую з дзецьмі і дрэвамі.
Убачу вярбу, і прыпомніцца свіст.
З галінак вярбы спускалі свісткі
кожнай вясной.
Адсвісталі.
Бярозы падобны на тых дзяўчат,
Якіх я кахаў.
Некалі ж уцякалі, а цяпер стаяць ля дарог.

Асіна — другое.
Бабуля казала:
«Заваліла б я долю сваю асінай горкай».
Долю, відаць, завальваюць горкай асінай,
А што крыжам дубовым, то гэта дакладна.
А дзеці ўлезуць заўсёды
У гліну, траву, пясок і сонца.
Ніяк не адмыеш.

### 4

Добрыя людзі вучылі:
«Не плач ніколі на ветры — застудзішся».
Стараўся не плакаць на ветры і на марозе,
Нідзе не плакаць,
Але прызнаюся: праз гэта ў сэрцы
Некалі знойдуць не золата, не серабро...
Толькі якое шчасце — змайструем плыт
і паплывём па Віллі.
А плыт калыша. Ляжы і слухай
Дыханне ракі і дыханне друга.

## 5

Гэта даўно напісана
Канькамі — па лёдзе,
Вяслом — па хвалях,
Бліскавіцамі на хмарынах.
Ды аўтабіяграфія — не рэклама.
Лёд растае, сплываюць хмарыны і хвалі.
Вось і вогнішча дарагае,
Трэба падкінуць голля...

1968

## БЕЛЫЯ РОСТАНІ

### 1

Таня, ўжо снег пойдзе скора.
Холадна будзе.
Стануць белымі нівы,
Вузкімі — дарогі.
Сонца не грэе сёння.
Будзе холадна вельмі.
Адзін я выйду на стынь адвячоркам
І прынясу настылых паленняў з дрывотні.
Гэта пагрэе, пасвеціць.
Зыход цеплыні так адчула
У склепе маёй гаспадыні
Віно маладое, з ранетак,
Што ўверх шыбанула
І выбіла коркі бутэлек,
Але не дагнала ні сонца, ні лета —
Бацькоў сваіх родных.
Дні цягнуцца доўга, пустыя,
Як тыя бутэлькі.
І як гэта так атрымалася, Таня?..
Скора ўжо снег. Ну, ён-то схавае,
Укрые, абеліць зямлю.
Шкада мне, што снег не ўкрывае
Мае успаміны сумётныя.
Холадна будзе...
Я знаю, ў цябе невялікая радасць.
Я знаю цябе. Знікла сонца за цяжкія хмары,
І ціха знікае малое сузор'е
Вяснушак на твары тваім,
Якіх ты не любіш,
Якія любіў я.
Вось, пэўна, і ўсё.
Толькі і ўцехі, што госця-зіма

Прыгоніць з работы нарэшце
Паромшчыка тога, што вёз на той бераг цябе.
І, можа, што госця-зіма,
Хоць плынь нашай рэчкі вірлівая вельмі,
Масты пакладзе на той бераг.
І, можа, адважуся я...

2

А вось і зіма. Калі што і адтае,
То сэрца. Як думаў я, так і было —
Хоць з поўначы бура і дзьме снегавая,
Не, тое за ветрам у свет не сышло.

А ўсё праяснілася. Так адмыслова
У яснасці холаду тут,
                    між бароў,
Акрэслены снежанем думка, і слова,
І лёгкі мой след на раўніне снягоў.

Ды не знаходжу таго, што шукаю.
Мне холадна? Цяжка. Не варта казаць.
Я гэта маўчаннем,
                    як лёдам, хаваю,
Хоць часам жаданні упарта крычаць.

Бо я адшукаў і цяпер навучыўся.
Нарэшце! Ніхто аніколі не знаў.
Я клінапіс гнёздаў усіх ластаўчыных
Пад ціхім застрэшшам тады прачытаў.

Люблю! Гэты бераг ізноў мне знайшоўся.

. . . . . . . . . . . . . . . .

Мароз распаляе усё, што відаць.
«Люблю!» — прачытаў я. І духам зайшоўся.
Ізноў мне, ізноў гэта слова чытаць.

### 3

Лыжы куплю, а з хутара ў лесе
Рэкса-сабаку звяду за сабой.
Паразімуем. Паходзім, пакрэслім
Снежны халодны сувой.

Ведаю гэтыя зімнія штукі,
Ведаю белую гладзь.
Сёння, пабраўшыся моцна за рукі,
Молада-вечныя хвоі стаяць.

Так я хаджу да зімы на спатканне.
Ціха на россвіце сонца ў мароз.
Трэба каму напісаць мне пасланне:
Як тут прыгожа — да болю, да слёз!

Ліст адзіноты і вечнай разлукі
Так вось і буду цяпер пачынаць:
«Сёння, пабраўшыся моцна за рукі,
Молада-вечныя хвоі стаяць».

### 4

Наш час, ты, нібы цень, імчаў за мной —
Не пройдзеш, зблудзіш у зіме сягоння.
Табе прытулак — непралазі хвой
У нейкіх там пушчанскіх занямоннях.

І летам, калі будзе над зямлёй
Сяміадзінствам ззяць вясёлка-арка,
Не пракрадзешся нават і па ёй —
Мой любы свеце, ты зазззяеш ярка.

1968

* * *

Сум ціхай поўні над пустою пожняй
Вазьмі сабе да мая напавер.
Яшчэ прасі ў бяроз, хай ліст апошні
Зляціць на даланю ці за каўнер.

Адкукавала лета, адхадзіла,
Пасцель на сене слала пеючы,
Крыніцамі на шчасце прычасціла,
А восень згубіць ад крыніц ключы.

Дарогай грунтавой, такою простай,
Даверліва нікуды не спяшы.
Бязбожнікам на першым тыдні посту
Было вось так самотна на душы.

Кліч аўдавелых ніў плыве па свеце,
Прабіўся чуйна праз варонні грай.
А можа, гэта і вандроўны вецер
На падарожнай скрыпцы заіграў.

Твая дзяўчынка ўзята, як за краты.
Таемна у вачах, як у лясах.
І толькі летні водар спелай мяты,
Хмялёнай руты-мяты не ачах.

1969

* * *

Прысніўся сон, дзіцячы сон —
У гладышы вясновы звон.

Вясновы, пругкі, малады,
Саладкаваты звон вады,

Той, што ў бярозе захадзіў
І кліча весела — дзінь-дзінь!

Змакрэлы красавіцкі лес.
Я на бярэзіну узлез.

Мая равесніца ў імжы
Вясновым холадам дрыжыць.

Я зверху падаю руку.
Яна — хаваецца — ку-ку!

Бо страшнавата ёй нябось
Глядзець з бярозавых нябёс.

Мая суседачка, кукуй
На крыгаломную раку.

І першы раз, дрыготкі раз
Прадвесне сустракае нас.

І калі потым маладым
Пяройдзеш ты свае брады,

Калі світальнае дзяўчо
Ўпадзе знянацку на плячо,

Прысніцца сон, дзіцячы сон —
У гладышы вясновы звон.

1969

## БЭЗ

Хто першыя спатканні помніць
І сёння выгляне здалёк?
Усходзіць серабрыстай поўняй
Пад сэрцам чуйны халадок.

Ледзь вылузаўшыся з падпаска,
Ты паднядзеліўся — і хват.
Здавалася, ў далоні пляскаў
Сусвет і выветраны сад.

У векавой зямляцкай далі,
Якую скалануў прагрэс,
Там, дзе маёнтак феадаліў,
Было там забыццё ды бэз.

Бэз-буйнагрон, туманны, светлы,
Буяў, кіпеў — вясне радня.
Абняў, здавалася, паўсвету
І нас упэўнена абняў.

Нібыта спуджанай сініцы,
Што толькі галасок знайшла,
Дзяўчынцы боязна спыніцца,
І між кустоў кружыць пайшла.

Мы з бэзам спрытную малую
Пільнуем — што, як уцячэ?
— Сарві галінку мне такую,
Што і не снілася яшчэ.

Цяпер, начлегі перабыўшы,
Азёрных сноў і навальніц,
Як пан той, высцебаны Рымшам,
Хаджу пад вокнамі святліц.

І разумею, што адплата
Занадта жорсткаю была,
Бо я амаль не вінаваты...
Ляцеў лісток з таго сяла,

Не выгукнеш: «Назад вярніся!»
Што толку — з лямантам ці без
Было прыпісана унізе:
«Учора карчавалі бэз».

Пра бэз сягоння ты не знаеш,
Мой першы сон, мой першы боль.
Далёка, нібы за Дунаем,
Жывеш і не прыходзіш больш.

Яснеюць у душы дагэтуль
І бэз, і нашая зара,
І ранг прыдворнага паэта —
Твайго, каханая, двара.

1969

* * *

Гестапаўцы гулялі ў баскетбол —
Не лішне адпачыць і на ваенцы.
А неба ўчадзіў дым змарнелых сёл,
І просіні — не хопіць на вакенца.

Пачуеш за дзесятую вярсту —
Шчыт баскетбольны крача, нібы качар.
Гуляюць.
Весела рабіць ляп-стук —
Зямля падскоквае і мячык скача.

Зашыўшыся ў кусты, як ад агню,
Схаваўшы страх і боль у позірк яркі,
На звонкую знаёмую гульню
Глядзяць-цікуюць хлапчукі-падшпаркі.

Туляйся з ветрам ля асін-рабін,
Сухар, блакадны дым і горыч коўтай.
Ах, мячык-скачык, што ты нарабіў?
Забыўся гаварыць па-хлапчукоўску.

Канчаецца гульня.
Ім весела — зірні.
Смяюцца.
Гоцаюць яшчэ патроху.
Канчаецца гульня.
Развязка ўсёй гульні
Прыйшлася на развязку ўсёй эпохі.

Якой цаной той міг аберагаць?

. . . . . . . . . . . . . .

Замосціць неба чыстым зорным брукам.
А рэчка ў абгарэлых берагах
Вясновым целам страпянецца пругка.

Прачнецца ў лесе дзіва — кветка-сон
І свету падмігне блакітным вочкам.
У партызанскай вёсцы бразне вочап,
Мужчына сонца падпіхне касой.

Лес набрыняе шызаю расой.
Узыдзе небывалая дзянніца,
Застогне на выжарах травастой,
І мяч, вядома, вернецца ў дзяцінства.

1969

# НОЧ ПАСЛЯ ХАТЫНІ

Хворы
Ляжыць на казённым ложку.
Памяць,
Нібы разрабаваны магазін.
Што гэта свеціць над галавой?
Месячны промень?
Ці ртутны слуп прабіў градуснік
І расце, набухае ад болю?
Чаму так доўгая гэтая ноч?
Ці мо дваццаць шэсць званоў Хатыні
На месцы хат спапялёных
Патрабуюць, каб суткі былі
дваццаць шэсць гадзін?
Звон... Звон... Звон...
І раптам нарэшце голас
Амаль металічны і дзіўна замежны
Адтуль, з вакзала: «Uwaga! Uwaga!
Pociąg pośpieszny numer...»
Гэта экспрэс міжнародны падходзіць.
Адкуль імчыць той экспрэс?
Можа, з Асвенціма ў Хатынь
Уцякаюць начамі людзі
З думкаю, што перад Асвенцімам — гэта рай.
Польская мова...
Між іншым, адна палячка
Пытала пра шар зямны:
«А як па-вашаму Kula ziemna?»
Пра кулю зямную, вядома,
Можна б забыцца і ёй, і мне, і ўсім,
Змяніўшы папросту назву,
Калі б аднавіць,
Галубячы сэрцам, рукамі, дыханнем
Гэтую кулю.
А можа, экспрэс з далейшых краёў,

Бо праз тры хвіліны тое самае па-нямецку:
«Achtung! Achtung!»
Можа, і мне папрасіць мікрафона,
І я скажу голасам металічным:
«Ахтунг! Ахтунг! Хатынь у полі!
Ахтунг! Ахтунг! Пад снегам ляжыць!
Ахтунг! Ахтунг! Над горкай доляй
Сіваваронка крычыць!»
Але ніхто мне не дасць
Вакзальнага мікрафона.
Публіцыстычная лірыка
Не ўваходзіць у план работы.
Цёмная ноч
Цямнейшая за вароннія крылы.
Звон... Звон... Звон...
Ахтунг!
Ах...
А-а-а...

1969

* * *

Вось пішу табе ліст
Пра цябе і мяне.
Пра ціхі свіст.
Ліст будзе доўгі і нецяжкі.
Там у канцы напішу радкі:
«Наш свет быў агульны і непадзельны,
Расставанне здавалася
Чорнай нядзеляй.
Гэта падобна — як бы ўдваіх
Глядзелі ў глыбокую студню.
Нікому не хочацца, хоць на міг,
Першаму адарвацца.
А што цікавага?
Хлопчык гуляе на пляцы.
Усмешкі... дзікія ружы... танцы.
Небам галовы накрылі да рання,
Дрыготка чыталі буквар кахання».
Буквар той, на шчасце,
Здаецца, недачыталі.
Пра гэта мой голас,
Як голуб паштовы,
Ляціць і буркуе ў далях.

1969

## РАЗВІТАННЕ З САДАМ

Як рыпнуць пад нагой расходжаныя сходкі,
Любімы, дарагі пасляваенны сад,
Не трэба, не праводзь, не йдзі да паваротк —
Ты малады зусім — заблудзішся назад.

Бывай, і памаўчым. Хай не мігцяцца покуль
У стомленых вачах Варшава альбо Льеж.
Ёсць родны ціхі дом, дзе ў печцы цёплы попел,
А ты, вясновы друг, у шыбы голлем б'еш.

Яшчэ адно прашу — якой бы горкай доляй
Ні крутануўся развітальны рай,
Ты яблыню адну у сны мае ніколі,
Наймаладзейшую, ніколі не пускай.

У жніўні зоры абтрасала неба,
Шчаслівае спатканне ў свет вяло, як спеў,
Сказала дзеўчынка: «Ты загадай што-небудзь,
І збудзецца». А я і не паспеў.

Зляцела зорка пуста, без загадак,
І яблыняй між яблынь прарасла.
Сягоння дзве рукі, як два крылы над садам,
Я узнімаю зноў, шукаючы святла.

І толькі лёгкі шум сукенкі снежна-белай
Глухім прыбоем стогне і заве сустрэць.
А два лісткі святла — далонькі азалелі —
Трапечуцца і клічуць абагрэць.

Ты удыхні, мой сад, нібы трызненне, доўгі
Вясновы маналог пра беззваротны рай,
Бо аднаму ўтрымаць той жнівень — вельмі многа...
Расці вялікі — і бывай... бывай...

1970

## СВЯТА БУСЛОЎ

Не байкі гэта, мусіць,
Не забабонны жэст,
Калі з сям'ёю бусел
Ляціць на летні фэст.
  Дзівуйцеся! Зірніце!
  І вам спадзе пяро.
  Буслы ў самім зеніце
  Віхруюць балеро.
Лятали, асядалі
На блізкія дубы.
Ажно ў дубоў трашчалі
Зялёныя чубы.
  Без жаднага спачынку
  Іх лепшы віртуоз
  У дзюбе аблачынку
  І воблака прынёс.
Гартанна клекаталі
Народам і стагам.
І з рэчкі выпівалі
Законныя сто грам.
  Той касаклёпны клёкат
  Меў просты добры свет.
  Буслы малыя лётаць
  Наўчыліся як след.
Нябёсныя дарогі.
На крыллях сонца ўзваж.
Цыбатыя іх ногі.
Вышэйшы пілатаж.
  І, можа, цяжка дубу,
  І, можа, што не так.
  Дарма!
  Не звесіў дзюбу
  Увечары важак.

1970

* * *

Наіўная вясна
Дрыжала у паўзмроку.
Быў чуцен стогн вясла
З маёй Віллі далёкай.

А можа, журавель
Паміж сігнальных вышак
Зблудзіўся — і заве
Маёй спагады лішнасць.

Зямляк, я сам даўно
Ад холаду скрычаўся.
Марознае радно
Хай знікне гэтым часам.

Сагрэемся з табой,
Кіруйся у даліну —
Гартоўны перастой
Рубіннае каліны

Дарэшты не датлеў.
Крыло табе сагрэе.
І я душу б сагрэў,
Пакуль не развяснее.

. . . . . . . . . . . .

У росквіце начэй
Наіўнае чаканне.
Крык выклікаць лягчэй,
Чым пагасіць крычанне.

1970

* * *

...ale w Granadzie zaraza.
А. Міцкевіч

Трэба было б прайсці навальніцай —
Пад бліскавічны візгат.
Можна і чорту перахрысціцца,
Ды і дастаць тую візу.

Толькі найлепей на жнівеньскім лузе
Стаць важаком жураўлінага кліна,
І кіраваць да аблок андалузскіх,
І апусціцца ў нізіну.

Там жа ляжаць інтэрнацыянальна
Нашых бацькоў аднагодкі.
Дым пастухоў адплывае світальна...
Не, і не толькі з нагоды.

Там з-пад Вілейкі, там з-пад Смаргоні
Леглі і болей не ўсталі.
Зорка Венера, ўздыхні на пагоны —
Хлопцы амаль не кахалі.

Стогне каса, калі дома кляпаеш
Перад бацькоўскім парогам.
Стогне душа, калі доўга шукаеш
І не знаходзіш дарогі.

Трэба дадому паклікаць і ў хаце
Сесці на покуце разам.
Трэба аб чэсці і аб гранаце,
«...ale w Grenadzie zaraza».

1970

* * *

Паўстанцкія берагі
І вельмі сумныя сосны.
Заключэннем зямляцкай тугі
Нарач на хвалі выносіць.

Катэра мерны гул
На глыбіні не змялелай,
Б'ецца не ў трысьнягу
Нарачы сіняе цела.

Б'ецца яно ў вайне,
Б'ецца ў нудзе і нястачы,
Чайкай сівой прыльне
Сястра — удава-рыбачка.

Дзякуй, што воды твае
Ад гора нічуць не згарчэлі.
Дзякуй, што хвалі твае
Сама найлепей пелі.

Хоць гістарычна, але,
Нібы магутны дзядуля,
Гатавіцкі лес
Нарач заўсёды затуліць.

1970

* * *

Пад сонных ліўняў галасы
Ты ціха спала,
І загайдаліся лясы
Дзевятым валам.

А разняволены наш сад
Лістотай лопаў.
Назаўтра — сонечны пагляд
І летні клопат.

Здаецца, што гады ў рады
Выходзіш босы
На пераправы і брады
Да сенакосаў.

Пад вечар сцішана было,
Было салодка.
Адпачывала і вясло,
А з ім і лодка.

Як нехта некага вядзе
І ў полі блудзіць.
Ах, што там будзе цераз дзень,
Праз месяц будзе?

Шчырэе жыта у палях.
Зенітны чэрвень.
Найдоўгі дзень, найлепшы шлях.
Дымок вячэрні.

Спявала птушка, летучы,
Пра шчасце гэта,
І лёгка дыхала ўначы
Душа планеты.

1970

* * *

Спытай не тое, ці багаты
Наш свет з яго ахвотай жыць.
Ці шчодры ён?
А колькі святаў
На ўцеху людзям удружыў?

Яшчэ пяройдуць у легенды
І маладыя жаніхі,
І захмялелыя гавэнды,
І валачобныя шляхі.

Дыханне вымытай падлогі,
Святло фіранак і сурвэт,
Дух лапак хвойных ля парога,
Гасцінны сонечны прывет.

Хоць святы розны чын займалі,
Ды ўсе адзначаны красой.
І мы карову ў поле гналі
На Юр'я, першаю расой.

З суседскай памяці не сцёрта,
Як цераз месяц і другі
Чаргой Міколы,
Янкі,
Пётры
Ішлі на покуць, як багі.
Яны-то мелі прыналежнасць
Да самых важных сіл зямлі,
Яны, як гэта і належыць,
Пра гаспадарства сказ вялі.

Не жабравалі нашы святы,
А нас насілі на руках.

Не толькі лічбаў проста даты:
Яны — як вехі на шляхах.

Іх прыбывае.
Крокам смелым
Прыйшоў да нас праз небакрай
Спярша не ўсім і зразумелы,
Але харошы Першамай.

Шуміце, святы гадавыя,
І імянінныя святкі,
І непраграмныя, ну тыя,
Дзе даражэнькія сваткі.

Будзь пэўны — збоку не асудзіць
Ніхто
Душэўных спраў такіх.
Тут той сакрэт,
Што нашы людзі
Не лічаць будніх дзён сваіх.

1971

# ПОЛЬКА
# У ВЁСЦЫ ПЯЦІХАТКА

Спаганяй былую хватку,
З-пад іголкі кажушок —
І на польку ў Пяцíхатку
У спагадны вечарок.

Бура ў полі і ў настроі.
Ты са мной, і я з табою.
У двухвёдзерных кішэнях
Зор калядных поўны жмені.

Пяцíхатка пасклікала
Акалічны наш народ —
Аж народу месца мала,
Бо здаровы ён, як лёд.

Вунь сват сваццí пляце лапці –
Панскі розум мае сваццяː
Як да жніва —
Ледзьве жыва.
Як на танцы —
Пяць каханцаў.

Мы хоць з форсам, ды не столькі,
Каб варожкі слаць здаля,
Калі тут арбітай полькі
Круціцца сама зямля.

Каркаломная арбіта,
Дзе другі абсяг відзён,
Дзе зусім і не забыта,
Толькі ўзнесена над бытам
Боль і радасць нашых дзён.

Стань збавеннем ад разлукі
З краем, дзе зара шчыміць,
Раскажы, якія мукі
Ты умела пагасіць.

За расстайныя дарогі
І за тое, што люблю,
Пэўна, новую падлогу
Сёння з полькай праламлю.

Праламіць і праваліцца
Мне ад сораму цяпер
За ліхія навальніцы,
За нядаўнія найперш.

За зацемнены той розум,
Што з агнём ішоў да хат.
І за ганьбу той бярозы,
На якой павешан кат.

І ад шчасця, што ў чысцейшых,
Сарамяжлівых краях,
Пяціхатка шчодрай цешчай
Нанач полькаю пацешыць.

Шлях сюды — як Млечны Шлях.
Полька-свацця, полька-сведка.
Жар з баянаў выграбай.
Ты ляці са мной, суседка,

Ці то ў пекла, ці у рай.
Каснічок куплю чырвоны —
Лёгкім бантам завяжы.
Будзе вёска біць у звоны —
Ты не бойся, не дрыжы.

Як палюбіш, як пачубіш
І заціхнеш на руках,
Стане лёгка — і пачуеш —
Тчэ зіма снягі ў пасаг.

Зоры я ў кішэнь кідаю
Разамлелаю рукой.
Калышу і абдымаю —
Вось як будзе ў нас з табой.

Ажно дзед, што з манапалькі
Не вылазіў пры царах,
Крэкчэ ў куце — ах ды ах!
Пяціхатка скача польку.
Пяціхатка, Пяціха-а-а...

Во было дык было —
Аж пад пятамі гуло!

1971

* * *

Не ад'язджай, прашу цябе, ў Капыль.
Як дагадзіць табе і як старацца?
Ну, гарадок... Як на адзін капыл
Каты, сабакі бегаюць па пляцы.

Пакінеш сіратою ты свой смех —
Ён нада мной у гром перарастае —
І пацалунка развітальны грэх,
Што на губах вясёлкава зайграе.

Лясы?
Спакой?
Ці мроі ў Капылі
Расчэсваюцца маладзіковым грэбнем
Прывабілі?
Забудзь аб той зямлі,
Пакуль зазімак не ўвярэдзіў грэблі.

Бо калі дадзена гарэць агню,
Каму тады да цеплыні туліцца?
Так і ганяем нашу цішыню
Мы з кута ў кут, як гора-вучаніцу.

Ці звыкнуцца з тубыльцамі табе? —
Стуль шмат вядомых дзеячаў, паэтаў.
І нават певень, што зару дзяўбе,
Відаць, таксама ганарыцца гэтым.

І доўга будуць гаварыць дзяды:
«Вось тут жылі бацькі.
Пасля памерлі.
А хатка ўсё стаіць, як і тады...»
(Калі адкінуць факт, што шула сперлі.)

Засцеле далі снежаньскай імжой,
І зойдзецца зямля бясслёзным плачам,
І тонкі профіль у смузе начной
Няўжо праз шыбу стылую не ўбачу?

І, як заўсёды, ўсё ж не перайначу?
Не ад'язджай, прашу цябе, ў Капыль...

1971

* * *

Лепш бязбожна адхрысціся,
Лепш хай год ці два міне,
А пакуль што не прасіся,
Не прасіся да мяне.

У мяне густыя травы,
Надта золкая раса,
Гаркаваты дух атавы,
Вельмі ранні ледастаў.

А мяне парой бясхлеб'е
І раскоша спадмане.
Нават сонечнае зрэб'е,
Як кляйноты, у мяне.

Толькі вершы і складаю,
Быццам даў каму зарок.
Сам апоўначы гуляю,
Як забыты вецярок.

1971

# ІНТЭРНАТ

Жыццё другою пойдзе ратай.
Дзе павальней, дзе на ляту.
Ды раптам голас інтэрната
Пакліча, нібы сірату.

Хто знаў, што ў шэрай камяніцы,
На станцыі юнацкіх сноў,
Так ярка будзе жыцца, сніцца...
І раскавана забруіцца
Амаль сусветная любоў?

Там першая мая паверка
Прыпамінае кожны след.
З якою, бацькаўшчына, меркай
Нас выпраўляла ў іншы свет?

Свабодны розум быў закладам:
Час — не айчым і не ліхвяр,
І гаспадарскім добрым ладам
Сягнем далей мы за буквар.

Яе натруджаныя рукі
І даўніны бунтоўны дух
Нам сведчылі, што у навуках
Не толькі Вільня, Пецярбург.

Казала прыказка нам:
Пільна
Вядзі свой рэй праз новы свет,
Табе і ў хаце будзе Вільня.
Такім быў даўні запавет.

Апошні выкладу чырвонец —
Мітынгаваць пусці ў твой свет,

Усіх нячыстых сіл хрышчонец —
Мой запаветны факультэт.

Не пусціць, зноў напомніць даты,
Як на нябёсных паплавах,
Над светам тым, над інтэрнатам,
Студэнцік-месяц усплываў.

Чамусьці з ім, чамусьці разам
Бяссонным прыцемкам начэй
Шукалі яснага адказу
На ўвесь кругазварот падзей.

Ці бескарыслівасць зіхцення,
Ці тайна лёгкасці святла
Дражніла наша утрапенне
І ў яснасць роздуму вяла?

Далёкі голас інтэрната,
Ты сёння адказаць спрабуй.
Далёкі голас інтэрната,
Ты калі што — мяне пачуй.

Жывіце дружна — сэрца змесціць
Любоў і боль, бяду і здзіў.
Ну, а на наш студэнцкі Месяц
Ужо і чалавек ступіў.

1971

## ВЯРТАННЕ КНІГ

### 1

«Жыў слаўны майстра у Брэслау...»
Звініць нямецкі верш стары.
Пярэхрыст войнаў нецікавых,
Брэслау — Вроцлаў з горкай славай,
Куды там — даўнія майстры.

Яны не ў той ваеннай гары,
Дзе сорак пяты б'е пад дых.
Там, каля Вроцлава ў ангары —
Бетоннай самалётнай тары,
Склад паланёных з Мінска кніг.

Усё спазнаеш не ў маленстве.
Пастой... пастой... крыху пастой...
О наша краснае пісьменства,
Ты вечна злучана з крывёй.

Ты трапіла не ў першы допыт,
І мог жа гэтак лёс злаўчыць —
Павезлі хуценька на попыт
Цікаўных бюргераў даўчыць.

### 2

Загадкай не змяніць эпоху.
Не апускайце толькі рук.
Яны вяртаюцца патроху
У Акадэмію навук.

Не для пяра, не для фатыгі
Пішу пра жахі і палон.
Вам, дарагія нашы кнігі,
Удзячнасць наша і паклон.

Мы шмат людзей не далічылі,
І самі вы не ўсе дайшлі.
Ляжаць далёка ад Айчыны
Байцы і кнігі у зямлі.

Ляжаць байцы, што памянёны
У памяці усіх жывых.
Там нашы родныя пісьмёны,
Як кроўная радня ля іх.

А тыя, што дайшлі, і далей
Паслужаць на сусветны рух.
Адкрыеш вокладку — і ўдарыць
Свабоды старажытны дух.

1971

## БАБУЛЯ

Старэйшая за дваццатае стагоддзе.
Вучылі і вучым, каб шанавалі старэйшых.
Ды блуднае дзіця нашай эры
Мала помніць пра гэта.
Сёння пытаемся — хто разумнейшы —
Настаўнікі альбо вучні?
Яна ж не прасіла, каб столькі войнаў
Лезлі ў яе вербы над рэчкай маладосці,
У лён, які гадавала.
Была б нават рада, каб лён той прыдаўся
Хоць на аборы ў няшчасныя лапці.
Іначай выходзіла —
Пятля вісіць на бярозе-сястры.
Каго павесяць — сына ці брата?
Лён гадавала, не патаптала.
Позна таптаць.

Склала шмат калыханак,
Што ні дзіця — новая песня.
Калыханкі знікалі разам з дзецьмі,
Сталі далёкім няясным матывам.
Жыта шуміць маладое?
У колас пайшло?
Ці брук гудзе пад салдацкім ботам?
Ізноў?
(Цяжка хадзіць ёй — як дабірацца
Па шляху гісторыі ад знічкі параўнання
У «Слове аб палку Ігаравым»
«Ісці дажджу стрэламі»
Да сваіх няхітрых расказаў:
«Пайшла я ў лазу па каня,
А кулі, як боб, сыпяцца».
Стрэлы, як дождж...
Кулі, як боб...)

Позіркам сіраты
Глядзіць, нібыта гаворыць:
«Скора пайду ўжо я ў тое поле,
Дзе не спяю дажынкаў.
Даўно не падобны вочы мае
На сінія кветкі ў жыце.
З тых дзён, як вышывала дзецям
Сарочкі шлюбныя сінімі васількамі.
Адны яны нечапанымі засталіся».
Позіркам сіраты глядзіць.

1971

## ЗІМОВАЕ

Які шчаслівы смех!
Так сонечна іскрышся.
Ты — лёгкая на снег,
Ні трохі не баішся.

А лёгкай нездарма
Выходзіла на сходкі —
Парыпвае зіма
Шчасліваю паходкай.

Ідзі — і не чакай.
Прамерз надзейны лёдзік.
Марозік той — малодзік.
Ажно гарыць шчака.

1971

## ПАЛЯВАННЕ

Па цаліку уладна крочаць
Праз неруш гурбін снегавых
Трох паляўнічых, трое гончых
І шэсць уласных руляў іх.
З зярнятаў, металічна-дужых,
Пагудкай рэха прарасло.
І нешта яркае, як ружы,
У снезе цветам зацвіло.
Цяцерка, ведама, дурная
І не зачэпіцца за сук.
Ды ўжо ў настылы снег злятае
І каралевіч-цецярук.
З глыбокім зіркам дубальтоўкі
Прастуюць праз сасновы свет
І возьмуць звыклаю гатоўкай
Усё.
І нават зайцаў след.
Пад вечар астывалі тушы
Без аніякіх там надзей.
Звярыныя цяжкія душы
Перасяліліся ў людзей.
А людзі аддавалі жарам,
Праходзіла лясная злосць.
І толькі, рэхам напужаны,
Ад іх хаваўся чуйны лось.
Ён з крыўдаю сваёй ласінай,
Далёка ад людскіх дарог,
Брыдзе грамнічнай ноччу сіняй
Скубці ў зарэчча хрумсткі стог.

1971

* * *

Дзесьці ў полі ляскоча падвода.
Што яна лічыць — выбоіны? годы?

Стылая далеч асенняй прасторы
Чуйна разносіць усё, што гавораць

Людзі, дарогі, падводы, машыны
І ў паднябессі клін жураўліны.

Не, нездарма самым вечным і блізкім
Здасца зямля, гэта поле-калыска,

Боты ў раллі, у асенняй, стамлёнай,
Дзень, што як быццам мядзведзь захмялёны,

Цяжка варушыцца ў мускулах нашых,
З намі да цёмначы папрацаваўшы.

Здасца — у ціхіх сялянскіх разорах
Выспелі, стынуць вялікія зоры.

1972

* * *

Здзівіся, друг мой,—
Неспадзеўкі
І для цябе, і для мяне
Такія паўзрасталі дзеўкі
У нашай роднай старане.

Пасляваенных тых пястушак
Так шчодра час панасяваў.
Не проста ў дочак, а ў дачушак
Свой мёд на вуснах заспяваў.

Ды што такім гадоў запасы,
Каму самім семнаццаць ёсць?
І нават нас вось-вось тым часам
Старымі абзаве — і баста —
Іх эгаізм і маладосць.

І весялухі і на птушак
Падобны, што ў гняздзе пяюць.
І кожнай па капе падушак,
Напэўна, мацеры дадуць.

Пакуль што не падушкі — пер'е
Збіраецца як незнарок,
Пакуль у хату не наперла
Ганцоў здалёк ці нездалёк.

Ах, каб жа блізка дзе! Схавае
Матуля свой уздых крадком,
Хаця ўжо прыблізна знае,
Куды дачка свой лёс трымае,
А род увесь той і той дом

Агледжан ёй з таго калена —
Тут можна многа развгажаць,—

Дзе ўжо і вечнасць акалела,
Ды як жа маці дакарац ь?

Калі вяселле загуляе
Уся радня, уся сям'я,
Яна-то шчыра не ўтрывае,
Заплача: «Кветачка мая...»

Вяселле скончыцца не сёння,
Хмель разышоўся нездарма,
І зоймецца зара півоняй,
А кветкі ў хаце ўжо няма.

. . . . . . . . . . .

На перазменцы пакаленняў
Падкажа дзіўнае чуццё
Шаптаць сабе, нібы маленне:
— Ты ўсё ж цудоўнае, жыццё.

Няхай ты бэсціш нас ці лаеш,
Але надзеяй — зноў і зноў —
Паглянь — юнацтва расцвітае.
І значыць — вечная любоў.

І пасумуе, і у ладкі
Паплешча з намі на зямлі.
— Прывет вам, мілыя дзяўчаткі!..

І ў нас не горшыя былі.

1972

# ТРЫЦЦІХ

## 1

Паверце, што і ў маці у маёй
Былі алешыны па-над ракой,
Алешыны юнацтва, што спявалі,
Як юныя надзеі сустракалі.

Былі вандроўкі па шляхах жыццёвых.
Яны не захацелі памагчы ёй.

І гэта ўсё аб той жанчыне, той,
Што школу кінула на шостым класе
(Камусьці ж трэба і кудзелю прасці),
Змагалася за праўду у калгасе,
А потым стала ціхай і сівой.

Ты адкажы — канал, а можа, рэчка,
Якую выпрастаў разумны век
(Ды дзе там рэчка —
Недзе паўгаршчэчка
Збярэш вады,
Як слёзаў з-пад павек).

Хоць ты скажы, бо лёс арэшын млее
Дымкамі з печак важка, як слюда,
А дзе надзеі, юныя надзеі?
Ты, можа, знаеш, мелкая вада?

## 2

Бо я не знаю. І якія крыкі
Перасягнуць няведання мяжу?
Я толькі помню — на любую крыўду
Мы румзалі: «Вось маме раскажу».

Ах, тыя крыўды — дай мне бог цяпер іх.
То ўпхнуць у лужыну, а то мацуюць лоб.
Калі ж яны граніцы распасцерлі,
Што сёння крыўда — ўзрывы дальніх бомб?

Што сёння крыўда і чума напалму.
Дый нават і мяшчанскі ўвесь ажур.
. . . . . . . . . . . . .

Век нас узвысіў, дый на нас напаў ён,
Аж часам роспач: «Маме раскажу».

Не, сам мужней! Хаця трымайся веры,
Што маці на любых зямных шляхах
Усё да простай самай праўды зверне
І разбярэцца, хто ў якіх правах.

3

Дамоў ідзеш з вячэрнім снопам стомы,
І наплывае гул забытага радка:
«Усходзіць зорка поля па-над домам
І мацеры маёй самотная рука».

1972

## ШКЛЯР

У гадах, але якраз
Маю стаж.
Пакуль што зоркі
Спраўна жыхкае алмаз,
Ажно ў шкле міргаюць зоркі.

Найслаўней мне вокны шкліць.
Сам заціхнеш вечарамі —
Здасца, на ўвесь свет глядзіць
Дом той цёплымі вачамі.

Толькі жудка шкліць было
У разбуранай сталіцы —
Вокны цемрай замяло,
Нібы мёртвыя вачніцы.

Удыхні святло у іх,
Будзеш трошачкі усцешан.
Горчыць хлеб заробкаў тых,
Сёння, пэўна ж, весялейшы.

Мяч віркам у вокны б'е.
Гвалт узвіхрыўся над домам.
Ах вы, шклярыкі мае,
Зарабіць далі старому.

Зарабілі і сабе
Ласкі бацькавай папружкі.
Хто там носікам дзяўбе
Набрынялую падушку?

Дзеці,
Гэткай паўбяды
Лёгкім жартам мы адбудзем.

Бацька б'е — адны мяды.
Кепска, калі людзі будуць.

І нічога,
Мы мігом
Схаўрусуем з бацькам строгім.
Будзе зноў здароў ваш дом.
Лепш глядзіце на дарогі.

Колькі выхаджана іх,
Як бы сплачваючы доўг ім,
Брукаваных,
                    палявых,
Крыжавых,
Кароткіх, доўгіх.

Помню з маладых гадоў
Пылу смак і пах заранкаў,
Смак пастаўскіх праснакоў
І смургонскіх абаранкаў.

Бачу родную зямлю
У святле і рыштаваннях,
А найбольш за ўсё люблю
Вокнаў сонечнае ззянне.

Шкляр развабжыць гэтак, так,
Лёгкіх слоў развяжа кайстру
Працавіты наш зямляк
І, галоўнае, што майстра.

1972

## ЛІПА

### 1

Ліпы пахнуць найлепей здалёк —
Так ужо загадала прырода.
Гэты чэрвеньскі мяккі паўзмрок...
Лёгкі водар праз вёрсты і годы...

Ты глядзі, не забудзь пра мяне,
Цвет гаючы, ты ўзыдзеш над краем,
Як раса ледавая міне
І надыдзе раса медавая.

Там, дзе трызніць дажджамі зямля,
Ліпа цветам шуміць на пагодзе.
Як ты пахнеш мне сёння здаля
Ля апошняе чвэрці стагоддзя!

### 2

Маці нашых калысак слывеш,
Найлягчэйшае белае дрэва.
Калыханкі радзімы найперш,
Тыя ўсе перапевы-напевы

Свет між намі дзяліў напалам.
Іхні сум і пяшчота у лёсе.
Тых сядзібаў, прысадаў, палян,
Дзе табе караніцца прыйшлося.

Ад якой несусветнай бяды
Калыханкі дзяцей заклінаці?
Недзе там, і ў тваім кальцаванні
Абазначаны тыя гады.

«Не плач, маё дзіцятка,
Сціхні, маё роднае:
Вунь там войт ідзе,
На татку, на мамку
Ён бізун нясе...»

Ці прыпомняцца свету яны,
Калі знікне далёкая стома?
Пагасаюць іх гукі, таны,
Нешта новае цепліцца дома:

— Спіце, дзеткі, як спяць трысьнягі,
Спіце, дзеткі,
як спяць перапёлкі.
Век свае не апусціць сцягі,
Дзень не стане балючым і золкім.

Калыханкай на тысячу міль
Разышліся вячэрнія гукі.
Так вось, Tilia cordata mill *,
Сарцавідная, мовай навукі.

3

Дык пачуй жа і сэрца маё,
Векавая, на дальнім узмежку,
Месяц кінуў сваё вастрыё
І вядзе на далёкія сцежкі.

Сто гадоў, як на гэтай зямлі
Адмянілі ваеннае права.
Больш чым сто, як этапы прайшлі
У Сібір без пагонаў за славай.

---

* Ліпа звычайная, сарцавідная (лац.).

Гора ліпу пачне абдзіраць,
Лыка тоненька драць на істужкі,
Будзе гора ад гора скакаць,
Прыпяваючы песню-дрындушку:

«Танцуй, Мацей,
Не шкадуй лапцей,
Пакуль ліпа зацвіце —
Бацька новыя спляце».

4

А як ліпа ды ў нас зацвіце,
Мы яе не кранём, не зачэпім,
Лёгкі крок будзе быццам як цень,
На заручыны чэрвень і чэрвень...

Найсвятлейшы, ад ліпаў агонь...
І з вачамі сустрэнуцца вочы.
На зары зацвітання твайго
Ах, якія кароткія ночы!

5

Хай сабе там філосаф-паэт
Адчаканіць на вокладцы кніжкі,
Што мякчэе, лагоднее свет.
Як сказаць тут, і знаючы лішне?

Толькі ты нам пацвердзі, скажы —
Да цябе сапраўды спагаднейшы.
Ты стаіш на нябачнай мяжы
Дзвюх эпох, што скальцованы вершам.

Свет не будзе цябе абдзіраць,
Новы свет не дапусціць да глуму.

Кожны мусіць на міг замаўчаць
Перад споведдзю вечнага шуму.

Толькі пах твой мядовы і цвет
Даплывуць, далятуць да нашчадкаў.
Ну, а горыч і поскрып лапцей
Стануць з часам, магчыма, загадкай.

Добры край, светлы край, мілы край...
Ціха цэдзіцца змрок вечаровы.
Ты мяне прычакай, дачакай,
Не забудзься на нашы размовы.

**6**

Буду цвет я ліповы збіраць,
Як бы мне і патрэба найболей,
Буду доўга усё ўспамінаць,
Як бы нехта навек заняволіў.

Каля ліпы суціўшы крок,
Зажуруся на летняй выгодзе.

. . . . . . . . . . . .

Як ты пахнеш мне сёння здалёк
Ля апошняе чвэрці стагоддзя.

1972

# ЛЕТНІЯ МАЛЮНКІ

## 1. Пісьмы

У вечаровым краі вясковым,
Дзе лёгкі гоман і поскрып брам,
Па пяску прыазёрным кіем сасновым
Пісьмы пішу сябрам.

Пра адзіноту, пра сосен свячэнне,
Пра лодку і шум трысця.
І нешта няяснае, як вызначэнне
Любові ці сэнсу жыцця.

Ненадзейная пошта — я знаю.
Ды гэты вечар бунтуе душу.
А хваля за хваляй ціха змывае
І лодку, і адзіноту, і шум.

Мае адрасаты не забывалі
Праз гарызонт працягнуць руку.
Што рабіць мне? З упартасцю хваляў
Пішу на мокрым пяску.

## 2. Жнівеньскія зоры

Дазорцамі станем.
Пастой, дзе спакой?
Пасцелі засмоктваюць багнай ганебнай.
Глядзі,
Як кідаюцца ўніз галавой
Зоры з самага сёмага неба.

## 3. Птушка

Астывае трава лугавая,
Хмельна ткуцца палотны смугі,

І у промнях зары залатая
Піша птушка над лугам кругі.

Каля позняй зары перагрэтай
Льецца лёгкай нязнанасці крык.
Залатая!
Як радасць над светам.
Ён да цудаў яшчэ не прывык.

Залатая яна, маладая,
Можа, нават з апошняй вясны.
Жнівень цёпла ёй крыллі гайдае.
Першы раз азалеюць яны.

## 4. Адажыо

Дабранач!
На ціхую воду
Ляглі вечаровыя цені.
Дабранач!
З якое нагоды
Мой голас амаль што асенні?

Застынуў у золкім чароце,
Згубіўся такі сіратлівы,
Падобны да тых, што ў чароды
На вырай склікаюць шчымліва.
Дабранач!
Над месячнай сцежкай
Лунае мой голас праз Нарач.
Асенні, каго ён усцешыць?
Дабранач...
Дабранач...
Дабранач...

1970—1972

# ЛЕБЯДЗЁЎСКАЙ ПОШЦЕ

Лебядзёўская пошта
У маёй старане,
І навошта ты, навошта
Забываеш мяне?

Пісем шмат сёння маю,
А той сіні дамок
Нешта не адзначае
Свой стандарт-штампялёк.

Сувязь светаў чакальных
Выклікала парой
На парог чужадальны,
А найбольш — то на свой.

Нестандартныя штукі
Там са мною былі —
Радасць першай навукі
На вялікай зямлі.

Больш, чым школа, мястэчка
Вучыць нас пакрысе.
Быстрацечная рэчка...
Гусі ў дымнай расе...

Там увосень літанні
Прыдарожных бяроз.
Там касцёл вёў змаганне
З цэрквай —
Роўны іх лёс.

Сельскі клуб пахне жытам,
Ён умеў віраваць,
А факстрот «Рыо-Рыта»
Нас вучыў танцаваць.

Ды здавалася мала
І такога сяла.
Свету нам не хапала —
Пошта сведчыць магла.

Там і жолуд стаў дубам,
А рамантыкі чад
Аніколі не думаў
Паварочваць назад.

Вось не думаў, а сёння,
Адрасат, ты падрос.
Знаеш месца пад сонцам —
Да мястэчка сто вёрст.

Пошта, можа, як-небудзь
Мы паладзім з табой.
А не ты, то хай лебедзь
Узмахне нада мной.

1972

* * *

Любіце на вокладках даты.
Калі і чаму — паталкуй.
І кнігі тады, як салдаты,
Што ў энскім служылі палку.

Прыйшлі на свой дэмбель.
Ці спраўна,—
Пытаюць,— на свеце жывём.
Якія такія папраўкі
У ход гістарычны ўнясём.

А можа, іх змест — вы паверце —
Сказаць абавязвае вас,
Што дзень іх народзін быў смерцю,
А ў пешках і аўтар, і час.

Тады не прыйшлі, і не дэмбель,
А проста папера ляжыць.
І ўсё-ткі прыглушаным тэмбрам
Хоць дата для сэрца гучыць.

1972

## БЯРОЗА

### 1

Хай ліпа размаўляе з вечнасцю —
Ёй болей на зямлі пражыць.
Нявестачкай яшчэ нявенчанай
Бяроза пад акном стаіць.

Да хаты той яшчэ не раз прыйсці
І глянуць праз маёвы дым.
Здаецца, аж сакоча з радасці
Пад зыркім сонцам веснавым.

### 2

Сакоча, ажно разлягаецца,
Усім наўкол чутно-відно.
На стол пісьмовы прыглядаецца
У разнасцежанае акно.

З юнацтвам толькі і заручана.
Смяецца:
«Крэмзай, малады,
Нявыкрутка — гартай падручнікі.
Пісалі шмат — такой бяды».

Мне не прызнанне пераходнае
Душу хвалюе, а само
Існенне граматаў ахоўных
На словы, літары, пісьмо.

Яны важней за ўсе падручнікі,
Хаця сустрэнуцца радзей
Бярösты векавечнай скрутачкі...
Там слова: жыта... дабрадзей...

Ах, тыя граматы выдатныя.
Галоўнае, што права ёсць.
Далучыцца усё астатняе.
Хай застаецца маладосць.

Такая вось, як ты, пявучая,
І незалежная, як ты,
З зямлёй для будучыні злучана,
Для новых слоў і дабраты.

Яна любыя беды здужае.
Калі ж паперу адбяруць,
Ёсць вечная папера мужная —
Раздолле думцы і пяру!

Бярозачка ды вілаватая,
Шуміш, шуміш ва ўсе канцы.
Як будзем нечым вінаватыя,
Скажы, што пойдзеш па дубцы.

3

Пярэстасцю сваёю зорнаю
(З засады — нібы светлячок)
Ты, партызанская дазорніца,
Не раз высвечвала здалёк.

Не, не змыліцца ім, здарожаным.
Начныя стукі ў родны дом
Лятуць ціхутка, як гарошынкі,
Але і ў іх ужо закожаны
Салютны, пераможны гром.

Ты грэйся, сувязны, да золаку
Пад небам дарагіх вачэй.

Расстайны голас шэпча:
— Золатка,
Прыходзь хутчэй, прыходзь хутчэй.

А на бяросце у дазорніцы —
Жалобны тон і светлы тон.

. . . . . . . . . . . .

Адных вярнула хваля вольніцы,
Другія — ў плыні даўніх дзён.

4

Я прамаўчу на жарты нечыя —
Надумаў — з дрэвам размаўляць.
А час не выпесціў сустрэчамі,
І гэта найцяжэй прызнаць.

Ды папрашу цябе, насмешніца,
Заўсёды свой дазор нясці.
Як выпадзе, што беды ўсцешацца,
Па даўняй дружбе пасвяці.

Сцяжынкі родныя і наскія
Мне адгукнуцца ўначы
Пад водгул славы партызанскае,
Перад якой і хлус дрыжыць.

Няхай сабе хоць і пад раніцу
Знайду свой запаветны край.
А ўжо тады як зажадаецца —
Шкадуй альбо дубцом карай.

Так, толькі з пэўнаю павіннасцю
За кожны дзень, за кожны крок

Я рады да цябе ізноў ісці,
Спаткаўшы родны вецярок.

І гэта важнае расказана —
Як бы сабралася сям'я —
Зямлі,
Якой мы абавязаны
Аднолькава —
І ты, і я.

1972

* * *

Вайсковыя могілкі Мінска
Не будуць варот зачыняць.
Спыніся — далёкі ці блізкі,—
Тут маршалы нацыі спяць.

Купала і Колас...
Раптоўна
Адчуеш свабодна зусім —
Не толькі радком загалоўным —
Ты ўсім абавязаны ім.

Трывожаць не рангі і званні,
Інакшы азначыўся плён —
Дзяржаўная важкасць гучання
Адзіных і розных імён.

Імёны ключоў жураўліных,
Бароў і герояў зямлі,
А з імі у назву Айчыны
Паэтаў імёны ўвайшлі.

Айчыны, што вырасла хутка
Праз радасць і боль заваёў.
Мой родны мой кут, не ў закутках
Пачэснае месца тваё.

І не пры магільным граніце,
А скрозь на вялікай зямлі
Любіце паэтаў, любіце!
Іх так ненавідзець маглі.

1972

* * *

Хто бы дерево бортное чужое
со пчолами — сосну — сказил
або пожаром опалил
або яко-колве шкоду дереву вчинил,
тот за тое дерево и за пчолы
повинен будеть платити тому,
чие будет, копу грошей...

Статут Вялікага княства
Літоўскага, 1529 г.

Ашчаднае сярэднявечча,
Далёкі лясны гуманізм
Не знялі,
Што сосны заенчаць
Крычаннем амаль чалавечым
І разам з аблокамі — ўніз.

Калі спаганяць у Еўропы
За нашыя дрэвы даўгі,
Складзеш на даўнейшыя копы —
Не знойдзеш з багаццямі тропу —
Пластамі скідай у стагі.

Хаця не зіхціць пад фуганкам
Апошняя дошка труны
Дачаснай,
Што стане ля ганка,
Што выплыве атамным ранкам
З крамнёвай
Ці бортнай сасны,

Хаця не скавалі кайданы
Разораў,
І рук,
І надзей,
Паўноччу, як звон разгайданы,

Як нота лясных акіянаў,
Сасновы наш бор загудзе.

Ён будзіць усё — нават кволы
Законаў стары фаліянт.
І здасца, што літараў сполах
Са Статута, з рупнасцю пчолаў,
Ляціць да бароў на агляд.

1972

* * *

А як біліся паны,
То чубы трашчалі ў хлопаў.
А ў нас конь — ён вараны,—
У яго найбольшы клопат.

Ён паўсвету аблятаў,
Ён найлепей сама знае
І як віцязь паміраў,
І як хлопец наш канае.

Вось і глянулі паны
На замурзаныя вёскі
І ў палацах арданы
Заблішчалі зыркам блёсткаў,

Толькі ж, пэўна, нездарма
У пустой стагнала хаце
Не халопка, а сама
Проста маці, наша маці.

Лёгка ўходзіла яно
Галасіць уголас права
У бяссоннае акно
Мацярынскае дзяржавы.

— Каго буду даглядаць,
Слаць сасновыя палаці?
Перапёлкі не крычаць:
— Жыта жаці, жыта жаці!

Быль складалася даўно,
Ды таму і паўтараю,
Што бяссоннае акно
І да сёння не згасае.

Не спазнаўшым той тугі,
Нам з маленства лёг на твары
Водсвет вокнаў дарагіх
І заклятых тых пажараў.

Маці ночы не даспіць,
Сваё гора перабудзе,
Маці доўга мусіць жыць.
Маці!
А мы — тваe людзі!

1972

6 Зак. 2194

# ПЯСОК

## 1

Відаць, і праслыву
закончаным вар'ятам,
Пра што і так ёсць падазрэнні у суседзяў,
Як прывязу дачцэ ад роднай хаты
Пяску.
Чым горш
за магазінных лісаў і мядзведзяў?
Гуляй, дачка, гуляй,
Пясок перасыпай.

## 2

Забаўка, бачыш — залаты, сыпучы.
Не то што марны гарадскі —
ды і таго нямнога.
Гуляй пакуль з пяском, другому час навучыць.
Нядрэнна жыць, не знаючы нічога.

Гуляй, дачка, гуляй,
Пясок перасыпай.

## 3

Нішчымны ён,
гуляць з ім будзе лёгка,
Пражыць вось на пясках не так салодка.
Паўночны Захад ад выгодаў быў далёка.
Мо мільгануць у ім, як зоры, слёзы продкаў.
Зіхцяць яны...
Гуляй...
Пясок перасыпай...

## 4

Ды не схлушу,
скажу, што шчасце ўсё-ткі
І там яснела добраю пагодай.
Каровы йдуць дамоў...
дыміць пылок салодкі...
Спрабуй забыць той вечар і пылок праз годы.

Спрабуй забыцца, як капаюць студні,
Як дыхае пясок каля крыніцаў,
Што вусны перасмяглыя астудзяць.
Спрабуй сягоння гэтак прычасціцца.

І гэты прысвятак прад самым святам —
Падмесці сцежкі і пяском пасыпаць жоўтым.
Бы Млечныя Шляхі, сцяжынкі каля хаты,
Дзе пройдуць госці і дзе сам прайшоў ты.

Гуляй, дачка, гуляй,
Пясок перасыпай.

## 5

Ці дзіва, што прайшлі, адбалявалі?
Час нават горы крышыць,
смокча рэкі.
І Млечныя Шляхі кудысьці пазнікалі,
І выстылі сляды, а многія — навекі.

Ёсць бег календара і подбег дзён няспынных.
І нашую з пяском нашто шукаць віну?
Хаця з віной і горыччу я кінуў
Па грудачцы
не на адну труну.

Таму ён мне і блізкі, і балючы,
Пясок, што ззяе у тваіх руках.
А кожны успамін жыццё праясніць
лучыць...
Як весняя трава, пясок на курганках.

Хвілінку пачакай...
Хвілінку не капай...

1972

* * *

А можа, зноў прайсці ля інтэрната
Марознай вуліцай пад месяцам сваім?
Як і тады, студэнтам вуглаватым,
Пускаючы цыгаркі лёгкі дым.

І зноў падумаць спознена, што шчасце
Прайшло, як дым, ва ўсёй хадзе падзей.
Там ёсць акно.
І рама — як распяцце.
Ці не на ёй там калісь стыў мой цень?

1973

# З ВОСЕНЬСКАГА ДЗЁННІКА

24 верасня. Дзень празрыста-асенні.
1973 год.
Дзень без сонечнага зацьмення.
Без патопу.
Не будзе прыгод.

Рупіўся зранку ў матчыным доме
Падрубу новую затынкаваць.
Гліну мясіў,
а нязвыкласці домесь
Пыталася: як жа тынк мацаваць?

За паветкай быў дроту калючага скрутак,
З канцлагера, ад вайны.
Зялёным прыхоплены вокісам,
нібы атрутай,
Звіўся ў траве ля глухой сцяны.

Нялёгка было бесканечнасць раскручваць,
Да падрубы прыбіць —
дрот не слухаў цвікоў.
Які ж ты, нявольніцкі дрот, жывучы —
Мінулася столькі гадоў,

У нас, паваенных, свае ўжо дзеці
Галінкамі гоняцца ў рост.
А ты не гінеш,
спрутам паўзеш па свеце,
За Анды цяпер перапоўз.

Дрот у Сант'яга,
ў турме-стадыёне
Далягляды закратаваў.

На гэтакі ж дрот,
як і мой,
сёння гоняць,
Хто супраць рабства паўстаў.

Сёння ў мяне паслухмяным гэты,
Моцнага гарту,
змусіўся стаць,
Але руіны дому Альендэ
Крычаць... Крычаць...

Стаіць вядро
і гліна чакае —
Жменька планеты, названай Зямлёй,
Планеты падзеі,
трывогі,
адчаю,
Пытання: дрот, ці ўкіруем нарэшце табой?

1974

## ТАПОЛІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

«Зразаюць галіны таполі...»
О горкая моц і жальба!
Зайсціся да смутку і болі
Мацней, чым калісь галыцьба.

У полі,
Дарогай у полі,
Суцішыўшы роспачны крок,
Ужо неадступных таполяў
Дрыготкі спаткаць халадок.

Маіх, палявых, не кранула
Сякера, піла і зіма,
Ды здасца — жальба не мінула,
І, мусіць, зусім нездарма.

Бо гэта ж вясною, няйначай,
Як камень — і той уздыхне...
Бо толькі таполі заплачуць
Ягонай апошняй вясне.

1974

* * *

І гэткі ўжо роўны шум соснаў —
Наўрад ці удасца, наўрад
Той голас сасонкі адрозніць,
Пасаджанай рана ці позна —
Ну, скажам, год дваццаць назад.

1975

# ПРОЗА



## ЛІЧЫЛА ДНІ ЗЯЗЮЛЯ...

Ліпеньскай раніцай далікатна стукаюся ў дзверы загадчыка Смаргонскага райана. Заходжу ў невялікі кабінет, дзе стаіць зеленаваты паўзмрок — адзінае акно засланілі кусты акацыі,— і вітаюся з чалавекам сярэдніх гадоў. Кажу:

— Мяне накіравалі працаваць у ваш раён.

— Вельмі прыемна, сядайце.

Пакуль загадчык гартае мае паперы, папраўляю акуляры, а потым удумліва гляджу на голую сцяну — раблю ўсё, каб хоць з аблічча быць трохі падобным да настаўніка.

Загадчык падымае галаву і прыемна ўсміхаецца (папаўся!), а пасля пытае:

— Чаму вы выбралі іменна наш раён?

Ён, відаць, хоча пачуць ад мяне хвалу свайму раёну, але я ад чыстага сэрца прызнаюся:

— Мне адгэтуль дамоў блізка — маці жыве ля Маладзечна.

Здзіўляюся, што замест расчаравання загадчык бадзёра ўсклікае:

— А-а, значыць — землякі! — І тут жа цікавіцца, куды мне хацелася б паехаць.

— У Залессе,— адказваю, хоць самому карціць астацца ў Смаргоні (ведаю ж, што мяне не пакінуць, бо ў Смаргоні сваіх настаўнікаў больш чым трэба).

Але тут адбылося тое незвычайнае, чаго век не забыцца. Сказаўшы колькі слоў, у якіх былі адзначаны мая энергія і маладосць, загадчык

абвясціў, што пасылае мяне дырэктарам васьмігадовай школы. Гэтага я ўжо ніяк не чакаў. Трохі апамятаўшыся і зразумеўшы, што сказана зусім сур'ёзна, я пачаў адмаўляцца, гаварыць, што век быў нізавым актывістам і ніколі не збіраўся нікім камандаваць. Але загадчык быў няўмольны, як Рабесп'ер. І тады я кінуў сваё апошняе:

— Дык я ж ніколі не быў дырэктарам.

Загадчык усміхнуўся.

— Добра, едзьце дамоў і падумайце тыдзень. Малінаўская васьмігадовая школа, куды мы вас адпраўляем, не такая і дрэнная, аўтобусы ходзяць праз вёску, калгас неблагі, і старшыня талковы. Падумайце.

Праз тыдзень я зноў сышоў на перон смаргонскага вакзальчыка з вясёлага прыгараднага цягніка Маладзечна — Гудагай і пашыбаваў да райана. На гэты раз усё было каратка і ясна. Загадчык пайшоў у адпачынак, а мне сакратарка дала загад, у якім было напісана, што мяне пасылаюць дырэктарам Малінаўскай васьмігадовай школы. Праз якія паўгадзіны я ўжо шпарка крочыў па Смаргоні, напяваючы: «Хто быў нікім, той стане ўсім». Мне было не тое што весела, але смешна.

Аўтобус Смаргонь — Свір грукоча па драўляным гулкім мосце цераз Вілію. Бывай, Смаргонь! У вясёлай аўтобуснай штурханіне, дзе амаль кожны вязе па ладным звязку славутых смаргонскіх абаранкаў, прашу вусатага пажылога дзядзьку, што стаіць ля мяне, каб сказаў, дзе мне вылазіць. Той, пачуўшы слова «Малінаўка», здаволена ўсміхаецца:

— А-а, ты ў Свінку едзеш. Яшчэ стой і драмі, бо не так і скора.

Здзіўлена думаю: «Пэўна, недачуў, глухаваты»,— і галасна паўтараю:

— Не, мне ў Малінаўку!

Дзядзька пацвельваецца і зноў:

— Ну, ну, да Свінкі!

Заўважыўшы маё замяшанне, дзядзька тлумачыць, што гэтая вёска нядаўна звалася не Малінаўка, а Свінка. «Ну,— думаю,— добра, што хоць назву змянілі. А то пісьмы сябры і сяброўкі пасылалі б у нейкую Свінку».

Другі дзядзька, ля якога я пасля прымасціўся на апошнім сядзенні, сп'яну пачынае давяраць мне сваю вялікую крыўду:

— Знаеш, хлопец, не ведаю, як і жыць далей. Жонцы маёй саўсім галава ўжо не служыць. Паехала гэта да дачкі ў Смургоні і піша мне пісьмо адтуль. І гэта, значыць, на канвэрце слова Смургонь піша з цвёрдым знакам на канцы. Не ведаю, як і жыць з ёй. Дваццаць гадоў разам жыў, а цяпер не магу.

Дзядзька яшчэ гаворыць мне нешта пра самаадукацыю жонкі, але я ўжо не слухаю. За акном праплываюць то вёскі, то пералескі. Канчаецца жніво, і нават у аўтобус даносіцца суха-салодкі пах спелага жыта.

Нарэшце на слупку ля дарогі бачу блакітную стрэлку са словам «Малінаўка». Нішто сабе. Хаты добрыя: высокія і шаляваныя; шмат зеляніны, у гародах буяюць чырвоныя і жоўтыя вяргіні. Толькі на поплаве за хатамі адсвечваюцца сінню неба нейкія сажалкі. Поўдзень, і на брукаванай шэрым каменнем вуліцы — ні душы. Хоць бы адзін мой будучы вучань паказаўся. Відаць, Малінаўка некалі была куды меншая. Пазнаю гэта па тым, што адна з каплічак, якія ставіліся з абодвух канцоў вёскі, стаіць амаль пасярэдзіне.

У хату Чарняўскіх мяне прывяла мая папярэдніца — дзяўчына-дырэктар. Гаспадар хаты — калгасны каваль. Я ўспомніў прыказку «Каваль куе, а жонка пяе». Сэнс прыказкі такі — за кавалём добра жонцы. Калі ж мы вечарам паўз вярбовыя прысады падышлі да вялікага старасвецкага дома ў баку ад дарогі, то ўбачылі, што жонка каваля не спявала, а, седзячы на прыступцы ганка, скрабла бульбу. Угледзеўшы нас, устала і ветліва запрасіла ў хату. Мы апынуліся ў вялізным пакоі, ад якога шафамі была адгароджана бакоўка. У пакоі, апроч шафаў, стаяла і камода, накрытая белай сурвэтай, а таксама драўляны нефарбаваны тапчан.

Гасцінным людзям заўсёды здаецца, што ў іх нешта не так, горш як у людзей, і цётка Стася, якой, пэўна, не больш за трыццаць сем гадоў, пачала была такое:

— А хто яго ведае... А ў нас усё па-простаму... ці дагаджу я...— і г. д.

Але мы хутка паразумеліся, бо мець харомы ў гэтай вёсцы я не збіраўся.

Прыезд новага чалавека не можа прайсці незаўважана, бо не вельмі часта ў такія вёскі, дваро ў на 120, прыязджаюць новыя людзі. А пра дзяцей і казаць няма чаго, бо гэтыя кірпаносікі проста дзяжураць на вуліцы, каб хоць трохі выведаць, прыгледзецца. Без ніякай азбукі можна прачытаць на іхніх тварах пытанне: злосны ці добры?

Гаворкі з імі я пакуль што не заводжу, бо не да размоў. У Малінаўцы да гэтага года была чатырохгодка, і ў ёй — 26 вучняў, а ў суседняй вёсцы Свяцілавічы, за паўтара кіламетра, ёсць васьмігодка, і ў ёй... 38 вучняў. Трэба зліць гэтыя школы ў адну, каб мець больш-менш прыстойную

васьмігодку. Вось і бегай па крузе: кантора калгаса — Свяцілавічы — Малінаўка — кватэра, бо трэба перавезці то парты, то сталы, то шафы.

Першае ўражанне ад Малінаўкі — спакой і прыгажосць. Гулкая дарога заціхае рана, сонца лянiва апускаецца ў лес, чапляючыся за вастраверхія яліны і сосны. Ва ўсіх вёсках каровы ідуць вечарам з пашы павольна, ляніва, а тут і зусім ледзь плывуць, так напасвіліся — лугі траўлівыя і трава ядкая.

Амаль на кожным пагорку ля дарог купы вынасістых сосен. Ідзі проста дарогай ля сосен, мінеш дзве крыжоўкі, пасля ўбачыш высокую вышку лесніка, які забіраецца часам на яе паглядзець, ці не закурыўся дзе лес, пасля будзе пад'ём на ўзгорачак дарогі, і ты аслупянееш — як вялікае блакітнае вока зямлі, люструецца, пераліваецца ў промнях сонца Вішнеўскае возера. Паколькі з гэтага боку да берага падступіцца цяжка, палюбуйся на возера здалёку і ідзі назад, але ўжо селавой дарогай, і трапіш у Свяцілавіцкую школу — некалі панскі маёнтак — вялікі, ужо стары, з патрэсканымі аж да сарцавін бярвеннямі, але яшчэ моцны дом, які рабіўся на шмат гадоў. Дах лабаты, на гарышчы цэлыя хмары галубоў. Вакол дома вялікі парк, доўгія цёмныя прысады з ліпаў, куды даходзіць толькі водар лета, а не яго гарачыня. Відаць, некалі па гэтых прысадах гуляў ветрык, а з расчыненага насцеж акна чуліся гукі фартэп'яна; прыезджы улан шаптаў пад вячыстай ліпай сваёй каханцы: «Панна». Гэта, вядома, ужо ўрывачак са шляхецкай ідыліі, але пасля верасня 1939 года старая пані пісала знаёмым у лісце з Варшавы: «Пакуль мы танцавалі танга, Саветы рабілі танкі».

Упрогся ў гуж. Добра, што хоць у школе да

мяне зрабілі рамонт, а то прапаў бы — нарады ў раёне, педсаветы ў школе (праводзіў першы і заікаўся) — усё лавінай пасыпалася на галаву. Але найцяжэйшы занятак на свеце — напісаць расклад урокаў. Сама больш вучняў з самой Малінаўкі і з ваколіц яе — Айцвіл, Пастарынь, Бібак. Калі Свяцілавіцкая школа размяшчалася ў панскіх пакоях, то Малінаўская — у больш сціплым доме. Школа стаіць у садзе, наводшыбе ад вёскі. Тры класныя пакоі і яшчэ адзін вялікі, перагароджаны шафамі на калідор і піянерскую; маленькая настаўніцкая і зусім маленечкая кухня — вось і ўся школа. Цеснавата. Ні пра якія кабінеты і гаворкі не можа быць, хоць усялякіх прыбораў, наглядных дапаможнікаў і карцін поўныя шафы.

Сёмага класа, на жаль, не будзе, бо знайшлося толькі чатыры вучні, а каб адкрыць клас-камплект, трэба не менш за пяць. На апошнім жнівеньскім педсавеце настаўнікі меркавалі і так і гэтак. А ўсіх настаўнікаў у школе разам са мной восем чалавек, і чатыром з нас — па 22 гады. Так што школу можна лічыць маладзёжнай. Маёмасць кожнага з нас, як высветлілася пры бліжэйшым знаёмстве, можа змясціцца ў чамадане, ды і то невялікім. Любоў Іванаўна вядзе біялогію і нямецкую мову, займаецца на трэцім курсе Віцебскага педінстытута. Жана Маркаўна — рускую мову, Яўген Іванавіч — матэматыку і фізіку. Абое з сярэдняй адукацыяй. Ёсць яшчэ гісторык і географ Уладзімір Аляксеевіч, ён ужо даўно на пенсіі, мае год пад семдзесят, але яшчэ думае прынесці карысць на ніве народнай асветы. Якую навучальную ўстанову скончыў Уладзімір Аляксеевіч, я так і не дазнаўся. Вось гэтыя настаўнікі і бегалі, шукалі па навакольных вёсках так патрэбнае дзіця з шасцікласнай адукацыяй, але не

знайшлі. Шкада тых чатырох сямікласнікаў, але нічога не зробіш, прыходзіцца адпраўляць іх у далёкія школы.

Хадзіў па пустых класных пакоях гэтай дзіўна малой школы, дзе яшчэ востра пахла свежай фарбай. Плакаты, граматычныя і арыфметычныя табліцы развешаны па сценах, пакладзены на сталы. Зрэшты, якая розніца — вялікая школа ці малая? Косы прамень вячэрняга сонца паласнуў у паўзмроку дзеяслоўную табліцу. Там напісана: «Што рабіць? Што зрабіць?» Мілая дзеяслоўная табліца... Дзеці звычайна трываць не могуць граматычнай нуды, а стануць дарослыя — і вечна будуць задаваць сабе ў жыцці такія пытанні. Пра табліцу забудуцца. «Што рабіць? Што зрабіць?»

31 жніўня зранку ля школы і ў школе вясёлы вэрхал. Дзеці, а ўсе яны прыбраліся ў сукеначкі, кашулькі самых ясных калёраў, ніяк не могуць нацешыцца радасцю сустрэчы — бегаюць, гукаюць адзін аднаго, смяюцца; летняя вольніца дзяцей перасялілася на нейкі час у школу. Усе настаўнікі сабраліся ў настаўніцкай, мы тэрмінова складаем план правядзення ўрачыстай лінейкі; у суседнім класе двое хлопчыкаў, відаць, дужаюцца, бо ў акне настаўніцкай злёгку пазвоньваюць шыбы; я думаю пра тое, што калі сёння гэты стары дом-школа вытрымае напор дзяцей, то будзе стаяць яшчэ сто год. Але вось дзеці строяцца літарай П на пляцоўцы перад школай; вынас сцяга пад барабанны пошчак. Віншуем сваіх школьнікаў з пачаткам навучальнага года. Вялікая пацеха з першакласнікаў. Такія ўрачыстыя, што некаторыя і слова не могуць вымавіць. Стаяць, баючыся (а калі дазнаюцца, што ўчора ў лялькі гулялі і ўсё яшчэ з мамай спім?), прыглядаючыся да настаўнікаў (а як яно тут будзе?).

У кожнага вучня букет цудоўных восеньскіх вяргіняў, суха-калючых астраў; толькі хлопцы-старшакласнікі без букетаў — не прызнаюць гэткіх сантыментаў.

Але 1 верасня заняткаў у школе не было, бо не паспела дайсці да канца ўрачыстая лінейка, як з'явіўся стары і хітры нарыхтоўшчык з раёна; прывёз ён на грузавіку 80 пустых скрынак, у якія мы павінны скласці ўвесь ураджай школьнага саду, інакш, сказаў ён, вы пасля будзеце бегаць за мной, а не я за вамі. Нам не хацелася бегаць за нарыхтоўшчыкам. А яблыкі сёлета слаўныя! Сад стары і надта ўраджайны. Калі б не падпоры, голле, пэўна, не вытрымала б яблыкаў. Залатыя ранеткі, пепіны, мундэры, антоны — чыстыя, не паточаныя. Дзяўчаткі абіраюць яблыкі стоячы на зямлі, а хлапчукі ўзлазяць аж да верхавінак... Вось ён спрытна і хуценька, як вавёрка, перабіраецца з сука на сук, між тым вельмі асцярожна ружовыя пальчыкі яго рук абхопліваюць цёмны шурпаты камель яблыні, і ні адзін лісцік, ні адзін сучок не абломваецца; блакітныя, ужо даволі расфутболеныя кеды лёгка мільгаюць сярод зеляніны лістоў; падаю яму пустое вядро, якое, чапляючыся за сучкі, цінькае, як сініца; хлапчук спрытна бярэ за вочап, і яго светлы твар заззяў сярод цяжкіх даспелых яблыкаў. Ён зрывае самы большы яблык, кідае яго ў пустое вядро (донца глуха бумкае) і асцярожна падае вядро назад. Я не разумею такіх паводзін і пытаюся, механічна беручы вядро:

— Чаму ты аддаеш назад? Трэба ж яблыкі абіраць.

А ён трохі пачырванеў, па-дзіцячы сарамліва і лёгка адвёў сінія вочы недзе ўдаль, на дах калгаснай кузні, і сказаў:

— Гэта залатая ранетка... Вам. Пакаштуйце...

Акуратна пакуем яблыкі ў скрынкі, а скрынкі носім на ганак школы; яны стаяць там два дні, і па ўсёй школе разліваецца прыемны салодка-вераснёвы пах...

Дырэктар — гэта пасрэднік між вучнямі і настаўнікам, ён павінен кіраваць вучэбным і выхаваўчым працэсам і абавязкова мусіць увесь час, пакуль ідуць заняткі, быць у школе і за дзень наведаць не менш як два ўрокі ў любога настаўніка. Гэта толькі частка тых настаўленняў і рэкамендацый, што даюцца нам на канферэнцыях і нарадах.

Пасрэднік. Матэматык крыкнуў на ўроку на шасцікласніка:

— Заткніся!

Той, доўга не думаючы, спакойна адказаў:

— Заткніцеся самі,— ну, і, вядома, апынуўся аж у настаўніцкай ля майго стала. Утаропіў вочы на зялёнае сукно стала і стаіць роўненька.

— Чэсь, чаму ты нагрубіў настаўніку? Чэсь, ці мае права вучань так размаўляць са старэйшымі?

Такія пытанні задаю яму мінут пяць, а ён ані слова. Як бы я гавару не да яго, а да сцяны. Потым пачынаю чытаць лекцыю аб правілах паводзін вучня. Зноў ні слова. Толькі адзін раз гэты самы віхрасты Чэсь з нейкай затоенай крыўдай, пераступіўшы з нагі на нагу і паглядзеўшы мне ў вочы, прашаптаў: «А што яны самі так гавораць...» Зразумела, што шасцікласнік не нагрубіў бы, калі б супакоіцца яго папрасілі далікатней. Ён жа чалавек, і хоць малы, але мае пачуццё ўласнае годнасці. Адчытваў вучня, а пасля і настаўніку прыйшлося сказаць некалькі слоў.

Гаспадар мае кватэры Мечыслаў Віктаравіч

пры знаёмстве з цікавасцю агледзеў мяне і сказаў:

— Дзяцей вучыць будзеце? Чаго-чаго, а мэнкаў [1] з імі дастанеце. Дзеткі такія пайшлі, хай бог крые. Некалі бацька як гляне на цябе раз, то і сядзіш, як свянцоны, а цяпер...— ён безнадзейна махнуў рукой.

Вядома, дзеці рухавыя, асабліва ў нашай школе — амаль усе старшакласнікі ездзяць у школу на веласіпедах, або, як тут кажуць, на роварах. Цэлая велакалона імчыць раніцой да школы. Сонца мігціцца на спіцах. Які чалавек з горада мог бы падумаць, што ў нас веласпартыўная школа!

На першай змене ўсяго дванцаць шэсць вучняў, а настаўнікаў заўсёды пяць ці чатыры — парадак трымаць не так і цяжка, бо кожны навідавоку.

Вось пяты клас. Пяцікласнікі выпырхнулі з чацвёртага класа, дзе іх вучыў адзін настаўнік, у пяты, і ў іх адразу шэсць настаўнікаў. Тыя прывыклі працаваць з большымі вучнямі, а гэтых не заўсёды разумеюць. А дзеці яшчэ перажываюць за няўдачы зайчыкаў і лісічак у розных казках. Светлавалосая дзяўчынка расказвае, стоячы за партай, пра Алёнку і ваўка. Яна нібы просіць дапамогі, і, здаецца, нібы не Алёнка — яна сама ідзе праз лес, а за ёй гоніцца люты воўк. Я знарок папрасіў шасцікласніцу расказаць гэтую казку — і адразу адчуў розніцу ва ўзросце. Рэня Шарка расказвала і хітравата ўсміхалася: яна ўжо ведала, што значыць казка, і ў канцы сказала:

— Але ж гэта казка, так жа не бывае...

---

[1] Мэнка (польск.)— мука.

У пятым класе ўрок літаратуры ператвараецца часам ледзь не ва ўрок спеваў, бо вельмі ж працяжна дзеці расказваюць — «пяюць». Дзе-небудзь вельмі жвавыя, а тут выклічаш да дошкі, напрыклад, Любаміра Караля, ён абавязкова паправіць рукой сваю густую грыўку, адвядзе позірк у куток, на печ, і пачне: «Жы-ыў бы-ыў на-а све-це на-адта злы-ы па-ан. Ён му-учыў лю-юдзей». Хоць бяры мандаліну і падыгрывай. Была б нішто сабе араторыя пра злога пана. Але замест гэтага ўсім класам хорам чытаем у хуткім тэмпе: «Між алешын, кустоў, дзе пяе салавей, і грыміць, і звініць срэбразвонны ручэй». Звон дванаццаці галасоў, які аддаецца рэхам у калідорчыку, стварае ўражанне не толькі срэбразвоннага ручая, але і цэлага горнага вадаспаду.

Поспехі вучняў у пісьмовай мове куды слабейшыя.

Дзеці гавораць чыстай беларускай мовай, прачытаўшы мастацкі твор, могуць складна пераказаць яго нават літаратурнай мовай, але калі трэба напісаць што-небудзь самастойна, то граматычных памылак не знойдзеш толькі ў двух-трох вучняў. Не кажу пра коскі і кропкі, бо асобныя абзацы самастойных работ дзяцей падобны на вершы французскіх і італьянскіх новаавангардыстаў, якія знакаў прыпынку не прызнаюць. Акрамя таго, у большасці пяцікласнікаў надзіва развіта абстрактнае мысленне з гіпербалізацыяй. Даюцца намёкі на нешта канкрэтнае, а дэталі астаюцца па-за ўвагай:

«Базыль і Грышка былі дружбакі. Яны разам тры зімы сядзелі на адной лаўцы. І на трэцяе лета яны разам пасвілі кароў. Калі маці дасць ім кавалак сала, то яны падзеляць.

Базыль любіў сядзець на беразе Нёмана.

Ён пойдзе, сядзіць (такі націск меў на ўвазе вучань.— *Р. С.*) на корань і сядзіць. І глядзеў, як у Нёмане плаваюць рыбы. Грышка бегаў па беразе і шукаў Базыля. Ён увідзяў, дзе сядзеў Базыль.

Базыль вельмі спужаўся.

Ён адарваўся ад дрэва.

Грышка падняў крык ратуйце.

На гэты крык збегліся.

Першы прыбег рыбак. Ён хутка раздзеўся і кінуўся ў ваду. Прыбегла маці, яна кідалася ў ваду, але яе дзяржалі мужчыны.

Так хлопчыка выратавалі.

Базыль яшчэ больш быў задумлівым».

Гэта пераказ апавядання Я. Коласа «У старых дубах». Калі вы самі не памятаеце зместу апавядання, то па гэтым пераказе вам цяжка будзе ўспомніць, хоць пісаў пераказ не горшы вучань у класе, які, вядома, змест ведаў. У пераказе шмат што разумелася дакладна, але не так было выказана пісьмова. Праверыў сшыткі, прынёс у клас і кажу Віктару Арловічу:

— На якой лаўцы сядзелі разам Базыль і Грышка тры зімы? Можна падумаць, што ледзь прыйдзе зіма, то яны выходзяць на вуліцу і сядзяць там на лаўцы немаведама чаго.

Смяецца ўвесь клас, смяецца і сам вучань, а потым гаворыць:

— У школе, у класе на адной лаўцы яны сядзелі разам.

А шасцікласнікі — чатыры хлопчыкі і чатыры дзяўчынкі — ужо зусім дарослыя. Куды там! Прыйшлі ў клас і адразу падзяліліся на два лагеры: хлопцы селі папарна на адным радзе, а дзяўчаты — на другім («Во, будзем мы з дзяўчатамі сядзець! І так пяць гадоў сядзелі. Мы ж не маленькія»). Але як ім там ні хацелася быць ужо

дарослымі, для большай дысцыпліны класны кіраўнік зрабіў усё ж «перамяшчэнне народаў», пасадзіўшы папарна хлопчыкаў з дзяўчаткамі. «Народы» спачатку ўзнялі шум, але што зробіш! Сталасць, як вядома, прыходзіць пазней. «Народам» прыйшлося змірыцца.

Шосты клас вучыцца нягорш. Да таго ж, хлопцы вельмі ваяўнічых настрояў, вельмі любяць чытаць, слухаць апавяданні пра вайну і ў любы момант згодны стаць партызанамі, хадзіць у разведку. Ад такой страшнай справы, як вайна, бярэцца толькі рамантызм. Прыходжу ў клас і даю такое заданне: напісаць апавяданне-ўспамін на вольную тэму. Праз гадзіну трымаю ў руках стосік сшыткаў. Дванаццацігадовы хлапчук піша: «Гэта было ў 1941 годзе. Фрыцы напалі на нашу краіну. Я быў ужо немалы. Мне ішоў чатырнаццаты год. Я ўспамінаю сваю школу. У партызанскім лагеры я знаў камандзіра. Камандзірам быў Саўчанка Васіль. Магіла гэтага савецкага салдата знаходзіцца непадалёку ад Маліна.ўкі. А я быў разведчык. Вось іду я аднойчы ў лагер, раптам бачу: бяжыць сабака. Мой Джэк завурчаў. Джэк — гэта мой абвучаны ваўкадаў. Ён скокнуў да таго сабакі, рвануў яго за горла. Але гэна быў не сабака, гэна быў чалавек. Ён падняўся з зямлі. Я паглядзеў на яго і ўбачыў: на мяне наведзена дула пісталета. У мяне ў кішэні быў маўзер, а другой тэтэ (скарочана тт). Чалавек з пісталетам сказаў: «Следуй вперёд». Я свіснуў — паявіўся Джэк. Ён убачыў чалавека каля мяне. Я скамандаваў «Джэк, узяць». Джэк кінуўся на шпіёна. Той у адзін міг ляжаў на зямлі. Калі я звязваў яго, ён пробваў вырвацца. Але сабака дзяржаў яго. Я прывёў шпіёна ў штаб, хлопцы смяяліся ад душы. Асабліва радаваўся мой друг Чэсь Ар-

ловіч, з якім я разам сяджу цяпер на парце. Мы з Чэсем пачалі сунуць немцу пад нос нашатырны спірт. Ён не мог пакрануцца, толькі міргаў вачамі. Гэта гульня нам спадабалася, і мы часцей сунулі спірту».

Гэтак «успамінае» Лёнік Прымачоў, ваяўнічай энергіі якога хапіла б на ўсіх аднакласнікаў.

Восень ідзе вельмі хораша. Раніцай над Малінаўкай густы туман белай аблогай вісіць над вёскай. У часе першага і другога ўрокаў за акном адбываецца самае прыгожае. Калі туман рассейваецца — падобна на тое, як у тэатры паволі рассоўваецца заслона, а за ёй адкрываюцца казачныя дэкарацыі. Поле зялёнай, ажно сінявата-шызай ад расы руні, а за полем жоўтыя, залатыя, барвовыя, вогненныя ясені і ліпы. Паўзабытымі старажытнымі легендамі вее ад гэтай вечнасці. У поўдзень, калі туман тужліва ападае з лісцяў кроплямі расы, сонца ўрачыста адбіваецца ў кожнай кропельцы. Імгненне — і кропля разам з асколачкам сонца падае з сучка грушы, другая кропля набягае. Зноў і зноў... Але асабліва летуценіць не выпадае, бо вучань вунь як захапіўся ля дошкі прыгожым пісьменствам: «...і тады князь загадаў закапаць гусляра разам з гуслянятамі ў зямлю».

— Зянон, якія гэта гусляняты былі ў гусляра?

— Ой, не так! Трэба: «Разам з гуслямі загадаў закапаць».

Ловы Гіля. Жыў на хутары Бібкі самы звычайны хлопчык. Яго зваць Валодзя Гіль. Хлопчыка вельмі любілі тата і мама, бо ён жа адзіны сынок. Сынок яшчэ ў другім класе выбіў два зубы сваёй аднакласніцы. Тата і мама не падумалі ўціхамірыць сына. Маці хадзіла і радасна расказвала: «Во, наш Валодзя дантыстам будзе...»

І вось дзень за днём, год за годам рос Валодзя, як кажуць людзі, на лес гледзячы. Дайшоўшы да восьмага класа, падумаў, што ўся навука — гэта толькі «закруцэнне мазгоў». Прайшоў верасень, а вучань восьмага класа Уладзімір Гіль ні разу не быў у школе. І класны кіраўнік, і я, і дэпутат па чарзе ходзім на хутар. Валодзі ніколі няма дома, а маці яго мала што ўжо мае і гаварыць: «Няма, ніколі не начуе... што рабіць з ім?» Летам уцякаць з дому Валодзю было зусім проста — забраўся сабе ў кусты і паглядай, што робяць, дзе паварочваюцца бацька і маці. Пайшлі яны з хаты — залез праз акно ці гарышча ў кухню, пад'еў — і ўсё ў парадку. Валодзя звязаўся з хэўрай нейкіх прайдзісветаў у вёсцы Вішнева. Там пілі самагонку, гулялі ў карты і г. д. Але ў цёплых летніх кустах стала халадаць, і хлопец пачаў хавацца ў хаце на гарышчы, куды зашываўся і спаў. Тут не раз яго лавіў бацька, тут жа лупцаваў папругай. Сын, вядома, прасіўся і казаў, што пойдзе ў школу. Але не паспяваў бацька зашпіліць папругу, як сын рабіў сваё.

Не менш былі вінаваты і мы, настаўнікі, што Валодзя не хадзіў на заняткі. Раптам навіна — у Вішневе ноччу абчысцілі магазін. А праз дзень усе зладзеі папаліся як міленькія. Тады і стала ясна, што трое кралі, а Валодзя пільнаваў. Бяру ў гаспадара веласіпед і еду ў Вішнеўскі сельсавет, каб дазнацца пра гэтую справу. На паўдарозе — невялікая вёска Асінаўка. З клёнаў і ясеняў так і сыплецца жоўтае лісце, усцілае брук; пад коламі веласіпеда ўзнімаецца залатая мяцеліца. Усе мае летуценні перарывае брэх сабак, якія вырваліся з нейкай падваротні і стараюцца дагнаць веласіпед... У сельсавеце — абед. Стаўлю свой самакат пад сцяну і падыходжу да мураванага кас-

цёла, што стаіць на пагорачку ў палоне ліпаў,— хачу бліжэй глянуць на гэтую хароміну. Касцёл абнесены зялёным дашчаным плотам, і дзверы яго на вялікім замку. На самым пад'ёме пагорачка стаіць лёгка апрануты, як для восені — без паліто,— чалавек, ён у акулярах, на галаве чорны берэт. Чалавек з відочнай цікавасцю глядзіць на мяне і, калі падыходжу зусім блізка да плота, дабрадушна пытаецца:

— Чаго ты сюды ідзеш?

Кіўком галавы, моўчкі, вітаюся з ім і кажу, што хачу глянуць знадворку на касцёл. Пачынаецца размова, і я адчуваю, што гавару з ксяндзом. Яму гадоў пад пяцьдзесят. Дазнаўшыся, што я дырэктар Малінаўскай школы, ксёндз — ён, відаць, нязгодны з новымі назвамі вёсак — гаворыць:

— Добра было б, каб у гэтай самай Малінаўцы яшчэ і маліны раслі, тады і новую назву можна апраўдаць.

Ён мае цікавасць да маёй адукацыі і ведаў у літаратуры: пытаецца пра польскія раманы «Агнём і мечам», «Фараон». Ксёндз, якому, аказваецца, вайна перашкодзіла скончыць Віленскі універсітэт, цікавіцца, ці вучаць у Мінскім універсітэце польскай мове. Кажу, што цэлы год вывучаў яе.

Да нас пад'язджае на бліскучым матацыкле «Ява» малады хлопец, вішнеўскі паштальён. Ён прыўзнімаецца з сядла матацыкла, здымае шапку, гаворыць ксяндзу: «Нех бэндзе пахвалёны» і падае яму газеты — «Жыце Варшавы» і раённую «Сцяг працы». Ксёндз дзякуе і кажа паштальёну, каб той ездзіў асцярожна, бо цяпер многа людзей гіне ў дарожных аварыях.

Далей наша гаворка пераскочыла на лацін-

скую мову. Ксёндз гаворыць, што, якія б дасканалыя мовы цяпер ні былі, усё роўна звяртацца да латыні трэба.

— Вось глядзіце, пане, такое сучаснае слова, як астранаўт. Ведаеце, яно лацінскае: астра значыць зорка, а нау — плаваю. Плаваю між зорак.

Некалі ў Вішневе жыў наездамі Францішак Багушэвіч, ён арандаваў тут маёнтак у Яна Карловіча. Ксёндз гаворыць, што старыя людзі помняць Багушэвіча як вельмі добрага і вельмі беднага чалавека.

Пры развітанні ксёндз пытаецца ў мяне:

— Як вы думаеце, ці правільна зрабіла Анна Карэніна, што кінулася пад колы вагона?

Кажу, што Анна Карэніна зрабіла правільна. Мой субяседнік так не думае. І яшчэ ён раіць, калі мне давядзецца весці антырэлігійную прапаганду ў вёсцы, каб я не даходзіў да экстазаў, бо ўсе экстазы ў любой справе выглядаюць непрыстойна...

У сельсавеце сакратарка супакоіла мяне: міліцыя абышлася з Валодзем Гілём даволі лагодна — яго не будуць судзіць, а строга загадалі хадзіць у школу.

Але прайшоў дзень... прайшоў другі... а Гіля ў школе няма.

Ліхтар свяціў цьмяна. Восем гадзін кастрычніцкага вечара. Несусветная цемрадзь. Вядомы старажытны філосаф Дыяген днём з ліхтаром шукаў разумнага чалавека. Не помню, ці знайшоў. Гэтым вечарам мы з настаўнікам М. Ц. Амелькам пайшлі шукаць Валодзю. А без ліхтара ў гэтых мясцінах лепш і не хадзіць, бо можна паляцець дагары нагамі ў якую канаву ці ў яму. Паўгадзіны ішлі да хутара Гіля, паўгадзіны ўжо сядзім

у цёплай хаце, але Валодзі няма. Яго маці цяжка ўздыхае, часам адхінае фіранку і ўзіраецца на двор, але што там убачыш — за шыбамі чарната. У сямейным альбоме на адным фота — прыгожы віславухі сабачка ля будкі. А на адвароце зыбкім почыркам дзіцячай рукі (пісаў Валодзя) жаласлівыя словы: «Гэта быў Малік. Яго ваўкі з'елі».

Дзесяць гадзін. У хату зайшоў Гілёў сусед — стары, рухавы і худы дзядок. Былы апошні аднаасобнік у сельсавеце. Расказвае, што летась здаў каня і ўступіў у калгас. Вядома, які ўжо з яго работнік. Але прынялі ў калгас, каб аднаасобніцтва было ліквідавана канчаткова і назаўсёды. Старому далі пенсію.

Мы не дачакаліся Валодзі, зноў запалілі свой ліхтар і пайшлі дамоў, а Валодзя, аказваецца, стаяў пад акном і чуў усе нашы размовы, усе нараканні маці на яго. Што можа думаць хлапчук, які стаіць пад вуглом хаты, а вакол цёмная бездань кастрычніцкай хутаранскай ночы, дзьме халодны вецер? Цяжка сказаць, але ён, з-за каго суседзі пачалі вешаць на дзверы па два замкі, проста саромеўся пры нас зайсці ў хату. А ў школу збіраўся і сумку ўжо склаў, хоць і не адважваўся — «дзеці смяяцца будуць».

Праз некалькі дзён усё-такі прыйшоў, дакладней — прыехаў на веласіпедзе. Па школе пранёсся крык: «Гіль едзе!» Валодзя з'явіўся чамусьці толькі на трэці ўрок. Я ўяўляў яго не такім, а ён — сярэдняга росту, каштанавыя густыя валасы падстрыжаны пад канадку (відаць, што многа быў на ветры і сонцы, бо віхор амаль жоўты), удумлівыя карыя вочы, вялікія — як даспелыя слівы; прыгожы, трохі мешкаваты хлапчук. Пастукаў у дзверы настаўніцкай, стаў ля парога.

— Добры дзень.

— Добры дзень.
— Гіль?
— Гіль.
— Табе трэба будзе даганяць у вучобе сваіх аднакласнікаў, бо яны за месяц шмат што ўжо вывучылі.
— Я пастараюся. У мяне ўсе кнігі ёсць.
— Ідзі ў клас і займайся.

Першыя дні здавалася, што яму ўсё роўна, як з ім будуць абыходзіцца. Пішуць усе ў класе — ён піша, не вывучыў урока — падняў руку, сказаў, што ўчора памагаў бацьку ўзорваць нейкую там аблогу. Яго вочы казалі, што да ўсіх апекуноў ён ставіцца даволі падазрона. Але гэта быў напускны спакой, і Валодзя выдаў сябе. Неяк я папытаўся ў яго на перапынку пра дзікіх козаў, якіх каля Малінаўкі водзіцца шмат. Тут ён ажывіўся, яго колішнія лясныя вандроўкі якраз прыдаліся, і з захапленнем загаварыў, што па рагах казы можна даведацца, колькі ёй гадоў, бо штогод на кожным рагу прыбаўляецца колца; што козы прыходзяць ласавацца зімой сенам да стагоў, а шкурку забітай казы добра паслаць каля ложка. Расказваючы ўсё гэта, ён як бы хацеў давесці, што ведае не менш за іншых хлапчукоў, а значыць — і не горш за іх. Можа, гэта і так, але галоўнае, што ён пачаў хадзіць у школу.

...Неяк у сярэдзіне лістапада ліў дакучлівы халодны дождж. А ў поўдзень аднойчы праяснілася. Дождж сціх. Вечарам у школе адзначалі свята восені. Дзеці паказалі невялікі канцэрт, пасля гулялі ў рыбку і вельмі смешна танцавалі «дарослыя» танцы. Раптам у клас убягае пяцікласнік і крычыць на ўвесь голас: «Ой, паглядзіце, што на вуліцы робіцца!» — і сам выбягае за

дзверы. Дзеці адразу ж кінуліся за ім, выбеглі і аслупянелі. Увесь школьны сад зіхцеў. На галінках быў лёд — гэта дождж замёрз на іх. У лёгкім святле месяца, якое адбівалася і драбілася ў лёдзе, галіны былі падобны на крыштальныя. Зіхцелі і вочы ў дзяцей.

...А пасля — снег, чысты, як маленства. Па снежнай раўніне мы едзем у вазку. Лес блізка, ён увесь на пагорках. Уз'ехалі пад пошум сосен на першы пагорак, і хлапчук, які трымае лейцы, не можа спыніць каня — вазок ветрам ляціць з горкі. Паварот — і другі хлапчук, які стаіць ззаду на кончыках палоззя, адрываецца і кулём ляціць у гурбу, а праз хвіліну яго блакітныя вочы, як першыя пралескі, весела ззяюць сярод снегу.

Перад другімі школамі ў Малінаўскай ёсць свае выгоды: з-за таго, што вучняў мала, у першы клас могуць хадзіць і шасцігадовыя. Яны могуць вучыцца, як і другія дзеці, але запісаны ў класны журнал будуць тады, калі ў іх хопіць стараннасці і цягі да кніжак. Так увесь верасень хадзіла ў школу мая маленькая гаспадыня Марыся Чарняўская. Пасля ёй захацелася на волю. Яна пачала на ўроках смяяцца сваім залівістым смехам, разы са два трапіла ў кут, а пасля і зусім настаўніца адправіла яе дамоў. Марыся не надта і сумавала і цяпер вечарамі займаецца самаадукацыяй — нешта грымзоліць на паперы алоўкамі і аўтаручкай, наўгад: «Не прынялі ў школу, ну і як хочаце, абыдуся і без вас». Яна піша і прыгаворвае: «Так-сяк накасяк, абы не па-людску».

Штохвіліны адрывае ад хатняй работы бацькоў:

— Тата, што тут напісана? — і гэтак бясконца. Бацька спачатку патурае Марысі, пасля раіць пагуляць з лялькамі, а потым не вытрымлівае:

— Трэба было ў школу хадзіць: «Што напісана, што напісана...» Кабыла лысая, вот што напісана...

Аднойчы гэта самая Марыся зрабіла мне невялікае адкрыццё. Гуляла на кухні са сваёй пакалечанай лялькай і спявала ёй даволі радасную калыханку гэтых краёў:

Люлі, люлі, люляшу,
Я дзіцятка калышу,
Нітачку звіваю,
Песеньку спяваю.
Як саўю я нітачку
Дзіцятку на світачку,
Астануцца кончыкі
Дзіцятку на штончыкі.

Пасля Марыся прыйшла да мяне і кажа:

— А вы ўжо ў нас у Малінаўцы разморшчыліся.

У Марыські хітраватая ўсмешка, зубкі востранькія, як у вавёркі.

— Як гэта я разморшчыўся?

— Спачатку быў такі,— Марыся перакасіла свой тварык,— а цяпер ужо як дома.

— Марыся, а ты мяне баялася?

— Ці ж баялася? Я стыдалася...

Сядзім мы неяк з гаспадаром і палуднуем. За акном здрадліва ціхая, як дзіця ў сне, восень. Раптам Віктаравіч глянуў на панадворак і кажа:

— Ну, дзякуй богу, мая Стася добра прызямлілася. Невядома, як другія бабы там чуюцца.

Гаворыць і не смяецца. У гаспадара адразу не зразумееш, калі ён жартуе, а калі сур'ёзна гаворыць. Сказаў — і зноў есць. Глянуў я праз шыбіну і бачу — мая гаспадыня ледзь валачэ перад сабой у абедзвюх руках нешта вялікае і белае. Віктаравіч загадзя адчыняе ёй дзверы і адразу пытаецца:

— Ну, што там у небе чуваць? Мусіць, на зямлі лепей, калі так скора вярнулася?

Гаспадыня як бы злуецца:

— Ну, вот ты, Мечусь, смяешся, а якраз і файны парашут, і нядорага, а колькі прасцінаў выйдзе і навалачак з яго.

Аказваецца, гэта штука трапіла да гаспадыні не таму, што яна захацела займацца парашутным спортам. Старшыня калгаса Ул. Д. Прымачоў збывае сваім калгаснікам парашуты на хатнія ўборы. Я адразу зазначыў сам сабе: «Не старшыня, а спекулянт нейкі». Гэта быў самы звычайны парашут, на якім скідваюць з самалётаў груз. Ён такі вялікі, што нават у маім пакоі яго няма як расцягнуць на ўсю шырыню. Пашыты ён з невялікіх кавалкаў белай тканіны падвойным швом, а паверх швоў змацаваны яшчэ і тасёмкамі. Увесь парашут трэба далікатна распароць на кавалкі. Гэта тытанічная работа, якой мы аддаём свой вольны вячэрні час і за якой гаворым пра ўсё на свеце. Праўда, больш гаворыць Станіслава Канстанцінаўна і Мечыслаў Віктаравіч, а я пытаюся.

— Канстанцінаўна, а дзе ваш старшыня гэтыя парашуты бярэ?

— Вот, пытаецеся. Наш Прымачоў чорта з-пад зямлі дастане, не тое што парашут. Ён у нас вёрткі і жвавы мужчына. Гэтыя парашуты, мусіць, у нейкай вайсковай часці спісалі і абмянялі на нашу бульбу ці буракі. А калхозу, глядзіце, і даход будзе ад іх.

Мы з Канстанцінаўнай лёзамі чыркаем парашут па швах.

— А вы, Канстанцінаўна, самі родам з Малінаўкі ці адкуль здалёку?

— Не, я лічы што і малінаўская. З хутара каля вёскі. Тата з мамай і цяпер там жывуць. Я з

хутара выйшла і на хутар замуж пайшла, бо некалі ж і гэта хата хутарам была. Гэта цяпер што забудавана тут скрозь, а после вайны, то не так усё было. Толькі той непамыснасці, што мае бацькі простыя мужыкі, як кажуць, а Мечыкавы бацькі былі пры Польшчы шляхтамі. Мечык як быў малы, то яго да вясковых дзяцей і гуляць не пускалі, у хаце гаварылі толькі па-польску. Ён і цяпер добра ўмеіць па-польску, і Марыся наша як была малая, то гаварыць пачынала па-польску: мая свякроў яшчэ жыла, яна была моцна ніздаровая, то чатыры гады ў ложку ляжала і Марысю вучыла гаварыць па-польску. А як падрасла наша Марыся, пайшла да дзяцей на вуліцу, то ўсё і пазабывалася. Можа, які вершык і помніць яшчэ.

Марыся задаволена ўсміхаецца і спачатку крычыць:

— Помню! Помню! — а потым з нагоды расказвае верш:

Jadą, jadą, dzieci droga,
droga siostrzyczka i brat
i nadziwic się ni mogą
jaki piekny swiat.
Tu sie krzyje biala chata
pod slomiany dach.
Dalej werzba rosochata,
a w konopiach strach.

Канстанцінаўна расказвае далей:

— Знаеце, некалі ж пры Польшчы гаварыць па-польску было як бы культурней, і ў школах вучылі гэтаму, і шмат хто запісваў сябе палякамі.

У нашу гутарку часам уступае і Мечыслаў Віктаравіч, які то варочае качарэжкай у печы галавешкі, то ладзіць сваё сталярскае начынне:

— Я толькі адно знаю, што найлепей, як ча-

лавек па-ўсякаму ўмеіць гаварыць і па-ўсякаму панімаіць. Бо на свеце хоць калі так зробіцца, што ні знаіш, ці тут плакаць, ці смяяцца.

Мы гаворым далей, толькі час ад часу нашу гаворку праразае, як ціхая кулямётная чарга, трэск парашутных швоў. Канстанцінаўна складвае гатовыя кавалкі будучых просцінаў, навалачак.

Я расказваю гаспадарам пра тое, што робіцца ў клубе, а Канстанцінаўна тлумачыць:

— Знаеце, у простыя нядзелі маладыя ў касцёл радзей ходзяць, а як якое свята, то і шмат, болей дзяўчат, прыходзяць. Цяпер усялякія святы любяць святкаваць. Вот пагледзіцё, у маі будзе калхознае свята — дзень вясны, а ў чэрвцы ў касцёле на Яна фэст, то і там будзе поўна народу.

Віктаравіч толькі ўсміхаецца. Ён даволі скептычна глядзіць на такія паводзіны цяперашняй моладзі:

— Цяпер не той народ пайшоў, бацькоў не так ужо і слухаюць. А некалі слухаліся, бо ведалі, што пачні сваім розумам жыць, то бацька зямлі не дасць і голы пойдзеш у свет. А цяпер у свеце не прападзеш, і з пустым чамаданчыкам прытулак знойдзеш. Гэта, можа, і няблага, што так свет змяніўся, але распушчэнства пайшло вялікае. Вот толькі паглядзець і паслухаць у нашым клубе — маладыя людзі, а такія словы, як падвып'юць, такое мацюганне, што аж вушы вянуць. А некалі ж у нас так не было.

Цёця Стася ўспамінае, як некалі малінаўцы абыходзіліся без брыдкіх слоў:

— У нас ніхто не ругаўся, гэта ж грэх вялікі, толькі клялі ўсякімі клятамі. А ўжо самыя страшныя кляты былі — «Каб цябе зямелька аблажыла» і «Каб ты зязюлькі не чуў». Як пачу-

еш гэта, то аж мароз па скуры. А цяпер што дзіця ляпеча, што тыя кляты — адно і тое. Я ў чвэртак, ну, тое самае, у чацвер, з магазіна ішла, то чую — мне на галаву зверху так і сыпнуў нехта, як агню, гэтага ругання. Гляджу, а гэта ж электрыкі, што прыехалі нам свет праводзіць, сядзяць на слупах і адзін аднаго крыюць. Хай ім языкі пааблазяць, хоць яны нам і электрыку праводзяць,— не могуць па-людску гаварыць, ці што.

У 1927 годзе грамадаўская газета «Наша праўда» пісала: «Трыста бяздомных сямей! «Kurjer Wileński» друкуе карэспандэнцыю з Вілейшчыны, у якой гаворыцца, што ў трох толькі гмінах Вілейскага павета — Войстамскай, Вішнеўскай (Малінаўка цяпер у Вішнеўскім сельсавеце.— *Р. С.*) і Жодзішскай — каля трохсот сямей жыве дагэтуль у зямлянках! Вось як выглядае «паваенная адбудова» ў Заходняй Беларусі».

Мне кінулася ў вочы гэта заметка таму, што ў Малінаўцы вельмі прыгожа і разумна пабудаваны цяпер дамы. Звычайна будыніна стаіць уздоўж вуліцы. Дом мае два ўваходы. Ад вуліцы нам відаць толькі адзін, парадны, з зашклёнай (у некаторых дамах рознакалёрнымі шыбінкамі) верандай, праз якую трапляеш у невялікі пакой, дзе стаіць буфет альбо шафа. Гэта прыхожая-гасцінная. Тут сям'я снедае, палуднуе, вячэрае; насупраць дзвярэй параднага ўваходу — дзверы ў кухню. Што робіцца ў кухні, ніхто чужы не можа бачыць. У кухні печ, ёсць свой выхад, ён тут завецца чорным і служыць для гаспадарчых спраў. З той жа гасцінай налева альбо направа будуць дзверы ў залу, дзе звычайна стаіць круглы стол, канапа, адна ці дзве шафы для адзення (звычайна дзве: адна сучаснага фасону, а другая

яшчэ старых часоў, самаробная), у некаторых хатах — камода, засцеленая сурвэтай; гадзіннік насценны або настольны: новы з арабскімі лічбамі альбо стары з рымскімі ў разьбяной шафцы, пафарбаванай пад чорнае дрэва. У зале звычайна дашчаная пераборка. За пераборкай невялікая спальня. На залу і спальню адна печка.

Ва ўсім — у характары вядзення гаспадаркі, будове хат, у самім побыце адчуваецца густ, гаспадарлівасць, умельства.

...За гародамі, на лужку, стаіць лазенька. У калгасе ёсць і свая вялікая лазня, але ісці туды далекавата, таму мой гаспадар і трое яго суседзяў пабудавалі сабе невялічкую і кожную суботу па чарзе цепляць яе. І блізка, і выгадна, асабліва зімой з дзецьмі.

...Гаспадар замест старой будуе па цяперашнім фасоне новую хату, ужо яна пакрыта цынкавай бляхай. Яшчэ ўсярэдзіне шмат работы, але знайшлося часу выразаць з жалеза невялічкую стралу — флюгер, і прыбіць яе на вільчаку. Цяпер добра відаць, куды дзьме вецер.

А лістападаўскі вецер і не думае сціхаць. Ужо ў яго ледзяных парывах чутно набліжэнне зімы, шыбы настылі, але яшчэ не замерзлі, яны пацягнуты ледзяной смугой; і панадворак, і стары сад відаць праз іх у месячную ноч цьмяна; дакучліва рыпаюць варотцы ў садзе, немаведама чаго брэша сабака — рабы Шарык.

Вечары пачынаюцца рана. Канстанцінаўна кажа, што ў такія ночы ёй шкада вартаўнікоў і што страшна выходзіць на ганак. І яшчэ кажа:

— Што цяпер! Усіх маладых можна па пальцах палічыць. А некалі, як я дзеўкай была, гадоў пятнаццаць назад, столькі моладзі ў вёсцы было! Але і маіх каляжанак і хлопцаў нашых цяпер не

так шмат у Малінаўцы. Многа па свеце параз'язджалася і паразыходзілася.

— А чаму яны параз'язджаліся?

Віктаравіч сумна махнуў рукой, задумаўся, а потым сказаў, што пра гэта трэба доўга гаварыць.

Віктаравіч дадае:

— Сёння гляджу я і думаю, як і сам перамяніўся. Каб мне цяпер сказалі, ці ўзяў бы ты назад тыя дзесяць гектараў зямлі, што былі ў твайго бацькі, я век не ўзяў бы. З такой гаспадаркай, як тады мелі ў адной сям'і, шапка ніколі на галаве не была — лоб вечна мокры: бегаеш і бегаеш цэлы дзень.

Парашут распораты. Яго кавалкі ляжаць, як крылы белай разарванай птушкі.

25 снежня — першы дзень калядаў. Гаспадыні пачалі скрабці, адмываць лавы, бяліць сцены, вытрасаць пыл з дываноў, посцілак, мыць, сушыць. У кожным панадворку нацягнуты ад хлява да хаты шнуры, а на іх трапечуцца, як ветразі, просціны, абрусы, навалачкі, ручнікі. Кожная малінаўская хата падобна на карабель, які вось-вось узніме гэтыя белыя ветразі і адправіцца ў рэйс. Калі ідзеш раніцой у школу — то ў тым, то ў другім канцы вёскі чуцен прарэзлівы піск: колюць кабаноў. Гаспадары наразаюць у запас сечкі каровам, на вялікую ўцеху дзяцей валакуць з лесу елкі. Тры аўтобусы на дзень са Смаргоні перапоўнены не так людзьмі, як абаранкамі, рыбай, торбачкамі з цукеркамі. Набліжэнне свята відаць усюды, але адна прыкмета страшэнна канспіруецца. Ды ўсё-такі і яе можна выпадкова ўлавіць. Гоняць самагонку, і познім вечарам не-не ды глуха бразне вядро ля студні — зменьваюць ваду

ў сухапарніку (так завецца адна з частак самагоннага апарата).

Малінаўка, вядома, нікуды не адплыла на сваіх белых ветразях, але вось у нашай хаце, напрыклад, стаяць першародныя пахі — ад елкі густа цягне борам і баравой дарогай, свежая бялізна кружыць галаву чысцінёй і крухмалам, а цукеркі і пячэнне на елцы пахнуць маленствам, а яшчэ і далёкім таямнічым горадам. У нядзелю гэтыя водары змяшаліся з выстаеным, вострым, як бы чабаровым пахам кажухоў — прыехалі госці, прынёсшы пацалункі, усмешкі і гасцінцы Марысі. Малінаўка шуміць, а нашы школьныя неслухі ціхенька займаюцца «канакрадствам» — адвязваюць лейцы ад шула, куляюцца ў вазок і паганяюць каня, на якім прыехалі госці,— едуць катацца. У хатах крыкі, звон пасуды.

— Ну выпі ж, цётка, хоць паўчаркі.

— Ай, што ты, што ты, кумок, пайду карову даіць, то цялушка з мяне смяяцца будзе.

Затое дзядзькі не вельмі і баяцца смеху цялушак.

Вечар засеяў неба зорамі. Стаю на пагорачку ля клуба і ўсё паглядаю на нашу хату, якая сváточна свеціцца ўсімі вокнамі,— чакаю гаспадароў з гасцямі. На захадзе неба зноў уваскрэсла Венера. Да клуба, як да магніту, цягнуцца з усіх бакоў цёмныя на белым снезе чародкі людзей, больш моладзі. У адным вясёлым гурце, што на падыходзе да клуба, пераліваецца вясёлая песня: «Упілася молада, ледзьве йду...»

У небе, роўна над сваёй галавой, злавіў позіркам, хоць не адразу, коўш Мядзведзіцы. Сем зорак. Агністая спайка. У маленстве гэты коўш повен таямнічых казак і легенд. Цяпер гэтыя зор-

кі здаліся падобнымі больш на пытальнік, чым на коўш. Цікава. Вечны пытальнік над зямлёй. У памяці чамусьці пачалі клубіцца абрыўкі размоў з гаспадарамі, нібы іх паклікаў цяпер гэты вечны пытальнік.

Вось баяліся ж тут некаторыя людзі новага жыцця, выязджалі ў Польшчу, Вільню... абы не тут. Другія туляліся па лясах. У Адама Міцкевіча ёсць такое: «Нацыянальны дагмат Расіі — царскае самадзяржаўе, Польшчы — патрыятызм». Дагмат — асноўнае палажэнне ў рэлігійным вучэнні, якое прымаецца слепа на веру і не можа быць пакрытыкавана. Вядома, што асабліва ў апошняе стагоддзе крытыкуюцца шмат якія рэчы, найбольш дагматы, і не толькі ў рэлігійных вучэннях. Але цяпер не пра гэта. Усім вядома, што дагмат польскага патрыятызму быў выхаваны ў некаторай частцы беларусаў-католікаў, была вера ў яго. У каго свядомая, у каго стыхійная. Адданасць сваім поглядам была настолькі вялікая, што пасля 1939 года, калі знік грунт, на якім трымаўся гэты дагмат, многія пацягнуліся на берагі Віслы. Між іншым, калі не карэнныя палякі, то тыя, што стваралі аблічча бульварнай прэсы, не бог ведае як высака ставіла насельнікаў «крэсаў усходніх», і часта прыезджым прыходзілася з-за іх вульгарнага польскага вымаўлення чуць старую мянушку «хам з-за Буга».

Але вось і мае гаспадары з гасцямі ідуць па заснежаным лажку. Людзей старэйшага веку ў звычайныя нядзелі бывае ў клубе мала, але сёння клуб набіты і маладымі і пажылымі. Усе вяскоўцы, акрамя тых, хто паспіваліся (а такіх мала), тут. У клубе гоман, як у даліне Юзафата перад страшным судом, а пад столлю дымавая заслона, якую пусцілі курцы з задніх радоў і якая, му-

сіць, хутка задушыць агонь ва ўсіх чатырох лямпах. Але публіка не зважае на гэта. Хлопцы і дзяўчаты сёння смелыя, усе паскідалі свае, як тут кажуць, пальты (паліто), паўпальты (кароткае жаночае паліто), футэркі (мужчынскае кароткае паліто), ясёнкі (жаночае паліто дэмісезоннае). Аж вешалак не хапіла — паскладвалі на сталах на сцэне.

Тэня папраўляе на плячах рамяні ад баяна, ускідвае галаву і націскае на лады. Спачатку плывуць даволі сумбурныя гукі. Але вось Тэня злавіла такт, і такая знаёмая, вясёлая полька выскоквае з кута на ўвесь клуб. Пары выходзяць танцаваць не адразу, а тады, калі баяністка зробіць ужо некалькі заліхвацкіх пераборaў. Вось дзябёлы хлопец ужо не першай маладосці (відаць, не адну пару абутку стаптаў, ходзячы на танцы), у высокіх наваксаваных да бляску хромавых ботах, у галіфэ і фрэнчы сіняга сукна, галантна, узмахам рукі запрашае на танец дзяўчыну. Тая, відаць, трохі саромеецца ісці ў першай пары, бо гэта лічыцца своеасаблівым форсам: на першую пару звычайна глядзіць увесь клуб. Але вось яны выходзяць на цэнтр, хвіліну стаяць, ловячы тэмп, пасля ступаюць убок — і раптам зрываюцца з месца ў вір музыкі. А калі пайшла першая пара, то танцавальны круг запаўняецца ў адзін момант. Маладзейшыя хлопцы выглядаюць большымі моднікамі, чым старэйшыя: у іх вузкія штаны — апошняя мода на расклёшаныя яшчэ не дайшла да Малінаўкі, і абуты яны не ў боты, а ў чаравікі ці туфлі, таму спаборнічаць ім са старэйшымі цяжкавата — боты робяць больш груку, а гэта таксама адзін з форсаў у польцы. Кожны танец іграецца доўга. Калі скончыцца, хто-небудзь з дзяўчат бярэ вядро і злівае падлогу, каб асадзіць

пыл. Пырскі ляцяць з рукі, цьмяна свецяцца і разбіваюцца аб падлогу.

Кажучы па праўдзе, мне ў гэтым клубе няма чаго рабіць, бо ўжо месяц, як я зняслаўлены ў вачах тутэйшых дзяўчат. Адбылася даволі недарэчная гісторыя, вінаваты ў якой адзін мінскі сябра. Напісаў мне ліст, а на адваротным баку канверта, дзе ставяць штэмпель, намаляваў нейкую птушку, якой у прыродзе век не існавала, але якая, відаць, сімвалізуе голуба, а знізу напісаў чатырохрадкоўе: «Из-за тебя я матушкой проклята, привета твоего мне слишком мало, прости меня, но я не виновата, что я любить и ждать тебя устала». Злосны жарт. Як зазвычай, наш паштальён Антон прыносіць пісьмы ў кантору калгаса, высыпае іх на стол, бо найболей пісьмаў прыходзіць у сам калгас і канторшчыцам-дзяўчатам. Перабіралі дзяўчаты гэтыя пісьмы і знайшлі цуд літаратуры і мастацтва майго сябра. А назаўтра гэтыя самыя дзяўчаты завабілі мяне ў кантору і ўсчалі допыт. Як я ні аднекваўся, з таго часу малінаўскія прыгажуні паглядаюць на мяне коса, бо калі ўжо адна там нейкая «матушкой проклята», то, маўляў, ведаем, што ты за хлюст. Вясковыя ж дзяўчаты любяць надзейных кавалераў.

Прымасціўся недзе на сярэднім радзе і паглядаю. Ад левай рукі каля мяне сядзяць два пажылыя мужчыны ў вялізных кажухах, шытых, як відаць па крої, у аднаго краўца. За мужчынамі — цётка ў тоўстай саматканай хустцы. Дзядзька, мой сусед, прыйшоў без жонкі, ён гаворыць да другога мужчыны:

— Знаеш, Вінцусь, я дванаццаць лысых сёння ў вёсцы лічыў, каб мароз перастаў. Не хваціла аднаго, а я і не дадумаўся, што ты злысеў. Як гэта мне памяць адняло! Мароз жа адваліўся б!

Другі дзядзька змікіціў адразу, што сусед хоча на ім праехацца.

— Я вот і лысы з жонкаї, а ты хоць і маладзішся, але адзін, як удавец, ходзіш.

— А моїі ты браце, маю жонку сёння перуном забіла і вадоїі у Чортава балотца знясло.

А клуб гудзе і грыміць. Добра, што падлога новая — вытрымае. Гумовыя і скураныя боцікі, чаравікі, нават валёнкі ў галёшах тупаюць па ёй з усяе сілы, і, разбадзёраныя музыкай, святам і весялосцю, аблічча людзей як бы гавораць, што весяліцца ніхто не забараняе і што калі ўжо здарылася такое — ну дык што ж, павесялімся. Адна немаладая дзеўка са свежай пунсовасцю шчок, лоўка абшчапіўшы адной рукой свайго партнёра, другой узмахвае да людзей і ў такт польцы выспеўвае частушку: «Як вазьму я пісталет з ручкаю зялёнаю, ніхай знойдуць мяне ў садзе ўсю расстралёную».

Мае суседзі-дзядзькі ніяк не могуць супакоіцца. Ніводзін не хоча саступіць у дасціпнасці.

— Дай закурыць, Вінцусь. Я дома забыўся.

— Трэба насіць з сабой, але калі так хочаш, то проша.

— Ты, Вінцусь, заўсёды разумнейшы быў і папяросы не забываўся. Ты і пры паляках не гэтыя іхнія паперкі складаў, як я, а золата... Я ж малады быў і дурны.

Мне вельмі падабаецца вясёлы сусед, і я знянацку пытаюся:

— Дзядзька, а хто з вас болей у грыбы хадзіў?

Дзядзька глядзіць на мяне сваімі надзіва светлымі вачамі, якія гавораць, што ён нічога не разумее, а потым раптам усе складкі на яго твары

ажываюць — дзядзька глуха смяецца, ляпае мяне па плячы.

— А, братачка ты мой, Вінцук болей хадзіў, ён аж шэсць гадоў, а я ўсяго тры. Вот тут ужо ён маху даў і ў дурнях астаўся.

Мушу растлумачыць, што такое «хадзіць у грыбы». Гэта значыць не ўступаць у калгас. У самым канцы саракавых — пачатку пяцідзесятых гадоў тут пачалася калектывізацыя, і праходзіла яна доўга і цяжка. Ідуць у хату да якога ўпартага аднаасобніка людзі з сельсавета, калгаса ці раёна. Толькі яны ступілі на панадворак, жонка ці хто там з сям'і крычыць: «Ідуць!» Гаспадар імгненна зашываецца ў якую-небудзь каморку ці на печ. Прыйшлі тыя людзі, пытаюцца, дзе гаспадар, а жонка адразу: «Няма дома, ён у грыбы пайшоў. Не знаю, калі й прыйдзіць». Так гаварылі ў многіх хатах. Неяк раз у адзін дом прыйшлі зімой, а жанчына, відаць, разгубіўшыся, адразу адрапартавала:

— Няма дома, у грыбы пайшоў.

— Цётка, якія грыбы зімой растуць?

Тая жанчына аж прысела. Дзядзька ўспамінае пра той час:

— Знаеш, братачка, гэта ж, як я цяпер пагляджу, цэлая камэдыя была, а тады хоць плач. Далёка і хадзіць не трэба: сёння ў мяне толькі сорак сотак — і белы хлеб кожны дзень на стале, а тады я гэты пірог толькі на вялікдзень і каляды еў, хоць зямлі ў дзесяць разоў болей было.

Весялосць у клубе не сціхала да чацвёртай гадзіны раніцы. Самае цікавае, што ў Малінаўцы за ўсе дні свята я ні разу не чуў пра якое-небудзь набажэнства. Праўду казала гаспадыня — проста людзі любяць святы.

Пра гаспадарку найлепей пытацца ў гаспада-

ра. Са старшынёй жа калгаса «Малінаўка» Уладзімірам Адамавічам Прымачовым выпала пазнаёміцца даволі блізка, бо ён сябра сям'і майго гаспадара, некалі кватараваў у іх. Ды і цяпер не мае ўласнай хаты, што мне вельмі спадабалася. Жыве старшыня ў калгасным доме для спецыялістаў з жонкай і трыма сынамі, адзін з якіх, ваяўнічы Лёнік, вучыцца ў шостым класе, Саша — у другім, а Жэнік толькі вучыцца хадзіць.

Што старшыня малінаўскага калгаса даволі арыгінальны чалавек, я зразумеў яшчэ да нашага знаёмства. І вось як. У нашай школе працуе настаўнікам гісторыі і геаграфіі Уладзімір Аляксеевіч, чалавек пенсійнага ўзросту. Па абавязку я павінен хадзіць да яго, як і да кожнага настаўніка, на ўрокі. Гэтага занятку я не любіў, бо пасля павінен быў рабіць агляд тых урокаў, калі працую ў школе без году месяц. Але да ўрокаў Уладзіміра Аляксеевіча прыйшлося прыгледзецца не таму, што ён карыстаўся сумнай славай у вёсцы і што мяне папярэдзілі ў райана. На якім бы ўроку ні быў, якая б тэма ні вывучалася — ці то «Далучэнне да Расійскай дзяржавы Паволжа і Заходняй Сібіры», ці то «Чартысцкі рух у Англіі» — галоўнае заключэнне настаўнік рабіў такое: багатыя жылі багата, а бедныя — бедна. Спачатку я думаў, што тут нейкае непаразуменне, а пасля далікатна намякнуў, каб настаўнік канкрэтна тлумачыў вучням канкрэтную тэму ўрока. А ён пачаў даводзіць, што ўсе веды вучням трэба падаваць на фоне адчування класавай свядомасці. Так-то яно так, класавая свядомасць у дзяцей павінна быць, але апрача фону павінны быць веды. Уладзімір Аляксеевіч проста стаміўся працаваць.

Неяк у кастрычніку прыйшоў ён у настаўніц-

кую, і я заўважыў, што нешта ўстрывожыла настаўніка. Пытаецца:

— Скажыце, калі ласка, як вы думаеце, вось калі чалавек пры царскім рэжыме не сядзеў у турме, то ці значыць гэта, што ён чалавек дрэнны?

Трохі здзіўлены, адказваю:

— Абсалютна не значыць. Яшчэ трэба ведаць, за што сядзеў у турме чалавек.

Уладзімір Аляксеевіч ажывіўся:

— Вот бачыце, я так і думаў, а гэты Прымачоў мне яшчэ нешта даказвае.

А адбылося такое. Жонка Уладзіміра Аляксеевіча, калгасніца, другі месяц без уважлівай на тое прычыны не хадзіла ў калгас. Праўленне падало на яе ў таварыскі суд, які прысудзіў ёй штраф і абавязаў хадзіць у калгас. Уладзімір Аляксеевіч прыйшоў у кантору да старшыні і пачаў даказваць, што яго імя вельмі зганьбілі: ні ён, ні яго бацька, ні дзед ніколі не судзіліся і не былі на лаве падсудных — як гэта так, што яго жонку судзяць? Прымачоў, не доўга думаючы, заявіў: «Бачыце, вашы дзед і бацька жылі пры цары, і тое, што яны не сядзелі ў турме, ніяк не гаворыць, што яны жылі правільна. Тады многія змагаліся за народную свабоду і сядзелі ў турмах, а ваш дзед і бацька не сядзелі, значыць — не змагаліся». Так Прымачоў паставіў настаўніка ў тупік.

Сам Прымачоў і яго жонка родам з-за Магілёва. Сярэдняга росту мужчына, ваеннай выпраўкі, гадоў 38, адзеты па-паходнаму (галіфэ, боты, скураная куртка). Ён заўсёды вельмі заняты, але ўсё-такі мне ўдалося пагаварыць з ім некалькі разоў. Асабліва пашанцавала тады, калі Малінаўку занясло снегам, і Прымачоў не змог выбрацца ў раён.

— Не трэба было, Уладзімір Адамавіч, дазваляць лес так церабіць. А цяпер сядзіце, чакайце вясны, тады і трапіце ў раён.

Прымачоў толькі ўсміхаецца:

— Нашы блізкія лясы былі некалі дзяржаўныя, а цяпер яны калгасныя, таму і парадзелі, і не толькі ў нашым калгасе...

Прагульваючыся па ваколіцах Малінаўкі, мне даводзілася бачыць раскіданыя сярод палёў або ў лесе адзінокія сядзібы. Ля хаты звычайна стаіць гумно, хлеў, склеп, студня. Абавязкова сабака на прывязі. Антэна прыёмніка, які працуе на батарэях. Трэба ж неяк звязацца са светам. Акрамя гаспадароў, людзі ходзяць тут рэдка, таму калі ідзеш, то сабака так зацята брэша і бегае ля будкі, што, здаецца, зараз парве ланцуг.

Хутар — гэта маленькая дзяржава са сваім укладам жыцця, які стварайся найбольш пры Польшчы. Гаспадар купляў колькі гектараў зямлі і будаваў сваю сядзібу на ёй, вёў тут сваю гаспадарку. Працавала ўся сям'я. Амаль усе прадукты былі свае, хлеб пяклі свой. Часам трэба было выехаць і ў свет, напрыклад, у краму па соль ці купіць селядцоў. Гэты выезд ператвараўся ў цэлую падзею. Запрагалі лепшага каня ў брычку, сядзенне засцілалася даматканым дываном. Гаспадар, абавязкова ў фрэнчы і галіфэ, абуваў боты. І вось з'яўляецца такая параднасць у цэнтр тагачаснага жыцця, на вуліцу, дзе заўсёды ажыўлена. Усе манеры, паводзіны хутаранца нібы гавораць: вось бачыце мяне, мой вазок, каня — мяркуйце самі, а што робіцца дома, я вам не скажу, гэта — не ваша справа. А дома — сум, адзінота, выпадзе адпачыць ад працы — не ведаеш як. Есці ёсць што, але не разганяліся: трэба купіць зямлі (сыны ж растуць!). Не дазвалялі сабе шыкаваць.

Нeяк гады чатыры назад група студэнтаў універсітэта ездзіла ў фальклорную экспедыцыю. Зайшлі ў адну хату ў вёсцы і там папрасілі праспяваць якую-небудзь песню. Старая жанчына заспявала, не злазячы з печы, што ёй вельмі цяжка прывыкнуць пасля хутара да вёскі.

Я прашу Уладзіміра Адамавіча расказаць, як ставяцца самі хутаране-калгаснікі да свайго сённяшняга становішча.

— Бачыце, хутар як быццам і створаны для таго, каб раз'яднаць людзей. Але пры панскай Польшчы хутар не быў выпадковай з'явай. У той час ідэя набыцця зямлі была ідэяй незалежнасці. І сялян не трэба вінаваціць у гэтым. Іншая справа, што тады ў некаторых людзей пачалі выяўляцца драпежніцкія інстынкты.

А сёння, вядома, усё роўна калгасніку дзе жыць — ці на хутары, ці ў вёсцы: больш за сорак сотак ён нідзе не будзе мець. Не ведаю, як тут з вашым фальклорам, а наконт перасялення ў вёску ў хутаран розныя думкі. Вы правільна гаварылі, што людзі там абжыліся і прывыклі. Яны прывыклі да свайго жыцця, адвыклі ад жыцця грамадскага ў нашым сённяшнім разуменні. Ды і наогул — што такое хутарская сістэма для агульнай гаспадаркі? У нас у калгасе 278 двароў, з іх больш за семдзесят — на хутарах. Калі глянеш на гэтыя хутары нізка з самалёта, то яны падобны на павукоў. З усіх бакоў да хутара сцежкі-дарожкі. І гэта ўсё па калгасных пасевах. Вось чаму хутары нявыгадны нам эканамічна, ды і не павінны ж мы пакідаць у баку ад нашага культурнага жыцця трэць калгаснікаў-хутаран. Што да настрояў іх саміх, то я прывяду вот такі факт. Вось цяпер у Маліна́ўцы праводзяць электрычнасць. У магазіне ёсць і тэлевізары, і пральныя

машыны, і электрапрасы. Людзі іх ахвотна купляюць. А хутаране стаяць і не ведаюць, што рабіць: і хочацца, каб электрычнасць у хаце была, каб выгоды ўсялякія былі, і грошы ёсць, а нічога не атрымліваецца. Калгасу няма ніякай выгоды цягнуць слупы на семдзесят хутароў.

— А якое выйсце?

— Трэба перасяліць людзей у вёску. Палітыка калгаса ў гэтым пытанні не прымусовая. Але зрабіць перасяленне адразу, за адзін год, мы не можам. У 1939 годзе ва ўсходніх абласцях ссялілі хутаран за адзін год: проста загадалі перасяліцца ў вёску, і ўсё. І многія людзі асталіся без жылля зімой, бо не мелі сіл пабудавацца за лета і восень. Адразу гэта рабіць нельга. Не стае будаўнічых матэрыялаў. Калі б нам з раёна адразу далі матэрыялаў колькі нам трэба, то, я думаю, гэтую праблему мы вырашылі б за два гады, сама болей. А то цяпер перасяляем па 10—12 хутароў, так што гэта можа зацягнуцца яшчэ на сем год. Але я пагавару ў раёне, і, думаю, там падтрымаюць нас.

Скажу і вось што. Тутэйшым людзям было вельмі дзіўна, што я раюся з імі, што жыццёвая практыка самога селяніна бярэцца ў аснову гаспадарання. І толькі цяпер, пасля многіх год застою, безгаспадарчасці, цякучасці кіраўнічых кадраў мы пачалі падымацца ўгору, сяляне пачалі верыць у калгас. А было ўсякае.

Неяк гадоў шэсць назад я ішоў дахаты і бачу: стаіць купка калгаснікаў, вясёлая, відаць, трохі падвыпілі. А перад гэтым у нас з аграномам выйшла спрэчка — дзе, на якім кавалку зямлі, садзіць бульбу. Я настойваў на суглінку, ён — на падзоле. І я, і ён былі людзьмі амаль што новымі ў гэтых краях. Адзін з мужчын слухаў, маўчаў,

а потым і кажа мне са злосцю: «А што вы ў нас пытаецеся? Вы ж гаспадары, вы самі ўсё ўмееце, разумныя, пазабіралі ўсю зямлю, а цяпер пытаецеся ў нас. Самі гаспадарце, я некалі гаспадарыў, то ні ў кога не пытаўся, што мне дзе сеяць і садзіць».

Вось так было. Але галоўнае — нам трэба больш і больш рознай тэхнікі. Калі пасля 1963 года яе павялічылася ўдвая, то зрухі прыкметныя. Калі на пачатку 1963 года мы мелі 4,6 цэнтнера збожжавых з гектара, то цяпер маем 9,3 цэнтнера. А кукуруза, якая асабліва прапагандавалася ў свой час і заняла ў кожнай гаспадарцы раёна бадай ці не найвялікшую плошчу, выцесніўшы канюшыну, не апраўдала сябе. Сяўба азімых і яравых дае большы эфект — 18 цэнтнераў з гектара. Вы гаварылі тут, што наша зямля лепш родзіць, чым нават землі блізкіх ад нас калгасаў. У нас 1000 гектараў ворнай зямлі. І толькі за 250 гектараў я магу сказаць, што яны ўрадлівыя. А астатняе — ці то завільготнены падзол, які патрабуе меліярацыі, ці суглінак, які патрабуе торфу. Праўда, летам 1966 года нам памагла арганізацыя «Белсельгастэхніка». Яна асушыла 80 гектараў зямлі. Гэта будзе наш самы ўрадлівы ўчастак. Але калі мы хочам павысіць прадукцыйнасць гаспадаркі, павінны правесці меліярацыю на ўсіх астатніх забалочаных участках. А зрабіць гэта не так і проста, бо мы не маем тэхнікі на такія работы. Тут трэба крыўдзіцца не на раённае начальства, якое размяркоўвае тэхніку, а на нашы заводы, якія мала яе выпускаюць. І мы маем да нашых заводаў вялікія прэтэнзіі...

Неяк увосень гаспадар вёз у гумно воз сена. Разгаварыліся, як косяць і дзе косяць. Я і пытаю-

ся: «А колькі сотак лугу вы скасілі на гэты воз?» — «А сотак шаснаццаць. Некалі, як мой бацька гаспадарыў, дык мелі б з такога кавалка паўтара воза, а цяпер лугі бяднеюць».

Я расказаў пра гэта Уладзіміру Адамавічу і зноў папытаўся: чаму?

— Зноў мы вярнуліся да гэтай самай тэхнікі. Калгас і рады быў бы купіць сенаўборачныя машыны, але ці так гэта проста? Таму пачынаем касьбу ў сярэдзіне чэрвеня, бо баімся, што не ўправімся. А касіць у чэрвені ранавата. Лугавыя травы ў самым цвеце, не паспелі абсыпаць насенне. Таму і ўраджай пачаў зніжацца. Маючы 3200 галоў скаціны, мы не можам не турбавацца пра лёс нашых лугоў, як і гаспадаркі наогул. Нам вельмі і вельмі патрэбна тэхніка.

— Уладзімір Адамавіч, якія з апошніх мерапрыемстваў і пастаноў нашага ўрада па сельскай гаспадарцы асабліва эфектыўна адбіліся на павышэнні эканомікі іменна вашага калгаса?

— Усе апошнія пастановы мелі вялікае практычнае значэнне, але найбольш сакавіцкі Пленум ЦК партыі 1965 года, на якім было вырашана павялічыць закупачныя цэны на сельгаспрадукты. Гэта, напрыклад, вельмі памагло калгасу «Малінаўка». Якраз тады гаспадарка была ў крытычным становішчы, бо годам раней, калі дзяржава даравала даўгі некаторым гаспадаркам, Малінаўка» не трапіла ў іх лік, хоць і ў нас справы ішлі не гладка. Калі б не павелічэнне закупачных цэн, мы не расплаціліся б.

— Скажыце, калі ласка, яшчэ адно. Я часта хаджу ў малінаўскі клуб. Вялікі, прыгожы клуб. Але моладзі збіраецца не больш як чалавек трыццаць. У чым тут справа?

— Клуб тут, вядома, не вінаваты, хоць ён і

сапраўды адзін з лепшых у раёне. А што да моладзі, то гэта вельмі балючая праблема. Сапраўды, колькі ў нас хлопцаў і дзяўчат у калгасе? Лічаныя людзі. Камсамольская арганізацыя мае дваццаць пяць чалавек, і то з іх палова — інтэлігенцыя. Такое становішча не толькі ў нашым калгасе. Моладзь адышла ад зямлі, але яна павінна вярнуцца і ўжо вяртаецца да яе. І зусім вернецца толькі тады, калі калгас культурна і эканамічна зможа задавальняць патрэбы моладзі. Адбылося так, што бацькі былі моцна прывязаны да зямлі, а дзеці не. Рэзкі гэты паварот адбыўся пасля вайны, і не таму, што бацькі не вучылі сваіх дзяцей любіць зямлю. Зноў жа — калі пачалася калектывізацыя і зямля была абагулена, аплата працадня была нізкая, і бацькі і сама моладзь не бачылі сэнсу працаваць тут. «Мы, старыя, неяк пражывём і так, а вы, маладыя, шукайце сабе другой дарогі». Так і раз'язджаліся хто куды: хто ў Маладзечна, хто ў Смаргонь, хто ў Мінск, а многія — на вярбовачныя работы. А цяпер, калі маладыя ў нашым калгасе могуць зарабляць не менш, чым некваліфікаваны рабочы ў горадзе, многа каму можна было б астацца ў вёсцы. Але тут ідзе па інерцыі — раз паехалі старэйшыя, то паедзем і мы, малодшыя. Спыніць гэтую інерцыю не так і лёгка, але трэба. Трэба рабіць усё, каб моладзь не палохалася вёскі. У нас ёсць клуб, бібліятэка, думаем зрабіць паштовае аддзяленне, а ў былым панскім доме ў Свяцілавічах, дзе цяпер школа, адкрыць бальніцу. Культурна-бытавое будаўніцтва адыграе немалую ролю ў падняцці аўтарытэту вёскі. Да гэтага дадам яшчэ два факты. У свой час, можа, і ненаўмысна, але калгасам і вёскай пачалі пужаць. І хто? Мы самі. У 1949—1950 гадах свірская раённая газета змяшчала

артыкулы з заклікамі да моладзі ехаць працаваць у гарады на будоўлі. Правільна, гарады трэба было адбудоўваць. Але што пісала газета? «Юнакі і дзяўчаты! Едзьце на будоўлі! У горадзе жыць культурней і весялей!» А варта было б, відаць, пісаць так: «Юнакі і дзяўчаты! Давайце зробім усё, каб у вёсцы стала жыць культурней і весялей!»

Альбо другое. Я чуў не раз, як настаўнікі чыталі мараль дрэнным вучням і канчалі, як заўсёды, так: «Нічога з цябе не выйдзе, калгаснікам будзеш вечным, больш нікім». Нібыта калгаснік — апошні чалавек на зямлі...

Цяпер гэтак не гавораць, але любоў да зямлі павінны выхоўваць і ў школе.

І апошняе пытанне да Прымачова:

— Уладзімір Адамавіч, вы часта ездзіце на сваю радзіму, Магілёўшчыну. Ці ёсць сёння якая-небудзь розніца паміж усходнімі і заходнімі абласцямі Беларусі?

— Не бяруся даваць усебаковыя адказы, але калі гаварыць пра магутнасць калгасаў, дабрабыт народу, то думаю, што розніцы няма ніякай.

Цяпер людзям у Малінаўцы нават дзіўна, як гэта яны некалі жылі без электрычнасці, награвалі прасы вуголлем.

...Калгас за свае сродкі пабудаваў новую вялікую школу, бо дзяцей у Малінаўцы ўсё большае.

...У вёсцы аб'явілася адна беспрацоўная жанчына, якую завуць тут Маляванка. Многія гады наездам на нейкі месяц яна малявала людзям «каўры» — вядомыя гусі са змеевыгнутымі шыямі, якія плывуць па вадзе сярод нейкіх джунгляў. Такі тавар у Малінаўцы ўжо не ідзе ў ход.

...Уладзімір Аляксеевіч згадзіўся пайсці на пенсію.

...Лёнік Прымачоў не страціў сваёй ваяўнічай энергіі, а яго брат Саша падпісаў маёй гаспадыньцы Марысі ў дзень нараджэння паштоўку вось так: «Марыся, віншую цябе з днём нараджэння, жадаю добра вучыцца і слухаць маму і тату». Праўда, ні Саша, ні Марыся асаблівай паслухмянасцю не вызначаюцца, але імкненні, жаданні ў іх, як бачым, вельмі добрыя.

...Новыя падзеі, з'явы, перамены. Хай жа яны будуць тут, як і на ўсёй зямлі, толькі радасныя і добрыя.

в. Малінаўка, Смаргонскі раён

1966—1967

## БАЦЬКА Ў КАЛАЎРОЦЕ

### I

«Такія вось паперы»,— некалі часта казала цётка Мар'я, якая сёння забыта ўжо ўсім матэрыяльна-духоўным светам. Чаму цётка казала пра паперы — невядома, але менавіта так яна канчала ўсе хвалюючыя расказы, асабліва пра самы крытычны момант у сваім жыцці — як гадоў дваццаць назад гнала яна этапам з калом у руках свайго Васіля ад «той сучкі» Насты...

Ніякіх папераў там не было — проста Васіля калацілі дрыжыкі, балела плячо, якое ён выбіў, выскачыўшы з акна.

А сёння яшчэ адны паперы... У самым цэнтры горада, у духмянай булачнай, абапёршыся на падаконнік, чалавек нешта пісаў у кнігу водгукаў і прапаноў. Як і забытая цётка, ён верыў у дзейснасць паперы.

Сярэдніх гадоў, невялічкі і тоўсценькі, па-дзіцячаму кірпаты, ён размашліва шпарыў шарыкавай ручкай па грубаватай шорсткай паперы, якая, відаць, спецыяльна выпускаецца на водгукі і прапановы так, што напісаць іх цяжка, а прачытаць яшчэ цяжэй. І ўсё ж чалавек упарта пісаў.

«Люблю зайсці ў булачную, асабліва як на душы стане цяжка. Бывае, што нічога і не купляю, але ўсё роўна зайдуся. Моцна пахне тут хлебам, булкамі, а значыць жыццём і здароўем.

Так і ўспамінаецца тады самая шчаслівейшая пара — маленства. Некалі дзед браў мяне ў млын, і гэтая дарога засталася самай шчаслівай у жыцці. А васількі ў жыце, а спеў перапёлак вечарамі! Жытнёвае поле ў ліпені дыхала саладка, як гарачая печ восенню, калі на кляновых лістах пёкся першы хлеб. І, можа, хлеб тады елі не па поўніцы, але ўсё ўспамінаецца толькі дабром. Калі тое было. Цяпер у людзей і хлеб, і да хлеба, а другому немаведама чаго хочацца. Круціцца кола дзён, як некалі круціўся калаўрот маёй цёткі, калі яна прала вечарамі. Панядзелак, аўторак, серада — і да канца тыдня, а пасля зноў усё спачатку. І так бясконца. І я кручуся ў калаўроце дзён; але хто б ведаў толькі, у якія неспадзяванкі можна ўкруціцца...

Немаладзён ужо я, і не да булак сёння мой інтэрас: гады не тыя. Толькі і бяды, што ў іх разынак малавата. А мне і з імі свет горкі. Дзе яшчэ магу я сказаць пра сваю крыўду як не тут, дзе пахне так родна і знаёма, як некалі ў нашым доме?

Не першы год выкладаю я ў інстытуце, і рэдка добрая якая душа скажа мне ласкавае слова. І што я маю? Неблагі аклад, асобны пакой у аспіранцкім інтэрнаце, смешачкі ад студэнтаў — і ўсё. Сумна і холадна жыць мне ў маім пакоі».

— Вы не скажаце, тыя булачкі, што з макам, свежыя ці не? — кранула чалавека за плячо дамачка — цэлы парфумны магазін на абцасіках.

Чалавек уздрыгнуў і, адарваўшыся ад паперы, з такой нянавісцю зіркнуў на цікаўнуую, што яна, як козачка, скокнула ўбок.

«Ёсць у мяне і суседзі — неўтаймоўная Адэля і аматар выпіць Лукаш, а самыя блізкія — жывуць за сцяной — аспіранты Толя і Саша. Яны

мяне Бацькам завуць між сабой, я раз падслухаў. Нават яны, каго я сам вучыў, каго па сённяшні дзень кармлю крупнікам, бо ў іх частае безграшоўе, і яны не могуць зразумець гора, якое мучыць мяне. Яны маладыя. Яны пішуць дысертацыі, а я сваю вось ужо дзесяты год не магу закончыць. Тры гады правучыўся ў аспірантуры, працую сёмы год, закончыўшы яе, а дысертацыі ўсё няма. Мае маладыя суседзі Толя і Саша шчаслівейшыя — яны напішуць, бо маладыя.

Пазаўчора на вучоным савеце выступіў адзін наш дзеяч і сказаў, што некаторыя выкладчыкі, такія, як, напрыклад, Зміцер Апанасавіч, гэта значыць я, не павышаюць свайго навуковага ўзроўню, застаюцца ўчорашнімі і ў навуковых, і метадалагічных пытаннях, дысертацыі закінулі пісаць.

Калацілася маё сэрца як авечы хвост: не прамінулі-такі і мяне. Добра памог і землячок мой, гэта ануча Цвыркун. Які толькі чорт цягнуў яго за язык: ускочыў на трыбуну — і давай: «Сапраўды, таварышы, я добра ведаю, што ў Зміцера Апанасавіча ў пакоі кніжак толькі тры стаіць, ад сілы пяць, пахіліўшыся на этажэрцы, ды і тыя ён у студэнцкія гады купіў».

Так і выйшаў я апляваны, і як толькі цяпер з'яўлюся на факультэт, усе ад мяне, што ад тыфознага, у бакі кідаюцца. Баяцца невуцтва падчапіць. Маладзейшым лягчэй трываць. Трымаўся і я дагэтуль мужна. А цяпер сілы ўжо няма. Ёсць у нас і шчаслівейшыя — іх ніхто не чапае. А як да мяне, то і парушынка ўсякая прыстане. Эх, Цвыркун! Пасля палучкі тыднямі ад мяне не вылазіў, кніжак не бачыў, каб табе засланіла!»

Зміцер Апанасавіч хацеў яшчэ нешта дапісаць,

але махнуў рукой і задумаўся, сумна слухаючы ціньканне капяжа за акном.

— Усё? — як стрэліла над вухам прадаўшчыца, беручы кнігу скаргаў. Яна з самага пачатку цікавала за чалавекам і здалася яму цяпер дакторкай ці санітаркай, бо была ва ўсім белым і мела строгі твар.— То зараз пойдзем да загадчыка. Я не ведаю, чым вам не дагадзілі мы.

Загадчык магазіна быў з тых вясёлых, да каго і абаранак капейкай прыкоціцца. Не страціўшы веры ў людзей, якія, як яму думалася, не раз яшчэ падкоцяць у яго бок не адну вялікую, бы абаранак, капейку, ён глядзеў на свет трохі іранічна. Недзе равеснік Бацькі, сам увесь быццам здобны, загадчык доўга чытаў каракулі на шорсткай паперы, потым паглядзеў на Бацьку з усмешкаю.

— І гэта ўсё?

— Усё.

— Чаго ж гэта вы так узнерваваліся?

— Мне кожнай вясной думаць хочацца,— прызнаўся Бацька.— Натура ў мяне такая.

— Я таксама спачатку думаў. А пасля кватэру атрымаў. І яшчэ... яшчэ машыну з жонкай агаралі. Праўда, нам тут булачная добра памагла. І тады расхацелася думаць.

— Вас пасадзяць за тое, што булачная памагала машыну купляць.

— Бяздарны графаман! Скаргі напісаць не ўмее, а пужае,— адразу зазлаваў загадчык.— Я хутка б там разабраўся.

— Не, там жа не з прадаўшчыцамі вам,— запярэчыў Бацька.

— Тады самае большае, што я магу зрабіць — не прадаць вашым непрыяцелям ані хлеба, ані булак.

Зміцер Апанасавіч ішоў насустрач вільготнаму ветру і з адчаем думаў, што ніхто не можа яму памагчы. Разгулялася стыхія, і яе не спыніш адразу, як і моцнага ветру.

Такія вось паперы...

Зміцер Апанасавіч прыйшоў у свой даволі пустэльны пакой і на хвілінку сеў ля круглага легендарнага стала, за якім было перагаворана шмат жыццёвых казак. Не распранаючыся, ён глядзеў на бляск кропелек вясновай імжы, што аселі на рукаве паліто, думаў аб хуткасці змен у жыцці, аб самой яго часовасці.

Адразу, як толькі ўвойдзеш, у пакоі налева і направа кантаватымі выступамі ўпіраліся ў самую столь светла-карычневыя шафы. У левай стаяў у Зміцера Апанасавіча багаты гаспадарчы скарб, ажно гатовы ўламаць паліцы,— лыжкі, місы, тое-сёе з круп і варэння.

Гаспадар падышоў да правай шафкі і з пакутным выглядам расчыніў яе, жмурачыся ад залатога бляску. То ззяў цісненнямі строй падпісных выданняў класікі.

Не ззялі толькі верхнія і ніжнія паліцы аніякімі бляскамі — там стаялі не надта папулярныя кнігі па мовазнаўству. Яны выдаюцца малым тыражом, з бяднейшымі вокладкамі, але Зміцеру Апанасавічу спатрэбіліся.

«Сам ты, Цвыркун, ні бэ ні мэ. Я забыўся больш, чым ты ведаеш,— падумаў Зміцер Апанасавіч.— Ці ж вінаваты я, што не ўсё людзям паказаць магу?»

Далей ён зазначыў сам сабе, як шмат усяго прачытана за нядоўгае жыццё, і чамусьці ўспомнілася народная мудрасць: век вучыся і дурнем памрэш.

Крыўда за несправядлівасць, за няўдалую

скаргу ў булачнай пякла сэрца, як воцат, і Зміцер Апанасавіч быў нібы чужы ў сваім пакоі. Не хацелася ні распранацца, ні жыць далей.

«А што, як нават і памрэш? — падумаў ён.— Зноў жа не па-людску. Дня нараджэння свайго не ведаю. Памрэш — і ў рамкі не аформішся. Вось добра жыву — жыву і ведаю, што нарадзіўся, як снягі сыходзілі. А калі яны маглі сыходзіць трыццаць сем год назад? Казала маці, што на апошнім тыдні посту, у сераду. Якраз на чысты чацвер зыходзіла, і карова тады цяліцца мелася...»

Зміцер Апанасавіч успомніў разгублены твар сваёй добрай старой маці. Саромячыся, не раз гаварыла яна пра сваё няведанне, і не то перапрашала, не то сцвярджала: «Так ужо, дзеткі, выйшла, снег якраз сыходзіў тады і серада, помню, была».

Ён задумаўся, шукаючы, каго вінаваціць.

Раптам дайшло: «Феадалы праклятыя! Праз іх усё гора! Самі панавалі, балявалі, а народ у цемры гібеў. На пальцах людзі лічылі, простай арыфметыкі не ведалі. Вось табе і снягі. Памерці захочаш, то і ведаць ніхто не будзе, колькі пражыў ты».

«Бум-бум-бум!» — гулка загула сцяна. У суседнім пакоі нехта малаціў у яе кулаком.

Зміцер Апанасавіч адразу здагадаўся — Саша з Толем дурэюць. Некалі ён кінуўся б да іх адразу, але ў цяперашняй роспачы ні на кога глядзець не хацелася. Не да жартачкаў.

Маркотна думалася пра несправядлівасці жыцця, асабліва пра мінулы час, які стаіў нават дату нараджэння, не хацеў адпускаць яе са сваіх жорсткіх кіпцюроў.

«Бум-бум-бум!» — зноў загула сцяна, але Зміцер Апанасавіч рашуча падумаў: «Не, хлопчыкі, павучыцеся самі крупнік варыць...»

Сапраўды, у сцяну барабанілі хлопцы, якія прывыклі за спіной у Зміцера Апанасавіча да лёгкага жыцця і крупніку. Ён добраварыў крупнік.

Прагрэсіўнае чалавецтва збіралася вячэраць, а яны — маладыя аспіранты — самастойныя людзі з самастойным ветрам у галовах — ляжалі на казённых ложках і гадалі, дзе б ім пазычыць грошай. У кішэнях было пуста і нудна.

Не дачакаўшыся ніякіх гукаў з-за сцяны ад свайго, так званага Бацькі, Толя запытаўся ў Сашы:

— Слухай, ці гэта чыстая праўда, што амерыканцы гуму жуюць?

Саша зразумеў яго: на стале між драўляных забавак стаялі гумовыя і гутаперчавыя фігуркі — адзіны рознакалёрны і невядома нашто патрэбны набытак іхняга бесталковага падарожжа па Прыбалтыцы, дзе ляснулі ўсе грошы. І хоць апошні рубель адстартаваў ад іх раніцай, а ў вачах Толі свяцілася прага спазнання смаку гумы, Саша падумаў: «Толік, не дай божа»,— і пацвеліўся:

— А ты што? З калыскіываліўся? Пра гэта даўно пішуць і яшчэ больш гавораць.

— Разумны ты. А наш калгас быў адсталы. І брыгадзір каня не даваў. І газеты на трэці дзень прыходзілі. А толку што прыходзілі — адразу сцены ў хаце абклейвалі. Дзве старонкі вывучыш на памяць, а што ззаду — не знаеш. Вось табе і хібы ў весцях усякія. Буквар з братам за зіму скурылі.

Толя цяжка ўздыхнуў:

— Добра, не буду есці звяркоў, выдумай мне псеўданім. Толькі харошы. Буду пісаць раманы, дакучае навука, усе гэтыя «як адзначалася ўжо», «калі ўважліва глянуць», «падыходзячы з крытычным аналізам».

Ці то ў Сашы замігцела ўваччу, але яму здалося, што задаволеныя звяркі пачалі танцаваць на стале з радасці свой лясны танец.

— Табе трэба які-небудзь шляхотны. Каб неяк шаноўна было. Ты ж хутаранец, бацька некалі два гектары балота меў, а на ім дзве тысячы купінаў і дзвесце тысяч жабаў. З крэпкай сям'і.

— Каб зірнула цяпер маці, то б адсвенціла: не думае, каб дзе капейку ўтаўчы ды ў хату, а бура яго недзе носіць. Свету паглядзець захацелася. А лепей у разглёды да дзевак схадзі — ці мала цяпер вучаных.

Раптам удалечыні калідора пачулася звыклае кукаванне інтэрнацкай зязюлькі:

— Пламбір па дзевятнаццаць! Каму марожанае? Пламбір па дзевятнаццаць!

У адрозненне ад зязюлькі, марожаншчыцы не займала голас ні на восень, ні на зіму. Гэтая эскімоска даводзіла хлопцаў да вар'яцтва. Яна не пераставала крычаць, пакуль яе трохпудовая карзіна не рабілася парожняй.

— Песня ты наша недапетая. Як бы мы без цябе і жылі.

У Сашы на спіне з лапатак раптоўна выраслі маладыя дужыя крылы і адзіным пырхам вынеслі яго за дзверы.

— Цёця Вера, пазычце два марожаныя.

— І-і-ш, пазычце! Па дзевятнаццаць!

— А за васемнаццаць аддасцё?

У Сашы было тры капейкі.

— На базар ідзі, там і таргуйся, а ў мяне законныя, і буфетчыца распісалася пад імі.

— Пазычце да заўтра.

— Бяры. Пад зямлёй знайду. Помні маю ласку.

Саша ўскочыў у пакой. Два асколачкі айсбергаў, што выпадкова засталіся ад апошняга ледавіка, ззялі ў руках.

Крылы зніклі.

Толя ачумлена глянуў:

— На якую трасцу?

— Еш. Успомнім нешта.

Яны сядзелі за сталом, і так званае кароткаштоннае, так званае басаногае дзяцінства далёкім журботным халадком павявала адтуль, з напаўвясковага гарадка, дзе на брукаванай плошчы шумеў кірмашовы дзень.

Сустрэліся дзве бабулькі, колішнія прыяцелькі. Цяпер яны як бы ўжо і не з аднаго свету — даўным-даўно адна з іх зайшла замуж у зарачанскую вёску. Як на той час — даль несусветная. Усё жыццё амаль штодня бачацца на рынку, але навін, як вады. Пасучы назіркам унукаў, шчыруюць з паўгадзіны ля вазоў, а пасля ідуць перадыхнуць ад кірмашовай гаманы пад блізкія ліпы. Па дарозе ўнукі вішчаць — «марожанага». Чысценькія насоўкі, у якія вузельчыкам завязаны небагатыя бабульчыны грошы, белымі птушкамі трапечуцца ў руках, і вось ужо бабулькі не ашчаджаюць капеек — купляюць не толькі ўнукам, але і сабе «лёдаў».

Толя і Саша перамігнуліся і ну проста запелі галасамі сваіх бабулек:

— Але ж і смачна.

— Палягчэла. А то ў роце суха, хоць боб малаці.

— А гэтыя лёды і з разынкамі.

— Смачней з разынкамі. Мая нявестка на гэтую сёмуху пякла пірагі з разынкамі, то такія ж пірагі былі ўдалыя. Ды што думаеш, гэтыя дзеці — распуста такая пайшла — пакалупалі ўсе пірагі — разынкі даставалі. Надта ўжо гэты рыштант,— бабуля ківае на ўнука,— загоніць руку аж па локаць, і порацца, і порацца. Было яму...

— Не дай божа. Трэба лупіць часцей. У нас у канюшню ўбіліся і давай коням хвасты нажніцамі абразаць. Нашто, каб хто папытаўся? Пецька-конюх пудзіў іх — даганяў-даганяў, ды не надта ўгонішся. А ён, бедны, у гумовых ботах ляцеў і на нейкі востры прэнт ускочыў. Адзін бог увесь разлупіў.

— Пэўна, дасталося Пецьку ад Манькі. Я ж чула, што за малую макулінку грызе. І мужчына ў сіле, але ўжо каб так бабе папусціцца.

— За абы-што. Ды хоць бы ўжо ў хаце, а то выйдзе на панадворак і па ўсёй вуліцы разлягаецца. А вуліца шырокая, і рэха аж на ўсю вёску са студняў і ад стрэх адлятае. Цяпер хаты бляхай крыты, і ў кожнага свая вада.

— Добра людзі сталі жыць. Паглядзі — і машынаў столькі, і паязды, і самалёты гэтыя ўсё лётаюць.

— У нас над хатай то гудуць і гудуць, як бы прысяга ў нас ім якая. Сабака ночай баіцца — вішчыць, бедны, і не брэша. Малы яшчэ.

— Цяпер усё неба вышнуравалі. Маладыя кажуць, што бога няма — вось ляталі людзі ў неба — нічога не знайшлі.

— Надта бог ім і пакажацца. Ніхто бога ўгледзець не можа.

Хлопцы ўжо заходзіліся ад смеху.

З тых маленькіх і далёкіх разынак выраслі такія вялікія дрэвы фантазіі, якія могуць вырасці толькі на ўрадлівай глебе напаўвясковага гарадка, аглушанага сусветным прагрэсам.

Весялосць была кароткая, як і промень вясновага вячэрняга сонца, які ўцякаў з пакоя. Прыдуркаватыя вароны грагалі ў блізкім скверы, парушаючы вясёлую сімфонію маладых аспіранцкіх думак. Было непазбежна, што праз гадзіну-паўтары на небе праклюнуцца начныя свяцілы з цікавымі замежнымі імёнамі і надыдзе ноч.

Бацька на ўпарты стук не адазваўся, таму сігналам да дзеяння быў заклік Сашы ісці атакай на Адэлю.

Ада — а па найменню хлопцаў Адэля — была асобай гадоў пад трыццаць, нявысветленага сацыяльнага паходжання, але з голасам пажарнай сірэны. Шыбы дрыжалі. Лямпачкі лопаліся. Цёмна рабілася.

Легендарная Адэля па сваёй добрай волі на грамадскіх асновах, значыцца, вяла культмасавую работу ў інтэрнаце. Масы дранцвелі ад страху. Калі, напрыклад, да дзяўчат у пакой заходзіў чалавек у вайсковым адзенні — брат, былы сусед ці проста знаёмы якой-небудзь дзяўчыны, то назаўтра інтэрнат ведаў, што ў пакоі начаваў цэлы ўзвод салдатаў.

З Толем і Сашам Адэля вяла тактыку міны замаруджанага дзеяння. Яна пакуль што маўчала. Гэтая незвычайнасць мела простую адгадку: у Адэлі было ўжо двое хлопчыкаў. Адэля, відаць, сур'ёзна надумала арганізаваць у інтэрнаце сваімі сіламі клуб вясёлых дзяцей. Яе зацюканы муж — супрацоўнік інстытута — ад неча-

канасці ў павелічэнні сямейнікаў запрымеў тармажэнне ў абодвух паўшар'ях мозгу. Зразумела, што сям'і цяжка ўтоўпіцца ў пакойчыку, які мае пяць метраў удоўжкі і два з паловай ушырыню. Адэля магла б дабудаваць які і трохсценнік, але калідор цесны, не надта разгонішся.

Адэля пачала падлізвацца да хлопцаў. Думала, што тыя проста з моста аддадуць ёй свае, большыя, чым у Адэлі, няшчасныя квадратныя метры. Яна даўно распланавала, дзе і што паставіць, прыб'е, куды пасадзіць мужа і як будзе гойсаць у пакоі сама. Яна ўжо не раз прыходзіла да хлопцаў. Усе сцэнкі пачыналіся з фальклорнага зачыну пра мужа, які хваляваў яе не больш чым залеташні снег. Праўда, яна часам цалавала яго вечарамі, але толькі дзеля аднаго: дазнацца, на падпітку ён ці не.

— Эдзіка ў вас не было?

— Не, не было.

Калі ж хлопцы ляжалі, то Адэля пыталася:

— Чаго вы ўсё ляжыце? Паменей ляжыце, а то бакі адлежыце.

Калі ж хлопцы чыталі, то Адэля не з меншым імпэтам цікавілася:

— Што гэта вы ўсё чытаеце? Паменей чытайце — большы парадак будзе ў галаве.

Невядома, пра што яна спыталася б, калі б Саша з Толем сярод белага дня, напрыклад, ні з таго ні з сяго развучвалі бальныя танцы.

Потым Адэля расказвала жахі, якімі пужала хлопцаў ужо другі год. Сваімі вушамі чула ад пэўных людзей, што пакой, у якім жывуць хлопцы, і суседнія будуць пастаўлены на рамонт. А тым, хто жыве,— ідзі куды хочаш. Чым далей Адэля гаварыла, яе правінцыйная фантазія пачынала рабіць усё больш смешныя для вопыту га-

радскога жыцця завіхрэнні: «Калі вы не хочаце бегаць па горадзе, то перабірайцеся ў мой пакой, а я да рамонту і ў вашым дабуду. Нам так ці гэтак трэба кватэру шукаць. Другім не пайшла б на такую ласку, але вас шкадую».

Хлопцам рабілася сумна. Яны нешта ціха і жаласна мычалі, як апоеныя цяляты. Саша і Толя зусім не думалі рабіць ніякіх пярэбараў, але пэўны інтэрас падказваў ім мычаць. Таму што, вось і цяпер...

Адэля сядзела на табурэтцы перад авальным двухрублёвым люстэркам, дзе другой было выгравіравана: «Дорогой Аде в честь нашего знакомства. Эдя». Зазірнуўшы ў люстэрка, можна было ўбачыць, што глыбокі надпіс каронай кладзецца на Адэліну галаву.

Адэля рабіла андуляцыю, гэта значыць — лёгкую хатнюю завіўку. Каб не прападаў дарма час, яна выхоўвала дзяцей, адвярнуўшыся ад іх:

— Такія нягоднікі, яны яшчэ румзаюць. Зноў зараз як угрэю!

Праз хвілін пяць Саша пад канвоем Адэлі валок па калідоры вялізную карзіну бруднай бялізны. Адэля імчалася хутка. Бігудзі вылузваліся з валасоў, падалі на падлогу, і незаконачаная андуляцыя была падобна на ветры буйныя, якія застылі на галаве. Уварваўшыся ў пакой, яна паставіла карзіну ля парога і па-гаспадарску распарадзілася:

— Цяпер хай гэта пастаіць, вы пакуль вячэрайце, а тады да дванаццаці ночы мы ўсё перацягнем. І ваша, і наша. Так яно будзе лепей. За адным разам.

Адэля завялася:

— За адным разам... за адным разам... І доб-

ра будзе... і добра будзе... Я вам пазычыла...

Саша склаў фігу і трымаў яе ў кішэні.

Камандорша Адэля падала кліч:

— Ну, дык вячэрайце. А тады адразу да мяне. Спачатку шафу перацягнем.

Яна знікла. Саша адчуваў сябе вінаватым перад Толем і маўчаў. Толя ніколі не чакаў такога легкадумства ад свайго сябра, таварыша і брата, таму і ўпікнуў:

— Які гэта дурань наперад пасаг валачэ? І калі ты ўжо ўздумаў сысціся з Адэляй, то мог бы і раней мне сказаць.

— Ідзі к чорту! Сам з ёю пагавары. Сунула мне ў адну руку дзесятку, у другую карзіну і сказала, што ёй няма ўжо сілы трываць.

У магазін ішлі моўчкі. Толя і Саша калі і сварацца, то лёгка, як бы дражнячыся. Ужо год, як яны жывуць у адным пакоі на роўных правах аспірантаў, толькі Саша трохі старэйшы — ён правучыўся два гады, а Толя — каля года. Аспірант — чалавек, пра якога можна сказаць вядомае: ад зямлі адарваўся і ў рай не трапіў. Зямля — гэта тое жыццё, якім жывуць былыя аднакурснікі. Яны раз'ехаліся па рэспубліцы, жэняцца, выходзяць замуж, гняздуюць гнёзды сабе, дзе пачынаюць ужо ціనькаць дзеці. Вырваўшыся са студэнцтва, як з пажару, аднакурснікі абжываюцца. А аспіранты ў дзіўным для сябе становішчы — ужо не студэнты і яшчэ не выкладчыкі. Такім маладым ім не хацелася яшчэ гнездавацца. Без лішняга пошуму яны займелі тытулы аспірантаў і жылі ў сваім родным інтэрнаце.

Шэры пасляваенны дом у чатыры паверхі! Інтэрнат з высокім цэментаваным ганкам і дзвярамі, якія ніколі не замыкаліся! Дом юнацтва,

акружаны старымі серабрыстымі таполямі з думным шумам лістоты! Дзіўна, што ты не адляцеў куды-небудзь. Гэта магло вельмі проста здарыцца. У табе ж, як ні ў адным доме, жыло і жыве шмат крылатага — маладых песень, свежага іскрыстага смеху, пацалункаў, мараў, надзей — усяго таго, што надзелена вялікай сілай палёту. Страшна падумаць, што гэтая сіла збіраецца недзе ў адно і некалі можа ўзняць цябе высока-высока, куды сягалі толькі мары тваіх гадаванцаў. Не адлятай, наш добры бог, родны дом нашага студэнцкага юнацтва! Сталеем мы, трохі марудней старэюць таполі, але хто скажа, што можа змяніцца інтэрнат пад таполямі?

Сашу і Толю дзіўней за ўсё было тое, што, жывучы ў гэтым жа доме ў новай фазе свайго быцця, з дзён студэнцтва ўспаміналіся нават самыя розныя дробязі. Напрыклад, тое, як недзе на першым курсе, калі мароз замуроўваў вокны, па яшчэ дзіцячай вясковай звычцы прахуквалі вочкі ў шыбінах, глядзелі на вячэрні, у агнях, горад, думалі кожны пра свой дом, і страшна, соладка было ведаць, якія вялікія гурбы намяло каля ганка і платоў.

Інтэрнат! Пачаўшы жыць у тваіх сценах, мы ўсвядомілі розумам, якая вялікая і прыгожая наша радзіма і асабліва той куток, адкуль мы так прагнулі вырвацца ў шырокі свет. Аказваецца, да гэтага мы і не ведалі, што любім той кут. І наша адкрыццё было нават сарамяжлівым — пра яго мы не казалі адзін другому. Але дом, дзе прыйшло адкрыццё, застаўся не проста шэрай камяніцай.

Ні Саша, ні Толя не верылі, не хацелі верыць, што цяпер, стаўшы аспіранцкім, іх дом можа змяніцца.

— А вунь глядзі, ашаломлены ідзе,— не вытрываў Толя, зарагатаўшы на ўсю вуліцу.

Па тратуары цераз вясновыя лужыны, не звяртаючы ні на кога ўвагі, праставаў, аж пырскі з-пад ног, дзябёлы, сялянскага складу крапчак гадоў за трыццаць. Саша пазнаў — Фанатык. Фанатык ішоў як бы з перабітай паясніцай — галава і тулава служылі самі сабе — а ногі як бы не неслі іх, а падкідалі знізу. Ён быццам не ішоў, а гоцаў. Некалі ў студэнцтве ў хлопца была размашыстая хада вясковага дзецюка і было яму добра. Але стаўшы невядома нашто аспірантам, а заадно і Фанатыкам, ён рашыў хадзіць іначай. І вось ужо на трэці год зайшло, як мучыцца чалавек, ногі якога сумуюць па родных разлогах, дзе жывуць яго жонка і двое дзетак.

Але Толя рагатаў не з хады — да яе ўжо прывыклі. Тут было другое — Фанатык уссадзіў на сваю вялікую кучаравую галаву новы капялюш. І чамусьці задам наперад.

Ад знаёмага смеху Фанатык ачомаўся. У блакітным святле неонавай рэкламы яго збялелы твар здаўся зусім памярцвелым. Утрапёным позіркам ён глядзеў на хлопцаў і мітусліва загаварыў:

— Гэта немагчыма... Гэта немагчыма...

— Што немагчыма? — проста-такі заходзіўся Толя, паглядаючы крадком на капялюш.— У нас усё магчыма.

— Вы разумееце... Цяжка паверыць...— падступаўся да хлопцаў Фанатык і, цяжка дыхаючы, глытаў словы: — Мне даверылі такую адказнасць... Мне даверылі...

— Насіць капялюш задам наперад? — усміхнуўся Толя, але Фанатык нічога не зразумеў.

— Не, капялюш я купіў з-за такой вялікай па-

дзеі. Мне даручылі быць кіраўніком работы адной дыпломніцы. Прыйшло вялікае выпрабаванне маіх сіл. Яны хочуць дазнацца, чаго я варты.

— О-хо-хо... І ўсяго толькі,— уздыхнуў Толя і перакруціў капялюш на галаве Фанатыка.

— Не, вы яшчэ маладыя, не ўсё разумееце,— павярнуўся Фанатык і пашыбаваў з ранейшым імпэтам, паўтараючы: — Гэта немагчыма, гэта немагчыма...

«Ну, наложыць на сябе ручанькі тая дыпломніца»,— падумаў Саша.

Гарадскі гадзіннік талкова і меладычна прабіў дзесяць гадзін вечара. Хлопцы сядзелі і ўміналі кансерву з хлебам. Перад вялікай бурай заўсёды бывае вялікая цішыня. Замкнуліся на два замкі. Саша нясмела абазваўся:

— А можа, змыемся куды нанач?

Тым часам у Адэлі ішла рэвалюцыя. Бедныя дзеці, якія хацелі спаць, складалі ў скрынку свае цацкі-лялькі, церлі кулачкамі нявінныя вочы. Сама Адэля то таўхала ў плечы мужа, то са шчаслівым гіканнем кідала ў кучу ўсялякую драбязу. Каструлі, чамаданы — усё было разам.

Блакада пачалася неўзабаве. Яшчэ не паспела ўзысці Венера — зорка пастухоў і закаханых, як Адэля смела пастукала і тузанула дзверы:

— Хлопцы, давайце!

Замкі раўнадушныя да эмоцый. Саша са страху закашляўся. Толя лупіў яму кулаком па плячах — не так дзеля выручкі, як са злосці:

— Мы хворыя!

Адэля нешта скеміла, бо раптам забарабаніла рукамі і нагамі:

— Нічога! Пахварэлі раптам! Адчыняй!

Жалобна, як галодная сініца, прапела электралямпачка на столі.

— Мы не будзем перасяляцца,— крыкнуў Толя.

— Я з табой, дурнем, і не гаварыла. Я з чалавекам гаварыла. Альбо аддавайце маю дзесятку.

— Аддадзім заўтра. Мы табе ні разу не скруцілі.

Саша ўжо ачуняў, падышоў да дзвярэй і спакойна параіў:

— Ада, ты выйдзі ў двор, пад акно, я нешта скажу.

Адэля пайшла. Чуцен быў яе енк на лесвіцы. Саша ўмомант адшукаў шпагат, прывязаў яго да ручкі карзіны з Адэлінымі трантамі і адчыніў акно. Разам з Толем яны асцярожна апускалі карзіну ўніз. Адэля не паспела паказацца, а перавозка ўжо закончылася, карзіна з мануфактурным скарбам апусцілася на зямлю. Як толькі Адэля сваёй рашучай хадою ўвайшла ў двор, Саша адразу зачыніў акно.

Адно шчасце, што пакой на другім паверсе, іначай яго спасціглі б вялікія беды.

І сніцца Сашу незвычайны сон. Не трэба думаць, што на казённых ложках сняцца толькі казённыя сны.

Саша быў перакананы і мог прысягнуць, што сны падзяляюцца на звычайныя і каляровыя. Каляровыя найболей цікавыя. Бачыць нейкія карціны ў самых натуральных фарбах — значыцца мець і ў сне найбольшую прыязнасць да свету. Медыкі гавораць, што гэтыя надзвычай прыгожыя відовішчы бываюць ад высокай нервовай напружанасці. І можа здарыцца, што пры

яе развіцці вы адправіцеся самі ці вам культурна дапамогуць дайсці да тых дзвярэй, дзе напісана — «Псіхіятр». Там вам пачнуць задаваць наіўныя пытанні: які сёння дзень, якая дата, ну і іншае... Мабыць, гэта немалая цана за ўсю фантасмагорыю колераў.

Усе астатнія сны — здаровыя, але маюць горшы — шэра-белы тон. Іх падзел просты — абывацельскія, прарочыя і гераічныя. Абывацельскія самыя сумныя і непатрэбныя. Ад іх ні ўспамінаў, ні фантазіі, адно баламуцтва ў галаве. Суседзі... плёткі... магазіны розныя...

Любіць трэба гераічныя сны, іх можна расказваць усім, бо геройства здаровіць свет. Падхалім паказвае ў сне дэспату-начальніку кулак, а пасля, мачаючы палец у чарніліцу, малюе на яго лысіне розныя брыдоты; бухгалтар, абтросшы пыл з вушэй і паказваючы язык маладому Месяцу, імчыць у прасторы навыперадкі з міжпланетным караблём і грыміць лічыльнікамі; бабуля, якая цішком ад вялікай сям'і ласуецца вішнёвым кампотам, уязджае на белым кані ў родную вёску Сірэневая, якая калісь называлася Цяляткі. Весела!

Саша сніў прарочы сон. Быццам ехаў ён цягніком у сваё мястэчка. Сыходзіць надвячоркам на мілы, цёплы перончык. А да ўсяго гэтага, як цёплая блукаючая зорка, пад сэрцам дрыжыць адно жаданне — хутчэй дахаты, дзе адразу пачнецца вэрхал сустрэчы і вясковыя навіны без ніякага ладу і парадку пасыплюцца на галаву. Але самае найлепшае прывітанне — падбегчы басанож да глыбокай, аж на дзесяць труб, студні і, стоячы на халоднай жарстве, нагнуцца ў цёмную бездань і крыкнуць — ау! Дзесяцітрубны голас зямлі і вады, халодны і страшны. Ён та-

кі ж, як і ў маленстве, таямнічы і таму дарагі і жаданы. Голас адгукнецца так, што па ўсім целе пойдуць колкія і салодкія дрыжыкі: «Жыву-у-у».

Саша ідзе па пероне, але — дзіўна! — яго ніхто не пазнае́, хаця сам ён бачыць шмат знаёмых. Ён вітаецца з людзьмі, а яны здзіўлена глядзяць на яго. Не пазнае нават сусед — дзядзька Андрэй — дзяжурны па станцыі. Яго форменная шапка з чырвоным верхам наліваецца яшчэ большай чырванню, і Сашу здаецца, што ціхманы дзядзька нечага вельмі злуе.

І вось, засмучоны, Саша нібыта ідзе ўжо не проста па дарозе дахаты, а цягнецца чагось убок, на луг, да быстрай рэчачкі. Здаецца, што і булькоча вада, і звіняць на дне каменьчыкі. А сама рэчка быццам уцякае ад яго. Саша разуваецца, ступае ў лютую крынічную ваду і бярэ са дна далікатна-ружовую ракавінку. На беразе, распластаўшы даланю, ён цвердзіць ракавінцы дзіцячы заклён: «Слі́мак, слі́мак, выстаў рожкі, дам тры грошы на пірожкі».

Саша спрасонку паўтарыў яшчэ раз, потым яшчэ, але рожкі не вылазілі. З дзірачкі пачуўся тонкі піск: «Не выстаўлю рожкі. Не так ты завеш, хоць словы і правільныя. У цябе ўжо не наш голас, не такі, як быў. І ніхто не гукне — ні студня, ні рэчка, ні шыбіна акна ў вёсцы. Мне не трэба твае грошкі на пірожкі».

Піск скончыўся, а Саша ўсё трымаў гэты маленькі цуд на далоні і, не ведаючы, што рабіць, меркаваў: «Можа, і сапраўды я дарма звязаўся з усёй гэтай вялікай навукай? Я забудуся назвы траў, зорак, забудуся, як звалі суседзяў. Нават слімак пачаў пішчаць на мяне. Але ж некаму трэба займацца і навукай, рабіцца, напрыклад, тэарэтыкам літаратурнага працэсу альбо гісто-

рыкам літаратуры, такімі, разумееце, смарчкамі і архіўнымі жучкамі».

І тут у сонную свядомасць Сашы раптоўна прыплыў здалёк адзін цвёрды голас вялікага пісьменніка і прагучаў радком яго літаратурнага запавету, які нядаўна Саша чытаў: «Заклінаю розных літаратурных далакопаў не шукаць і не друкаваць маіх вершаў і апавяданняў, якія параскіданы па розных газетах і часопісах...»

Саша сніў сябе грабаром у чорным адзенні, страпянуўся і... прачнуўся, абліты ліпучым халодным потам.

«Што за чорт»,— падумаў ён.

На шыбах трымцела світанне.

## II

Цвыркун — той самы, што выбіўся ў нейкае начальства і на сходзе складна выкрыў Зміцера Апанасавіча за яго невуцтва — адчуваў усё-такі ў душы, што і ён, і Змітрок «роўнай грамаці» (так некалі казалі ў вёсцы Цвыркуна). Праўда, Цвыркун неяк нашкроб дысертацыю, але ўжо і сам забыўся, што ў ёй было напісана. Разам вучыліся яны са Змітраком, разам у студэнцкім агуле спрачаліся, сябравалі, наогул, жылі людзі людзьмі.

Цвыркун, як толькі завёў сваю сям'ю (дзеўкі не надта любілі яго за крывы нос, якім ён увесь час шморгаў), кінуў беднага Змітрака ў пакоі аднаго. Як і кожнага чалавека, Цвыркуна часта цягнула назад, часам нават несвядома ён хадзіў да роднага інтэрната. Тым больш, жонка забараніла яму «шморгаць», і дамоўісці не хацелася. «Лёгка Змітраку жыць аднаму, ужырэўшыся, а тут і жонка з дзіцем, і кватэра, на ней-

кага д'ябла кааператывам будаваная»,— не раз думаў ён.

Думалася і другое: сорамна — хадзіў да Змітрака, сталаваўся задарма.

Думаць так было трохі часу: Цвыркун цікаваў чарговую ахвяру. Факультэт вялікі, і зрабіць гэта не так цяжка, тым болей што ахвяры самі ішлі ў рукі. Ён хадзіў ля аўдыторыі трэцяга паверха, чакаючы канца лекцыі, каб зрабіць праверку. Цвыркун зусім не думаў, што выкладчыца псіхалогіі, гаворачы студэнтам пра асаблівасці чалавечых характараў, дае характарыстыку такім, як ён.

Выкладчыца гаварыла:

— Нярэдка ў жыцці наглядаецца, што двудушнік, пустазвон кожнага сустрэчнага надзяляе такімі ж рысамі характару, якімі валодае ён сам. Устаноўлена яшчэ, што прыпісваць уласныя якасці і перажыванні схільны перш за ўсё той, хто вылучаецца недастатковым самакрытыцызмам, мае пра сябе высокія думкі.

Цвыркун не чуў, ён падпільноўваў, каб адзначыць, хто ёсць, а каго няма. У сваім узросце ён ужо забываўся пра незразумелыя зрухі, якія адбываюцца ў дзявочых і юнацкіх душах вясной і цягнуць студэнтаў на волю. Забываўся — сорак год усё-такі, залысіны палезлі ўжо.

Раптам увесь план праверкі, як і часта бывае ў заклапочаных людзей, перарвала неспадзеўка: перад Цвыркуном паўстаў сам Бацька, Міцер Апанасавіч. Ён неяк бездапаможна і як бы тоячыся паглядзеў на земляка.

— ...Ага, то ты кажаш — студэнты любяць цябе? — дапытваўся Цвыркун.

— Любяць, як быццам я толькі на свет нарадзіўся,— расказваў Бацька.— І яшчэ я думаю

сваю дысертацыю трошкі наперад зрушыць. Таму і прашуся камандзіраваць мяне ў Вільню, мне трэба там некаторыя старыя кнігі паглядзець.

— Надта добра, што ты імкнешся павысіць сваю дасведчанасць.

— Добра, пэўне ж, добранька,— неяк невядома куды хілячы, згадзіўся Бацька.

«Ніякай ты дысертацыі не напішаш, і студэнты цябе не надта любяць»,— тым часам падумаў Цвыркун, а сам сказаў:

— Вось што, Змітрок, ты на мяне за *тое* не крыўдуй, на некага мне трэба было сказаць. Нам трэба імкнуцца да нечага, іначай нас балотам стаячым назавуць. Кніжкі ў цябе ёсць, я ведаю, але тут галоўнае, што мы не заспакойваемся, імкнёмся. Таму я цябе і пакрытыкаваў. А хочаш у Вільню — едзь, павышай свой узровень.

Нічога не разумеючы, Бацька пайшоў па камандзіроўку.

Уся Бацькава задума з Вільняй была трошкі інакшай, чым ён расказваў Цвыркуну.

Бацька ясна зразумеў, калі праклінаў праклятыя мінулы час, што дату свайго нараджэння ён наўрад ці ўстановіць. Метрыкі сваёй ён і ў вочы ніколі не бачыў, а царкву, дзе ў спецыяльнай кнізе мусіў быць адпаведны запіс аб яго хрышчэнні, разбамбілі ў вайну. Але тады ж ён раптам пачаў, раздвойваючыся душой, размаўляць сам з сабою:

— Можна ўсё-такі дазнацца,— гаварыў адзін голас.

— Ну як, як? — адчайваўся другі.

— Не ўсюды ж цемра была, непісьменнасць, свет варушыўся ж неяк.

— І да чаго ён даварушыўся?

— Газеты выходзілі? Выходзілі. І ў іх пра ўсё пісалася.

— І пра нараджэнне такіх, як я?

— Не. Але пра вялікдзень таго года і пра нашу сераду, пра якую маці гаварыла, у газетах было. Можна проста вычытаць.

— У якіх газетах?

— У польскіх, за польскім жа часам нараджэнне было. А палякі пра вялікдзень у газетах пісалі.

— Але ж я не веру ў бога.

— Вядома, ды што зробіш — дату можна толькі так дазнацца.

— Дзе ж узяць тыя трухлявыя газеты?

— Там, дзе яны выходзілі.

— У Варшаву ехаць?

— Нашто? Метраполія пасылала свае ідэі і на крэсы.

— Куды ж тады?

— Найбліжэй — у Вільню, у бібліятэкі.

Так узнікла ідэя паездкі ў Вільню, узнікла з глыбокага адчаю пакрыўджанага чалавека, які рашыў на ўсякі, можа, нават трагічны выпадак, дазнацца пра пачатак свайго жыцця.

Недзе аж на самым прыцемку Толя нарэшце прыйшоў з доўгага вучонага савета, дзе яго атэстоўвалі за першы год навучання ў аспірантуры.

Атэстацыя падобна нечым на перавод вучня з класа ў клас. Толькі і розніцы, што вучня могуць адсадзіць на другі год, а аспіранта — не. Калі яго не атэстуюць, то можна забіраць свае паперы і ісці хоць куды з лёгкім, як на цяперашні час, вясновым ветрам.

Толю сур'ёзна пагражала і такое, бо апошнім

часам пайшлі ўпартыя чуткі, што ён нічога не робіць.

А на самой справе прычына была трошкі інакшая. У Толі зусім не аспіранцкі выгляд і павадзіны. Лепей за ўсё, калі аспірант вёрткі, рухавы, а Толя быў мешкаваты і незваротлівы. Худоба таксама ўпрыгожвае аспіранта, яна сведчыць, што чалавек сохне ў навуках. Толя ж паўнеў і ружавеў. Аспіранты думаюць, што яны вялікія разумнікі — кідаюцца звышвучонымі слоўцамі, чапляюцца да людзей са сваімі так званымі нагляданнямі і вывадамі, не ведаючы таго, што іх можа быць столькі, колькі і слоў у лексіконе чалавецтва. Толя ведаў пра гэта і маўчаў.

Да таго ж, Толя нядаўна зрабіў антынавуковы ўчынак, які пахіснуў нават веру кіраўніка ў свайго аспіранта.

Кіраўнік аднойчы сказаў важна:

— Прапаную вам апублікаваць тэзісы ўступу вашай дысертацыі, значыцца, саму пастаноўку праблемы, у калектыўным навуковым зборніку маладых вучоных. Месца мы даб'ёмся.

Толя ўсміхнуўся:

— Гэта тая ратапрынтная брашура, якая будзе каштаваць тры рублі і выйдзе тыражом у дваццаць пяць экземпляраў?

— Напачатку важна і такое. Вы робіце першыя крокі. Няўжо ж мільённым тыражом выдаваць? Ганарова і гэтак,— насупіўся важна кіраўнік.

— А як выйдзе зборнік, буду насіцца я з ім і паказваць усім знаёмым, а пры жаданні і незнаёмым.

— Справа ваша. Толькі прыйдзецца на некаторыя выдаткі пайсці, за друк заплаціць.

— Нічога, я і гаспадарку бацькаву спушчу, каб надрукавацца толькі.

— Вось гэта ўжо навуковы падыход.

Але жартачкі не спадабаліся прафесару. «Паўгаловак нейкі,— падумаў ён.— Ніякай сур'ёзнасці».

Саша па нязвычнай, лёгка-сентыментальнай паходцы сябра адчуў,— пранесла, атэставалі Толю.

Толя сквапна паглядзеў на свой ложак і зажмурыўся.

— Слухай, ты правакацыі кінь. Раскажы лепей.

— Што расказваць? Хацелі з'есці. Накінуліся, як злы на нягоднага.

— І як яны не з'елі? Рэдка бывае так.

— Ты не дадумаешся, хто мяне ўратаваў. Сам рэктар. Прыехаў на атэстацыю. Мяне лаялі. А потым устаў ён і сказаў, што я сялянскі сын і трэба выхоўваць мяне, а не адхрышчвацца. Усе нібы солі глынулі, абкружылі пасля. Рэктар жа мне актыўнасці пажадаў, руку паціснуў.

Саша зразумеў, што ад Толі нічога больш не даб'ешся, а Толя задумаўся і сказаў зусім сур'ёзна:

— Нешта справядлівае было ў папроках, толькі метады не тыя. Ды і ў аспірантуру я трапіў неяк знянацку, нечакана. Ты ж ведаеш...

...Скончыўшы філфак інстытута, Толя ўладкаваўся ў райцэнтры Дубнякі працаваць на такой рэдкай пасадзе, як карэспандэнт-арганізатар раённага радыё. Быў ён сам сабе начальнікам — сам пісаў, рэдагаваў, сам стаў і дыктарам. Амаль год усё клеілася добра. Дубнякоўскі раён па серадах і суботах паўгадзіны слухаў свае раённыя навіны, а разам з імі і разважлівы барытонны голас Анатоля. Яму ставала нямала

клопату з перадачамі — спачатку запісваў іх на магнітафонную стужку, пасля праціраў якасць запісу і толькі тады ішоў у эфір. Да таго ж, з нядаўняга часу вырашылі ўвесці навіну — музычнае афармленне, каб перадачы не здаваліся занадта сухімі і правінцыяльнымі. Яны суправаджаліся ў пачатку і ў канцы лёгкай мінорнай мелодыяй, што надавала паведамленню пэўную лагічную завершанасць і нават крыху нейкі энтузіязм.

У тую праклятую суботу за дзве гадзіны да ўжо гатовай перадачы магнітафон раптам сапсаваўся — прапаў гук. Круцілася стужка, але скрынка толькі гула сіплым гудам і нічога не расказвала. Упіралася. Толя — цёмная бутэлька ў тэхніцы — разгубіўся і паскардзіўся па тэлефоне рэдактару раённай газеты — першаму свайму начальніку. Той не здзівіўся: «Ну і што? Чытай адразу ў эфір. Ты ж здольны хлопец».

На перадачу Толя ішоў з гаспадаром сваёй кватэры Міхалкам, які нёс на плячах баян. Не шмат большы за баян Міхалка — дубнякоўскі гарманіст і гультай гадоў сарака. Калісьці без яго не абыходзілася ніводная ўрачыстасць у невялікіх Дубняках і наваколлі. Цяпер, як ён сам кажа, парафія паменшала, тэхнікі музычнай шмат. Але Міхалка цвёрда верыў у свой талент і ў тое, што на яго век кавалак хлеба знойдзецца. За Толем гаспадар увязаўся ад беспрацоўя — «выручу цябе, што там мне рыпнуць пару разоў».

Толя спярша аж разгубіўся ад прапановы на самадзейнае музычнае афармленне, хаця Міхалка — гарманіст удалы. Дарогай былі апошнія настаўленні: іграць толькі па знаку Толіка, спачатку што-небудзь бадзёрае, потым — працяжна-задуменнае.

Бесклапотны вёрткі гаспадар слухаў слаба, пачынаў ужо фарсіць, тузаючы кватаранта за рукаво:

— То, кажаш, па ўсім раёне разлягацца будзе? Я і на ўсю вобласць урэзаць магу — не падкачаю.

— Ты глядзі ж, не падвядзі мяне пад дурнога хату.

У васемнаццаць трыццаць пачалі. «Увага! Гаворань Дубнякі! Перадаём раённыя навіны»,— абвясціў Толя і ўзмахнуў рукой Міхалку, які натапырыўшыся, пры гальштуку, сядзеў у куце пакойчыка.

Міхалка так урэзаў, што зазвінела ўся металічная апаратура. У Толі аж слязу выкрасала. То быў самы ўрачысты марш, які ведаў Міхалка,— «Развітанне славянкі». Ім музыкант пачынаў самы важны момант вяселля — першы заход гасцей за сталы ўслед за маладымі. Пачынаў «Развітаннем славянкі», магчыма, з-за таго, што маладая, яна ж і славянка, назаўсёды развітвалася з маладосцю.

Гукі проста ляцелі навыперадкі, настолькі класным было гранне з заліхвацкімі пераборамі.

— Каб яшчэ бубен ды цымбалы, цэлую сімфонію згарбузавалі б,— голасна пашкадаваў Міхалка на апошнім акордзе.

— І нашто такія збыткі — па тры скваркі ў булён,— запярэчыў Толя.— І так добра.

— Ну, не скажы. Далікатней пайшло б...

Родная мелодыя, залунаўшы з прыёмнікаў, навастрыла вушы дубнякоўцаў. Многія нават збянтэжыліся — сёння выдаваў замуж адзіную дачку старшыня райспажыўсаюза, і ўсе чакалі вялікага вяселля.

У адной хаце стаўся такі перапалох. Дзве ка-

беціны, сабраўшыся ісці глядзець на дзіва, сядзелі-гаманілі і, пачуўшы раптам радыё, войкнулі ў адзін дух:

— Далібог, ці не Паўбутэлек іграе? (Міхалку звалі так за мізэрнасць.)

— Ён жа, ён!

— Няўжо і ў радзіве будуць перадаваць?

— А што ты думала? Стары ж над усімі базамі стаіць, як захоча, то і кіном пакажуць.

— А-е-я-ей! Нешта ж рана пачалі! Як мы з табой прашалопалі. Ляцім.

— Ляцім, дзеўка. За сталы ўжо ідуць. Паўбутэлек разрываецца.

Кабеціны рвануліся з хаты.

Не адны яны спадмануліся, покуль Толя перапыняў Міхалку і пачынаў чытаць навіны.

Амаль аглушаны музыкай, Толя гаварыў у мікрафон: «Клічуць вясновыя гоні. Спяшаецца ў дадзены перыяд вясна. Раней, чым звычайна, вызваліліся ад снегу палеткі нашага раёна. Хлебаробы спяшаюцца, каб не ўпусціць адказны момант і, як належыць, правесці падрыхтоўку да пасяўной кампаніі. Вось-вось, на працягу параўнальна невялікага адрэзку часу, запросіць зерня набрынялая зямля».

Далей Толя гаварыў пра цэнтнеры і гектары, пра падкормку лугоў і пашы, а Міхалка меркаваў, што яму найлепей сыграць на заканчэнне.

Чым далей Толя чытаў, то ўсё брыдчэй рабілася яму за сваю пісаніну. Не то шчымлівая музыка, не то сама зялёная тэма вясны ўзнеслі яго на лірычны лад.

Адсунуўшы паперы, ён неяк незнарок пачаў гаварыць сам ад сябе:

— Да нас прыляцела ўжо дзіч, жаўранкі запяялі, а снег пазлазіў — вясной запахла ў па-

ветры. Гразі вялікай сёлета не мелі, цяпер дарогі добрыя, гэта ўперад было, што хоць чарцей у балоце тапі. Жыта сёлета з-пад снегу выйшла чорным, а як пырскнуў дождж, яно і зазелянела. І трава пасля дажджу трошкі рушылася. Пачынаюць развінацца дрэвы — вярба, бэз, бяроза. Кузюркі ўсякія павылазілі.

Толя адчуваў, што стыхія настрою адносіць яго не туды, у бок ад клопатаў пасяўной, і ён папяўся на грамадзянскасць, стараючыся гаварыць гучней:

— Народ наш спрадвеку земляробны, да працы прывыкшы, то ёсць спадзяванка, што запланаваныя трыццаць цэнтнераў з гектара мы возьмем. Але скрозь трэба вока ды вока, бо інакшай не адзін старшыня пакруціца восенню, як уюн, соллю пасыпаны.

Прарастай, зерне, пад спеў салаўіны!

Міхалка меркаваў-меркаваў, чым яму закругліць Толеву вясну, і вымеркаваў: ага, найлепей будзе «Расцвіталі яблыні з ігрушмі».

Па каралеўскім жэсце Толі мілая «Кацюша» шпарка і ўпэўнена панеслася гуляць па ўсім раёне.

Толя адразу падумаў: «Ну і дурніло ж ты, Міхалка»,— але паправіць нічога ўжо не мог.

Далей Толя расказваў пра другое:

— Як шырокая і быстрая рака, плыве жыццё дзяржаў і народаў. Плыве яна ад няведамых часоў, і нікнуць у ёй гады і стагоддзі, як кроплі вады. Мінуўшы тыдзень быў трохі зацішнейшы ў міжнароднай палітыцы, але зацішак цяжкі, як хмара, што заступіла сонца, і ад якой можна ўсяго спадзявацца. Гарачка палітычная не адпускаецца.

Толя адчуў, што яго захліствае плынь на-

строю, нейкая самадзейная філасофія. Калі ж яму не стала пра што гаварыць, ён глыбакадумна скончыў: «Так што, можна ўсяго спадзявацца».

Міхалка ўшпарыў «Бывайце здаровы, жывіце багата...».

Мала таго, што ён зайграў, ён яшчэ і запеў вісклявым голасам. Вырашыў, што адной музыкі для развітання мала, устаў і фацэтна распінаўся, выжыльваючы шыю і прытупваючы. Спяваў рэзка, з пачуццём уласнага гонару, націскаючы на асобныя гукі. Такім чынам выходзіла: «Быв-в-вайце здар-р-ровы...»

Пасля першага куплета Толя адключыў мікрафон, бо ўявіў сябе на месцы тых, хто сядзіць, а мо ўжо і ўпокаткі ляжыць ад рогату ля прыёмнікаў. Шчокі яго зардзеліся, як півоні ў сонечнае і дажджлівае лета. Узнікла цвёрдае адчуванне, што спакойнага праходу па вуліцах Дубнякоў ужо не будзе. Прагнаўшы голас Міхалкі з шырокага свету, Толя адзін даслухаў да канца эпапею развітання.

Перадача была ў суботу, а ў панядзелак Толя падаваў заяву аб звальненні па ўласным жаданні.

— Нельга пазайздросціць твайму пераемніку ў Дубняках.

— Яму цьмяна там, невыразна цяпер. Заходзьце! — гукнуў Толя на нясмелы стук.

Як хораша могуць пастукаць дзяўчаты ў пакой да хлопцаў! Сама музыка водзіць іхнімі пальчыкамі. У тых далікатных гуках ёсць і сарамлівасць, і спадзяванне на нешта незвычайнае. І наогул, вельмі нядрэнна, калі прыходзяць дзяўчаты.

Ля дзвярэй стаяла Іна Валынец, аспірантка,

аднакурсніца Толі. Пры электрычным святле здалося, што вясновая вячэрняя імжа на яе брывах і павеках, на шапачцы і каўняры дублёнкі дыхнула ранішняй лугавой расой.

Толя падскочыў першы: «Заходзь, Іна, заходзь». Ён памагаў распранацца, а Саша пасміхаўся ў думках: «Правільна, Толічак, дублёнку прыйдзецца перавесіць цераз біла ці на тумбачку пакласці, бо шафу адчыняць ты збаішся — на цябе паляціць гара пустых бутэлек, якія мусіў быў ты даўно ўжо вынесці з пакоя».

Саша ніколі не разумеў, чаго паступаюць у аспірантуру дзяўчаты. Заместа таго, каб шукаць чалавека і выціраць насы сваім малым, пячы ім піражкі, яны трацяць імпэт і маладыя сілы на высвятленне законаў грамадскага развіцця ці на асаблівасці якіх-небудзь суфіксаў -ік, -ык ва ўмовах, скажам, Капыльскага раёна.

Але Іна, як прыемнае выключэнне, была на сваім месцы. Тэорыя літаратуры — усе разнавіднасці памераў, строф, жанраў, відаў, усё пекла сінекдахаў і тэсісаў проста самі прасіліся ў яе памяць.

— У вас так цікава,— дзівілася Іна, любуючыся галінкамі сасны ў слоіку.

У пакоі нічога цікавага: Іна здзівілася прастаце інтэр'ера. Гармідар кніг і папер на тумбачках, непрасаваныя фіранкі, стары настольнік, на сценах панаклейваны фатаграфіі кінаакторак. А тут яшчэ ў кутку кавалак тынку выбіты, нібы пры бамбёжцы, адным занадта вясёлым другам, і голы цэмент вельмі маляўніча аздабляе пейзаж.

Толя гаварыў з Інай зусім свабодна, жартаваў — аднакурсніца ўсё-такі. Саша ж адчуваў сябе не так і проста, як бы не ведаючы, што ра-

біць — Іна ўсё ж была дачкой старшыні гарвыканкома.

Некалі ў дзяцінстве Сашу добра дасталося за адно панібрацтва. Хата стаяла ля самай шашы, і наезджыя людзі былі не дзіва.

Аднаго разу паважны капітан і яго жонка палуднавалі ў хаце, а бліскучая «Пабеда» чакала. Саша разгуляўся з іх сынам, сваім равеснікам. Равеснік у раскошнай матросцы глядзеў на вёску флегматычна, а Саша вісеў на рыпучых варотах, не асмельваючыся зачапіць першым. Калі ж равеснік пачаў калупаць у носе і ўсё маўчаў, Саша нарэшце не вытрываў:

— А вось давай, хто скарэй даляціць да таго унь слупа?

— Какога гэта слупа?

— Ну унь, з белымі чашачкамі,— аж закрычаў Саша, дзівячыся цямноццю.

Ірванулі з месца. Саша быў вясковы, босы і абставіў наезджага як мае быць. А праз хвіліну яны ўжо качаліся, як лепшыя сябрукі, на траве. Саша спачатку даў маху, разгубіўся — гарадскі, аблажыўшы яго, уссеў верхам і, гоцаючы, моцна крычаў: «Но-но-но!..» Саша спрудзіўся, і яны пакаціліся ажно ў дзядоўнік ля плота. Тут ужо верх узяў Саша і на добрым прыкладзе зацешыўся: «Но, конік!»

Капітанша бегла прысадамі з гвалтам, а за ёю, войкаючы, Сашава маці. Матроска малога госця была разлуплена, гальштучак целяпаўся недзе на пупе, а сам ён унурыўся. перапэцканы зеленню. «Пабеда» таропка ад'ехала, а новы сябрук Сашы паспеў паказаць яму праз акно машыны язык. Саша не мог даўмецца аднаго — як, седзячы ў такой амаль казачнай бліскучай машыне, ён не баіцца паказваць язык?

Тым часам маці ўшчувала Сашу: «То ж табе не са сваімі душыцца ля платоў... Такія людзі ў хату зайшлі... У яго ж бацькі пагоны на ўсе плечы...»

Бабуля дык зусім спужалася: «Няможна так, унучак, ён і стрэліць мог з нагана...»

Той Сашаў дзень і стаў днём пакут і пачатку сумненняў. Дагэтуль было ўсё проста: яго маці, бацька — самыя дужэйшыя на свеце, яны ўсё могуць і нікога не баяцца. А тут не — ёсць і такія бацькі, на якіх і твае азіраюцца.

Прайшло ўжо шмат год. Але не-не, у некаторых, як і сённяшні, выпадках, успаміналася свая дзіцячая бяда, сіняя матроска, і цягнула больш на ўспаміны, чым на размовы.

— А чаму ў вас вісіць такі стандартны плакат і на самым відавоку? — спыталася Іна пра кут, дзе быў прышпілены шэдэўр агітацыі. Маладая пара з нейкім авечым шчасцем у вачах парываецца ў нязнаную далячынь, трымаючы ў руках ашчадную кніжку, а ўнізе подпіс, вялікі, чорнымі літарамі: «Трудовые рубли — в сберкассе храни».

— О, мы маскіруем ад каменданткі вялікі твор мастацтва.

Саша адчапіў верхнія кнопкі. Проста на сцяне вуглем быў выведзены лёгкімі штрыхамі змрочны тып у капелюшы. Адставіўшы нагу ўбок, ён, здаецца, прытанцоўваў на сцэнцы і жорстка ўсміхаўся.

— Ці не мясцовы імпрэсіянізм? — здзіўлялася Іна.

— Аўтапартрэт аднаго паэта. У недалёкім будучым. Паэт сам сказаў, што гэты вобраз будзеісці за намі зданню ўсё жыццё.

— За што ж?

— Паэт часта прыходзіць і дае нам розныя настаўленні, ён кажа, што мы будзем паразітамі на жывым целе літаратуры і гадуем самі з сябе нягоднікаў.

— Тады і я разам з вамі, ці што?

— Выходзіць, так. Паэт гаворыць, што кожны такі, як мы, напіша адзін раз нейкі опус пад назвай дысертацыя і атрымлівае за яе ўсё жыццё рэнту. А тыя, пра каго ён піша, магчыма, і без грошай кукуюць часцяком.

Іна глядзела на Сашу, як бы адкрываючы нешта новае для сябе.

— Не перажывай. Паэт гаворыць, што заўсёды так было, і ён знаходзіць задавальненне, лаючы нас. А нядаўна ён намаляваў гэты свой партрэт. Ён цікавы чалавек.

Іна спазнала яшчэ і не такія дзівосы. Чорную каву Толя падаў на стол проста ў алюмініевай каструлі, дзе кава і варылася. Шырока і пахуча пайшла пара.

Іна са спагадлівай усмешкай гаспадыні глядзела на Толеву механіку і не ўтрывала — узялася памагаць сама, а калі селі за стол, запытала сур'ёзна:

— Толя, ты сёння на мяне не злуешся з-за вучонага савета?

— Іначка, дай ты рады. Рэктар і ты былі там адзінымі маімі сябрамі.

— Не смейся. Нядобра неяк выходзіць. Атэстоўвалі толькі нас дваіх, актыўнічалі мы з табой аднолькава, а ўляцела аднаму табе.

— І правільна. Яны далікатныя людзі — паважаюць жанчын.

Іна недаверліва павяла галавой:

— Я сама ведаю — яны азіраюцца на аўтарытэт майго бацькі. Колькі разоў сама ўпрошвала

даручыць мне што-небудзь на факультэце, аж не — апякунства нейкае дзіўнае кругом: не турбуйцеся, вучыцеся.

— Смешная ты — то і не турбуйся. Раз ім не сорамна, то чаго табе бедаваць? Эх, мне б такія мяды.

Калі выходзілі з Інай, на ганку інтэрната наскочылі на Фанатыка. Ён чамусьці аж рот разявіў, так і застыў на прыступках. Не, ён не паверыў сваім вачам, бо дагнаў ужо за інтэрнатам і напомніў: «Вы ж не забудзьцеся сёння да Змiцера Апанасавіча на вечар прыйсці».

Ці ж забудзешся? Перад ад'ездам у Вільню Бацька рашыў даць развітальны банкет ворагам. Так ён называў цяпер у душы ўсіх сваіх знаёмых.

На дзень ён наняў Адэлю за аканомку. Ніякай платы Адэля не захацела, але паставілася: яна мусіць быць на самой урачыстасці.

Адэля паразганяла ўсіх жанчын на агульнай кухні, смажыла, пражыла і камандавала Бацькавым суседам і сябрам аспірантам Лукашом, які спецыяльна адклаў усе справы і абавязкі на іншы дзень. Лукаш шлындаў туды-сюды за памагатага, і па яго замглёных вочках Адэля бачыла, што ён употайкі пацягвае з Бацькавых запасаў.

— Помачы тут з цябе. Адно набярэшся, як жаба гразі, покуль людзі збяруцца. Вечара не можа дачакаць.

— Ціха, Адачка, за добрага чалавека не грэх.

Бацька тым часам пакаваўся. Ён збіраўся на адзін дзень, але партфель узяў вялікі. «Так-так,— меркаваў Бацька,— пару бялізны чыстай я паклаў, трэба яшчэ брусочак сала ўкінуць і ножык. Мала што дзе ў каго ёсць, а сваё меўшы, не пра-

падзеш, у чужыя ж людзі еду. Бывае, што і за грошы не купіш».

Лукаш насцябаўся-такі да вечара, але з максімальнай натугай сіл да стала дайшоў. У ім абудзіліся нейкія дыктатарскія замашкі, і ён рашыў быць тамадой невялікай кампаніі — Адэлі, Бацькі, Фанатыка і Толі з Сашам. Кампанія была, як трэснутая крыга,— Адэля не размаўляла з хлопцамі.

Лукаш грозна паглядзеў на начупыраную Адэлю, зіркнуў на Бацьку і проста як закамандаваў:

— Гладкай дарогі табе, Змітрок!

Усе згадзіліся, толькі Адэля, якая чакала грандыёзнасці і салюту, пакрыўдзілася:

— Мала ж ты сказаў.

— Затое я гавару без адзінай арфаграфічнай памылкі,— узганарыўся Лукаш.

— Не можа так быць.

Бацька пры першай чарцы папрасіў Адэлю:

— Вы ж на мой пакой паглядайце, каб хто не ўбіўся часам.

— Пластам лягу, нікога не ўпушчу, не чужыя ж мы,— дзякавала Адэля за ўвагу.

Лукаш, як чалавек больш сардэчны, параіў практычней:

— Я магу тут і пажыць, папільную, пакінь толькі скрынку віна.

— Не, братачка, па табе ўсё маё можа ляснуць.

Адэля радасна зіркнула па кутах і шчыра прызналася:

— Я-то ўзяла б вунь той таршэрчык.

— Дурная, калі ўжо браць, то цэлься, каб падчыстую,— не згадзіўся Лукаш.

— А тут больш нічога людскага і няма,

У шафцы толькі кніжкі ёсць. Ад кніг клапы ў кватэры заводзяцца.

Бацька камянеў ад гутаркі сваіх дабрадзеяў. Яму рабілася шкада сябе, такога маленькага і адзінокага, які заўтра будзе пакутаваць у людным мурашніку вакзалаў. Па нагах будуць таптацца чужыя людзі — сустрэчна, развітальна і проста абы-як. Ім і ў голаў не зойдзе, калі едуць яны ў свае камандзіроўкі, на госці альбо проста пагуляць, што ёсць на свеце чалавек, які не ведае даты свайго нараджэння і пнецца яе адшукаць у калаўроце дзён.

Што там чужыя? Тут як бы і свае, і то не ведаюць. Можа, ён прападзе, і па ім ні адна душа не ўкленчыць. Чакаюць толькі, каб ён з'ехаў, Адэля ўжо і таршэр прымеркавала.

Шкада было свайго пакоя, картатэкі з незнаёмымі яшчэ ўсяму свету дыялектнымі словамі. На вусны сама прасілася сумная песня са словамі «Степь да степь кругом, путь далек лежит».

«Куды ехаць і па што ехаць? — дадумваў Бацька.— Адной стравы на дваццаць душ навварана, а яны за сподкі мае грызуцца ўжо». Дадумаў Бацька і пажаліўся:

— Ні разу я ў Вільні не быў. Як там лягчэй было б бібліятэку акадэмічную знайсці?

— Паперу! — гукнуў стомлены маўчаннем Саша.— Я намалюю план горада і ваш маршрут.

Саша вёў лініі і думаў, што ніякія планы, карты, малюнкі, фільмы не могуць расказаць нават і прыблізна пра самы прыгожы для яго горад на свеце, найпрыгажэйшы не толькі таму, што Вільня была першым сапраўдным горадам, які ён убачыў.

Падумайце і прызнайцеся хаця б самі сабе. Ці часта тое, да чаго вы імкнуліся, чым трызнілі,

што было далёка і недаступна вам, пры спазнанні не траціла сваёй прывабнасці? Такое бывала рэдка.

Але Вільня была для Сашы тым сапраўдным цудам, які не знішчыў легенды пра сябе. Легенда пачалася ў вёсцы, з прыказкі «Працуй пільне — будзе і ў хаце Вільня».

Якая ж то яна, Вільня ў хаце? Відаць, не ў пасляваеннай зямлянцы, куды і ластаўкі ў застрэшша не лятуць, а ў хаце высокай і шалёванай можа пасяліцца яна. Вільня будзе з прыгожымі гафтаванымі фіранкамі, з белай — аж зажмурышся — сонечнай сасновай падлогай і чыстай кафлянай печкай. У той Вільні людзі не плачуць, не праклінаюць свайго жыцця. Яны, вядома ж, і не хаваюць пару брусочкаў тонкага сала да такога далёкага сенакосу.

Легенда пра Вільню была неадназначнай, у ёй жыла і суровая прыгажосць сціплага подзвігу многіх мужчын вёскі, людзей бывалых і паважаных, бо яны пры Польшчы з Лукішкаў не вылазілі, мур угравалі, як пачціва казалі пра іх. За тое, што перад Першамаем вывешвалі на бярозах чырвоныя сцягі, на вечарынках раскідвалі лістоўкі — па-вясковаму «фішкі», таксама прывезеныя з Вільні.

У Вільні вучыліся ў вялікіх навуках, туды хадзілі дабівацца праўды, успамін пра горад жыў скрозь. Нават скупога горад надзяліў крыллямі — смяяліся, што ён і за грош пагоніць у Вільню вош.

Так і ўяўлялася, як нягеглы хутаранец Юзя, блытаючыся ў сваіх нагах і смаргаючы носам, брыдзе па бруку з вялікім дубцом, гонячы няраслага паразіта.

Горад не спадмануў і ў самым галоўным, што

адкрыла веліч і бязмежжа свету — кнігах. Недзе на апошніх гадах школы Саша пачаў проста паляваць за ўсім друкаваным — ужо не хапала ні школьнай, ні сельскай бібліятэкі. Вось тады на дзядзькавым гарышчы і калаціла яго не так ад лютаўскага марозу, як ад хваляваиня. Ён перабіраў у скрынцы, глытаючы вачмі літары, старыя запыленыя кнігі. Яны, зляжалыя, у несамавітых простых вокладках, былі напісаны так, як гаварылі дома, слова ў слова, і было адчуванне роднасці, толькі што адкрытага здзіўлення і гонару за тыя словы.

Цяпер дык ужо Саша ведаў, на што было падобна тады яго адчуванне, бо яно адзін раз паўтарылася, калі ён першы раз глянуў на мора. Гэта адчуванне бязмежжа, якое і кліча, і палохае цябе менавіта сваёй бяскрайнасцю, калі пад сэрца коціцца халадок сапраўднай свабоды, і ты покуль не ведаеш, што табе рабіць.

На вокладках, унізе, было напісана: «Вільня».

І легенда жыла да гэтых дзён, бо сам горад не жадаў развейваць яе.

Горад падобны на ластаўчына гняздо, калі на яго глянуць з гары Гедыміна ці з самалёта.

І хаця горад у катлаване лёгкага Панарскага ўзвышша, і ў ім шмат вуліц, на якіх як толькі дваім размінуцца, і шмат старых дамоў, арак, скляпенняў, Сашу ніколі ён не здаваўся цесным. Сіла чалавечага генія, які збудаваў касцёл святой Ганны, аздобіў палацы скульптурамі, сіла прыроды, якая так прыгожа коціць воды Віліі і гоніць у рост шырокія гаі над ёю, вадзіла Сашу за сабой цэлымі днямі. Ён прыязджаў у горад летам да цёткі, да якой і забягаў толькі пераначаваць.

Усё соладка пераблыталася ў свядомасці —

і палёт готыкі, і гул крокаў на вячэрніх вуліцах, і халадок у падвалах колішніх рамеснікаў, і падобная на чорную бліскавіцу трэшчына на магіле вялікага грэшніка Паца, які не адкупіўся ад сваіх грахоў, нават зафундаваўшы гораду сабор Пятра і Паўла.

Легенда жыла, і гэта, магчыма, было адзінай узнагародай Сашу за жорсткія расчараванні пры спазнанні іншых ідэалаў.

«Так, Вільня,— думаў Саша, чэрцячы план,— ты бачыла шмат славутых людзей, нават Напалеона. Цяпер ты ўбачыш Бацьку».

Дзверы павольна адчыніліся без ніякага стуку. На парозе стаяў высокі чалавек гадоў сарака. Ён быў пры старым капелюшы, у чорным плашчыку, з сукаватай кульбай. Чарнявы, худы, з выразам болю на ўніклым твары, ён, не павітаўшыся, нізкім хрыпаватым голасам прадэкламаваў:

Не знал бы никто, может статься,
В почете ли Пушкин иль нет,
Без докторских их диссертаций,
На всё проливающих свет.

— Ну, што, п'яўкі, сабраліся? — закончыў ён грубай прозай і дадаў: — Дэгенераты!

Гэта быў паэт.

Усім стала ясна, што вечар ляснуў.

## III

Бацька чытаў па-польску някепска. Яму прынеслі стос газет, і ён нырнуў у даўнія гады, як у палонку. Праўда, чытаць было цяжкавата — шорсткая папера тых далёкіх гадоў не магла датрымаць друкарскай фарбы. Па-над старонкамі ўздымаўся чорны пылок.

Бацька гартаў газеты з шыкоўнымі назвамі, якія сведчылі, што журналісты і панкі на крэсах размахваліся досыць шырока. Гэта былі «Grodzeński exspress poranny» («Ранішні гродзенскі экспрэс») і «Wieczorny kurjer grodzeński» («Гродзенскі вячэрні кур'ер»). Бачыце, маўляў, і мы не лыкам шыты — не проста так, а з кур'ерамі, з экспрэсамі.

Газеткі, як звычайна, былі так сабе. Для абывателя сярэдняга ўзроўню лепшага чытання перад сном і не трэба. Палітычныя паведамленні, амаль у кожным нумары нешта падобнае на перадавіцу з туманнымі разважаннямі пра паляпшэнне дабрабыту краю, пра ўдасканаленне нораваў грамадства. А пасля — што папала: бульварная хроніка, моды, аб'явы.

«Бог ты мой,— думаў Бацька, гартаючы газеты,— нібы дзесяць стагоддзяў прайшло ад тых дзён, а я яшчэ як бы і маладым лічуся. Так... так... Банкет у гонар візіту ў Польшчу караля... вячэра ў гонар замежнага міністра... абед у гонар консула... яшчэ адзін абед...»

Бацька шыбка гартаў газету і думаў: «Ну, абеды і вячэры яны да гэтага часу, мабыць, ужо з'елі і мяне не паклічуць, таму прапусцім іх».

Ён думаў яшчэ пра бесклапотнасць і блізарукасць тагачасных палітыкаў: на свеце чорт ведае што робіцца, кругом путчы, перавароты, а яны раз'язджаюць, байкі нейкія на прыёмах расказваюць. Нервы сабе супакойваюць.

Вось фота — міністры замежных спраў у Варшаве — англічанін Ідэн і паляк Бек пасля перагавораў, а затым паведамленне: «Прэса французская аб варшаўскіх канферэнцыях Ідэна». «Le Temps» піша, што «ў поглядах польскага

ўрада на важнейшыя з'явы знешняй палітыкі вялікіх змен не адбылося».

Бацька абураўся несусветнай хлуснёй «Le Temps» і адначасова паводзінамі Ідэна з Бекам. Думкі яго ішлі гарачкай: «Ды ці ведаеш ты, «Le Temps», што змены адбыліся, і яшчэ якія. І чым далей, тым горш. Ці гэты ўрад з яго Бекам думае, што робіць? На крэсах усе турмы забіты людзьмі».

А тут, у гэтых жа газетках, паведамленне: «У Берліне адкрылася выстаўка польскага мастацтва». І фота — вышэйшыя нямецкія чыны глядзяць з паблажлівай цікавасцю на польскія карціны. Пасол пан Ліпскі дае тлумачэнні, а яны любуюцца пейзажамі. Любуюцца з-за далікатнасці, думаюць, што ўсе гэтыя краявіды хутка будуць пад іхняй пятой у натуры. «Старайся, старайся, пан Ліпскі. І ты, пан Бек, таксама, бо ходзяць чуткі, што аднаго з гэтых нямецкіх вар'ятаў вы хутка запросіце на паляванне ў Белавежскую пушчу.

Думалі б вы больш, панове, а не забаўляліся на прыёмах. А то можа быць, што праз чатыры гады памчыць галопам польская кавалерыя на нямецкія танкі. Тады ўжо не да тостаў вам будзе...»

Аблаяўшы такім чынам палітыкаў і адчуваючы сябе чалавекам дальнабачным, Бацька пачаў больш разглядаць фатаграфіі і чытаць аб'явы.

Вось стаяць у Белградзе румынскі пераемнік трона Міхай — госць маладога караля Югаславіі Пётры II. Румын то ўжо бярэцца пад дзецюка, больш важны, а гэты Пётра II зусім яшчэ хлапчук гадоў дванаццаці. Глядзіць так весела. Чубчык тырчыць з-пад берэціка, дробненькі жвавы твар. Ззаду стаіць паліцыя, чэсць аддаюць. Далі б лепш

дзецям футбол паганяць, яны б з радасцю наладзілі каралеўскі матч Румынія — Югаславія, а іх мучаць нейкай няволяй афіцыйнай.

Бацька ўспомніў, што калі было яму столькі год, як гэтаму зграбненькаму каралю Пётру II, то ён меў вялікае разгарненне на волі, пасучы кароў на сваіх славутых родных лугах Азярышча, Маргі, Французы, і пашкадаваў караля: сапраўдным каралём ён стаць не паспее — вайна пачнецца.

Разважанні пра палітыку былі ўмомант спынены, як толькі Бацька прачытаў кароценькае паведамленне: «Паставы. Укралі каня на вуліцы са збруяй і санямі на шкоду Міхалу Рыхліцкаму. Украў Уладыслаў Лешчык, якога хутка і злавілі ля пошты».

Гэта было ўжо роднае і знаёмае, куды больш зразумелае, чым усялякія тонкасці. «Ага, папаўся Лешчык,— падлыгнуў Бацька, мяркуючы, колькі могуць даць Лешчыку па польскіх законах.— Так табе і трэба, не крадзі. А разумнейшы б быў, то не ўцякаў бы па цэнтры, ля пошты».

З думкамі пра Лешчыка знайшлося нарэшце і галоўнае. У строгай старажытнай зале Бацька ледзь не войкнуў. Так і ёсць — велікодны нумар газеты — нядзеля, дваццаць першага красавіка 1935 года. Якая пампезнасць стылю, які тон: «Узрадуйцеся ж, браты мае...»

Зміцер Апанасавіч таропка выпісаў тое, што яму і трэба было. Баючыся завязнуць у нетрах далёкіх падзей, якія палохалі яго напружанасцю, і рады свайму адкрыццю, ён паспешна здаў старыя газеты маладой, строгай бібліятэкарцы.

Узбадзёраны Бацька хацеў запрасіць бібліятэкарку на полудзень, ну хаця б на кубачак кавы, але не асмеліўся.



У майскім садзе на Серабранцы:
Рыгор Семашкевіч з дачкой Данай, 1971 г.

Янка Брыль, Анатоль Вялюгін, Рыгор Семашкевіч,
Маладзечна, 1961 г.



Вячаслаў Чамярыцкі, Рыгор Барадулін, Рыгор Семашкевіч,
Маладзечна, 1961 г.



Аднакурснікі: *(знізу)* Казімір Камейша, Сяргей Судніковіч, Эдуард Зубрыцкі; *(зверху)* Уладзімір Пацэнка, Рыгор Семашкевіч, Уладзімір Навумовіч, БДУ імя У. І. Леніна, 1963 г.



Нарада маладых у Каралішчавічах. Валянцін Мысклівец, Мікола Федзюковіч, Рыгор Семашкевіч, 1964 г.



На з'ездзе пісьменнікаў: Рыгор Семашкевіч, Алег Лойка, Яўгенія Янішчыц, Юрка Голуб, 1971 г.





Сябры: Рыгор Семашкевіч і Юрка Голуб, 1969 г.

У студэнцкай сям'і, інтэрнат БДУ імя У. І. Леніна, 1974 г.



Рыгор Семашкевіч чытае вершы марской пяхоце, Далёкі Усход, 1972 г.



На літаратурным вечары ў Карэліцкай раённай бібліятэцы: Мікола Маляўка, Казімір Камейша, Рыгор Семашкевіч, Аляксей Карпюк, Юрка Голуб, 1977 г.



У Ярэмічах над Нёмнам: Казімір Камейша, Аляксей Карпюк, Юрка Голуб, Мікола Маляўка, Рыгор Семашкевіч, 1977 г.



Кафедра беларускай мовы і літаратуры БДУ імя У. І. Леніна ў гасцях у салігорскіх шахцёраў; Рыгор Семашкевіч сядзіць уверсе, 1980 г.



Рыгор Семашкевіч, 1981 г.



Магчыма, што пасля кавы яна пісала б яму пісьмы, якія пачыналіся словамі: «Дарагі Міця...» (Бацька думаў чамусьці, што бібліятэкарка можа пачаць толькі так.)

Частыя пісьмы з жаночым почыркам на імя Бацькі далі б здзіву Толю і Сашу. Яны старасць яму гвалтоўна прыпісалі, Бацькам назвалі, а ён бы даказаў, што не такі і стары, яму таксама дзяўчаты пішуць, як і ім. Зміцер Апанасавіч не браў бы сваіх пісем з агульнай паштовай скрынкі да позняга вечара, каб і Толя з Сашам убачылі іх...

Суцешымся разам са Зміцерам Апанасавічам тым, што дае нам жыццё. Хіба мог быць другі чалавек на галоўнай вуліцы сонечнай Вільні шчаслівейшы за яго, хто так лёгка і проста адшукаў вытокі сваіх жыццёвых слядоў?

Цяпер Бацька ішоў да якой-небудзь сталоўкі і па дарозе настойліва думаў: «Згарыць гарам усё ліхое, я цяпер цвёрда ведаю, што нарадзіўся ў сераду, семнаццатага красавіка 1935 года...»

Новае, неспазнанае дагэтуль адчуванне трываласці грунту пад нагамі наплыло на Бацьку, і ён ажно абцасам ударыў па тратуары, каб упэўніцца, што сапраўды існуе.

Позірк праясніўся, і больш рэзка вылучыліся контуры аблокаў, дамоў, машын. Было такое адчуванне новага бачання, як і некалі ў дзяцінстве. калі першы раз глянуў на свет праз святочна-зялёнае шкельца.

І раптам успышка прароцтва тут, у старажытным горадзе.

Стала лёгка-лёгка, як пасля навальніцы, калі ўзнікаюць новыя далягляды.

Узбадзёраны Бацька зайшоў у кафэ. Белыя хвалістыя шаўковыя шторы, лёгкі трапічны пах

кавы, акуратны звон пасуды, драўляныя бар'ерчыкі, а на іх зеляніна, і яшчэ бесклапотныя людзі,— усё прыемна заспакойвала Бацьку, пакуль ён чакаў свайго заказу, седзячы побач з маладзенькімі смехатухамі-дзяўчатамі. Асабліва здзіўляў Бацьку невялічкі фантанчык. Проста сярод залы, у басейне чорнага граніту, невысока струменіла вада. Ля краёў басейна застылі, як доўгія агеньчыкі, чырвоныя рыбкі.

З другой залы загучала шчымлівая музыка. Бацька ў думках адзначыў, што гучыць хутчэй за ўсё Шуберт, а тут яшчэ так спакойна булькоча збоку вада. Бацька сам адчуў, што ён соладка адпачывае, як накасіўшыся на сваім родным балоце і прысеўшы дзе пад кустом, у цянёчку, а побач бруіцца крынічка і шчабечуць дзве яго родныя сястры, такія ж маладыя і вясёлыя некалі, як цяпер дзяўчаткі побач за сталом.

Афіцыянтка прынесла стравы. Суп удаўся смачны, ды і налілі Зміцеру Апанасавічу, як роднаму брату.

Ад гарачага ды яшчэ ад чарачкі, што ён узяў за знаёмства з горадам, Бацьку размарыла, ён асалавела глядзеў кругом, і калі і хацелася што рабіць, то толькі прыемнае і добрае. Есці шніцэль з рысам ахвоты ўжо не было.

Як загучала музыка, залатыя рыбкі ў фантане заварушыліся. Яны грацыёзна плавалі, найбольш парамі, і здавалася, што яны танцуюць, прыгожа выгінаючыся. То быў чароўны танец доўгіх чырвоных агеньчыкаў у чорным граніце басейна, танец, якім кіравала гармонія прыроды, рух музыкі. Рыбы наогул вельмі чуйныя да гукаў, а да музыкі тым больш.

«Разгуляліся,— думаў Бацька, гледзячы на

ваду.— Жвавыя. Відаць, есці захацелі, бо стаялі ж цішком».

Бацька набраў лыжку рысу аж з коптарам, павярнуўся бокам на крэсле і, не ўстаючы, а толькі падаўшыся ўперад, сыпануў. Зярняткі дробна забулькалі ў неглыбокай вадзе, а на паверхні вясёлкава зайгралі, расплываючыся, тонкія палоскі тлушчу.

У кафэ на хвіліну стала ціха, як у вуху. Толькі некаторыя пальцамі паказвалі на Бацькаву спіну.

Бацьку было ўсё роўна. Гледзячы на рухавае гулянне рыбак, ён незалюбіў гэтыя гулі. Рыбкі стройна плавалі, высвечвалі чырвонымі плаўнікамі і абміналі пачастунак. Яму крыўдна зрабілася: «Паненкі надта, залатыя арыстакраткі. Рачная рыбка і рада была б ухапіць якую бубачку. Мусіць, не таго заводу».

Потым ціхае кафэ ўздрыгнула і скаланулася, ажно фіранкі на вокнах ходарам захадзілі. Адны — несвядомыя і маладыя — рагаталі дружным рогатам, абдымаліся. Наляцелі работнікі кафэ ў белых халатах, прыскочылі швейцары з пазументамі. Узнікла столькі немеладычных рэзкіх гукаў, што спужаныя рыбкі насіліся, як бы ўжо ў нейкім шэйку, і здавалася, што ў фантане варварыцца.

Кола людзей ля фантана і ўспружыненага Бацькі звужалася, але не так ужо і цесна было, бо многія пабойваліся. Маладзенькая афіцыянтка спалохана закрычала найгаласней:

— Kaip jis taip gali? Jis matyt išprotejo, suriškite jes! [1].

---

[1] — Як ён можа такое? Ён, відаць, вар'ят, вяжыце яго! (літоўск.)

Расхваляваны Бацька, тупаючы ля самага бережка, з радаснай злосцю крыкнуў праз фантан да тонкай і бялявай, падобнай на льдзінку Балтыкі, афіцыянткі:

— Па-літоўску nesuprantu [1].

Дзябёлая буфетчыца ў белай накрухмаленай наколцы, як бура, выходзіла з енкам з-за стойкі:

— Які нягоднік! Што ён нарабіў! Я ўсё бачыла!

Адступаючы ад яе задам вакол фантана, Бацька яшчэ радасней гыкнуў, падскочыўшы:

— Nesuprantu!

— Ён яшчэ ідыётам прыкідваецца! Ну і хам!

— А вось і ўсё роўна nesuprantu, захачу і nesuprantu,— настойваў Бацька, радасна паводзячы плячмі.

— Зразумееш! Навучаць у міліцыі! — рыўком хапянула буфетчыца яго за каўнер і павалакла Бацьку на радасць цікаўным.

Кафэ тэрмінова зачынілі, напісалі аб'яву, што ў сувязі са стыхійнай бядой.

Бацьку ў міліцыю не павялі, але ачысціць фантан ён мусіў. Перш за ўсё вылавіць рыб, каб ім не зашкодзіў багаты пачастунак.

За Бацькам наглядаў швейцар. Жанчыны з залы выскачылі, бо Бацька ўжо разуваўся.

Спачатку ён ніяк не асмельваўся, усунуў адну нагу, паспрабаваў другой і тады толькі, зажмурыўшыся, стаў як статуя. Валасатага Бацьку ў белай майцы і шырокіх сініх трусах да каленяў, якраз, як у футбалістаў трыццатых гадоў, калаціла не ад халоднай вады. Колкая жарства і ракавінкі ўпіваліся ў ногі. Рэзкасць зялёных

[1] — Не разумею (літоўск.).

палосак неонавага святла, што падсвечвала знізу басейн, сама нязвычнасць адчування падганялі яго.

Плюх-плюх-плюх у фантанчыку! І не разгонішся надта, цясней, чым у адной вечнай лужыне на вуліцы іхняй вёскі. Сагнуўшыся, Бацька зацята бегаў у фантане, рукі яго раз-пораз сціскаліся ў кулакі, вось-вось зараз, здаецца,— хоп, і твая рыбка, але дзе там! Ашалелыя, рыбкі насіліся, як вогненныя кулі, падскоквалі над вадой, здавалася, што ўжо яны пішчаць.

Важны і дужы швейцар, увесь у залатых галунах, з пасівелай серабрыстай галавой, стаяў збоку і з садысцкім спакоем назіраў. Толькі калі ўвесь змакрэлы, спацелы Бацька спыніўся аддыхацца, ён нешта доўга думаў і паспачуваў:

— Нічога, перажывеш.

— Го-го! Плыты некалі па рэках з дзядзькам ганяў,— гледзячы на ваду, чамусьці ўспомніў Зміцер Апанасавіч.

Рыба не давалася, хаця некалі ў сваёй рачулцы Бацька добра лавіў уюноў на відэлец. Але ж залатых рыбак не ўпораш. Каб яшчэ каменні ў басейне добрыя былі, то рыбы ў іх маглі б зашыцца, лягчэй цопнуць, а то тут адно смецце ад ракавін.

Швейцар нарэшце адпусціўся і палагаднеў:

— Нашто яны цябе мучаць? Давай лепей... ваду трэба спусціць.

Пад камандай швейцара праз дзесяць хвілін усё было ў парадку. Бацька абуваўся, калоцячыся ад холаду і перажыванняў. Швейцар зусім дабрадушным стаў, суровы твар памякчэў:

— Адкуль ты прыехаў?

Бацьку гэтае пытанне здалося падазроным: ці не вывіжоўвае чаго чалавек? Таму ён скорагавор-

кай выпаліў адразу так, што прагучала дзіўная назва, нешта як скорагаворка: «Гыр-мы-мы».

Швейцар не збянтэжыўся ані трохі:

— Прыгожы горад, я там быў, шырокі такі.

— І ваш прыгожы.

— Прыгожы, старынны. Ты як, змёрз?

— Ды трохі трасе,— скалануўся Бацька.

— Ладна, пойдзем сагрэемся, буфет жа на месцы.

Зайшлі за тую стойку, адкуль так нядаўна на Бацьку ляцела белая, як завіруха, буфетчыца. Тут стаяў складаны водар дарагога заморскага і айчыннага пітва, алмазна-колка blішчалі ў розныя калёры дзівосныя бутэлькі.

— Пакаштуй нашага яблычнага кальвадосу,— гаспадарна наліваў дзіўны швейцар.

Выпілі. Бацьку пайшло, як сваё.

Швейцар зусім раздобрыўся і наліў яшчэ.

— А дзе ты працуеш?

— Дзяцей вучу.

— Гэта добра. Век жыві — век вучыся. А я вось мала вучаны, то мушу тут за парадкам глядзець.

— Яно так, як хто да чаго налажыўся.

— Але. Ты не думай благога, я гэтых рыбаў сам ненавіджу, мне іх даглядаць трэба. Але фантан зрабілі, і кліенты вельмі капрызныя.

— Га́ды.

Разгаварыўшыся, як найлепшыя сябры, дайшлі да таго, што кожны навучыць адзін аднаго якой-небудзь вясёлай песні сваіх краёў. Бацька ўспомніў самую тую, што часта спявала бойкая суседка, якая мела вясёлую славу.

Так іх і засталі з песнямі. Абапёршыся на стойку і ўважліва гледзячы адзін аднаму ў вочы, яны, расчырванелыя, засяроджана выводзілі ў

адзін тон; праўда, голас Бацькі гучаў больш выразна і ўпэўнена. Яны спявалі:

> А дзе ж дзеўся Міхалюк Еўчын?
> А ён мяне ж усю ноч мэнчыў...

Да гэтага часу Бацька авалодаў ужо не менш вясёлай песняй з загадкавымі словамі: «Gieriu, gieriu...» [1]

«Якія харошыя тут людзі! — думаў Бацька, калі яго выправоджвалі з кафэ і здымалі з дзвярэй таблічку аб загуляўшай стыхіі.— Шкада толькі — мала паспявалі».

У лёгкай гойданцы скорага поезда, добра падрамаўшы з паўдарогі, Бацька з млявай задаволенасцю падрахоўваў вынікі свайго падарожжа.

Па-першае, добра, што горад хоць трохі паглядзеў. Некалі можна будзе і пахваліцца як бы між іншым. А самае галоўнае — схадзіў у бібліятэку. Цяпер ён не нейкі бяздомны пасынак прыроды, а мае такія ж правы на дакладную дату нараджэння, як і ўсе.

Дзіўна бывае! Хоць і ехаў Бацька ў Вільню з магільнымі думкамі, але пра смерць і не ўспаміналася цяпер.

Якая і гаворка можа быць пра смерць, калі ведаеш столькі, нават і палітыкам можаш управіць мазгі, як было сёння ў бібліятэцы.

Не, тое адчуванне трываласці грунту, якое раптоўна і ўпершыню свядома прыйшло да Бацькі на галоўнай вуліцы Вільні, з'явілася нездарма.

Бацьку, які глядзеў у вечаровую, па-вясноваму мяккую цемень за акном і лавіў агеньчыкі ся-

[1] П'яны я, п'яны... (літоўск.)

дзібаў, лезла ў голаў нешта філасофскае: «Як шмат людзей жыве на свеце... І хто дзе — адны ў Літве, другія ў Беларусі і далей, і далей. А як пашыраў свет для чалавека і за такі кароткі час! Маці плакала, як я ад'язджаў вучыцца ў вялікі горад, у такую даль, бо сама ў мясцовым гарадку разы тры ўсяго была. А я ўжо магу і за бацькоў дабрацца. Не так і дарогамі, як навукай. Вось прабіўся ж у тую цемру, пагартаў газеты вяльможных, якія яны ў свой час для сябе і друкавалі».

Сыходзячы на перон свайго горада, Бацька ўжо зусім весела муркатаў: «Gieriu, gieriu...»

Пасля віленскага дня і двух дзён лежні ў інтэрнаце трохдзённая камандзіроўка ў навуку скончылася. Зміцер Апанасавіч акуратна хадзіў на факультэт і кожнаму сустрэчнаму, акрамя студэнтаў і вахцёра, даводзіў пра сваю заклапочанасць: «Спраў шмат, столькі матэрыялу неапрацаванага ляжыць, раскапацца цяжка, толькі што з навуковай камандзіроўкі». Не забываўся і пра кнігі сказаць: «Шмат літаратуры мовазнаўчай з Вільні прывёз, часу трэба, каб усё перачытаць». Бацька гаварыў так заўзята, што аж сам сабе пачынаў верыць.

Цвыркуну Зміцер Апанасавіч зрабіў персанальную справаздачу, якую той слухаў пятае праз дзесятае. А вывад Цвыркун зрабіў глыбокі: «Вось бачыш, ты як хочаш, то і можаш. Па навуковай лініі ты ўжо і вызначыўся трохі».

Далей Цвыркун загаварыў ласкавей: «Трэба праявіць сябе і ў іншым плане».

Тут Цвыркун па-сяброўску, таямніча нахіліўся да самага вуха Зміцера Апанасавіча і шапнуў: «Памажы мне выявіць, хто са студэнтаў піша

на мяне брыдотныя вершыкі. З тым-сім пагаворы далікатней, павышаную стыпендыю паабяцай, ну, ведаеш, як лепей падысці».

Цвыркун паказаў адзін з пацёртых спіскаў паэмы, што падкінуў нехта ў кабінет, і параіў прыгледзецца на почырк.

— Гэта па маёй часці,— паабяцаў Бацька.

Вечарамі Зміцер Апанасавіч углядаўся ў пакамечаныя паперкі і радаваўся: ну і распісалі, жэўжыкі, Цвыркуна. Рыхтык ён! Так яму і трэба!

Бацька завучыў на памяць ананімны шэдэўр. Надта спадабалася яму крытыка пафасных выступленняў Цвыркуна. Яна канчалася такім прызнаннем героя: «Мне ногі крыгай паламала, а я іду, а я іду!»

Устанавіць аўтара твора найлепей было, як думаў Бацька, навукова-педагагічным спосабам, а не Цвыркуновай прамалінейшчынай.

На адным з пасяджэнняў метадычнай камісіі Зміцер Апанасавіч на ўсенароднае здзіўленне грымнуў цэлую прамову, дзе казаў і такое:

«Нас самым сур'ёзным чынам павінен занепакоіць узровень пісьменнасці студэнтаў. У самы бліжэйшы час мы павінны правесці на ўсіх курсах дыктоўкі, сачыненні, каб выявіць узровень пісьменнасці. На першым курсе можна і не спяшацца, мы ў іх не так даўно ўступныя прымалі. Я магу сам праверыць, каб было адно цэласнае ўражанне».

Усе здзівіліся самаахвярнасці Зміцера Апанасавіча: як-ніяк чалавек наважыўся праверыць звыш чатырохсот работ. Здзівіліся — і з радасцю саступілі яму месца.

Наконт пісьменнасці студэнтаў Бацька гава-

рыў чыстую праўду, але не яна задала турботаў — Зміцеру Апанасавічу патрэбны былі почыркі, усе почыркі факультэта, каб знайсці адзін, што пасягнуў на прэстыж Цвыркуна хлёсткімі вершамі. Першакурснікаў Бацька адхіліў нездарма — гэтыя цяляты яшчэ не даўмеюцца.

На факультэце пачаліся сачыненні-ізлажэнні. Зашумела папера фантазіямі на тэмы: «Мой жыццёвы ідэал», «Люблю наш край, старонку гэту», «Юнацтва неспакойнае маё», «Шумяць вербы ўздоўж грэблі». Студэнты, праклінаючы нечуваную апеку, пісалі.

Бацька тым часам купіў вялікую лупу і паказаў яе Цвыркуну:

— Бачыш, гэта для дэталёвай праверкі работ.

— Маладзец, Змітрок,— пахваліў Цвыркун, які дзе-нідзе пачынаў ужо ставіць яго ў прыклад як ініцыятыўнага таварыша.

Зміцер Апанасавіч з нецярплівасцю чакаў афіцыйнага пацвярджэння перамен. Па праўдзе сказаць, лупу ён купіў зусім для іншай мэты: кожную вясну Бацька высейваў у маленькіх скрынках, якія стаялі на падаконніку, насенне розных кветак. Праз лупу лягчэй было высветліць, як яны ўзыходзяць.

Чаканы дзень настаў нешта праз месяц пасля таго, як Бацька сказаў Цвыркуну, што сто работ ён ужо праверыў і пэўныя падазрэнні ў яго ёсць. Для большай важнасці ён нават папярэдзіў: падазрэнні грунтуюцца на супастаўленні стылю верша і стылю работ і па ўсім відаць, што паэма — твор калектыўны. «Буду працягваць пошукі»,— запэўніў Бацька, які і не думаў правяраць работ, а сам сабе адзначыў у думках: «Любіш ты, Цвыркун, з чужога скарыстаць».

У той дзень Саша пайшоў на сход аспірантаў факультэта. У аспіранцкім гурце можна было развесяліцца. Што не абыдзецца без спрэчак, Саша падазраваў і да сходу: вельмі ж ужо гарачае было пытанне. Чалавек дваццаць аспірантаў сабраліся абмеркаваць праспект зборніка маладых вучоных, з якога строіў кепікі Толя.

Сыры лес затлеўся з-за кардынальнай праблемы: як размяшчаць артыкулы — ці па алфавітнай паслядоўнасці прозвішчаў, ці па значнасці пастаўленых праблем.

— Вядома, па алфавіту,— упэўнена сказаў Фанатык, прозвішча якога пачатковай літарай цягнула на першае месца.— Гэтага патрабуе навуковая этыка.

Ажно пасінеў і напяўся ад злосці адзін настырны аспірант, які распрацоўваў маштабную тэму: «Агульначалавечае і ўласнанацыянальнае ў іх гарманічнай суадносіне ў сучаснай літаратуры».

— Ты што, думаеш са сваімі няшчаснымі дыялектамі наперад прабіцца? Нейкія ёўні-доўбні, сечкі-грэчкі. Наперадзе патрэбен размах.

— Надта ж ты размахнуўся, як ухапіць. Генералісімус.

— А чым ты розніпся ад вясковай бабы? Баба бульбу перабірае, а ты — свае картачкі.

— А-е-я-ей! — абурыўся Фанатык.— Я хоць ад жывога чалавека пачую людскае слова ды запішу сабе, а ты ж дысертацыю смокчаш з пяці левых пальцаў, а правымі запісваеш.

— Таварышы! Давайце пабудуем зборнік сістэмна, каб адзін артыкул нейкім чынам дапаўняў другі ці хаця б кантраснасці не было,— сур'ёзна і пераканаўча сказала Іна Валынец.

— Правільна, правільна! — падтрымалі яе другія.

— Цяжка будзе зрабіць, бо мы ўсе — індывідуальнасці,— пачуўся нечы голас.

«Сашка,— горача шапнуў Толя,— пойдзем ад індывідуальнасцей да калектыву».

Саша з Толем ушмыгнулі ў актавую залу ўпару — Цвыркун пачынаў прамову. Ён устаў з-за шырокага стала, падобнага на памост, накрыты пурпуровым плюшам, упрыгожаны кветкамі, і радасным голасам аб'явіў насцярожанай зале:

— А зараз, таварышы, справаздачу аб сваёй навучальнай і навуковай рабоце зробіць вядомы ўсім нам Зміцер Апанасавіч.

Бацька павольна і ўрачыста падышоў да трыбуны і, стаўшы збоку, паклаў на яе руку. Ён загаварыў напружаным голасам.

— Таварышы! Апошні месяц праходзіў у мяне пад знакам даволі вялікай і складанай працы. Акрамя правядзення абавязковых аўдыторных гадзін прыйшлося і прыйдзецца яшчэ шмат папрацаваць над высвятленнем узроўню пісьменнасці нашых студэнтаў.

Што да навуковай работы — тут таксама ёсць некаторыя зрухі. Я ездзіў у сталіцу братняй Літвы — у Вільнюс, дзе прачытаў некалькі дысертацый, аўтарэфератаў, тэма якіх сумежная альбо блізкая да маёй тэмы. Дарэчы, там, у Вільнюсе, я даведаўся тое, што і нам не зашкодзіць ведаць і нават зацікавіцца. У нашай рэспубліцы, на самай граніцы з Літвой, знаходзіцца літоўскі этнічны астравок. Жыхары яго добра ведаюць і беларускую мову, расказваюць казкі, легенды, спяваюць народныя песні. Акалічныя ж беларусы разумеюць літоўскую мову, людзі пажылыя і

сярэдняга веку добра гаворацць па-польску, а маладзейшае пакаленне — па-руску...

— Паліглоты нейкія там,— не вытрымаў Толя.

На яго сыкнулі з усіх бакоў, Цвыркун выцягнуў шыю.

— Я гавару гэта для прыкладу,— працягваў прамову Бацька,— з-за таго, што пры жаданні кожнаму з нас працы можа хапіць. Скажу вось такое: я пазнаёміўся з вуснапаэтычнай творчасцю літоўцаў і прыйшоў да вываду, што ў нас шмат агульнага — нават у тэматыцы песень, у іх мелодыцы. Асабліва блізкая да нашых багаццем стылёвых і сэнсавых адценняў, сакавітай лексікай песня «Gieriu, gieriu...».

Пра тое, што яна найбольш блізкая да Міхалюка Еўчынага, Бацька змоўчаў, але як толькі сказаў два словы па-літоўску, у публікі і дух заняло: якая эрудыцыя, якая тонкасць пранікнення!

Усім стала ясна, што з Бацькі досыць.

Урачысты, ён сеў на сваё месца.

Апошнюю казань казаў Цвыркун.

— Усе, хто сядзіць тут, ведаюць, што мы часам крытыкуем адзін аднаго для агульнай карысці справы. Але ў нас крытыка мае і каштоўныя якасці. Крытыкай можна забіць чалавека, а можна і дапамагчы яму. На нашым факультэце крытыка толькі таварыская. Нядаўна мы ўказвалі нашаму Зміцеру Апанасавічу на некаторыя недахопы. І што ж — прайшло зусім мала часу і чалавек у нас на вачах пайшоў угору.— Тут Цвыркун рукой нават паказаў, як шпарка і ў якія горы пайшоў Бацька.— Ён і ініцыятар цікавага пачынання за пісьменнасць на факультэце, і па навуковай лініі нямала ў апошні час

зрабіў. Карацей кажучы, у асобе Зміцера Апанасавіча мы маем перспектыўнага таварыша.

Шчаслівы Бацька адчуў лёгкае кружэнне галавы, як бы стаўшы раптам на вяршыню вялікай гары.

Дробязнымі і мітуслівымі здаліся ўсе ранейшыя перажыванні і асабліва пошукі біяграфічных рэалій.

Чалавек, ахмелены шчасцем справядлівасці, можа быць праніклівым. У сваім пакоі, на адзіноце, выправіўшы Лукаша ў магазін, Бацька раптам відушча ўспомніў той святочны нумар збуцвелай газеты, які ён асабліва доўга вывучаў, даходзячы пачатку летапісу свайго жыцця. Успомніў — і тонкі халадок падазронасці пракраўся ў свядомасць. Яшчэ і тады, у бібліятэцы, яго неяк несвядома занепакоіў нязвычны для яго выгляд намаляванага крыжа, у якім як бы нечага не хапала. Тады ён не звярнуў увагі, а цяпер успомніў: «Ага, а ў загалоўку было напісана па-польску: «Вясёлых святаў!», а ўнізе ішло велікоднае пасланне папы да ўсіх католікаў».

Па спіне запоўзалі мурашкі, Зміцер Апанасавіч даходзіў, што адкрыццё аказалася пустым — яго ж бацькі былі праваслаўнай веры, а там пісалася да католікаў. А такія святы не адным часам ідуць.

Зміцер Апанасавіч ужо даўно не ўспамінаў, яму не абыходзіла, што ёсць нейкая розніца ў веравызнаннях, тым больш не мог ён у вандроўніцкім запале падумаць пра гэта ў бібліятэцы ў Вільні.

Цяпер і верылася, і не хацелася верыць у свой промах. «Але, урэшце,— даводзіў ён сам сабе,— не слаў жа папа пасланне праваслаўным, у яго свая парафія была, што канём не аб'едзеш».

Чамусьці ўявіўся папа, стары дзядок на худым дабітым кані, ён едзе ў залатых рызах па пыльнай дарозе ад вёскі да вёскі і раздае свае пасланні. Пыл асядае ў карунках яго строяў, сляпні ядуць каня, а ён едзе і едзе, і не відаць канца яго дарозе.

Цемрашалы праклятыя! Шалелі б ужо разам у сваёй цемры, а то яшчэ нейкую асобнасць знайшлі. Маглі б і адной веры быць, невялікая розніца. Так яны там і верылі, народ трэба было трымаць у паслушэнстве і невуцтве. Феадалы... Зблыталі карты, што і цяпер не разбярэшся.

Але тут жа Бацька і сам сабе пярэчыў: «Калі і цяпер ёсць розныя землі і народы, то чаму ж некалі не магло быць большай рознасці між імі? Зусім магчыма».

Урэшце ён махнуў рукой на гэта ўсё, як бы сцвярджаючы, што ўсё яно глупства. Рамкі жыцця для яго цяпер не такая ўжо і важнасць, бо, сцвердзіўшыся сёння на факультэце, паміраць ён яшчэ не збіраецца.

## IV

Сашу выклікалі да дэкана. «Цікава, калі я там быў апошні раз? — думалася Сашу на сходках.— Недзе на курсе трэцім. Выклікалі ўсю групу, нас лаялі за пропускі заняткаў. Чатыры гады прайшло. Цяпер і дэкан другі, а значыць, і ў кабінеце ўсё па-інакшаму». Захацеўшы, Саша мог глянуць у кабінет і раней, трапіць туды даволі проста, але гасцей з усіх валасцей там штодзень і так поўна.

І перамен ніякіх угледзець не паспелася. Саша адчыніў дзверы — і ўмлеў. Пасярэдзіне кабінета, проста перад сталом дэкана, стаяў на руках

галавой уніз Фанатык. Ногі яго былі выструнены ўгору, а твар наліваўся чырванню. Дэкан, відаць, быў перапуджаны, бо адышоў ажно ў кут.

Фанатыкавы вочы хоць і глядзелі знізу ўгору, вылазячы на лоб, усё ж улавілі разгубленасць Сашы. Ногі апісалі дугу і, прыўскокнуўшы, ён стаў на ногі, а радасць свяцілася ў вачах.

Саша ў першую хвіліну толькі адно падумаў і чамусьці з радасцю: «Не ў аднаго мяне ногі крываватыя, вунь і ў Фанатыка, як палазы».

Фанатык без ніякага спачыну, усміхнуўшыся, таропка загаварыў, задаволены сабою:

— Вось і такі нумар быў. Ілюструю асабіста для вас, Іван Аляксеевіч. Усе рабочыя былі проста ў захапленні. Казалі: «Ну і малайцы філолагі!» Расце слава нашага факультэта. І дзяўчаты спявалі хораша. Як кіраўніку агітбрыгады, мне прыемна далажыць, што шэфства ў нас разгортваецца. Грамадская работа забірае ў мяне, вядома, шмат часу і энергіі, але для людзей нічога не пашкадую. Ледзь не забыўся — асабліва вось такі нумар спадабаўся.

Фанатык адбег ад дзвярэй, бухнуў тры крокі разгону і, спружыніўшыся ўсім целам, высока падскочыў, мільгануўшы ў сальта-мартале. Гэты складаны гімнастычны нумар, пры якім цела перакульваецца праз галаву, Фанатык выканаў нядрэнна. У Сашы аж уваччу замігцела. Але фінал быў няўдалым — Фанатык прызямліўся пятамі, абцасы не ўтрымалі, слізганулі па паркеце, і ён цяжка бухнуўся задам на падлогу. Падлога гула, пакуль ён няўклюдна ўставаў.

«Некалі кілім тоўсты ляжаў на падлозе, вось і дрэнна, што знялі,— думаў Саша.— Фанатыку мякчэй было б».

— Перастаньце,— ачуняўшы ад перапуду,

уладна загадаў дэкан.— Што тут за камедыя? Хто вас клікаў сюды? Ідзіце і раскажыце пра вашыя поспехі адказным за культурна-масавую работу на факультэце. А то...— Тут дэкан вяла махнуў рукой, не стаў гаварыць далей, толькі выгукнуў з дакорам: — Эх, вы!

Ён хацеў сказаць, што ведае такіх разумных — праз два месяцы размеркаванне, то пачаліся ўжо канвульсіі. Але ўвесь дакор змясціўся ў кароткіх словах: «Эх, вы!»

— Эх, ты,— рэхам паўтарыў Саша.

Фанатык ашчэрыўся злосна:

— Ну, сам нічога не робіш па грамадскай лініі, а другім зайздросціш.

Фанатык памкнуўся было да Сашы, але яго спыніў дэкан:

— Разыдзіцеся вы! Што сёння за такі пракляты дзень?

Фанатык знік.

— Вось што, аспірант,— зняможаны дэкан гаварыў, седзячы ў крэсле,— заданне даю. У суботу ў нас будзе вечар сустрэчы з выпускнікамі. Апошнія гады чамусьці мала збіраецца народу, выступіць няма каму ад выпускнікоў. Едзьце вось у гэты раён,— дэкан паказаў на карце недалёкую мясціну,— там нашых ёсць шмат, аселі стала. У Ліцянскай школе, напрыклад, працуе завучам Клім Крайскі, добры студэнт быў. Прывязіце яго ці каго другога.

— Я ведаю Кліма, жылі ў адным пакоі, ды і нядаўна бачыў — ён па нейкія глобусы прыязджаў.

— Тым лепш. Едзь.

«Грамадскі дзеяч... На руках стаў...— лаяўся ў думках Саша.— Ведаю іх, дзеячаў гэткіх. Пра

так звануюграмадскую актыўнасць і працу, якую многія хочуць ператварыць у бессаромную балбатню, крычаць наймацней дылетанты. Цытатамі чужымі век прыкрываюцца. На грош зробіць — на сто накрычыць, але крычыць — глядзіце, якія мы працаўнікі. Вунь бедныя настаўнікі як вырваліся адсюль, то мала хто хоча прыязджаць на сустрэчы і расказваць пра свае подзвігі. Людзі сціплыя. Сядзеў бы ты лепш, Фанатык, са сваёй фантазіяй у сваім раёне, урокі даваў паказальныя, партрэт раёнка дала б з яскравым подпісам. А то прыпёрся невядома чаго. Дзеці растуць сіротамі. Навуку ён падыме. Нос бульбінай, сам кучаравы. Які гэта сур'ёзны вучоны можа быць кучаравым? У сур'ёзных вучоных валасы рэдкія. Паеду лепш да Кліма, пагляджу, як ён там жыве, вясковы настаўнік. Сам пераканаюся».

У Лісцянае аўтобус дапоўз вечарам. Па дарозе Саша сіліўся ўспомніць, як жылося яму ў студэнцтве з Клімам — дабрадушным хлопцам, які любіў паспаць, добра паесці, але студэнтам быў прыстойным. Не пераносіў, праўда, беспарадку ў пакоі: часта браўся за салдацкую папругу: «На дзевак дык вы самыя-самыя, а падлогу месці хто будзе?»

Усяго Саша не ўпомніў, але для зачэпкі, на першае слова тое-сёе ўсплыло.

Клім гаспадарыў на абжытай некім сядзібе — можна было пазнаць па дагледжанаму садку каля вялікага — на тры акны ўпоперак — драўлянага дома. Ад акуратнага, прыгожа ашаляванага дома з верандай-вітражом дыхнула харошым вясковым спакоем, тым простым жыццём, якім найлепей жыць на свеце.

Клім плёў лапці. У кухні, куды Саша ўваішоў па вясковаму звычаю не пастукаўшы, стаяў здаровы, ледзь гаркаваты водар — у начоўках размочваліся стужкі ліповай кары. На халадзільніку ляжаў недаплецены лапаць з шырокага белага лыка. Некалі такія абувалі толькі ў святы.

Клім ад здзіўлення выпусціў з рук нажыкскладашок, якім злузваў кару.

— Здароў, Беларусь лапцюжная.

— Ну, здарова, балесны. То падрос жа ў аспірантуры. Я тут з лапцямі. Гэтыя дзяды такія нягодныя сталі, ніхто не хоча. Дзяды пенсію палучаюць і фанабэрацца — незалежныя,— гарачыўся схуднелы, па-дзіўнаму рухавы Клім.

Халадзільнік завуркатаў, і лапаць пачаў дробненька падскокваць — яму было нязвычна.

Клім растлумачыў, што лапці патрэбны для школьнага музея баявой і працоўнай славы, а дзяды не хочуць памагчы — распанелі.

— Слухай, ты, бачу я, не надта здарожыўся. Памажы мне бульбы нацягаць са склепа. Сёння я-то дагледзеўся, а назаўтра трэба чыгуны паставіць свайму свінству. Аспіранту карысна будзе, фуфайку дам.

— Клім, ты ж, па-мойму, жанаты.

— Сёння не. Жонка ўпрочкі сышла. Яна так часцяком робіць. Тут цешча блізка жыве — і гэта самае трагічнае.

У склепе Клім расказаў болей:

— Я думаю, што мне трэба было жаніцца з дзяўчынай, якая таксама была студэнткай, паглядзела на свет трошкі болей, чым з бацькавага панадворка відаць. А то яна скончыла дзесяць класаў, пайшла загадваць поштай — і ўсё. Інтэлігенткай вясковай стала на манер дырэктаршы ці

аграноміхі, а фантазіі мала. То яны навыперадкі — хто больш хлам'я ў хату ў сваю ўвалачэ.

Саша заўважыў, якім ён раскірэкам стаў — Клім спрытны, мінута — і кошык поўны, а ў яго рукі, як граблі, гнуцца не хочуць.

— Ты б з ёю выхаваўчую работу правёў.

— Яна неблагі чалавек. Але бывае не ведаеш — ці смяяцца, ці плакаць. Як учора. Прычапілася з раніцы, каб ехаў па нейкую люстру ў раён. Я не паехаў. Бурчала-бурчала, а тут, як на тое ліха, пад вечар сажа ў коміне загарэлася. Ну, жонка і закіпела, як вар. Згары ты, галосіць, гаспадар такі, з гэтым агнём. За сына — і пайшла. А сажа гарэла і гарэла. Я толькі глядзеў, каб агонь па страсе не пайшоў. Так яна ўся і выгарала. І я цэлы, і дом стаіць, толькі яна ўскіпела. А я ёй сказаў услед: «Можа, я і кепскі гаспадар, а ты скупая, і гэта куды горш, ты роднай сястры дзесяткі да стыпендыі ніколі не падашлеш».

Клім задумаўся над поўнымі кошыкамі, а потым спытаўся:

— Ты ў нашым доме жывеш?

— Вядома. Дзе ж знойдзеш лепшы?

— Лепшых не можа быць. Так шкада, што мая жонка там не жыла. Я помню, як і вы, жаўтаротыя, на першы курс прыехалі. Сундукі свае замыкалі, «елі хто сабе», з кулака. А пасля кулак расціснуўся.

Клім гаварыў святую праўду.

Дом пад серабрыстымі таполямі! Калі хто-небудзь складзе гімны ў твой гонар, ён не павінен забыцца пра вызваленне душ ад цемры недаверу, падазронасці, адчужанасці і ўсякага іншага хамства. Ты заўсёды быў самым дэмакратычным

домам. Так шкада, што цябе не хапае многім людзям!

З бульбай асабліва не важдаліся — плюхнулі ля студні па вядру вады на кошыкі і перасыпалі ў чыгуны.

Потым вячэралі, доўга, нетаропка, у Кліма чарка знайшлася. Але да Сашавай просьбы прыехаць на вечар Клім паставіўся вельмі скептычна.

— Што я ім вялікае раскажу, вашым студэнтам? Ты растлумач хоць, якія яны цяпер, студэнты, ці падобныя на нас?

— Непадобныя, Клім. Мне здаецца, што яны ўсё куды лягчэй успрымаюць. На нашым лёсе яшчэ быў водбліск вайны. Мы сур'ёзнейшыя былі. Вось табе простае, што прыкметней — у нас найбольшай бядой было, калі стыпендыі не заробіш добрай вучобай. І мы стараліся, бо што магла нам даць пасляваенная вёска? Цяпер і клопату няма — не даецца стыпендыя, ну і не давайце — маці з бацькам дадуць, а я і на тройках выеду. Парадокс, але нястачы кіруюць на лепшае.

— Я таксама думаў. Але ж не пойдзеш крычаць — назад, да лапцей, тых, што сёння для музея трэба плесці.

— Не пойдзеш. Не так даўно вырваліся з іх. Ёсць такое добрае паняцце: разумнае выкарыстанне дабрабыту.

— Яго вельмі правільна і дарэчы вывеў чалавечы розум. Пра гэта шмат пішуць і талкуюць. Але што вынікае — розум просіць розуму?

— Выходзіць, так.

У сенцах нешта заскрэблася, бразнула клямка, і ў хату ўвайшоў, высвеціўшы поўны роцік шчарбатага смеху, хлапчук гадоў шасці. Сінія вочкі яго гарэлі зухаватым агнём. Нічога не

кажучы, ён ухапіў кавалак хлеба са стала, скрылёк каўбасы і, скінуўшы шапку, пачаў есці. Еў стоячы і разглядваў Сашу.

— Гэта мой уцякач. Дзе ты скачаш?

— Мяне баба выгнала. Сказала, што бацькава насенне я,— пахваліўся малы.

— Што ўжо вытварыў такое?

— Попел выграб з печкі. Качарэжкай на падлогу. Пылу было, як дыму.

— Сеня, ці ж можна так рабіць?

Хлопчык незалюбіў і перавёў на другое:

— Татка, я дамоў хачу.

— Ты ж дома.

— Я хачу, каб з мамкай.

— Ідзі скажы, хай не баіцца, сажа ўжо не гарыць.

Малы панёсся, высалапіўшы язык, за ім выйшаў на пару хвілін і Клім.

Вярнуўся ён з ценем клопату на твары. Стаў пасярод кухні, памкнуўся нешта сказаць, але як бы саромеўся, вусны яго ўздрыгнулі. Перажыванні дабрадушных выглядаюць часам і смешнавата.

— Мо кладзіся спаць, позна,— нарэшце прамовіў ён, а пасля загаварыў чамусьці пра другое.— На вечар я прыеду, выступлю. Цяперашнімі начамі мушу дзяжурыць. Карова ў мяне ацяліцца мае.

Клім сказаў — і як гару з плеч звярнуў. Ён спакойна пабедаваў, што тут яшчэ і жонка ўцякла недарэчы.

Ісці спаць Саша адмовіўся.

Як ішлі ў хлеў глядзець першы раз, дзіўнае адчуванне павяло за сабой Сашу шляхам памяці.

Ён трымаў ліхтар за тонкую драцяную ручку, адзеты быў у Клімаву фуфайку. Стары, з хліпкім дробным дрыгаценнем, ліхтар пагойдваўся.

Забытая рэч мае сілу ўзбуджаць хоць далёкім водгукам колішнія пачуцці, калі яны тады, раней, уражвалі моцна. А ў Сашавых руках быў ліхтар.

Няяркае, мроіўнае святло досыць шырокім кругам высвечвала лапіну вясновага панадворка. На ім, ужо ў адліжным снезе, пачынала чарнець лёгкая выхаджаная сцежка. Амаль так, як шмат год назад, у другіх краях, на Сашавым родным панадворку.

Пад такімі ж вясновымі, халаднаватымі яшчэ зорамі, ішоў хлапчук за клапатлівай маці.

Паваеннымі зімамі салодкая радасць і надзея былі ў частых, як толькі есці садзіліся, матчыных словах: «Скора ўжо, дзеткі, ацеліцца наша Чарнуля, мусім папасціцца пакуль».

Маці давала запалены ліхтар.

Толькі цяпер, ідучы наперадзе Кліма, Саша здагадаўся, чаму тады ён не асмельваўся ісці па сцежцы першым. Палохала сама тайна невядомага — нараджэння. І невядомае мелася быць там, дзе ўсё так вядома — у хляве з патрэсканымі да сарцавін бярвеннямі, дзе стаіць у духў сваёй цеплыні наша карова.

І яшчэ быў на сцежцы жахлівы сорам за свае ўласныя думкі. У свядомасці хлапчука недзе блізкім па сваёй сіле стаяла такое: нараджэнне цяляці і нараджэнне бога.

Ва ўсім былі вінны святло, салома і яслі, а можа, і чаканне.

Калядным вечарам прыходзілі да акна па шызым, у іскрах, снезе калядоўнікі — «не варагі — па хлеб-пірагі».

І ўзыходзіла за марознымі шыбамі хаты ўсёй раскошай сваёй шматколернасці зорка. Сінія, зялёныя, чырвоныя агеньчыкі круціліся зачараваным колам. Грымела незразумелая песня, з якой дзіцячая памяць ухапіла толькі фразу — «в яслях на соломе господа нашли».

Ухапіла — і зайшлася ад жаху. Як гэта грозны, суровы бог, які немаведама дзе, але ўсё бачыць, цікуе за табой, мог быць на саломе ў звычайных яслях, з якіх і наша Чарнуля жуе таксама?

Тады святло ліхтара сярод ночы станавілася не менш урачыстым, чым святло каляднай зоркі за акном. А тут яшчэ і таемны змрок з высокім, урачыстым небам. Ажно сэрца калацілася ад пакут.

Цяпер Саша дзякаваў: «Прывітанне, ліхтар, трывожны і светлы агеньчык, з якім таіўся я за матчынай спіной. Бачыш, я выйшаў наперад, рэалісту нічога не страшна. Хоць міфы ўжо і развеяны, але цяперашняй ноччу дзіцячыя казкі ажылі. І гараць высокія зоры, і свеціш ты. Дзякуй табе».

Тым часам Клім тлумачыў сваё:

— Хлеў у мяне халодны, да часу роблены, ды і падсцілаць няма чым, відаць, прыйдзецца цялятка браць у хату.

Яшчэ і ліхтара не вешалі, як адчулі, што ўсё збудзецца скора: карова мычала.

— Яна маладая, толькі другім целем ідзе,— растлумачыў Клім.

Рабая невялічкая кароўка цяжка дыхала. У вялікіх круглых вачах было пачуццё болю і як бы страху.

Ужо далёка за поўнач усё было ў парадку — бычэчак ляжаў у кутку на сене. Клім узвёў Са-

шу ў ранг хрышчонага бацькі і за чаркай горка прызнаваўся:

— Сказаць па праўдзе, мне карова трэба, як чорту пацеры. Цешча жыве праз тры хаты з сынам-халасцяком. Яна з каровай, мусіць, і на той свет пойдзе, а сама малака ні ў рот. Ці майму малому не знайшлася б шклянка? Хапіла б усім, дый і ў калгасе можна выпісаць. Але ж вясковая натура век перацягне, ну і пачалі ўдваіх з жонкай: «Ды цябе ж вёска пальцамі затыркае. Столькі пашы кругом, а ты ў пралетары». Ну і прывяла мне цялушку ў хлеў.

«Му-у-у»,— працяжна і жаласна заплакаў бычэчак.

— Павер мне, ніколі не думаў, што так дзіўна можа перакруціцца на свеце. Як хлапчуком быў, то, пасучы карову, усю вясковую бібліятэку перачытаў і школьную. А цяпер з-за каровы не маю часу ў кніжку глянуць. Вось так яно сталася.

«Му-у-у»,— заплакаў бычок яшчэ жаласней.

...Вячэрні інстытут ззяў агнямі. Вы любіце сустракацца? Гледзячы калі і з кім? Не бойцеся прыходзіць да сваіх школ, інстытутаў. У іх сценах адгуло, адшумела здаровым вясновым шумам наша самае лепшае — маладосць. Хто аспрэчыць, што тая маладосць, якой вы жылі, тая дарога, па якой ішлі на заняткі, навучылі не меншаму, чым сама вучоба?

І ў інстытута ёсць права адклікаць цябе на хвілінку, паглядзець на цябе і нічога не сказаць. А ты ўжо сам успамінай: о, якімі былі мы перасмешнікамі, саркастычнымі, як лёгка выпашалі ўсе праблемы, як шмат паэтаў было ў нас. Калі мы, гордыя і галодныя, прыязджалі дамоў, нашы

бацькі маліліся на нас — дзіця ж усохла: вучыцца. Ды і мы да галавы не бралі, нават на апошнім курсе, што студэнцтва можа скончыцца.

Цяпер, у асветленай актавай зале, вялізнай як іпадром, студэнты ўсміхаюцца: бач, самастойным стаў! І цябе зусім не грызе пачуццё зайздрасці — у іхняе жыццё ты ўжо не хацеў бы вярнуцца. Сталеем, старэем — занадта адназначнае тлумачэнне. Проста, калі нават нябачны вецер спыніцца, ён ужо стане звычайным паветрам. Што тады казаць пра чалавека?

Няўжо чатыры гады назад і падумаць мог Клім, што будзе гаварыць з трыбуны так дзелавіта і нават пафасна: «Адно — набыць веды ў інстытуце, а другое — стаць добрым педагогам. Вам трэба будзе прайсці яшчэ вялікую школу практыкі, бо да кожнага вучня шукаеш свой падыход».

«Гэта, Клімка, так, але карова ўсё-такі ацялілася»,— думаў Саша.

Прыбраны, салідны Клім не супімаўся: «Вёска дае загартоўку, там толькі пачынаеш разумець усё значэнне вучобы, лекцый нашых выкладчыкаў, бо клопатаў хапае».

«Правільна, Клімок, ацялілася твая кароўка»,— ківаў галавою Саша.

Тут яго ўвага скіравалася на дзіўны факт: Толя, які сядзеў бліжэй да сцэны, нешта ўсё нашэптваў суседцы наперадзе. Саша адчуў — дабром не кончыцца, бо разварушыць такога цюленя, як Толя — няпроста. Раптам, не зважаючы на педагагічныя развлжанні Кліма , яны падняліся — і пайшлі на выхад. Саша пазнаў Соню Квяткоўскую, аднакурсніцу Толі. У Сонечкі-перасмешніцы за паўтара года ўжо выпрацавалася строгая паходка маладой педагагіні. Выхаваўчая паход-

ка — як па нотах. Побач з ёю Толя выглядаў мядзведзем.

«Ну і нягоднік, заместа таго, каб паўспамінаць гуртам, ён індывідуальнічае. Вось чаму ты сам сёння скроб пакой першы раз за ўвесь год»,— дайшоў Саша да вытокаў спрыту цюленя.

Бацька на вечар не пайшоў. Сляды яго аднакурснікаў даўно згубіліся, іх і снягком замяло, а сустракацца са студэнтамі, якіх ён сам вучыў, Бацька не хацеў. Некалі яны атручвалі яму жыццё.

Надта ж маркотна было Бацьку святочнымі вечарамі. Людзі весяляцца, гуляюць, а яму — выйдзеш на вуліцу адзін, ходзіш-ходзіш, як дурны, дый назад прыйдзеш. Хоць Бацька і рашыў пачаць новае жыццё, дух адзіноты і адчаю навальнічнай хмарай вісеў у пакоі, спрутам лез у душу. Бацька не ведаў, дзе дзецца. Наварыў стравы на агульнай кухні; солячы сваю, пасаліў яшчэ раз, са злосці на ўвесь свет, і ў Адэлінай каструлі.

Пад'еўшы, ён запісаў у сшытак звесткі з факультэта:

«Круціцца калаўрот дзён і закруціўся шыбка-шыбка.

Сёння на практычных, калі я адвярнуўся да дошкі, падкінулі на стол запіску: «Эх, Нупрэй, незабыўны Нупрэй, ты хацяб ажаніўся хутчэй». Я трымаўся мужна — не звярнуў увагі. Я раблю ўсё большыя поспехі, удзельнічаю ў розных нарадах. Сёння куратар Іван Крук расказаў на метадычнай камісіі, што ён правёў гутарку аб творчасці мастака Рэрыха. Не адстаючы ад другіх, я таксама зрабіў каштоўную метадычную параду: трэба знаёміць студэнтаў не толькі з

творчасцю мастакоў замежных, як Рэрых, але і нашых, айчынных. Выкладчыца Ніна Сямёнаўна чамусьці засмяялася — відаць, думае рабіць пад мяне падкопы».

Потым Бацька доўга сумаваў у адзіноце, думаючы аб несправядлівасці маладосці, аб жорсткасці прадвесня за акном, якое вярэдзіць, катуе яго душу.

Нарэшце запелі дзверы ў суседнім пакоі. Бацька пазнаў голас Толі: «Ну то проша, заходзь да нас». Толя замыкаў дзверы з сярэдзіны, а Бацька навастрыў вушы: «Ого, нештачка зараз будзе».

За сцяной пацякла мерным тонам размова, часам Толеў смех, але да Бацькі ўсё роўна ішоў толькі спакойны гул. Бацька прыклаў вуха да сцяны. Здаецца, жаночы голас. І стук абцасікаў тонкім рэхам аддае. Але зусім пераканаўся толькі тады, калі ў сцяну пачалі барабаніць моцнымі ўдарамі, аж на Бацьку пабелка пасыпалася. «Так і ёсць, дзеўка ў пакоі. Толік сухое віно адкаркоўвае. У гэтай голі і штопара няма. Як самі п'юць, то корак пальцам у сярэдзіну заганяюць, а як хто ў гасцях, то лупяць дном у сцяну праз падушку. А ў мяне, дзякуй богу, штопар ёсць»,— усцешыўся Бацька пад грукат сцяны.

Суцешнасць была нядоўгай: загаманілі зноў, бразгануў посуд.

«П'юць, любяцца адно з адным, зараз музыку ўключаць, цалавацца пачнуць»,— пад такія думкі лютая, як змяя, зайздрасць упаўзла ў Бацькава сэрца.

Хадзіў-хадзіў туды-сюды, у адзін бок сходзіць па што, у другі — па нічога. А потым яго аж падкінула ад раптоўнай знаходкі: слоік трэба — і да сценкі — усё пачуеш.

Узяў вялікі, трохлітровы. Нават і адной працягнутай рукой не датрымаеш, трэба і другой пасобіць. Усунуўшы вуха ў слоік, Бацька пачаў вадзіць дном па сцяне, настройваючыся на выразнейшы гук. Дно шоргала аб тынк, балела, выжыльваючыся, шыя.

У тым нязручным становішчы, дзе Бацька павінен быў стаяць амаль ракам, яго «радыёстанцыя» нарэшце загаварыла. Хоць прыглушана, але больш-менш выразна.

— Няўжо і хлопцаў у вёсцы няма?

— Адкуль яны там? Зімой вечарамі ад нуды ссівець можна.

— А я злысею ў навуках.

— На таго ж і трапілі, хто лысее. Дай пагладжу тваю чупрыну, як некалі я любіла.

Радыё змоўкла. Бацьку калаціла дробнымі дрыжыкамі: што яны робяць цяпер? Абдымаюцца нябось? У Бацькі аж ніжняя губа дробна заторгалася, а твар скрывіла грымаса адчаю, што ніхто яго не абдыме, не пацалуе.

Чакаў даўгавата, аж пакуль зноў не пачуліся галасы:

— Толік, досыць. Надта разласаваўся. Дай мне цыгарэтку, падымлю трохі.

— Скора ж ты навучылася, за год нейкі.

— Мне і бабка мая гаворыць: не куры, дачушка, дым у грудзях асядае.

Курэнне за сцяной супакойвала Бацьку: значыць, нічога вялікага няма пакуль.

Яны адышліся, відаць, да стала, бо ніякіх ясных гукаў слоік не даваў. Бацька паставіў яго, пацёр намулянае вуха, ля якога аж да шчакі вырысаваўся чырвоны паўкруг.

У бязмэтнасці суботняга вечара намецілася вялікая ідэя: усе яны не лепшыя за мяне — ча-

му ж ім павінна быць лепш? Але пакуль што Бацька не адважыўся соваца да суседзяў.

Ён разнерваваўся. Цэлая паласа жыцця прайшла, не зачапіўшы яго і цяпер, дражніла, смяялася. Так у дзяцінстве, даганяючы вясёлку, падымаешся і падаеш, злуючыся, і ўсё ж даганяеш.

Для кожнага па-рознаму круціцца калаўрот дзён. Для адных — гладка, для другіх — рыпіць.

За сцяной зноў ажылі галасы.

«Ты, як мядзведзь, сціснуў»,— данеслася да Бацькі.

З нечаканасці ён тармаснуў галавой уверх. З пустым зычным звонам трохлітровік ахнуўся аб падлогу. Бацька адскочыў, узвіўшыся, як кот ад гарачай місы.

Бацька сумеўся, аж паджылкі затрэсліся, і рашуча рынуўся на калідор.

Толя здагадваўся, што за сцяной робіцца нешта трывожнае, але стуку ў пакой не чакаў. Ды так яно і сталася — на парозе вырас Бацька і, нічога не адказваючы на Толеў злосны позірк, уціснуўся ў дзверы.

— Ну што? — цыкнуў Толя.

— Нічога, хацеў толькі спытацца, як вечар прайшоў,— дробненька сыпануў Бацька.

— Традыцыйнае народнае гулянне было. Канкан танцавалі.

— А-а-а...

Колішняя студэнтка Соня Квяткоўская глядзела на Зміцера Апанасавіча з паблажлівай усмешкай, якраз так, як глядзяць дарослыя на свавольствы малых дзяцей. Соня перабірала пласцінкі, але няўважліва, нібы па абавязку.

— Добры вечар, Соня, не забываецеся пра нас,— здзівіўся Бацька.

Папраўляючы валасы, Соня незалежна адказала:

— Добры вечар, Зміцер Апанасавіч. Як жа забыць?

Бацька адчуваў, што насмешніца здзекуецца з яго сваёй сур'ёзнасцю.

Толя не чакаў такога выбрыку ад суседа.

— Піце, Зміцер Апанасавіч, і мы разам з вамі,— цвёрда гаварыў Толя, наліваючы ў шклянкі.

— За ваш курс з прыемнасцю. Будзем піць, каб аж вушы ў трубачку павіліся!

— Не, не будзем, каб віліся,— раздзельна і яшчэ цвярдзей адказаў Толя.

Бацька пачуў інтанацыю. І каб неяк суцішыць страх, ён пачаў падлашчвацца да Соні:

— Вы любіце музыку? Я нядаўна выдатную пласцінку купіў.

І вось у пакоі загрымела, тыранячы душы і целы маладых людзей, доўгая і нудная сімфонія. Бацька прывалок вялізную пласцінку і цяпер ледзь не дырыжыраваў ля радыёлы. Адначасова і каменціраваў спалоханай Соні і ўкамянеламу ад злосці Толю.

Калі музыка, падобная на выццё ваўкоў у піліпаўку, пачала перарастаць як бы ў сярдзітае вуркатанне грому, Бацька растлумачыў:

— Цёмныя сілы. Ідуць цёмныя сілы.

Цёмныя сілы сапраўды вар'яцелі на ўсю моц. Радыёла стагнала, аж пакуль не паплыла аднатонная, нейкая інертная мелодыя. Потым зазванілі званы пад барабанны перастук і запела флейта.

— Светлыя сілы,— узрадаваўся Бацька.— Зараз будзе змаганне.

— Будзе,— адсек упэўнена Толя, наступаючы на Бацьку.

— І... і... і... Я нічога... Светлыя сілы... цёмныя сілы...— адступаў у парог Бацька.

## V

Так, Бацька любіў музыку і праз нядоўгі час даказаў гэта зноў. Толя і Саша сталі сведкамі падзеі года.

Некалі даўно ў горадзе памёр вядомы спявак, ну, так сказаць, першы тэнар мясцовага значэння. Па такой з'яве, як забыццё, вырашылі тады гахнуць мемарыяльнай дошкай. І гахнулі, праўда, з некаторымі адхіленнямі ад агульных правіл, дзякуючы ўпраўдому.

Там, дзе жыў тэнар, упраўдомам быў мудры чалавек. Ён усё прадбачыў на два хады ўперад. Гэта зусім правільна, што дамамі, дзе жывуць славутасці, камандуе разумны чалавек.

...Белыя рэдкія сняжынкі, як прапелерчыкі, ціхутка апускаліся з неба. А па небе, як венка ад разбітай дзяжы, кацілася снежаньскае сонца. У такі нервовы час заклапочаны ўпраўдом увайшоў у належную ўстанову і адшукаў там патрэбнага чалавека, які, дарэчы, быў яго сябрам у школе. Упраўдом пачаў з налёту:

— Як ты думаеш, усе людзі паміраюць?

— Ты яшчэ пытаешся.

— І ўсе вялікія паміраюць?

— Усе паміраюць.

— Я так і думаў, халера на іх. Што ж рабіць? У мяне цэлы дом геніяў жыве. І ўсе яны памруць.

— Памруць,— сумна згадзіўся чалавек.

— І на кожнага трэба будзе дошка?

— Відаць, трэба.

— А дзе ж я тыя дошкі чапляць буду? — закрычаў упраўдом.

— Не ведаю. Калі яшчэ тое будзе.

— Ты не ведаеш, а мне тады бегай ломцадрыца-гоца-ца. На першым паверсе ўсім дошкам месца не хопіць. А не прыбі якому — ён з таго свету вылезе і мяне за горла...

Казённая муза зноў пырхнула ля галавы ўпраўдома і нават кранула яго лоб сваім бюракратычным крылом.

— Знаеш, што я прыдумаў сёння ноччу?

— Ну?

— Трэба прыбіваць ля кожнай кватэры, дзе хто жыве. І ні ў кога зла не будзе. Ты вось тут жыў — вось тут і дошка табе.

— Праўду гаворыш. Так і будзем рабіць.

На свеце з'явілася яшчэ адна бліц-ідэя.

Тэнар некалі жыў на чацвёртым паверсе пяціпавярховага дома. Там жа, у міжваконні яго кватэры, і была прыбіта дошка. У пагодныя дні на сцяне шэрай камяніцы можна было ўгледзець, добра вытрашчыўшы вочы, белы квадрацік, які з тратуара выдаваў ледзь большым за карабок запалак. На квадраціку пераліваліся залатыя блікі — сонца спявала ў літарах, далёкіх і невядомых для нас, як пісьмо этрускаў. Акрамя ўсяго іншага, дошка мела і вялікую асветніцкую ролю — па ёй вывучалі азбуку ластаўкі, якія гнездаваліся пад карнізамі вокнаў. І яны былі ўдзячны ўпраўдому. Ластаўкі шчабяталі: віцьвіць-віць. Упраўдому здавалася, што гэта яны дзякуюць яму, бясконца паўтараючы дарагое імя асветніка — Віця, Віця, Віця. І Віця ўсміхаўся.

Бацька пакутаваў доўга. Ён помніў былога тэнара. Спачатку Зміцер Апанасавіч злаваўся на вышыню, але нябёсы маўчалі. Вечарамі ён часта ўключаў радыёлу, ставіў пласцінку любімага спевака і, седзячы ў крэсле, доўга слухаў.

Бацька сядзеў, як на свярдзёлку. Яго падкідала нячыстая сіла дазнацца, што напісана на высокім мармуры.

Як і трэба было чакаць, жаданні і любоў абвастрыліся вясной. Цяпер пасля сакавіка ў нас застаюцца толькі цудоўныя ўспаміны, ну, скажам, пра бярозы, якія, здаецца, аж сакочуць ад радасці пад веснавым сонцам. А некалі, пры панах, царызме, сакавік быў самы цяжкі месяц — гаспадару не было чым пракарміць не толькі сваю худобу, але і сябе — начыстую канчаўся хлеб.

Бацька ведаў гэта, ды яшчэ якраз у адну з сакавіцкіх раніц выпісваў на картачку вядомыя словы Францішка Багушэвіча:

А чым кепска?— бо на марцы
Я радзіўся (пост праўдзівы,
Цяжкі месяц гаспадарцы —
Як пражыў хто — будзе жывы).

Бацька выбіраў з айчыннай літаратуры найбольш яркія прыклады для падмацавання сваіх навуковых поглядаў. Погляды былі складаныя, а прыклады трошку прасцейшыя. Пісаць дысертацыю Бацька задумаў даўно, а цяпер, пасля паездкі ў Вільню, і вунь як хацелася.

«Кепска будзе!» — гэта быў сімвал дня і, здаецца, усёй Бацькавай задумы. Бяда была такая: Бацькавыя складаныя погляды ніяк не маглі легчы ў словы, знайсці навуковае абрамленне. Таму ён і не мог напісаць ніводнага радка, а тры гады ў аспірантуры і ўжо сем пасля яе толь-

кі і выпісваў на картачкі з літаратурных твораў розныя прыклады да сваіх таямнічых поглядаў.

...Рыпіць пяро па белым квадраціку картачкі. Пад'еўшы крупніку, Бацька працуе. Картачка малая, і пяру, як вязню ў турэмнай камеры, няма дзе разгуляцца. Затое, які прастор у такія хвіліны Бацькавай фантазіі, у якія дзіўныя сады фантазіі вядзе яна! Вось ён, выхадзец з сялян, трыццаці шасці год, ён халасцяк, сержант запасу, маральна ўстойлівы, чаканіць да трыбуны. Уся біяграфія ў парадку, яго толькі трывожыць, што быў па волі несвядомых бацькоў ахрышчаны. Але Бацька думае: «Калі што, скажу — сілком ахрысцілі. І плакаў, і брыкаўся — не памагло».

Здранцвелая зала чакае. Заціхлі нават чорныя зайздроснікі. І ён глыбокім, пераканаўчым голасам скажа. Ён скажа: «Дарагія члены Вучонага Савета! Паважаныя таварышы! Тэма маёй дысертацыі — «Інфляцыя прыметнікаў у сучаснай мове». Яны будуць слухаць кожнае Бацькава вешчае слова, і інфляцыя прыметнікаў стане надоўга вядучай сілай іх жыцця. Пасля несумненна паспяховай абароны — віншаванні і, вядома, банкет. З прамовамі, тостамі і духавым аркестрам. Ах, як міла будуць вымучваць усмешкі кафедральныя дамы! З якім апломбам і энтузіязмам у прадчуванні блізкага застолля факультэцкія выпівохі будуць каменціраваць падзею («А вы ведаеце, Бадуэн дэ Куртэнэ і не закранаў гэту праблему». «Бадуэну дэ Куртэнэ займацца праблемамі мовы заўсёды перашкаджала палітыка».)

У Бацькі, як і заўсёды, ледзьве здабылося сіл запоўніць адну картачку. Увесь парыў да навуковай працы захапіла штормам вялізнае мора лятуценняў. Пяро перастала рыпець.

Увесь свет належаў Бацьку, які ўжо выйшаў прагуляцца. Яго добраму настрою падпявалі капяжы ў вадасцёкавых трубах, рэйкі трамвайнай лініі, пеўчыя ў гарадскім саборы, дзе служылася нейкая паніхіда. Само суладдзе гукаў было настолькі багатым і шырокім, што з яго раптоўна выплыў голас любімага тэнара, які сваёй сілай перакрыў усе астатнія гукі, скіраваў іх за сабой, і гэты магутны харал, як добры геній, вёў Бацьку па вуліцы.

А вось той дом і тая мемарыяльная дошка. Харал сціх. Бацька як бы працверазеў, глянуўшы на дошку. «Я прачытаю альбо сёння, альбо ніколі»,— зусім нечакана, але вельмі рашуча адсказаў ён сам сабе, гледзячы ўверх. Бацька адчуваў сябе вінаватым перад памяццю любімага спевака, і ажно збялеў ад свайго раптоўнага рашэння. Бацька пакруціўся на тратуары, цвяроза ўзважыў перспектывы. Ён зрабіў дакладны вывад, што адзін не справіцца аддаць даніну глыбокай пашаны. «Што ж, памогуць сыны, задарма, ці што, столькі крупніку пераелі»,— сказаў Бацька зноў сам сабе і рушыў назад, рашуча і мэтаімкнёна.

— Хлопцы, у мяне да вас інтэрас ёсць.

Толя неяк насмешліва і дзёрзка глядзеў на Бацьку, нібы хацеў сказаць: «Ну, давай, давай!»

— Я, хлопцы... гэта, хлопцы, каб вы мне памаглі прачытаць, што напісана на дошцы... адзін не далезу.

Хлопцы-малойцы ніяк не маглі дапетрыць сэнсу ў гэтай раптоўнай пальбе слоў, і Толя не вытрымаў:

— Якой дошцы? Што напісана?

Бацька як сякерай сякануў:

— Я ўвяжуся вяроўкамі і спушчуся да дошкі тэнара, а вы на даху вяроўкі трымаць будзеце за другі канец! Зразумеў?

Толя нічога не зразумеў. Тэнар... вяроўкі...

Саша прасвятлеў. Яго ўзрадавала ідэя Бацькі. І зразумеў ён хутка: Бацька быў нешчаслівы.

«Правільна, вельмі правільна, яму абавязкова трэба палезці і прачытаць. Іначай яму будзе вельмі цяжка,— думаў Саша.— Бацьку трэба быць якім-небудзь завучам у вясковай школе. Гэта была б найлепшая школа ў раёне, а то і ў вобласці. Як ён ганяў бы настаўнікаў за недакладнасць іх рабочых планаў! Якая дойная карова стаяла б у яго ў хляве. А ён увязаўся ў нейкія прыметнікі, ды яшчэ ў такое пекла, як іх інфляцыя. І цяпер яго энергія шукае выхаду. Гэта Бацькаў несвядомы бунт і пратэст супроць прыметнікаў і ўсёй механікі, што за ёй стаіць. Ніхто з іхняй кафедры не палезе глядзець, а ён палезе, і калі нават наложыць галавой, то на яго пахаванні трэба будзе і плакаць, і рагатаць. Гэта таксама нестандартна. Бедны Бацька! Яму трэба памагчы».

Пакуль Саша шкадаваў Бацьку, той паспеў таропка сказаць:

— Ну, дык рыхтуйцеся,— і шуснуў з пакоя.

— Ён што, звіхнуўся зусім? — Да Толі яшчэ нічога не дайшло.

— А ты, эфіоп, ніяк не скеміш. Проста яго душа, яго характар дэфармуюцца, так сказаць, пад атмасферным ціскам, якім уздзейнічае на яго свет. І яны ўрэшце змяняць свае формы, кажучы матэрыяльна. Але мне падабаецца, што яны спрабуюць даць супраціўленне. Якое б там ні было, як бы яно ні выглядала. Таму Бацьку трэба памагчы.

— Вы, мусіць, абодва напіліся зранку альбо вас адным пыльным мяшком ударылі. Ён — пра нейкія дошкі, ты — пра атмасферны ціск. Але як сабе хочаце, мне што? Пойдзем!

З інтэрната рушылі, перачакаўшы далёка за поўнач, калі зусім уціхлі вуліцы, і мелі нешта агульнае з крылатай пяхотай, з дэсантнікамі. Перад дарогай Бацька раскрыў план аперацыі і правёў частковую трэніроўку — паказаў, як ён будзе ўвязвацца вяроўкаю. Прытым, у яго руках была не звычайная вяроўка, а страпа ад грузавога парашута. Гэта было амаль неверагодна — так хутка дастаць у цэнтры горада страпу. Але Бацька растлумачыў проста: «Валялася ў касталянкі ў кладоўцы, нехта некалі прывалок».

Але добра, бо страпа шырокая і моцная, ад парашута, на якім спускаюць нават танкі. Што ж, будзе вельмі надзейна. Да таго ж, Бацька выбраў правільны і лёгкі спосаб увязвання. Страпа складваецца ў два разы, робіцца пятля і зашморгваецца на тулаве. Зручна і надзейна падвешвацца. Так, напрыклад, можна сушыцца, калі змокнеш.

— Я ведаю той дом,— гаварыў па дарозе Бацька.— Я некалі быў на пятнаццаць сутак заарыштаваны. Не падумайце, што хуліганіў — проста абараняў гонар жанчыны. І нас напрадвесні вадзілі туды скідаць снег з даху. Дах бляшаны, даволі пакаты. На яго мы ўзбяромся праз любы люк, туды іх ажно тры выходзяць з гарышча.

— Але ж мы не ўтрымаем з вышыні, вы нас пацягнеце ўніз,— затрывожыўся Толя.

— Не бядуй. Сам я апускацца буду па паўднёвым баку даха, а вы будзеце трымаць з паў-

ночнага, такім чынам, страпа будзе перагінацца па вільчыку; і ў вас будзе яшчэ ўпор — там ёсць жалезная драбіна да нейкага комінчыка, відаць, вентыляцыйнага.

«Чалавек створаны абсалютна для практычнага жыцця. За столькі год ён ніяк не можа напісаць плана дысертацыі, а тут за дзень стварыў цэлую стратэгію»,— падумаў Саша, гледзячы паверх галоў сваіх спадарожнікаў на прыцемненыя агні горада.

Толя неяк няўпэўнена сказаў:

— То нашто ўжо канечне лезці? Вы б узялі бінокль і ў ясны дзень усё разгледзелі.

Бацька зневажальна глянуў на яго і прамармытаў:

— Ніякай фантазіі ў чалавека!

Горад быў у лёгка-блакітным, ледзь заўважным вясновым мроіве, ноч відная, як для сакавіка — досыць цёплая. Толькі на душы быў нейкі здрадніцкі халадок — відаць, ад незвычайнасці ўсёй гэтай гісторыі. На вуліцы — ні душы, толькі цені голых дрэў бездапаможна паўзуць уперад пры кожнай новай хвалі ветру. Ад незвычайнасці адчування і паўзмрок, і дрэвы, і нават хруст ценкага лядку выдавалі па-дзіўнаму новымі, і Толю здавалася, што вуліца вядзе не на звычайны пагорак, а на Відную горку ў сваіх родных краях, з яе так добра было ў дзяцінстве коўзацца, аглядаць ваколіцы і бачыць, што свет бясконцы.

Каля запаветнага дома Бацька раптам замітусіўся — яму не спадабалася, што на пятым паверсе свеціцца адно акно. Яно было якраз над мемарыяльнай дошкай. Але нічога, святло слабае, не пражэктар жа б'е.

На дах узабраліся шчасліва. Адразу востра, як воцат, ударыў у галаву пах мокрай іржавай бляхі. Паселі адзін за адным на жалезнай драбінцы перадыхнуць. Люба глянуць на начны горад з вышыні. Бліскучыя дахі дамоў здаваліся гіганцкімі крылламі, якія вось-вось здрыгануцца і пачнуць цяжка рассякаць далягляды. На Сашу надыходзіла адчуванне бесканечнасці прасторы, наплывалі філасофскія разважанні пра тое, што значыць чалавек у такой прорве, як адлегласць, час, вечнасць, і што ўжо было тут разважаць пра такую бесцялесную з'яву, як інфляцыя прыметнікаў?

«Бацька не разумее,— думаў Саша,— што для яснасці і карысці пра ўсё гэта трэба пісаць не пухлы фаліянт, а проста старонačку тэксту без ніякіх спасылак і цытат. Ну, у агульным плане прыкладна так: «У сувязі з непамернай сусветнай балбатнёй, якая выклікана прыкрыццём нізкіх чалавечых інстынктаў — зайздрасці, подласці, прагі славы і г. д.— адбылася абясцэнка слоў наогул, а не толькі прыметнікаў. Знікла магічная сіла слова. У пачатку стагоддзя на нашай роднай зямлі людзі дранцвелі ад праклёнаў, ну, скажам, напрыклад, такіх: «Каб цябе хмара цёмная не мінула» альбо «Каб мае дзеці тваімі косткамі грушы абівалі». Сёння яны выклікаюць толькі лёгкую ўсмешку, а ўсе маты-пераматы бяскрыўдна пралятаюць ля вушэй, як посвіст ветру. Вось і ўсё».

Стройнасць кароткай філасофіі магла б развівацца і далей, але яе парушылі каты і кошкі, якія, як вядома, марцуюць напрадвесні. Неміласэрнае мяўканне і зялёны фасфарычны бляск драпежных вачэй акружылі пілігрымаў. Каты былі раз'юшаны, яны скраблі кіпцюрамі па бля-

се і, здаецца, толькі чакалі каманды, каб кінуцца на няпрошаных гасцей.

— Ну, што ж, пачнём,— трагічным голасам папрасіў Бацька і пачаў увязвацца.

Толя, як дужэйшы, першы стаў упорам на жалезнай драбіне, Саша — ззаду, так яны ўдвух і трымалі за страпу.

Бацька ўвязаўся, ступіў на вільчык, пасля няўклюдна лёг жыватом на дах, задраўшы галаву, і прашаптаў:

— Я свісну, і вы тады затрымаеце трошкі, на хвілінкі дзве.

Хлопцы адпусцілі страпу. Бацькава вялікая, як бручка, галава знікла за стромасцю вільчыка. Пачуўся спакойны шорхат. Бацька ў музычным суправаджэнні кашэчага мяўкання паехаў у вечнасць.

Тое верхняе акно на пятым паверсе, якое занепакоіла Бацьку яшчэ на вуліцы і ля якога цяпер яму трэба было пракаціцца на вяроўках, свяцілася нездарма. Увесь пяты паверх дома быў заселены адстаўнікамі. І невядома па якой прычыне — ці то для аховы таленавітых людзей, каб іх занадта не атакоўвалі крылатыя музы, ці то з-за жадання ўсцерагчы іх здароўе — у ваенных усё-такі ёсць трэніроўка, выпраўка.

Адстаўнік за асветленым акном пісаў. Пісаў, пакуль не прачнецца жонка і не пачне шпарыць свае ранішнія ідэі наконт жыцця. Старонкі мемуараў, якіх ніхто не друкаваў і не думаў друкаваць з-за іх стылёвай невыразнасці, як бліскавіцы, вылятаді з-пад яго рукі. Ён пісаў.

Абдумваючы чарговую фразу, ён падышоў да акна і ўтаропіўся ў начное неба. Фраза складвалася такая: «І вось я падняўся і крыкнуў: «Рота, наперад!»

Па няяснай задуме павінен быў адбыцца нават рукапашны бой. Рашучасць і адвага падхапілі баявы дух гэтага чалавека.

І раптам адвага сарвала свае крылы — за шыбінай проста перад чалавекам пачалі вынікаць і рашуча спускацца ўніз праз вясновую цёмную сінечу дзве нагі. Адстаўнік спачатку скамянеў, пасля на крокі два адступіўся, але ногі раслі, набліжаліся, потым пайшлі ўніз, і, нарэшце, перад ім узнік невялікі тоўсценькі чалавек, які асатанела глядзеў у пакой. Іх позіркі перакрыжаваліся. Бацька ўзнік перад адстаўніком усёй сваёй фактурай.

— А-а-а! — дзікім голасам закрычаў гаспадар кватэры і рынуўся ў спальню.

У Бацькі адняло мову. Ён праплыў перад акном і настолькі спалохаўся, што нават у бязважкасці адчуў, што здзервянеў. Ён ніяк не мог свіснуць, і мемарыяльная дошка праплыла перад яго затуманеным позіркам, які толькі і ўлавіў словы: «У гэтым доме...»

На енк адстаўніка збегліся сямейнікі. Акно з трэскам расчынілася.

— Цюга яго, цюга,— крычаў з падаконніка вясёлы малады чалавек, відаць, унук адстаўніка.

Выразна пачуўшы шум і крыкі на вуліцы, Толя напружыў слых, чакаючы Бацькавага свісту. Адпускаючы далей і далей страпу, услухоўваючыся ў прастору, ён хацеў прыўзняцца на пальчыкі і раптам неяк няўклюдна паслізнуўся. Збянтэжыўшыся, ён згубіў раўнавагу і хваціўся рукамі за перакладзіну драбіны.

Страпа напялася. Саша з жахам адчуў, што ён трымае адзін і што нейкая вялікая сіла цягне яго ўверх, у неба. Не маючы моцы адужаць яе,

Саша інстынктыўна выпусціў з рук страпу, якая імгнення шмарганула па далонях. Ён толькі і ўспеў падумаць: «Даруй, божа, цяжкі грэх».

Бацька чмякнуўся ў сінюю зляжалую гурбіну. Як ляцеў — помніў толькі, што зоркі блішчалі. Некалькі секунд ляжаў воблагам нерухома, а пасля, адчуўшы, што ён яшчэ жывы, ірвануўся з гарачкі ўперад. «Як хто выжыў — будзе жывы»,— успомніў Бацька словы з ранішняй цытаты і, падбрыкваючы, памчаў па вуліцы, цягнучы за сабой доўгі хвост страпы. Бацька спужаўся настолькі, што страціў арыентацыю. Калі Саша і Толя выскачылі на вуліцу, ён рабіў трэці круг вакол дома і яму здавалася, што ён усё бяжыць наперад. Бацьку трэба было спыніць і завесці дахаты. Зрабіць гэта было не так і проста, бо Бацька прамчаўся ля хлопцаў і не пазнаў іх. Дапамог дзіцячы пастушковы вопыт, калі прыходзілася ганяцца за якім-небудзь брыклівым бычэчкам. Саша наступіў нагой на страпу. Страпа напялася, і Бацька грымнуўся аб зямлю.

«Ну, цяпер ужо канец»,— самотна падумаў ён.

Змярцвелага Бацьку завялі аж на ложак, накрылі нейкай папонай і цішком вярнуліся ў свой пакой.

Толя заўсёды злаваў, калі не разумеў чаго-небудзь. Каб супакоіцца, прысеў і нешта моўчкі разгадваў. А да Сашы разам з яснасцю цяперашняй сітуацыі вярнулася здольнасць разважаць. Гледзячы на збянтэжаны погляд Толі, які адразу не згаджаўся ісці на такія подзвігі, ён скіраваў да яго свой мысленны маналог:

— Аспірант другога года навучання! Ты добры і сумленны хлопец. І ты ўжо ведаеш прыблізна, што для таго, каб закончыць аспірантуру, на-

пісаць і абараніць дысертацыю, можна і не мець ніякіх навуковых здольнасцяў. Людзі, якія сапраўды маюць іх і спадзяюцца толькі на іх, несвядома асудзілі сябе на немалыя блуканні па лесвіцы пошукаў большага ці меншага прызнання. Калі яны зразумеюць гэта, то гонар ужо не дазволіць павярнуць назад. Куды назад? Да той славутай кагорты, якая рашыла, што навука — гэта дрэва з залатымі яблыкамі, і варта толькі добра патрэсці дрэва, і яблыкі ападуць проста ў рот. Гэтая, на жаль, немалалікая кагорта любымі шляхамі лезе патрэсці дрэўца.

Я прывяду табе апошнюю крайнасць ужо нават не падхалімажу, а проста падзення чалавека. У Фанатыка і яшчэ аднаго яго сябра знайшлося здольнасцей дабіцца таго, што іх кіраўнік, ці шэф, як яны яго завуць, дазволіў ім мыць сваю машыну. Які гонар у працэсе навуковай дзейнасці! І вось гэтыя навукоўцы самі дадумаліся і прапанавалі шэфу ідэю — мыць трэба цёплай вадой і дзіцячым мылам. Два разы на тыдзень адбываецца купанне блакітнай «Волгі». І ім нават не сорамна паглядзець адзін аднаму ў вочы, ды, відаць, і няма калі — яны да пасінення шмаруюць навыперадкі.

І гэтым займаюцца маладыя людзі, якія праз год-два з дапамогай свайго шэфа стануць перад студэнтамі і будуць гаварыць пра высокае прызначэнне чалавека. І што мне з таго, калі гэта, дапусцім, нетыпова ў наш час? Нават адзіночны факт агіднага павінен быць сігналам для грамадскай трывогі. Бо ўсякая нізасць нашмат болей ваяўнічая, чым нават звычайная прыстойнасць. І чым далей яна развіваецца, тым больш нетыпова і незаўважна глушыць усё сапраўды разумнае. Той самы іхні нетыповы шэф памог

скалечыцца двум асобам, лёгка перарабіўшы іх у сваіх нетыповых падхалімаў.

Відаць, самае важнае для чалавека — перамагчы раба ў самім сабе. Я ведаю, таварыш аспірант, што гэта — праблема для многіх нават і недурных людзей.

Гэта нават не самае большае, што ўбачыў я ўжо амаль за тры гады, а колькі такога ўбачыў Бацька за свае гады? Ды ён і сам, нарэшце, спазнаў, што з яго здольнасцямі без абыходных шляхоў навуковых лаўраў не ўхопіш. Ён ужо і начальству дагаджае як можа, але вопыт малы і маладой вёрткасці няма. Адгэтуль — і адчай, і лянота. Чаму тады яму не здзяцінець? За такі час можна дадумацца лезці на Месяц, не тое, што на дом, да мемарыяльнай дошкі. Я канчаю, мой таварыш, свой мысленны маналог пра тое, што і ў храмах навукі, у яе святынях таксама чэрці водзяцца. Як шкада, што я не чую апладысментаў. Адкуль яны будуць? Маналог мой быў маўклівы. Зрэшты, такая ж мёртвая цішыня стаяла б у зале, калі б я сказаў гэтыя словы з трыбуны нашаму паважанаму вучонаму савету.

А Бацьку трэба было памагчы. А тое, што выйшла асечка, мы ж не вінаватыя.

## VI

Круціўся калаўрот дзён...

На Адэлю найшоў глыбокі роздум і, відаць, першы раз у жыцці — яна стала меней гаварыць, паходка зрабілася млявай. А пайшло вось ад чаго. Калі Зміцер Апанасавіч адлежаўся пасля перапуду, Адэля пачала чапляцца да яго са сваёй пляменніцай:

— І добра было б, каб вы пажаніліся. Вы і

падобныя адно на аднаго, і характары ў вас добрыя. Найлепей восенню жаніцца — і кветак будзе шмат. А пасля — вясельнае падарожжа.

— Куды? У Італію?

— Нашто так далёка? Лепей з'ездзіце ў Смургоні. Там базар добры. Вянок цыбулі мне купіце.

Аднойчы яна прывяла пляменніцу ў інтэрнат і зазвала Бацьку. Спалоханая пляменніца — дзеўка ўжо ў гадах, амаль равесніца Адэлі,— камечачы са страху рог абруса, гаварыла вяла, найбольш расказвала розныя паніхідныя жахі з бальнічнага жыцця, дзе працавала санітаркай.

— Не, я харашэйшы за тваю пляменніцу,— сказаў назаўтра Бацька Адэлі,— ды ў мяне і дзіця ёсць на раёне, шэсць годзікаў хлопчыку, прыедзе вось у суботу.

Бацька сказаў, а сам падумаў: «Якая там твая дзеўка — на пасцелі граблямі не знойдзеш».

Адэля больш не вырвала ад яго ніводнага слова. Вестка пра хлопчыка на раёне засмуціла Адэлю, і ўсё думалася ёй пра хлопчыка — як ён там, бедны, жыве, што ён есць і як ён спіць. Цяпер па суботах яна дзяжурыла на калідоры, чакаючы легендарнага малога, яна ўжо нарыхтавалася і спаткаць яго, назапасіла абойму ласкавых слоў: «Ай, які харошы хлопчык, нá табе цукерачку, як жа ты завешся?» Ад хлопчыка Адэля думала дазнацца і пра яго маці, і пра ўсе дэталі іх побыту.

Хлопчык не паказваўся, і Адэлю агарнуў роздум, які і мог даць выратаванне Бацьку. Мог даць, калі б не Лукаш. Лукаш сумаваў і без толку швэндаўся штодзень да знаёмых — яго навуковы кіраўнік з месяц назад узяў раздзел дысертацыі і ўсё не меў часу дачытаць да канца.

Кіраўнік быў заняты чалавек — меў пятнаццаць грамадскіх нагрузак. Можа, калі б ён меў чатырнаццаць, то ўжо прачытаў бы Лукашову працу. Ад беспрацоўя Лукаш таксама прычапіўся да Бацькі з жаніцьбай.

Неяк сышліся вечарам у Толі і Сашы ўсе ўчатырох. Гутарку вёў Лукаш:

— Ладна, Зміцер, калі жаніцца будзеш?

— Пашукаў бы якую дзеўку. А як не знойдзеш, то я пагляджу, як нашы маладыя, Толя і Саша, ажэняцца.

— Дзеўку я знайду. Ты лепей шыкуй гарэлку на вяселле.

— Што мне шыкаваць? Пайду ў магазін ды куплю.

— Купіш? Купляй! А ты ведаеш, што ў вёсцы мужыкі гарэлкі казённай не ахвочыя піць? Яна надта рэзкая. Самагонку жытнюю рабі.

— Кажаш, самагонку гнаць?

— А ты што думаў? — запэўніў Лукаш.

— А дзе я жыта вазьму? — узгарэўся Бацька.

— Хочаш, пшаніцы дастану ў мястэчку. Ці задарма я там дзевяць гадоў завучам адбыў?

Бацька ўнурыў галаву, бо ён ведаў гэта недалёкае мястэчка і не любіў яго. Некалі ў ім была барахолка, і ён ездзіў туды купіць якую адзежыну. Туды ехаў, а назад ішоў ці пад'язджаў на падводах і праклінаў усё на свеце — яго, другакурсніка, лёгка, як лясную варону, абабралі жулікі. Адтуль і дрэнныя ўспаміны засталіся.

— Во ў нас дык добрую гарэлку гоняць, пілі ж самі,— пахваліўся Толя.— Мацней нашай нідзе няма. Як агонь. Пра яе і вершык народ склаў: «Самагоначка-сястрыца, як цябе мне не любіць — з пяці фунтаў сем бутэлек і на пальчыку гарыць».

Нашто Толіку здалася гэтая Бацькава жаніцьба, сам ён тады ўразумець не мог. Відаць, у перапынках паміж седнямі ў бібліятэцы Толя яшчэ і фантазіраваў. Бо парашылі на тым, што Лукаш дабудзе пшаніцы, прывязе яе з Бацькам у горад, адкуль Толя і перапpавіць у свой раён на нейкім таямнічым грузавіку. А Бацька ўжо век яго не забудзе.

Ноччу Бацьку не спалася. Ён, як заклапочаны гаспадар, варочаўся і думаў пра будучае вяселле: «На сталоў восем, а то і на дзесяць народу збярэцца. Радня вялікая. Адных дзядзькоў і цётак родных колькі, а братоў і сясцёр стрыечных — не дай ты божа».

Бацька пачаў лічыць на пальцах радню, лічыў-лічыў і раптам задумаўся: «Гэтага Якуба і не варта было б прасіць — дзядзька родны называецца — некалі, як ехаў паступаць у інстытут, каня не даў да станцыі падвезціся. Маці кляла тады Якуба: «Вот кулацкае нутро, каб ты свету не дачакаў. Цяпер цягніся дзіцяці за дзесяць вёрст з чамаданам. Во воўчая натура».

«Не, яго зваць не буду,— падумаў спачатку Бацька, але, паляжаўшы, перадумаў: — Але ж дзядзька родны, не пакліч — уся вёска абгаворыць. Ды і конь ужо той здох, і да станцыі цяпер аўтобус ходзіць. Можа, хай прыйдзе і Якуб — ледзь ногі ўжо цягае».

— Народу будзе шмат,— лічачы радню, сказаў уголас Бацька.— Відаць, перагародку ў хаце прыйдзецца разбіваць. Ну, гэта адным махам. Але ж дзе музыку будзе зрабіць? Цяпер ніхто пускаць не хоча — ва ўсіх падлогі фарбаваныя, мэбля добрая — каму гэта хочацца псаваць? Тут будзе задачка дык задачка.

Засынаў заклапочаны Бацька пры вялікіх тур-

ботах у галаве. Апошняе, што ён думаў ужо ў паўсне,— гэта наказаць старым, каб павэндзілі каўбасы і кумпякі, надта ж смачна пахне тады ў застоллі.

— Каліва ў каліва, не пшаніца — золата,— бажыўся Лукашу і Бацьку на ганку пад вячэрнім местачковым небам раптоўны сябра Цяслюк. Вірлавокі, лысы, ён дуднеў у нос і ўсё хапаў за плячо то Бацьку, то Лукаша: — Не пашкадуеце. Нядорага. Чатыры мяхі аж пад завязку, у кожным па чатыры пуды. Сто рублёў — і мяхі твае. Дзе танней знойдзеш? Фундацыя мая будзе. І падводу аж пад хату падганю. Я ў бальніцы на гаспадарцы працую, конь заўсёды пры мне, можаце ўзяць хоць і на тыдзень.

На той падводзе, якую цягнуў жвавы конік Буланы, і ўехаў Бацька з пшаніцай познім вечарам у горад. Лукаш рашыў не даравацъ сквапнаму Цяслюку фундацыі і застаўся.

За ўсе дванаццаць вёрст дарогі Бацька нідзе не зазнаў такога гора, як у самім горадзе. Буланы прывык да ўсякіх дробных саўгасных трохтонак і проста звярэў у аглоблях пры лёце кожнага тралейбуса. Зыркія фары і ўраганны, працяжны свіст штораз кідалі Буланага ўбок, і Бацьку прыходзілася туга трымаць лейцы. Буланы цяжка хроп, стрыг вушамі і, урэшце, насупраць старых гарадскіх могілак рассупоніўся.

«Лятай ці поўзай — канец аднолькавы,— сумна падумаў Бацька, гледзячы на могілкі.— А пакуль што трэба хамут засупоніць».

Сырамятная стужка скуры набрыняла за дарогу ад туману, вылузвалася з рук, і Бацька ледзь-ледзь звёў у адно наравістыя клешчы хамута.

У двары інтэрната, ля агароджы дзіцячага садзіка, перапуджаны конь палагаднеў. Бацька распрог яго, пакінуўшы толькі аброць з лейцамі, якія туга закруціў за слупок агароджы.

Усё было б яшчэ цішэй і спакайней, ды інтэрнацкая касталянка ўвязалася памагаць уносіць збрую. На сходках між першым і другім паверхамі яна ўпусціла падсядзёлак. Той зазвінеў, куляючыся ўніз.

— А божа ж мой,— войкнула старая.

Бацька ўскочыў да хлопцаў.

Гулкі начны інтэрнат заціх толькі ўмоўна. Наогул, інтэрнаты — бяссоныя дамы, асабліва вясной.

Бацька ўскочыў і заціх. Хлопцы спрачаліся. Толя разважліва і спакойна, як і належыць чалавеку ў пасцелі, даказваў Сашу:

— Чаго ты надта пакутуеш са сваімі ідэямі пра гэту маладую літаратуру? Тут усё зразумела — няма асобы, няма і літаратара.

— Ты ўяві сабе — адзін вялікі пісьменнік у апошнія гады жыцця дыктаваў сакратару пісьмо беднай местачковай жанчыне, якая прасіла ў яго грошай на швейную машыну. Ты толькі падумай — вялікі пісьменнік і нейкая швейная машына. А ў нас... Кніжку літаратар падпіша і думае, што адбылося немаведама што.

Бацька з налёту аж анямеў ад шырыні размаху гутаркі сваіх суседзяў. Але пачуўшы, што яна досыць неканкрэтная, кінуўся да Толі і дзелавіта выпаліў:

— Ну, усё зроблена.

— Што зроблена? — не зразумеў той.

— Пшаніца на месцы, у двары вунь.

— Пайшла яна к чорту, гэтая пшаніца і ўсе вашы задумкі.

Так адказаў Толя, раззлаваны на Бацьку і на яго пшаніцу.

Бацька не чакаў такога нахабства і здзеку.

— Ты што, смяешся? — Бацька збялеў, і падбародак яго дробна закалаціўся.

— А вось і не смяюся. Што тут смяяцца?

— Дык мы ж дагаварыліся.

— Ну і што? У нас участковага другога прыслалі, цяпер з гэтым дзелам строга. Яшчэ не азнаёміўся з ім.

— Дык я ж вёз, стараўся, а ты гэтак...

— Ну і што?

— Сабака ты, парасё няскрэбенае!

Бацька крутнуўся, ляпнуў дзвярмі і разгублена застыў на пустым калідоры.

Лежачы на возе, на мяхах, пад вільготнымі вясновымі зорамі, якія, здаецца, ажно трымцелі на адліжным небе, Бацька ніяк не мог пагасіць сваёй крыўды на сыноў і асабліва на Толю.

«Шантрапа, асмялелі са сваімі жартамі,— думаў ён.— Разумнікі такія... Разгаварыліся... Без вас разбяруцца, што як трэба. Вядома, маюць час, у бібліятэку ходзяць, дысертацыі пішуць. Трэба будзе і мне хутчэй пісаць. Напішу спачатку аўтарэферат, а пасля вытлумачу свае тэзісы і выйдзе дысертацыя».

Адзінока і холадна было Бацьку на начным інтэрнацкім двары. Вартуючы пшаніцу, прыйшлося спасцігаць усе шорахі і зыкі трывожнага начнога прадвесня, і спакойнае дыханне Буланага, і крокі рэдкіх прахожых.

У паўдрымоце Бацька абдумаў, што найлепей цяпер будзе завезці пшаніцу да сястры і швагра.

Яны там ёй знойдуць ход. Але дарога туды — зноў жа віецца праз Лукашова мястэчка, ненадзейнае месца.

І яшчэ ведаў Бацька, што заўтра пасяджэнне кафедры і яму трэба схадзіць туды.

Раначкай касталянка ўзяла клопат пра падводу на сябе, і Бацька, спяшаючыся, бо заспаў, пайшоў на пасяджэнне кафедры. Ішоў ён спакойна, толькі ад падарожжа з Буланым засталася дрэнная звычка — Бацька кідаўся ўбок пры набліжэнні кожнага тралейбуса. Так, скачкамі, ён дайшоў да факультэта.

А тым часам у дзіцячым садзіку, ля якога быў прывязаны Буланы, пачалося цэлае свята. Усе дзеці стоўпіліся ля вокнаў і наперабой спрачаліся:

— Гэта конік!

— І ніякі не конік,— праспяваў флегматычны карапузік, расплюшчваючы нос аб шыбіну.— Гэта бегемот.

— Конік, конік! — пярэчылі другія дзеці.

— Гэта — мядзведзь,— прапішчала адна малая.

— Дзеці, гэта конік,— як настаўленне, сказала строгім голасам выхавацельніца.— Зараз мы пойдзем да яго гуляць.

— Ура-а-а! — затупалі дзеці з радасці.

Загадчык кафедры ўстаў з-за свайго стала і далікатна аб'явіў:

— Таварышы! На сённяшнім пасяджэнні нам трэба разгледзець такія важныя пытанні: аб ходзе напісання курсавых работ, аб стварэнні камісіі па прыёме ўступных экзаменаў, аб перавыбранні па конкурсе выкладчыка Гайдука і

дацэнта Доўнара, ёсць яшчэ некалькі дробных спраў.

Пасяджэнне пачалося даволі вяла. Загадчык сказаў, што работы мусяць быць абаронены ў тэрмін, да сярэдзіны мая, выкладчыкі павінны праводзіць кансультацыі, правяраць чарнавікі работ. У цішыні быў чуваць хруст і шоргат фальгі — дзве кафедральныя актывісткі, Зіна і Янiна, усеўшыся побач, раскручвалі абгорткі цукерак.

— І калі гэтыя бабы наядуцца? — бубнеў Бацька ў куце за апошнім сталом.— Села б другая дома дый натрэскалася, а то панялі моду, такі ўжо вялікасвецкі шык — есці цукеркі на людзях.

Пачалося абмеркаванне, і першым падхапіўся дацэнт Сённечка. Гэтага чалавека, які, відаць, таксама меў некалі імя і імя па-бацьку, звалі Сённечка з-за яго лішняй далікатнасці. Гаварыў ён заўсёды пяшчотна, памяншаючы, усё як бы енчачы ад шчасця. А ўсё з-за сваёй дабрадушнасці, нажытай разам з пузцом. Такія ўвесь век пражывуць добранькімі і харошымі, хоць да раны прыкладай. Праўда, калі рана развярэдзіцца пасля яшчэ болей, то асабліва не здзіўляйцеся. Сённечка пачаў правільна і па парадку.

— Дарагія, мой даўні вопыт падказвае, што пры напісанні курсавых работак дысцыпліна студэнтаў і кантроль над імі — галоўнае.

Далей-болей, і, адчуўшы сваю гаспадарскую замілаванасць, Сённечка саслізнуў неўпрыкмет на свой адвечны тон:

— На вучоным савеціку рэкамендавалі нам, напэўна ж, курсавыя работы рабіць па значнасці вельмі і вельмі самастойнымі. Дык вось, калі мы, балазе, сабраліся абмяркоўваць гэтае пытаннейка,

то давайце пагодзімся, што будзем сённечка сумленна адносіцца да працы, да нашай агульнай роднай працы.

Вось і ўсё, што сказаў Сённечка. Але яго слухалі, як заўсёды, ахвотна за яго манеры ў выступленнях.

Усё было б гладка і нават са светла-ружовай у блакітны гарошак рэзалюцыяй, калі б пасля салодкіх Сённечкавых прамоў не ўстала старая дзеўка Ліза Румянок, худзенькая, але і не такая ўжо і нягеглая жанчына.

Бацька адразу падумаў: «І сюды цябе бура ўнесла». Падумаў злосна, бо на кафедры даўно ўжо сваталі Бацьку да Лізы, а яму нешта не карцела.

Ліза Румянок, адчуваючы ўсю бездапаможнасць жанчыны, якая не абараніла яшчэ кандыдацкай дысертацыі, пачала нервова, канвульсіўна ўздрыгваючы:

— Я вельмі згодна з вамі,— яна кіўнула загадчыку,— што напісанне курсавых — адказнасць. Большасць нашых студэнтаў здольны іх напісаць.

Зіна і Яніна з рэўнасцю вывучалі някепскія ўборы Лізы і, відаць, разважалі прыблізна аднолькава: добра ёй, адной жывучы, і ўбірацца.

Ліза набірала разгон і прыйшла да самага галоўнага. На высокай трагічнай ноце, стралой выцягнуўшы шыю, яна абвясціла з адчаем:

— Але якія бываюць выпадкі! Жахліва падумаць! Некаторыя студэнты спісваюць курсавыя работы. Яны бяруць ад цяперашніх чацвёртакурснікаў леташнія чарнавікі, а больш нахабныя проста крадуць адсюль, з кабінета, старыя арыгіналы. Адны і тыя ж работы вандруюць добры дзесятак гадоў.

Бацька думаў: «І што тут жахлівага? Калі вы такія разявякі, то студэнты, вядома, ловяць момант».

Але Ліза не дайшла яшчэ да такіх цвёрдых высноў, і няведанне давала ёй шмат энтузіязму:

— У гэтым вінаваты і мы самі. У нас старыя работы валяюцца дзе папала, бяры вунь колькі хочаш на шафах, пад шафамі. Можа вы будзеце ласкавы сказаць,— яна зноў кіўнула загадчыку,— што пішацца ў інструкцыях пра захаванне курсавых работ.

У інструкцыях нічога не пісалася, загадчыку ўжо надакучылі гэтыя курсавыя, і ён сказаў, што інструкцыя абавязвае знішчаць работы пасля іх абароны.

— А як іх знішчаць, ці ўсе агулам, ці кожнаму выкладчыку сваё?

Цікаўная Яніна не кіравала напісаннем курсавых, але хацела ўсё ведаць. Тут сваю дзяржаўную моц і ўладу рашыў паказаць Цвыркун, які, не ўстаючы, аб'явіў нешта даволі дзіўнае:

— Работы можна было б здаваць як утыльсыравіну, але мы не дапусцім, каб нехта на гэтым нажываўся. Тут ёсць пярэчанне нормам маралі нашага грамадства. Таму ёсць думка, што старыя работы трэба паліць, і, галоўнае, аднаму чалавеку, які б за гэта адказваў. Нам трэба вызначыць падпальшчыка. Вось...

Цвыркун думаў скорым ходам і таму гаварыў па-вайсковаму рэзка. Па тым, як ён таропка абарваў сваё «вось», было відаць, што ледзь-ледзь не дадаў — «дурні непуцёвыя».

Фанатык, перад якім у яго гады толькі пункцірна намячаўся крамнёвы шлях навукі, вырашыў, што яго трэба адольваць яшчэ і карыснымі

парадамі. Угнуўшы спіну, ён дрыжачым, якатлівым голасам выпаліў:

— Можа, работы трэба аддаваць камендантцы нашага корпуса, яна хай знішчае. Я во магу пайсці і цяпер дамовіцца, а то выкладчыкам ці ёмка будзе?

Нейкую крамолу ўчуў тут Цвыркун і, састроіўшы сярдзітую міну, якая так не пасавала да яго востранькага, нюхлівага твару, зусім азвярэў:

— Ні ў якім разе, таварыш аспірант, выбачайце, забыўся, як вас зваць. Летась кафедра літаратуры даручыла гэта нашым тэхнічным работнікам. То яны паклалі ўсё ля вахцёра і пакуль адумаліся — нічога не засталося. Для гэтай сур'ёзнай справы нам патрэбен кваліфікаваны чалавек. Я прапаную даручыць Зміцеру Апанасавічу — ён надзейны таварыш.

Бацька заёрзаў. Усе маўчалі, бо радаваліся, што назначылі не іх, і Бацька згадзіўся, трывожна запытаўшы:

— А па якой лініі мне залічыцца гэта ў нагрузку?

Асуджаючы Бацьку ў душы за дробязнасць, Цвыркун сказаў, што гэта залічыцца па лініі грамадскай працы, а ў пратаколе трэба запісаць, што Зміцер Апанасавіч назначаецца адказным па захаванню курсавых работ.

Хаця дацэнт Доўнар і пакляўся сабе маўчаць, бо як-ніяк зараз пачнуцца яго перавыбары, усё ж не ўтрываў:

— Дык як жа мы запішам, што Зміцер Апанасавіч адказны па захаванню работ, калі на самой справе ён будзе іх знішчаць? Гэтак мы можам трапіць пад абстрэл любой камісіі.

Доўнар сказаў пераканаўча.

Цвыркун кашлянуў дзеля важнасці і прамовіў:

— Гм... праўда, тут трэба неяк інача павярнуць. («Каб ты варочаўся на тым свеце, у нейкія падпальшчыкі ўпісаў»,— слаў мысленныя праклёны Бацька). Напішам так: адказны за... за санітарны стан нашага кабінета.

Але самым няшчасным быў цяпер усё ж не Бацька, а Фанатык, які ўткнуў свае тры грошы: «Што ж я нарабіў? І заракаўся кожнае слова абкатаць, гаворачы з начальствам. Нашто мне было лезці? Не дадуць цяпер абараніць дысертацыю. Во, ён ужо і забыўся, як я завуся. А ў мяне ж двое дзетак дробненькіх. А-е-я-ей... Во ўскочыў, дык ускочыў. Як яго ўлагодзіць? Мабыць, куплю яму букет чырвоных цюльпанаў?»

Тым часам меркавалі пра другое. Уступ рабіў Цвыркун, які чамусьці адчуваў сябе, як на двое коней уссеўшы. Яго голас у важных выпадках гучаў элементарна занудліва:

— Таварышы! Усе вы ведаеце, якая гэта адказная праца — прыём уступных экзаменаў. Але нічога не зробіш — такая ўжо наша выкладчыцкая доля. Чакаецца, як і штогод, вялікі наплыў абітурыентаў. Вы ведаеце, што наш факультэт, як ніводзін, мае вялізнейшую папулярнасць, рэдка дзе знойдзеш такі конкурс, як у нас, філолагаў. Філолаг — гэта гучыць ганарова. Таму прадметная камісія з сямі чалавек, якую мы ствараем, павінна быць працаздольнай, мэтанакіраванай.

Напружанасць знікла пасля таго, як быў аб'яўлены спіс камісіі. Цвыркун і тут не прамінуў паказытаць людзям нервы:

— Мы выбралі самых дастойных і надзейных

таварышаў і думаем, што яны апраўдаюць наша давер'е.

Дастойныя сціпла апускалі позіркі, а недастойныя разгублена міргалі.

— Чуеш, Зінка, гэта пра цябе,— захоплена ўздыхнула недастойная Яніна і пачаставала сяброўку яшчэ адной цукеркай.

— Я прашу слова,— цяжка ўзняўся славуты сваёй дробязнасцю адзін дацэнт.— Хачу выказаць сваю просьбу і, думаю, мяне падтрымаюць. Вы, таварыш Цвыркун, як начальнік, павінны нам памагчы. Трэба, нарэшце, зрабіць старшынёй прадметнай камісіі чалавека з нашай кафедры, а не з кафедры літаратуры. Гэтыя літаратары-лібералы, яны вечна ўзвінчваюць высокі бал, яны праз пальцы глядзяць на памылкі, асабліва на знакі прыпынку. Гэта абуральна — няма ў сачыненні трох-чатырох косак, а ён усё роўна пяцёрку ставіць. Не экзамены, а цырк.

У кабінеце стала шумна, тлумна, шмат хто хацеў сказаць пра сваю крыўду на кафедру літаратуры.

— Правільна! Яны самі непісьменныя!

— Пачне там абітурыент складней гаварыць, то яны развесяць вушы і любуюцца, а што памылка на памылцы, то ім не абходзіць.

— Затое ж яны паэтаў набіраюць,— падкусіла вядомая грамадская дзеячка. Падкусіла і чамусьці захіхікала дробненька.

— Ад гэтых паэтаў усе непрыемнасці на факультэце.

— Гультаі і п'яніцы!

— Вучыцца не хочуць! Геніяў строяць!

— Цішэй, таварышы! — Цвыркун падняў руку.— Вашы крыўды справядлівыя. Я пастараюся памагчы. Сапраўды, як вы кажаце, з паэтамі

цэлае гора, і не толькі на нашым факультэце, а наогул. Хаї едуць у Маскоўскі літінстытут, у Маскве з імі разбяруцца, а наша галоўная задача — выхоўваць добрых педагогаў. Вось...

Бацька, нарэшце, адгадаў, чаму так сумна і нязручна яму сядзець, чаго ён соўгаецца на крэсле. У яго ж ногі мокрыя, чаравікі не высахлі з учарашняй адліжнай дарогі. Трэба падсушыцца, добра, што сеў ля батарэі. Развязваючы шнуркі, Бацька адчуваў нейкую несправядлівасць у гутарках сваіх калег: «Чаго яны хочуць? Каб не паэты, самі без хлеба засталіся б. Дзе б яны бралі прыклады да сваіх правілаў пра коскі? Уся іхняя пунктуацыя трымаецца на анархіі параўнанняў і метафар».

Бацька скінуў цяжкія, як кандалы, чаравікі, а шкарпэткі неўпрыкметку ўскінуў на батарэю і радаваўся. Ногі соладка і казытліва-балюча ажывалі. Пасля ўчарашняга вясновага раздолля Бацьку надта сумнымі здаваліся і гэты запылены кабінет, і гэтыя гутаркі, шырокія і мутныя, як рэкі ў паводку.

Душа выкладчыка Гайдука трымцела. Ужо ішло перамыванне яго костачак — перавыбіралі па конкурсе.

— ...але разам з тым у працы таварыша Гайдука ёсць і недахопы,— гаварыў далей загадчык. Толькі ён меў права пачынаць экзекуцыі.— Вы, напрыклад, слаба ўдзельнічаеце ў грамадскай рабоце. Якія ў вас грамадскія нагрузкі?

— Я — старшыня факультэцкага таварыства аховы прыроды,— прастагнаў успацелы Гайдук.

— Во-во,— узрадаваўся Цвыркун.— Нават жыццё факультэцкага расліннага свету не маглі ўберагчы. Усе вазоны пасохлі, усе кветачкі звялі.

— Што я зраблю? — апраўдваўся Гайдук.— Калі мне з грамадскай работай не шанцуе. Нядаўна складалі нейкія спісы, то як дзялілі, хто якую літару будзе весці, я выцягнуў «ы». І застаўся без грамадскай работы. Няма ў нас прозвішчаў на «ы».

Затое дацэнт Доўнар перад Гайдуком выглядаў, як свяціла перад медным грошам. Ён і член мясцкома, і прыкладны выкладчык, які карыстаецца заслужаным аўтарытэтам, ён і актыўны навукоўца (за пяць год апублікаваў звычайныя і пашыраныя тэзісы будучага артыкула).

Ліза Румянок, здаецца, зараз пачне мадрыгал па нотах:

— Шчасце жыць і працаваць, калі побач з табой працуе такі цудоўны, чулы калега.

Зіна і Яніна гадалі шэптам:

— Куды яна хоча вырваць пуцёўку? Ёй аж дух займае. Пэўна, у Сочы?

— Не, я чула, што выдзелілі адну на Залатыя пяскі ў Варну.

Шкарпэткі пачалі смярдзець. Бацька зусім і не пачуў, бо, як вядома, мала каму да сябе свой смурод даходзіць. Першы зашморгаў носам зацюканы Гайдук — ён сядзеў уперадзе. Але Гайдук і скрануцца не асмеліўся. Далей-болей — і хваля рэзкага распаранага духу пругка даплыла да Зіны і Яніны, лёгка перабіўшы водар іхніх парфум.

— Зінка, ты чуеш?

— Чую.

— Што ты чуеш?

— Цвіцём.

— Таварышы, прашу цішэй,— загадчык пастукаў аловачкам па стале.

Зіна і Яніна, як згаварыўшыся, перашмыгнулі на другі рад, да самых дзвярэй. Там людзі здзіўлена пераглянуліся: чаго гэта? «Распусціліся ўжо зусім,— падумаў загадчык, да якога таксама нічога не даходзіла.— Кафедру немагчыма правесці».

Ліза Румянок шчабятала, а тым часам асмялеў і Гайдук, які ўжо не мог трываць. Ён таксама рынуўся на другі рад, зачапіўшыся за стол і нарабіўшы грукату.

У загадчыка нервова затурзалася правае вока. Ён адчуў, што пачынаецца нешта нядобрае. «Што з імі робіцца? — калаціла загадчыка.— Ад іх, праўда, нічога добрага не прыходзіцца чакаць. Але ж ніколі так не было. Адзін толькі вунь Зміцер Апанасавіч чалавек чалавекам. Сядзіць сабе спакойна».

Тут падняўся Фанатык і перайшоў на адзінае свабоднае месца, што засталося на другім радзе. Загадчыка ажно падкінула з крэсла. «Яны, відаць, згаварыліся мяне забіць. На кафедры путч! — бліснула ў свядомасці прафесара.— Яны акружаюць мяне!»

З сухім трэскам шырока расчыніліся дзверы, і ў кабінет усунулася трывожная галава Адэлі. Адэля павадзіла мутным позіркам па людзях і, устрапянуўшыся, раптам закрычала:

— Зміцер Апанасавіч, каня апушыла!

Прафесар як стаяў, так і асунуўся ў крэсла.

## VII

Перакармілі. Каню аддалі ўсе абеднія аб'едкі з дзіцячага сада. Аб'едкаў сёння было як ніколі — у дзяцей, узбуджаных цікавасцю да няшчаснай жывёліны, прапаў апетыт. Буланы стаяў на

прывязі і толькі цяжка дыхаў. Яго бакі сталі вялізныя і тугія.

Калі Бацька ўляцеў у двор інтэрната, то вадзіць карагод каля каня прыйшла чарга самай старэйшай групе. Дзеці, шчасліва пабраўшыся за рукі, з імпэтам ішлі разам з выхавацелькай і голасна, няскладна вякалі: «Эх ты, конік, ты наш конік». Выхавацелька падпявала: «залатыя капыты».

— Ану, марш адгэтуль, шантрапа,— кінулася Адэля да выхавацелькі: — І ты, дзяцінная матка, замест каб парадак зрабіць, песні тут развяла. Глядзі, завыеш.

Бацька ведаў, што трэба найперш рабіць у такой бядзе.

— Развядзі гашанай вапны,— крыкнуў Адэлі.

Уліўшы Буланаму ў горла бутэльку вапнавага раствору, Бацька паспакайнеў і пачаў цягаць вёдрамі халодную ваду. Адэля астуджвала каня — палівала і масажыравала бакі.

Тым часам з-за вугла інтэрната раз-пораз цікаўна высоўваліся па чарзе галовы. Гэта дабеглі і сюды Зіна з Янінай.

— Зінка, глянь,— цыркі цэлыя.

— Парвацца можна!

З радасці Зіна ажно ўшчыпнула Яніну. Зарагаталі. Смялелі яны хутка. Асцярожна падыходзілі, робячы засяроджаныя і спагадлівыя позіркі.

— Бедная скацінка,— загаравала Зіна.

— Гэта ж трэба такое няшчасце,— падпявала другая.

Бацьку перасмыкнула, нібы ток па целе прайшоў, але ён усё ж змоўчаў, хаця вачмі шукаў сваю пугу-дратаванку.

— Дзіма,— Зіна далікатна звала Бацьку на

гарадскі манер,— чуеш, у нашай вёсцы, помню, пры такой бядзе соль у вочы сыпалі.

— Каму ў вочы? — перарваў Бацька.— Скаціне ці таму, хто падглядае? Дурное ваша сяло. Цяпер трэба хвост уверх падняць і трымаць, каб... гэтае самае... газы добра выходзілі.

Адэля, якая дагэтуль з нянавісцю касавурылася на няпрошаных, загадна ўзрадавалася:

— Ану, бярыцеся за хвост, чаго пасталі?

— Мы не хочам за хвост, мы кандыдаткі навук,— у адзін голас ганарова запратэставалі няпрошаныя.

— Ах вы, нягодніцы! — вызверыўся Бацька так, што сяброўкі кінуліся ў бакі.

Яніна абурана ўскрыкнула:

— Мы не падглядаць прыйшлі, а мы прынеслі курсавыя работы, якія вы, Зміцер Апанасавіч, павінны былі самі ўзяць. Вам жа сёння на кафедры даручылі знішчыць іх.

Яна кінула на мяхі пшаніцы цэлы стос курсавых, узяла пад руку сяброўку Зіну, і яны пайшлі.

Адэля памкнулася было лінуць на іх вядро вады, але не асмелілася, вельмі ж ужо важнай паходкай яны адыходзілі.

Бацька пагладзіў Буланага і, каб вывесці яго са здранцвення, пачаў вадзіць яго вакол садзіка. Пасля нейкіх трыццаці кругоў Буланы пачаў ажываць.

— Гэта ж трэба, каб так сталася,— казаў Бацька Адэлі, якая таксама сумленна прайшла ўсе кругі.— Хацеў жа свайму хлопчыку, што ў мяне ёсць на раёне, пшаніцы які пуд завезці, а тут — на табе...

Бацька, як ён і надумаўся ноччу, павёз пасля паўдня сваю пшаніцу да сястры і швагра. Ехаў у нейкай поўнай бязважкасці пачуццяў і думак,

згорбіўшыся, зусім не пакрыкваючы на Буланага. Конь пасля гарадскога жыцця ледзь ногі перастаўляў. Паглядзеўшы на Бацьку збоку, можна было падумаць, што агарнуў чалавека глыбокі одум. Невядомасць будучыні давяла да таго, што ўсё здавалася нерэальным,— і гэтая вузкаватая дарога, якая гублялася ў няшчыльным тумане, і гэтыя мяхі на падводзе, і піск колаў, што ўсё больш рабіўся выразным.

Так маркотна было Бацьку да самых прыцемкаў, да таго мястэчка, дзе ён купляў пшаніцу і дзе цяпер воляй-няволяй мусіў пераначаваць. Толькі цыгарэты памагалі, ды трохі ажыўляліся думкі, калі меркаваў, ці можна даваць есці Буланаму пасля такой бяды. Нанач добра падмарожвала, і калі вылузаўся маладзік, сінія вясновыя цені лесу так прахалодна і лёгка клаліся на дарогу і на вандроўніка, супакойваючы і суцяшаючы.

Бацька яшчэ больш неўзлюбіў мястэчка, калі заехаў да Лукаша.

Лукаш сядзеў на кухні, у бялізне. Ён спяваў. На стале, здаецца, чэрці гарох малацілі: пустыя бутэлькі ад гарэлкі і дзве поўныя віна, перакуленыя шклянкі, салёныя гуркі на газецінe, шпроты ў салатніцы. Лукаш спяваў з надрывам, манерна, аж кадык хадзіў ходарам: «Вы не вейтеся, русые кудри, над моею больной головой».

— Ну, Лукаш, здароў! Загуляў ты, відаць?

Бацька патупвае, расцірае скрэплыя на марозе рукі. Лукаш кінуў спяваць.

— Эх, друг ты мой, прыехаў. Прывёз майго кіраўніка? Дзе ён, заняты сабака? Сюды яго!

— А дзе Цяслюк?

— Не ведаю. Можа, ён і памёр.

За гадзіну з гакам Бацька ўразумеў з Лука-

шовых блытаных гаворак, якія перарываліся доўгімі запрашэннямі выпіць, што з Цеслюком яны прапілі добрую палову грошай. Жонка Цеслюка ў магазіне адабрала рэшту і лупіла мужа, а ёй памагала магазіншчыца. Шукаць Цеслюка няма чаго, бо на якую трасцу ён, безграшоўны, цяпер патрэбен? Лукаш гаварыў-гаварыў, а пасля зноў заспяваў пра «русые кудри».

«Што ж, калі так,— падумаў Бацька, распрагаючы каня,— заеду заўтра. Швагрусь будзе рады».

Вось нядобрае мястэчка ўдалося. Ніколі ў ім не шанцавала Бацьку. Але ён цвёрда рашыў даваць лататы адсюль толькі тады, калі, прагульваючыся, падышоў да канторы саўгаса. Ціха, пуста, вокны цёмныя, як палонкі. Месяц свеціць добра, і каля канторы відаць дошка-табліца. На ёй напісана шмат чаго. Бацька чытае: «Сацыялістычныя абавязкі на бягучы год. Атрымаць збожжавых 25 цэнтнераў з гектара, у тым ліку — азімага жыта — 23,5 цэнтнера, пшаніцы...» Тут нічога не было напісана, стаяў вялікі прочырк. «Ці ж яны тут не сеюць пшаніцы? То адкуль яе Цяслюк узяў?»

І тут Бацькава падазрэнне стала канчатковым прасвятленнем — Цяслюк прадаў ім не сваё, ён недзе нешта змахляваў, на возе крадзеная пшаніца. Божа, божа з высокага неба! Трэба дзыгаць адгэтуль!

Насупраць дошкі — пусты фанерны стэнд «Акно сатыры». Дзе ж вы, мясцовыя сатырыкі і гумарысты? Эх, мястэчка, нездарма тут барахолка была, яе махлярскі дух яшчэ не развеяўся па белым свеце. Бацька дастаў кавалак крэйды і намаляваў на фанеры нейкую брыдкую морду, а знізу падпісаў: «Цяслюк крадзе пшаніцу».

Бацька не быў мастак ад прыроды, асаблівага бляску і гармоніі ў малюнку не было, але сэнс быў дакладны.

Увесь вечар Бацька настальваў Лукашову зазубленую сякеру. Ці мала што ў дарозе можа быць? Свет цяпер трывожны... Сякера гадоў дзесяць была нявостраная, уся як піла, і Лукаша за такі дагляд трэба было лупіць, але ён хроп.

Нарэшце, калі лязо ад дотыку пальца зазвінела так, як Бацьку хацелася, звонкім гудам злой асы, ён супакоіўся.

Ранічкай Бацька паспешна з'ехаў. Быў ён выспаўшыся, абсохлы, ад таго і павесялеў. І чым бліжэй пад'язджаў да гарадка Сцешына, тым весялей рабілася на душы — як-ніяк усё ж бліжэй да сваёй стараны, а там і надзейна, і знаёма.

Бацька любіў Сцешына асаблівай любоўю. Можа, і таму, што ў свет яго дзяцінства гарадок увайшоў спачатку далёкай таямнічай легендай, дзе тварацца немалыя цуды. Яны даходзілі і ў хату — у каморы на паліцы стаялі гліняныя высокія глякі, большыя і меншыя міскі, збаны. І не такія простыя, на штодзень, а бліскучыя, паліваныя, аздобленыя малюнкамі шышак, галінак папараці, лісцяў. «Сёння на стол Сцешынскае»,— казала маці, і гэта значыла, што ўрачыстасць мае немалы ранг сярод іншых. З-за гэтых прыгожых узораў, з-за сваёй прыналежнасці да святаў сцешынскі посуд стварыў святочны, напаўзагадкавы культ невядомага Сцешына. Напаўзагадкавы таму, што няхітрае, але сапраўднае мастацтва ганчароў мела тады асаблівую сілу — гэта значыць у Сцешыне ёсць людзі, якія звычайныя шышкі, лісце могуць рабіць вунь якімі прыгожы-

мі, далікатнымі. I навек запомнілася Сцешына тады, калі першы раз ездзіў з дзядзькам у гарадок па кафлю. Кафля хоць і была, як ён помніць, дарагаватая, але ў вёсцы яна цанілася, «як звон сярэбраны». Цяжкія квадратныя кафліны ў ромбікі, з цёмна-зялёнай палівай, дзядзька па адной выносіў са склада і асцярожна, як нешта жывое, нёс на высланыя саломай калёсы. Ля падводы мацаваў пстрычкамі — ці няма дзе трэшчыны — у кафлінах дзынканне перарастала ў гул і заціхала. Зміцер Апанасавіч і цяпер помніць той шчымлівы гул, помніць і шчасце новай зялёнай печкі — самае прыгажэйшае і незвычайнае, што было ў хаце.

З такой вялікай удзячнасцю да маленькага гарадка ўехаў Бацька ў Сцешына, дзе ўжо выразна быў чуваць подых вялікіх лясоў — вецер быў не такі пусты, як у палях, а тужэйшы, з ледзь улоўным водарам ляснога прадвесня. Сцешына, здаецца, ажно цягнулі ўверх гонкія вежы двух касцёлаў — чырвонага і белага.

Пачапіўшы Буланаму на галаву аброчную торбу з аўсом, Бацька добра папалуднаваў у багатай сталоўцы. Потым ён зайшоўся на мясцовы базарчык пад гонтавай стрэшкай. Там было пуставата — пару бабак прадавалі шкляначкамі markedly рознае насенне, ды яшчэ тупаў дзядок у ватоўцы. Па яго рухавасці і худобе было відаць, што ён гаваркі, няўрымслівы, але гэтыя суседкі яму надакучылі. Дзядок прадаваў гліняныя пеўнікі-свісцёлачкі, нейкія весела пафарбаваныя чарапкі, драўляныя лыжкі і дудачкі. Торг, відаць, быў слабы, і дзядок ходарам захадзіў ля сваіх цацак, угледзеўшы незнаёмага.

— А дзе ж, дзед, вашы слаўныя сцешынскія збаны і глякі, талеркі вашыя?

Дзядок спачатку разгубіўся, часта заміргаў, а пасля пакорліва далажыў:

— У Бэльгіі, сынок, у Бэльгіі.

— У якой Бэльгіі?

— Ну, ёсць такі край, туды найболей і вывозяць на выстаўкі ўсякія. Цяпер усё гэта начынне робяць на фабрыцы спецыяльнай. А фабрыка табе на базар не панясе. У яе свой план, адпраўляюць усюды.

Дзядку яўна падабалася далёкая краіна з такой загадкавай, трохі фанабэрыстай назвай. А можа, ён меў калісь каня славутай бельгійскай пароды? Хто ведае...

— А чаму ж вы самі не робіце?

— Гэ, сынок, такой вось драбязы я магу нарабіць. А што большае — нашто мне цяперашнім светам трэба? Сваё ганчарства — гэта пекла. Фабрыка дык усё машынамі робіць, як у той песні — «камбайн косіць, і малоціць, і салому падае». Мой брат старэйшы некалі сам вырабляў, то, думаеш, шмат пажыў? Ад духу гарачага памёр, ад чаду — абпальваць цяжка было.

Дзядок засумаваў ад успамінаў, а потым з жалем прапанаваў:

— Купі во гэтую дудачку за паўрубля, паглядзі, як хараша трубіць: ту-ту-ту, тру-ту-ту... З клёну, з самага пеўчага дрэва.

Дудачка і праўда была харошая — невялічкая, але галасістая, з белага дрэва, на ёй выпалены розныя хітрыя ўзоры.

Дзядок яшчэ раз сыграў, узяў паўрубля і пачаў збіраць усіх сваіх пеўнікаў, сцішана радуючыся: «Ну і добра, мне болей і не трэба».

Добры гарадок Сцешын, і людзі ў ім спагадлівыя. Дзве малыя дзяўчынкі на выездзе нават ручкамі ў добры шлях памахалі. Шлях і праўда

быў добры. І Буланы ішоў жвава, і пагода лагодная. Бацька, які да Сцешына ішоў пешшу за возам, цяпер усеўся на мяшкі, шчасліва дастаў дудачку, пагладзіў яе і зайграў чыстым гукам:

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

Ён зайграў, пад сэрцам соладка заныла, і так захацелася падспеўваць самому сабе, голасна, ні ад кога не хаваючыся: «Калаўрот мой, калаўрот, ты ўсё круцішся».

Бацька і сам не ведаў, чаму далей мелодыя наводзілася на заліхвацкую шырокую польку, тую самую, з якой ён некалі збіў не адны чаравікі, той, пры якой пелася вясёлая прыпеўка: «Ой ты, полечка-трасуха, дождж ідзе, дарога суха...»

Тру-ту-ту-ту! Тру-ту-ту-ту!

І, як нешта далёкае, прыгадалася сваё далучэнне да вялікага свету polькі. Спачатку хлапчуком-падшпаркам не прапускаў з сябрукамі ніводнай вечарынкі. Сноўдалі між хлопцаў і дзяўчат, цікавалі, хто з кім найчасцей танцуе, каб не прамінуць назаўтра падражніцца. Цягалі ваду са студні разгарачаным танцорам, летам і восенню пад шумок латашылі гаспадарскія сады. Тады і былі засвоены асноўныя прыёмы танцаў.

Вечны гарманіст Мішка-смаляное горла (бо браў плату гарэлкай) расцягнуў мяхі (як казалі, аж да Вільні) — і адзін са старэйшых і дзябёлейшых дзецюкоў, фарсіста іграючы хромавымі ботамі, першым ішоў праз хату да дзяўчацкай сцяны. Пакуль ён далікатна, але ўпэўнена выструньваўся перад якой-небудзь дзяўчынай, адвешваючы ёй ледзь заўважны паклон, а другія дзеўкі елі яго позіркамі, нехта з хлопцаў гучна падраготваў: «Бач, як выпінаецца».

І пайшло. На паўвёскі чуваць было, як вўхала і, здаецца, ажно падскоквала сама хата. Ад-

ны танцоры — найбольш вёрткія пстрыкуны — віхурай аблятаді хату, робячы каркаломныя кругі, задаволена ўсміхаючыся свайму ўмельству і спрыту. Другія — больш флегматыкі — тыя засяроджана, па-гаспадарску, як бы робячы нейкую важную работу, малацілі нагамі падлогу, выбіваючы ў такт такі рытмічны грукат, што было страшна, ці дадзержыць падлога. Першая катэгорыя танцораў надавала польцы адчайны палёт, лёгкасць, другая — стварала ўражанне нечага важнага, заснаванага на трывалым грунце жыцця. Усё гэта суладдзе, праўда, трохі парушалася, калі пара падбіралася неадпаведна па сваіх тэмпераментах і адносінах да забавы — тады адзін з танцораў некуды ўсё памыкаўся ляцець уперад, а другі як бы стрымліваў яго, малоцячы нагамі. Але нічога, усё сыходзіла добра, калі толькі не пачыналася якая-небудзь валтузня ў сенцах ці нават бойка на ўсю хату. Лупілі па лямпе, а дзеўкі з віскатам вылятаді праз вокны і дзверы.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

Зміцер Апанасавіч шмат чаго з тых дзён пазабываўся, але першую сваю музыку помніць добра. Калі вучыўся ў дзевятым класе, пад дзецюка браўся, выходзіла замуж старэйшая сястра, да якой ён цяпер вось і едзе, і, вядома, тады ён, як родны брат, быў на ганаровай пасадзе першага шафера. Вясельная музыка — з цымбаламі і скрыпкай — узняла яго на сваіх крыллях, і хоць спачатку ёкала сэрца, а ногі, як адубелыя, ступалі не так і складна, але было нягорш ды яшчэ з такой танцоркай, як стрыечная сястра, цыбатая Гэлька.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

Меншая за Змітрака на адзін клас Гэлька, здаецца, нават і не танцуе, а проста падскоквае,

як бы ў яе скакалка ў руках. І косы яе, з вузельчыкамі банцікаў на канцы, таксама падскокваюць, і ў вачах столькі радасці, як, напрыклад, у маладой козачкі на вясновым лузе. Так думае пра Гэльку Змітрок — ён танцуе і не рады ёй, думае больш стала і ажно ўпацеў ад доўгага танца, але кінуць — абняславіцца не можа. Ды яшчэ цяпер, калі ён у новай вельветавай футболцы, з белымі шаферскімі стужачкамі на грудзях.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

Ад таго вечара і пайшло шмат танцаў у жыцці. Спачатку, па завядзёнцы, старэйшыя кавалеры са смехам глядзелі на «зелень», штурхалі. Было крыўдна і ўсё ж найперш радасна, што і ты вырас, і можна нават рабіць перакур, цвыркаючы раз-пораз слінай перад сабой. Уся «зелень», перш чым выбіцца ў сапраўдных кавалераў, таўклася па кутках і закутках. Ніхто з іх і асмеліцца не мог падацца на сярэдзіну хаты — усё роўна адціснуць старэйшыя, хоць ты, можа, і не горай за іх танцуеш. Ён тады і не думаў, што гэтая хлапечая крыўда не раз успомніцца яму ў дарослым жыцці асабліва выразна — некаторыя людзі думаюць, што аднаго толькі ўзросту зусім дастаткова для атрымання нейкіх асаблівых выгод ці ўвагі.

З вясёлымі вясковымі танцамі, якіх не мінаў будучы і студэнтам, праходзіла нялёгкая пасляваенная маладосць ад якіх-небудзь шаснаццаці год, калі пачаў і за дзяўчатамі ўвязвацца, падводзіць дахаты. Спачатку неяк смешна і бесталкова выходзіла, ажно злосна самому на сябе рабілася. Стаіць, спрабуе абняць дзяўчыну, а пасля ўсміхаецца ўноч і з радасцю, як першы раз пачуўшы, смяецца:

— Чуеш, як мой Лыска забрахаў...

Штогод усё бліжэй да сярэдзіны хаты прабіваўся пасталелы кавалер Змітрок.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

І тут, на танцах, аднойчы спазнаў, што ў свеце ўсё пабудавана на непарушных законах. Прайшоўшы ўрокі танцорскага майстэрства, Змітрок зразумеў — на ўсё ў жыцці ёсць свае правілы. Калі танцуеш — слухай музыку, няважна, як там іграюць — ці раскошна па-вясельнаму, ці мяхі расцягвае Мішка-смаляное горла — усё роўна патрапляй у тон і ступай у такт, як кажа музыка. Бо знайшоўся ж адзін рызыкант — дзёрзкі такі, выскачыў з дзеўкай на сярэдзіну і пачаў дурня корчыць — шырока захватваць кругі, чапляючы нагамі другіх танцораў, падсвістваць. І калі ўжо разышоўся як мае быць, узмахнуў рукой і, яшчэ больш настойліва прытопнуўшы, выгукнуў:

— Му́зыка іграе, як знае, а я скачу, як хачу!

Тут яго, вядома, дужэйшыя хлопцы за каўнер — і на двор.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

Ужо надыходзіў той час, калі Бацька думаў навекі развітацца са скокамі. Порстка падрастала новая «зелень».

Іграе сцешынская дудачка з самага пеўчага дрэва, праступаецца роўны шлях, і адчувае Бацька, што тады не скончыліся яго танцы, што пайшлі яны ў самым яго дзецюкоўстве другім ходам і другім манерам.

Першы раз ён адчуў гэта, калі аспірантам нешта вымкнуўся сказаць на кафедры пра дыпломнікаў. Сэнс яго разважанняў быў той, што да напісання дыпломных работ трэба дапускаць толькі добрых студэнтаў, а слабейшыя хай здаюць дзяржаўныя экзамены — можа, хоць падву-

чаць мову і літаратуру. Тады і сказаў яму стары прафесар Антон Пятровіч:

— Выкладчыкі вырашаць гэтае пытанне самі, а вы лепей займайцеся сваёй справай.

Тады ж адзін аспірант адвёў яго далёка ў куток і спалохана сыкнуў:

— Ты што, хочаш быць разумнейшы за начальства? Ды ці ведаеш, што для выканання аб'ёму работы кіраўніцтва дыпломнымі больш важыць, чым усе гэтыя экзамены? Прасі прашчэння.

Ён так і сказаў «прасі прашчэння». «Прашчэння» Змітрок не папрасіў, але перад жаночым днём усё змянілася. Той самы аспірант усунуў яму альбом у зялёнай плюшавай вокладцы, дзе на адвароце было напісана: «Дарагой Кацярыне Паўлаўне ад маладых вучоных».

— Я табе, як земляку, дабра хачу і ўступлю — на, занясі жонцы Антона Пятровіча падарунак.

— Дык я ж не ведаю Кацярыны Паўлаўны,— адказаў Змітрок.

— І я не ведаў спачатку. Нясі,— нерваваўся аспірант.

Змітрок неўразумела валокся з гэтым альбомам да кватэры прафесара і толькі сёння, праз многа гадоў, седзячы на возе, зразумеў, што ў той дзень пачаўся працяг яго танцаў, на новы манер і з інакшай музыкай.

І колькі з таго часу вады ў мора ўплыло? І на якіх могілках стаіць помнік Кацярыне Паўлаўне, якая спачыла пасля вечнага беспрацоўя, той самай Кацярыне Паўлаўне, якая некалі грэбліва ўзяла з рук Змітрака альбом?

Усяго было. І адзнакі некаторым завышаў, і сачыць за маладзейшымі ўмее, і маўчаць добра

навучыўся, і адчуваў, што як бы ўцягнены ў нейкія дзікія скокі, якім канца не відаць.

Толькі тут, на роднай вялікай дарозе, і чуешся чалавекам.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

Нічога не зробіш. Бацька добра помніць — знайшоўся быў адзін рызыкант, крыкнуў: «Музыка іграе, як знае...» І яму далі тады па карку, а пасля і яшчэ далі, бо ён не прасіў літасці.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

Мястэчка кепскае было, але Сцешына — харошы гарадок. Там прадаюцца цудоўныя дудачкі, і калі вы забыліся, як самі пачыналі далучацца да адной з жыццёвых забаў — танцаў — як уваходзілі ў смак, дзе, калі і перад кім вы танцавалі, то ўспомніць вам паможа галасістая дудачка.

Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!

## VIII

Амаль увесь красавік Саша з Толем не вылазілі з бібліятэкі, адчуваючы, што хутка настане такая пара, калі нават і за самымі разумнымі кнігамі ўседзець будзе цяжка.

Каму з тых, хто працаваў у бібліятэцы, не запомніўся строгі спакой навуковых залаў з лёгкім пошумам старонак кніг, газет? І асцярожная хада бібліятэкарак, нашых добрых анёлаў у акіяне друкаванага слова? І трапяткое хваляванне першых дзён, калі ты быў дапушчаны туды і замірал перад бясконцасцю стэлажоў, картатэк?

Апошнім часам Саша яшчэ вастрэй усвядоміў сілу друкаванага слова. Ён чытаў для сябе адну старую газету. Яе старонкі былі запоўнены вель-

мі канкрэтнымі рэаліямі даўняга жыцця беларускай вёскі. Газета была цікавая сваім правапісам, дыялектнымі словамі, па якіх няцяжка было пазнаць, адкуль прысланы допіс, і наогул надзіва сакавітай негазетнай мовай. Беднасць з усіх бакоў ціснула на рэдакцыю, якая часта звярталася да сваіх чытачоў, да вёскі, з просьбай аб дапамозе. Уся прывабнасць газеты была ў прастаце і натуральнасці.

Галоўнае, што ў газеце Саша чытаў і пра свае мясціны, пра сваю вёску. Контурней, выразней у плыні часу пачало вызначацца колішняе жыццё родных краёў.

Адзін допіс быў пазначаны псеўданімам Апальны. У ім пісалася: «У вярсце ад нашага мястэчка цячэ невялікая рачулка праз маёнтак пана Саковіча. Даўно ўжо ў народзе ходзяць слухі, быццам у той рэчцы з'явіўся цудоўны пан Езус. З году ў год на каталіцкае свята «Сэрца пана Езуса» каля гэтага цуду збіраюцца тысячы простага народу. Тамака людзі моляцца, мыюцца вадой з тае рэчкі ды нясуць у касцёл афяры: грошы, шмат яек, лёну, воўны і іншага дабра. Збіраецца такім парадкам больш як на тры сотні рублёў. Поп мясцовы пазайздросціў ксяндзу і зрабіў у той самы дзень праваслаўнае свята. Хоць ніколі не было чутно, каб каму гэты цуд як-небудзь памог, але ўсе ведаюць, што ксяндзу і папу ён такі добра памагае».

Саша чытаў і ўспамінаў крыштальны халадок той рачулачкі, якая цякла з блізкай крыніцы, гонячы каменьчыкі па цвёрдым дне. Рачулка была ў даліне, і да яе хадзілі, нагойсаўшыся па пагорках, густа парослых арэшнікам. Ля яе адпачывалі ўсёй дзіцячай гурмой — сядзелі на вялікіх торбах арэхаў, расказвалі пра розныя прыго-

ды. З палёў, як з печы, цягнула духмяным жарам даспелага лета, а тут была прахалода, ногі соладка адходзілі ад стомы.

Ужо даўно няма той крынічкі, яна пайшла ў зямлю — луг зааралі на поле, але калі памяць пра яе жыве на паперы і ў сэрцы хаця б аднаго чалавека, то хіба знікла яна назаўсёды? Яна жыве, як тыя жніўні і арэхі, у прорве часу яна бруіцца такая ж чыстая і халодная.

І яшчэ Саша радаваўся, што быў у іх краях нейкі яснага розуму вясковы грамацей, які стаіўся пад красамоўнай мянушкай. Гадамі ён упарта пісаў у газету, сілячыся скіраваць жыццё на лепшае, пісаў пра патрэбу школы, бібліятэкі, ваяваў з манапалькай, мясцовымі панамі. Быў, відаць, вясковы грамацей Апальны чалавекам вялікай веры, хадзіў даўным-даўно такімі знаёмымі сцежкамі, шмат чаго прыкмячаў, думаў. З якой павагай піша ён пра залатое мастацтва жанчын — пра іх вышываныя андаракі, сукенкі, пра цудоўныя тканіны, далікатна вытканае палатно.

Саша і сам добра ведаў скарбы бабулінага куфра, усё свята фарбаў у ім. Помніў палосы палатна, якое адбельвалі на вясновай расе лугоў, доўгія, як дарогі, палосы ў ззянні ранішняга сонца.

Якім цікавым сваёй непасрэднасцю, па-жывому трапяткім здаваўся допіс у газету пра тое, што дзеелася тады ў родных краях: «Нядаўна ў маёнтак пана Свентажэцкага прыйшло жаць нешта каля двух сотняў баб. Да таго дня ім плацілі па сорак капеек у дзень, а цяпер ім сказалі, што калі хочуць жаць усе, то памешчык дасць ім толькі па трыццаць; інačай ён пакіне на рабоце толькі семдзесят баб, а другіх адправіць дамоў. Бабы не згадзіліся, пайшлі дахаты

ўсе і, падняўшы на сярпах чырвоныя хусткі, заспявалі песню рабочага народа. Так адбылася гэта забастоўка».

Напамінак пра крыніцу і саматканыя строі жанчын, пра чырвоныя хусткі на сярпах наново, яшчэ больш шырока і радасна, адкрываў свой край.

З такім нязвычным адчуваннем, дзе не апошнім быў нават гонар, Саша і прыехаў дахаты.

Ні душы. Ранішняя вёска сцішаная. Здаецца, прыслухайся — і пачуеш, як натруджана трымцяць сонечныя промні ці як дыхае прагная вясновая зямля, чакаючы сяўбы. Нестарая яшчэ, пасляваенная хата ўся ў дагледжаным садзе, які ўжо ўвайшоў у сілу. Вясновая трава зыркай зялёнай да болю дражніць зрок, ажно жмурышся. Сцешка з падвор'я праз брамку вядзе да асфальту. Як і кожны год, сцежка зноў чысценька, да жывой зямлі, вымецена дзеркачом і, самае прыемнае, пасыпана жоўтым пяском.

Саша стаяў на ганку роднай хаты і са здзіўленнем адчуваў, што ён як бы прыкаваны да цэменту, нейкая дзіўная сіла не дае яму ступіць на сцежку. Падсвядомасць падказвала, што яму нечага не хапае, але яна не давала назвы канкрэтнасці. Як быццам дражнілася.

Саша напружыў памяць, але дарма. Такое адчуванне, калі ён не мог успомніць напаўзабытага, было з Сашам не першы раз. Саша пачынаў злавацца. Каб супакоіцца, ён паходжваў па ганку і курыў.

Ён добра ведаў, што сёння вялікдзень, і ўспомніў чамусьці, калі перастаў хадзіць у царкву. Гэта было недзе трынаццаць год назад. Да пятага класа ішоў і да споведзі. Там поп са службовай зацікаўленасцю, нахіліўшыся да самага тва-

ру, ва ўсіх дзяцей штогод пытаўся адно і тое: «Родителей слушаешь?»

А пасля Саша не пайшоў, хоць маці і ўпрошвала, і абяцала лупіць, як каня абознага. Гэтаму памагло вось што. Саша выпадкам убачыў, як па вялікадні пападдзя ссыпала свінням у карыта чырвоныя яйкі. Іх назбіралі свенцячы. Яйкі з розных хатаў — адны ярка-чырвоныя альбо бурачковыя, глыбокага і роўнага колеру — гэта фарбаваныя крамнай фарбай, другія — цямнейшыя альбо святлейшыя жоўтыя, няроўнага, з разводамі, тону. Гэтыя фарбавалі лупіннем цыбулі.

З усмешкай Саша пакепліваў: «Правільна, што перастаў спавядацца. Нашто быць такім эгаістам і шукаць адпушчэння грахоў, неяк вылучацца. Гэта было б няўдзячнасцю да сваёй радні. Ніводзін з тых, хто ўжо ніколі не сядзе за сямейны стол, не трапіў у рай. Гэта былі вясёлыя, радыя жыццю, а значыць і грэшныя, людзі».

Дзве... тры... пяць... хвілін. Ён кінуў недакурак, і, калі таптаў яго сандалетам, адбылася нейкая бліскавічная ўспышка ў памяці. Тады ажно палягчэла: «Ах, чаравікі; у мяне няма чорных бліскучых новых чаравікаў».

Чаравікі куплялі раз на год, да гэтага дня, як і ўсім вясковым дзецям.

...Маці заўсёды несла з горада вялікую напакаваную сетку. І аднойчы, стоена ўсміхаючыся, яна прыгаворвала: «Ну, што я табе купіла...» Як яна доўга развязвала сетку!

— Мерай, каб хаця цесныя не былі.

Пра тое, што чаравікі могуць быць завялікія, ніхто не бедаваў — дзіця вырасце за вясну і лета. Гэта былі звычайныя, на той час недзе пяцідзесяцірублёвыя просценькія чаравікі. Востра і

казытліва пахлі яны фарбаю, клеем і скурай. Якія чысценькія і бліскучыя яны, можна нават глядзецца, як у люстэрка. Ногі яшчэ не асвойталіся ў іх, і гэта найбольш прыемна, адчуваючы лёгкі халадок і рэзкасць новага.

Чаравікі чакалі свайго дня ў ніжняй шуфлядзе камоды. Калі ты адзін дома, можна, не саромячыся нікога, памераць яшчэ раз і яшчэ раз. І калі нават толькі ведаць, што чаравікі ёсць у шуфлядзе, то і старая, яшчэ з польскіх часоў, камода робіцца незвычайнай захоўніцай скарбу.

Абуты ў іх — у сваё бліскучае шчасце — і васемнаццаць, і пятнаццаць, і дзесяць год назад Саша такой парой кулём вылятаў з-за стала і з ганка ступаў на гэтую сцежку. У зорачках растаптанага пяску сцежка падобна на Млечны Шлях, які ў белы дзень апусціўся на падвор'е. Яго сябрукі ўжо на вуліцы. І ў Лёнькі, і ў Пётры, і ў Андрэя, і ў Сашы — ва ўсіх — новыя чаравікі! Сонца зіхаціць і скача ў іх. Якім доўгім будзе гэты вясновы дзень і на выгане за вёскай, і ў маладым бярэзніку, і на дзіравым масціку праз рачулку!

Цяпер, як бы баючыся ступіць з ганка, Саша адчуваў, колькі харошай паэзіі ёсць у сваёй простай зорнай сцежцы, у дзіцячым захапленні ёю, у самім збліжэнні і адкрытасці людзей, якія несла некалі гэтае вясновае свята.

Папы дарэмна хацелі ўціснуць паэзію ў свае догмы. Для народа свята заўсёды заставалася святам вясны. Ні адна малітва, ні адзін варыянт бібліі не сказалі так высока пра ўвесь трагізм і ўрачыстасць, што звязаны з ім, як сказалі простыя сяляне — «у гэты дзень птушка гнязда не ўе, дзеўка касы не пляце».

— Здароў, Поп! Як даход, як прыход?

Перад Сашам узнік яго сусед і колішні равеснік па новых чаравіках Андрэй. Ён таксама ўжо стаў дарослым і, відаць, таксама паснедаў.

— Прывет, Доктар!

З радасці нават абняліся. Як жа — гадаваліся разам. Цяпер Андрэй вось ізноў жыве дома, правучыўшыся пяць год у Мінску. Працуе інжынерам у саўгасе і, як відаць, задаволены лёсам.

Поп і Доктар... Хлопцы некалі даволі проста займелі такія мянушкі. У другім ці трэцім класе рабілі разам урокі. Так весялей і сапці над сшыткамі, і таблічка множання лепей запамінаецца. На кухні тым часам па-суседску сышліся іх мацеры і, усцешаныя стараннем неслухаў, радуюцца.

— Ну, можа ж, дасць бог, розум прыйдзе. А то і ў аднаго, і ў другога як адкрыеш дзённік, то ўсё — тры, тры, тры... ты-р-р... як калком па плоце.

— Цяперашнім светам трэба вучыцца. Уперад — хто з зямлёй — той сам сабе пан, а цяпер — хто з навукай. Усё перакруцілася.

— Але я табе скажу, як хто чаму навучаны. Ці мала ад нас пры Польшчы і ў Вільні, і па драбнейшых гарадах вучыліся? А дзе яны? Недзе ўсе ці галовамі налажылі, ці па свеце бадзяюцца. Як ужо хто з мужыкоў хоча свет перакруціць, то дабра яму не будзе.

— Пэўна ж так. Я дык хацела б, калі майму будзе навука падавацца,— гэта казала Сашава маці,— то хай бы ішоў ці на доктара, ці на бацюшку. Людзі ўсё роўна ўвесь час і хварэць будуць, і маліцца будуць.

Саша з Андрэем пісалі і слухалі. А пад вечар Саша дастаў з камоды святочную пасцілку-пе-

рабіранку, патыканую шоўкам, і, склаўшы ў два разы, ахінуўся ёю. Замест кадзіла Андрэй прывалок цяжкі бязмен з бліскучай гірай. Бразгаючы бязменам, Саша, падзадаволены віскатам сябрука, пачаў важна хадзіць вакол стала, працяжна распяваючы:

Мёйца сына духа,
На печы саладуха,
На прыпечку кісель,
Каб дастаў, дык бы з'еў.
Аман — чорту камень,
Богу — свечка,
А нам перапечка-а-а...

Не паспеў Саша дацягнуць гэтае працяжнае «а-а-а», як яму раптоўна прыйшлося прадоўжыць яго, толькі іншым тонам: ён узвіўся ад болю — маці ўхапіла за вуха.

Не выйшла — ні папа, ні доктара. Маці правільна вызначыла толькі напалавіну: людзі, праўда, хварэюць, але без папоў абыходзяцца.

— Мой прыход спіць, і даходу з яго вялікага няма. А як жыве сельская інтэлігенцыя?

— Жыве. Грошы на машыны збірае і стогне, што машыны дарагія і доўга чаргі чакаць. Яны і да мяне яшчэ падлізваюцца наперад, думаюць, што я ім саўгасныя запчасткі буду збываць.

Саша жыва зацікавіўся ўсёй гэтай машынэрыяй:

— А куды яны будуць ездзіць? На каго сваіх кароў пакінуць?

— Парасят будуць на базар вазіць. Знаеш, як добра — укінуў у багажнік — і папілаваў...

Раптам Саша цікаўна падумаў чамусьці: «А што цяпер робіць Бацька?»

...Зміцер Апанасавіч быў за многа вёрст ад Сашы таксама ў сваёй вёсачцы, што ляжала

між лёгкіх узгоркаў. Апошнім часам калаўрот яго дзён пайшоў як быццам бы больш запаволеным ходам. Прайшлі розныя згрызоты і дзівосы гэтай вясны, і Бацька спадзяваўся на заспакаенне. Ён паменеей стараўся заходзіць у якія-небудзь спулкі з Адэляй і Лукашом, а з хлопцамі зусім не размаўляў — быў скрыўджаны няўдзячнай ветранасцю прыёмных сыноў і думаў яшчэ аддзячыць ім.

Сумна было Бацьку, замаркоціўся ён ля расчыненага акна. І не з-за ўспамінаў пра гісторыю з той пшаніцай. Глупства гэта — бедаваць пра лішнія запасы. Толькі апошні звадыяш пачне плявузгаць так. Горай, калі пшаніцы няма.

Сум наплываў з зялёнай вуліцы вёскі, ад спраўных дамоў — уласнасці яго равеснікаў. Равеснікі, як было і відаць, і чуваць, жылі добра. Гаспадары, не тое што Бацька са сваёй няўдалай пшаніцай. У іх ужо і дзеці пад дзевак і дзецюкоў бяруцца. «Скора з табой на танцы хадзіць будуць»,— не раз строілі кепікі. Пакепліваалі незалежна ад іх прафесіі — вясковыя настаўнікі, даяркі, трактарысты, і нават паштальён, які, трымаючы сувязь з усім светам, павінен быў стаць, па цвёрдым перакананні Бацькі, чалавекам больш адукаваным.

«Каб вы ўсе на вушах пайшлі,— думаў тады Бацька, а ўголас казаў: — Яно, можа, і так, але хто звязаўся з навукай, таму ўсё трэба ў свой час рабіць».

Вяскоўцы смяяліся і ў вочы, і за вочы, асабліва насміхалася і не давала праходу аматарка вясковых вяселляў і ўсякіх бясед, ахрыплая песельніца Андрэіха: «Ну, калі ж тупнем?»

«Стапталася б ты хутчэй, старая панчоха, з цябе тых песень!.. Слухаеш — хоць вушы заты-

кай, адзін лямант: «Аставайся, матулька, здарова...» Раве, як з дубовай бочкі».

Так злаваўся Зміцер Апанасавіч.

Але сёння і маці родная не стрывала, сказала за сталом як бы не да яго, але жаласліва, быццам просячы: «Людзі і ўнукамі не нацешацца, і гасцінца маюць каму купіць, а хто дык і сходзіцца адзін, і на старасці кубка вады ніхто не падасць».

Маркотна было Бацьку, маркотныя былі думкі: «Добра гэтым, меўшы свае шаляваныя хаты, ды клумбы з высокімі кветкамі каля іх, ды сваю печ і нават свой дымок з печы, сваю перадойку альбо і цельную карову.

А тут вазьмі кабету сваіх гадоў, то што ёй ужо тады казаць — ці мілая, ці каханая, ці саломай напіханая, трасцу яе галаве. Ды і як сям'ю разводзіць у інтэрнаце? Адна Адэля жыцця не дасць сваімі парадамі. Альбо нават калі і кватэру атрымаеш, то мяды невялікія. Нагледзеўся на сваіх сяброў-службістаў. Усе кватэры, хоць большыя, хоць меншыя, аднолькавыя, бо стандартныя. І стаіць у іх усё амаль аднолькавае — на кухні белы фанерны буфет за пяцьдзесят рублёў, у адным пакоі спальня, у другім — тэлевізар на куце, ля сцен — які-небудзь тапчан і мяккія крэслы, кніжная паліца з беднасцю кніг, пісьмовы стол. І ўсё гэта паліраванае, з бляскам. Сядзеш пісаць — паліроўка вочы рэжа. І ніякая табе добрая думка не засвеціць — усё выходзіць прыгладжана, не па-свойму. Вось у вёсцы дык няма, скажам, дзвюх аднолькавых хат, кожны што-небудзь сваё выдумляе. Тут і людзі вальней чуюцца, і кожны неяк цікавей, на свой лад, гаворыць. Гаворыць... гаворыць... Зараз яны табе так нагаворацць, што і вушы звянуць»,— за-

ключыў Бацька, убачыўшы, што худая і лёгкая, як стрэмка, бабуля Паўліна дзыгнула з тылу, праз кухню, у хату. Бацька ўспомніў, што пра Паўліну казалі ў вёсцы: «Разумная, як сава». І праўда ж.

Пасля, седзячы ў Паўлінінай хаце, у зялёным халадку фікусавых джунгляў, Бацька слухаў, які ён вялікі і разумны чалавек. Паўліна, тупаючы ля стала, сама ўся спрацаваная, махала рукамі, як граблямі, і сыпала дробным макам:

— І праўда ж, дзе гэта было відаць, каб з нашых краёў чалавек далей мястэчка пайшоў ды ў такія вялікія людзі.

Спачатку Бацька мучыўся гаданнем, чаго паклікала Паўліна, бо ў яе не надта пажывішся. Але далей-болей — і ён змікіціў — зразумела, унучка канчае дзесяць класаў і будзе паступаць.

Паўліна для большага шыку выставіла не звычайнай самагонкі, а нейкага сурагату з квяцістай наклейкай пад назвай «вільяк». І ўсё яна штурхала пад локаць сына Колю:

— Ты ж не сядзі, а падлівай у чаркі, чалавек уважыў цябе, прыйшоў. Некалі ж дзецьмі, бывала, так добра гулялі.

Коля ўсё варочаў шыяй, натужваў блакітны позірк і ніяк не мог прагаварыць слова — Паўліна наперад загадала называць Змітрака на «вы», і ён усё сумняваўся: «Як гэта я Лэбуся буду на «вы» зваць? (Некалі ў школе Бацьку празывалі так за вялікі лоб.) І калі гэта мы добра гулялі — ці мала маіх пстрычак па яго галаве пагуляла?»

Урэшце такі ён сапсаваў, як і трэба было спадзявацца, усю Паўлініну дыпламатыю. Абсалют-

на проста, сваім грубаватым баском пляснуў Бацьку, як цэпам, па галаве:

— А сколькі ты ў месяц аграбаеш?

Яго не цікавіў, відаць, будучы лёс дачкі.

Паўліна закруцілася на крэсле.

Бацька для важнасці спачатку адкапыліў ніжнюю губу, пасля зморшчыў лоб і надбавіў сотню да сваіх даходаў: атрымалася недзе каля трохсот рублёў, пра што Коля моўчкі падумаў: «Хлусі, Лэбусь, пінжак унь зашмальцаваны, як у мяне, трактарыста, ватоўка».

Бацька адчуў, што хоць Паўліна і войкнула, нібыта ад шчасця, Коля мала яму верыць, таму ён і пайшоў атакай:

— А знаеце, расходы вялікія. Часта нашы прафесары ў госці запрашаюць — то на дні нараджэння, то на вяселлі дзяцей. Тады і падарыць трэба не меней як на рублёў пяцьдзесят, самі разумееце, кампанія ў нас такая грашоўная. Ды і ўсякія паездкі за мяжу на навуковыя канферэнцыі і сесіі. Так што, расход ёсць.

Бацька працяжна і ўрачыста смакаваў гэтыя словы, а сам думаў: «Гэта табе за тое, што ты адрабіў сваё — і прыйдзеш дахаты, маючы спакойную галаву, а тут усё жыццё біся як рыба аб лёд ды яшчэ слухайся ўсякага Цвыркуна».

— Ну, вядома, большы даход — большы расход,— наклала рэзюме Паўліна і такім мудрым чынам закрыла фінансавыя гісторыі і ўсё замежжа, хаця, па праўдзе кажучы, Бацька ездзіў найдалей ажно ў Брэст, ды і то па літасці прафсаюза.

Затое Паўліна адкрыла самае галоўнае:

— А ў нас жа, Зміцерка, з унучкай маёй цэлая бяда. Задумала сёлета ехаць вучыцца, а там жа гэтыя экзаменты трэба здаваць. То мо як,

Зміцерка, памог бы па-суседску, расказаў нам што. Яна складне чытае.

— Я ж там на службе, дзе на настаўнікаў вучаць. Ці ж хоча яна за настаўніцу?

— Хоча, хоча, вунь як хоча!

Коля быў інакшай думкі, пра якую не стаў гаварыць. «Нікуды яна не хоча. Гуляць яна хоча. Сабака аж ахрып на прывязі праз яе начныя гулі. І казаў жа ёй: дзе твая камсамольская совісць з такіх гадоў ціскацца?»

— То мо, Зміцерка, ты памог бы па-суседску, расказаў што. Яна чытае складне і задачкі ўмее рашаць.

Бацька адчуў, што сілкі Паўліны расстаўлены з такіх бакоў, як суседскасць, любоў да ўнучкі і дамарослы падхалімаж. І ён рашыў даць фінта праз такі ход, як жыццёвая аб'ектыўнасць:

— Цяпер з гэтым строга. Хто вучыцца ў школе добра, той і паступіць. Усе хочуць паступіць. Гэта пасля вайны больш на работы ішлі. Казалі ж тады пра каго-небудзь: «Ого, ён жа дзесяць класаў кончыў». А цяпер — не тое.

Коля — белабрысы спакойны здаравяк — ажно пачаў пацець ад несусветнай мудрасці роднай маці і вучонага суседа, які надта ж смачна жаваў падсушаную на гарышчы паляндвіцу. Паўліна шукала дзённік унучкі, пераварочваючы ў тумбачцы кнігі і прыгаворваючы:

— Яно так, але каб хто і памог. А мы, вядома, вясковыя цёмныя людзі, гэты ж во вучыцца, так як ты, не захацеў, на вяроўцы ў школу вадзіла. Калі ўжо што ад нас трэба будзе, то мы не палічымся з капейкай. Дзякуй богу, маем.

Бацька адчуў, што зараз яму заместа таго, каб есці смачную паляндвіцу — а Паўліна была на ўсю вёску гаспадыня — прыйдзецца вывучаць

сумны дзённік. Таму ён рашыў даць ход назад самым езуіцкім спосабам:

— Ну, добра, прыйдзе лета, там і паглядзім, як яна яшчэ здасць у школе экзамены. А я пакуль прышлю ёй спецыяльныя кніжкі, дзе ўсё напісана, як паступаць.

Так і парашылі, на ўцеху Паўліне, мудра і проста...

Застолле канчалі ў Бацькавай хаце, бо Коля ўвязаўся, барануючы нагамі вуліцу між прахалодных вясковых платоў, праводзіць госця. Гэты Белабрысы — пабіў місы (таксама школьная мянушка), як белы мядзведзь, аблакаціўся на стол і, хмялеючы, толькі шчасліва ўсміхаўся. Коля гаварыў мала, толькі ўсё паляпваў па спіне ніз-карослага сябрука свайго дзяцінства і пачынаў натужліва: «Ты знаеш...» — і не мог кончыць. Ёсць такая харошая катэгорыя людзей, якім лягчэй думаць, чым гаварыць усё падрад. Коля, відаць, успамінаў сваё і Бацькава вясёлае дзяцінства і, хмялеючы, усё расчульваўся. А пасля абняў ужо цяжкай, як кавадла, рукой Бацьку за шыю і пачаў прыгаворваць плаўна і расцяжна: «Эх... эх...» Бацька са страхам адчуваў, як рыўкамі пульсуе кроў у магутнай руцэ.

Колю яўна цягнула ўявіць сябе з Бацькам дзецьмі на якой-небудзь траве-мураве. У яго раптам заблішчалі ў вачах вірлівыя агеньчыкі, і ён, мала помнячы, што робіць, прыціснуў рукой Бацькаву галаву да сваіх грудзей.

Моцна ашчарэпіўшы Бацьку, Коля праспяваў: «Лэбуська, друг мой»,— і пачаў, як у дзяцінстве, лупіць пстрычкамі. Толькі пальцы ад галавы адскоквалі. Лупіў і рагатаў, як хлапчук. Бацька вірыўся ў яго каленях і, як некалі даўно, роў: «Пусці, Белабрысы чорт!»

Назаўтра троССя Бацька ў аўтобусе са сваімі вялікімі вандзэлкамі. Асабліва высока падкідала на выбоінах, і тады, здаецца, вось-вось выскачаць мазгі. У Бацькі балела галава, і не ад учарашняй гарэлкі, а ад пстрычак Белабрысага.

«Ну, Белабрысы, дачакаешся ты буранкі. Так зраблю, што дачка ні ў водзін інстытут не паступіць»,— злосна думаў Бацька.

«А як ты зробіш?» — падсміхваўся ўнутраны голас.

«Як захачу, так і зраблю»,— быў няўпэўнены адказ. Гэта ж трэба, што маці вырывала яго ад Белабрысага.

Толькі вось адна і ўцеха была, што гэтыя вялікія пірагі з уласнай пшаніцы ў вандзэлках. З імі нейкім маёмасным робішся.

«Гэтым вісусам, Толю і Сашу, дулю ў нос, а не пірагоў. Смаркачы бяспутныя»,— думаў Бацька.

Бацька важдаўся з гэтымі пірагамі тыдні два, як кот з салам. Спачатку ён, як і кожны прыстойны чалавек, які прыязджае з дому, участаваў сяброўку-касталянку. Прывыклая да аспіранцкіх пачастункаў, яна тут жа падумала, ухапіўшы кавалак, што Бацька мог бы ўрэзаць ёй, старой бабе, і болей — задарма ці што хамуты-падсядзёлкі разам з ім цягала? Бацька даў яшчэ вахцёру і буфетчыцы. Надарыўся момант паздзекавацца і над хлопцамі.

— Куды ідзеце? — Бацька глядзіць дапытліва, шоргаючы нервова абцасам па сходцы.

— У сталоўку.

— А, ну ідзіце,— здзекліва гаварыў Бацька.— Я дык пірагоў наеўся, з дому са свята прывёз. Такія добрыя ўдаліся і тлустыя — як пад'ясі — дык і мяса не трэба. Грошы сэканомяцца.

Хто не зявае, той і мае, а хто зявае, той ваду хлябае,— заключыў Бацька народнай мудрасцю і трушком, хоць і з думкамі пераможцы, пашыбаваў далей.

Праз колькі дзён Бацьку надаелі тыя счарсцвелыя пірагі, яны пачалі да пухіроў рэзаць язык і паднябенне. Ён дробненька крышыў іх на падаконнік галубам і голасна, каб чулі хлопцы, заклікаў у заваконную сінечу:

— Пыль-пыль-пыль-пыль. Ляціце ж пірагі есці.

Галубы не ляцелі. Хлопцы за сцяной рагаталі. Толік, вялікі знаўца галубінай псіхалогіі, высунуўся з акна і параіў:

— Зміцер Апанасавіч, галубоў трэба зазываць так: вуль-вуль-вуль.

— Абыдуся без настаўнікаў,— пачуўся нервовы, на высокай ноце, адказ, а потым трэск рамаў, што зачыняліся.

— Бацька фарсіць немаведама чаго,— абурыўся Толя.

— Ды і крупнік не такі ўжо і смачны варыў ён,— адзначыў Саша.

— Рэдкі.

— Пэўне ж, крупіна за крупіной ганялася з дубіной.

## IX

— Будзе бура! — сказаў Толя.

— З грымотамі! — зажурыўся Саша.

Пару тыдняў хлопцы празабаўляліся на шырокіх і розных дарогах майскага жыцця. Цяпер яны разглядалі шэсць запісак — па тры кожнаму. Як і ва ўсіх выдатных творах, строгі тон адпавядаў лаканічнаму зместу: «Неадкладна

з'явіцеся на факультэт да свайго навуковага кіраўніка — Сямёна Андрэевіча».

— Пачне ўжо выкручвацца, як скурат на агні.

— Нічога, Фенікс таксама доўгі час лічыўся птушкай, што прапала без вестак, а пасля, як вядома, нанова ўзнік з попелу.

— А мо пашкадуе? Хутка ж першае чэрвеня — Дзень абароны дзяцей.

— Ён блытае стагоддзі, а ты, дзіця, пра першае чэрвеня.

Сямён Андрэевіч і сапраўды не разумеў альбо забыўся, што ў маі дыхаюць нават кнігі, яны выдыхаюць стары пыл гадоў, шкодны для маладых арганізмаў. Да таго ж, прафесар не ўлічваў майскай магіі амаль белых пасля дажджу грунтавых цвёрдых дарог, блакітных маланак і ванільнага паху прасторы.

Ён не разумеў альбо забыўся, таму пачаў свой гнеўны рэпартаж адразу. Нервова ходзячы, як акцёр, якога па ходу дзеяння п'есы павінны задушыць, ён трагічна гаварыў пра нізасці свету і асабліва маладога пакалення: «Праз мае рукі, праз маю душу і сэрца прайшлі дзесяткі аспірантаў, але такога я не бачыў яшчэ. («І дарэмна»,— каменціраваў сам сабе Саша.) Дзе былі мае вушы і вочы, калі я рэкамендаваў вас у аспірантуру? («Сапраўды, чаму яны так часта адсутнічаюць?») Я адносіўся да вас, як родны бацька... («Увага: на авансцэне з'явіўся яшчэ адзін Бацька».) Але тое, што я чую ў дэканаце пра вашы інтэрнацкія паводзіны... («Правільна, наш новы Бацька. Стары Бацька аказаўся нягоднікам, ён усё данёс. Нашто ўжо Іван Грозны тыран, і то толькі аднаго сына забіў, а гэты адразу двух задушыў».)»

Саша з усмешкай слухаў Сямёна Андрэевіча і

меў такую вольнасць думак нездарма: яго ўжо лаяў аднойчы вучоны куды вышэйшы рангам.

Заўсёды так бывае: калі вас аблае самы высокі чын, то нараканні ніжэйшых за яго здаюцца проста камарыным піскам.

Гэта было год назад у Ленінградзе, цудоўным горадзе Ленінградзе, дзе, ратуючы Ісакіеўскі сабор, пішуць турыстам белай фарбай на асфальце: «Голубей не кормить». А ў Дзень Перамогі цалуюцца і абдымаюцца на вуліцах. Там жыве малады, жулікаваты таксіст, які, везучы правінцыяла Сашу на Васільеўскі востраў, раптам прысцішыў бег машыны і сказаў:

— А вось Александрыйская калона. Яна трымаецца на фундаменце толькі сілай сваёй вагі і не прымацавана да яго. Кацярына II, калі фурман вёз яе па плошчы, кожны раз прыгаворвала: «Ад'язджай далей, ад'язджай, баюся, што яна кульнецца».

Так хлусіў таксіст пра славутую калону, пастаўленую, калі не было ўжо царыцы Кацярыны, пасля вайны 1812 года.

У Ленінградзе Саша пераступіў парог кватэры члена-карэспандэнта, вельмі старога чалавека, які цяжка дыхаў у мяккім крэсле і сіліўся ўспомніць знаёмых навукоўцаў, землякоў Сашы. Адчуўшы безнадзейнасць свайго намеру, вучоны лагодна і ўважліва слухаў няскладныя Сашавы прэтэнзіі да сучаснай навукі. Калі размова пайшла пра зусім канкрэтныя рэчы, член-карэспандэнт спахмурнеў — Саша не ведаў, дзе знаходзіцца архіў аднаго вучонага-славіста, які памёр да вайны. І дзядок раптам пачаў крычаць, тупацець нагамі, а Саша не разумеў, чаго ён так бярэ гэта да сэрца.

— Вось, вось тут жа чорным па беламу напі-

сана: у гістарычным архіве Масквы,— трос дзед сінім томам пад назвай «Личные архивы в государственных фондах».

— Я ведаю гэтае выданне, але ў цэнтральнай бібліятэцы нашага горада прапаў другі том,— апраўдваўся Саша.

— Як гэта прапаў?

— Ну, прапаў. Можа, украў хто.

Пакуль Саша выпісваў каардынаты архіва, дзед паспеў абвінаваціць правінцыяльных варвараў у крадзяжы кніг, а асабіста Сашу нават у смерці вучонага-славіста.

Пасля Саша развітваўся і з перапуду наступіў члену-карэспандэнту на нагу. Той моцна паморшчыўся, а Сашу было вельмі няёмка.

Вось такі вэрхал быў у Ленінградзе, дзіўным горадзе, дзе на пастаменце той самай Александрыйскай калоны нейкі закаханы напісаў крэйдай словы: «Лена, я люблю тебя в белом платье».

Таму цяпер, маючы вопыт хрышчэння, Саша не так і перажываў, а больш шкадаваў Толю, якога дагэтуль і лаяў, мабыць, толькі які-небудзь затурканы дацэнцік, не больш.

Толя слухаў-слухаў, а пасля пачаў ратавацца, шчыра папрасіўшы:

— Вы ўжо нас прасцеце, калі што не так, а будзем жыць — пастараемся часцей да вас падыходзіць.

Дакладна так гавораць на вёсцы гасцям ветлівыя гаспадары пры развітанні, але тут былі ніякія не госці, і прафесар сумеўся.

— Добра,— сказаў ён,— я даю вам магчымасць выправіцца — павязеце групу студэнтаў на фальклорную практыку. Гэта вельмі адказнае заданне. А цяпер, Аляксандр, вы пойдзеце са мной на абарону дыпломных работ і пачакаеце, пакуль

я вызвалюся — я прачытаў раздзел вашай дысертацыі і скажу свае заўвагі.

Саша ўспомніў, што ён яшчэ і Аляксандр. Загадчык баіцца, каб Аляксандр не ўцёк, і цяпер пад канвоем пагоніць перад сабой.

Абарона дыпломных ішла па графіку, з вялікімі букетамі рознакалёрных цюльпанаў, якія сцяной адгарадзілі членаў камісіі ад урачыстых прэтэндэнтаў на пяцёркі.

«Хітранькія такія,— думалі ў камісіі, гледзячы на ўрачыстых.— Адхапіць пяцёрку не так проста, хоць вашы кіраўнікі і расказваюць тут розныя залатыя легенды».

Кіраўнікі неміласэрна хвалілі ўсіх падрад. На факультэце ўзнікла дзіўная традыцыя — лічылася, што калі дыпломнік атрымае тройку, то яго кіраўнік наогул нуль. Таму з трыбуны ляцелі афарызмы пра выключную важнасць пастаўленых тэм, уменне разбірацца ў крытычнай літаратуры, самастойна і аналітычна мысліць і г. д.

Акрамя таго, найшла новая чума — праблемнасць работ. На свет божы было выцягнута столькі праблем, што дзіву можна было дацца, як дзве кафедры — мовы і літаратуры — маглі толькі ўправіцца з імі.

Бацька ўсміхнуўся, убачыўшы Сашу з апекуном, чым зноў жа выдаў сябе.

«Смейся, смейся,— падумаў Саша.— Зараз ты паскачаш».

Учора вечарам, пасля даўгаватай адлучкі хлопцаў, Бацька пачуў нарэшце галасы за сцяной і вельмі ўзрадаваўся. Нягледзячы на халодную вайну, якая заставалася між ім і хлопцамі, Бацька не ўтрываў і заскочыў-такі да іх, нейкі быццам напалоханы і таму вельмі порсткі.

— Прыехалі? А мне тут проста ўсе дзверы

прабарабанілі, вас пытаючыся. І на факультэце столькі шуму было — усё кажуць: дзе вы дзеліся? Цяпер, у канцы года, працы шмат.

— Якой гэта працы?

— Ого, браткі, як у мяне цяпер, то і на дзень, і на ноч хапае. Толькі што курсавыя адышлі, а тут і дыпломныя. Шмат чытаць трэба. Вочы балець пачынаюць, я ж і акуляры сёння набыў. Блізарукасць прагрэсіруе.

Бацька дастаў чорны падрапаны футарал — паказаў стандартныя трохрублёвыя акуляры, памахаў імі ў паветры. Толя ўсё нічога не разумеў і разгублена папытаўся:

— Ну, добра, у вас курсавыя, дыпломныя, а ў нас якая трасца?

— Не ведаю, хлопцы, не ведаю. Начальству відней.

Бацька пайшоў задаволены: даў ім пуду — цяпер ноч не заснуць. Ён прыходзіў нездарма: за месяц Бацька нагарадзіў на хлопцаў усім, каму мог, такіх цудаў-бедаў, што ім доўга яшчэ прыйдзецца разбірацца. І цяпер з-за нейкай незразумелай боязі перад хлопцамі ён рашыў зблытаць карты, нахлусіўшы, што іх шукалі многія, хаця папраўдзе дапытваўся адзін толькі кіраўнік.

— Што гэта з Бацькам? Нейкі ён радасны...— дзівіўся Саша.

— У Бацькі, як у тым злосным прывітанні: «Рады бачыць я цябе з вяроўкай на шыі».

Хлопцы задумаліся, але што ўздумаеш наўгад? Маўчалі, покуль Толя не заўважыў забытыя Бацькам акуляры.

— Блізарукі Бацька... Няшчасны... Прафесійная траўма...

— Давай аддзячым яму за негасцінны прыём, тым больш што акуляры не яго. Ён хлусіць.

— Сапраўды, гэта нешта падобнае на камендантчыны. Бацька прагрэсіруе ў бок сімулянцтва.

— Зробім фокус-мокус. Бяжы прасі ў вахцёра ягоных, яны падобныя. Заменім плюс на мінус.

Цяпер, на абароне, Бацька сядзеў наперадзе, побач з засяроджаным Фанатыкам, які прывёў сюды сваю бедную ахвяру. Фанатык шэптам даваў ёй апошнія настаўленні, а тая калацілася і пакусвала вусны. Пісанне дыпломнай адняло ў яе шмат здароўя, за паўгода ад Фанатыкавага кіраўніцтва жанчына высахла да сухіх касцей.

Калі яна пачала гаварыць пра лексіку вёскі Стаўбуны, усе адчулі, як ёй цяжка змагацца сваім звялым голасам. З прамовы высветлілася, што ў вёсцы Стаўбуны людзі гавораць. Але вось філасофскі і абстрактна-адцягнены пласты ў лексіцы развіты слаба, і ў гэтым вінаватыя найбольш сельсавет і праўленне калгаса. Яны даюць указанні толькі канкрэтнымі тэрмінамі.

Затое Фанатык пачаў бойка, як на мітынгу.

— Лексіка! Гэта пяшчотнае слова хвалюе душу кожнага філолага і аматара філалогіі. З калыскі мы ўсведамляем сілу і значэнне абагульненняў...

Фанатык гаварыў і нешта пафаснае, то нагінаючыся да самой трыбуны, то ўзнімаючы голаў:

— Ух, лексіка... й-ых, лексіка...

Рэцэнзентам гэтай работы быў Зміцер Апанасавіч.

На трыбуне ён такі даканаў усю публіку: павольна выняў з кішэні вялікія і цяжкія, як матацыкл, акуляры. Бацькавы калегі і паплечнікі ахнулі. Уссунуўшы акуляры на нос, ён раптам баданыў галавой уперад.

Бацька бадануў ад нечаканасці: галава пайшла кругам. Рэзкі боль працінаў і, здавалася, раз'ядаў вочы — ад моцных, мінусавых шкельцаў усё расплывалася ўваччу. І мовы не магло быць пра тое, што ён можа вылавіць хоць адно слова са сваіх спісаных лісткоў.

Але Бацька трымаўся мужна і, не здымаючы акуляраў, па памяці адзначыў вартасць і, вядома ж, важнасць пастаўленай тэмы.

Залы Бацька не бачыў, у галаве шумела, але ён, як сляпы лірнік, упарта торкаўся за высокай трыбунай і суладна інтанацыі ківаў галавой.

Пахваліўшы работу, Бацька здагадаўся зняць акуляры, бо цяпер трэба было чытаць па пісанаму: ішлі крытычныя заўвагі.

Узмахваючы акулярамі, якія ён быў начапіў на нос для больш вучонага выгляду, Бацька злаваўся і на акуляры, і на дыпломную, рэцэнзію на якую не выйшла дачытаць з усім навуковаакулярным апломбам.

— Але, разам з тым, у дыпломнай ёсць і недахопы ў выглядзе недакладнасцей,— чытаў Бацька, нізка нагнуўшыся над паперай.— Дыпломніца піша, што слова «даярка» паходзіць ад слова «даяр», якое, у сваю чаргу, пайшло ад слова «даіць». А на самой справе наадварот, бо кароў дояць у асноўным жанчыны, а мужчыны пасля ўжо прылаўчыліся па нядолі сваёй. Вельмі агульна тлумачацца ў дыпломнай паасобныя словы. Пішацца, што «радыска» — агародная расліна з чырвонымі караняплодамі. Трэба было неяк інакш сказаць, выразней, бо з чырвонымі караняплодамі і буракі, і рэдзька, і цыбуля.

— Цыбуля не чырвоная, а жоўтая,— жвава запярэчыла з месца Яніна.

Студэнты напружана маўчалі. Яны баяліся гэ-

тых навуковых спрэчак з-за такіх знаёмых бурачкоў, цыбулек.

Бацька ўзвіўся на трыбуне, аж тая заскрыпела. Яму не спадабалася, і ён замахаў акулярамі.

— Яніна Мікалаеўна, афіцыйную заяву вы можаце зрабіць пасля, такі парадак у працы дзяржаўнай камісіі. А што канкрэтна датычыць цыбулі, то наша, мясцовая, цыбуля восенню як агеньчыкі ў градах гарыць. Вы, відаць, мелі на ўвазе вялікую жоўтую, што мы ў магазінах купляем. Але тую прывозяць з Украіны, а дыпломная пабудавана на ўласнамясцовым матэрыяле. Таму я абгрунтавана кажу пра недакладнасць у рабоце і пра чырвоную цыбулю.

Аднак вернемся канкрэтна да тэмы,— ацверазеў Зміцер Апанасавіч і ўспомніў, што гаварыць яму больш няма чаго. Тады, на злосць Яніне, сказаў, што і слова «салата» таксама тлумачыцца вельмі агульна. Бо мала, што яна травяністая расліна, якая ўжываецца ў ежу. У ежу ўжываецца і пятрушка, і кроп, а яны таксама травяністыя.

Адпомсціўшы такім чынам, Бацька сказаў:

— Але адзначаныя недахопы не зніжаюць агульнай вартасці работы, і лічу, што яна можа быць ацэнена станоўчай адзнакай.

Ён сказаў і пайшоў сабе гуляць па калідорах з акулярамі ў руцэ, падазрона паглядаючы на шкельцы.

Нарэшце ўсе разышліся, і Сямён Андрэевіч заняўся Сашам, гартаючы старонкі з яго пісаннямі:

— Вы ўзялі няправільны зыходны пункт у гэтым раздзеле, і ўвесь багаты фактычны матэрыял трымаецца на нетрывалай аснове. Вы пішаце, што пісьменнікі, мысліцелі толькі фармулявалі маральныя прынцыпы жыцця, якія ўзні-

калі ў свядомасці народа. Аднак заўсёды першасная роля належыць мысліцелю. Чытайце вось выпіску з Ібсена спецыяльна для вас: «Маральныя прынцыпы не ўзнікаюць самі па сабе ў свядомасці народа, справа мысліцеляў сфармуляваць іх». Бачыце. Перадумайце ўсё.

Саша не чакаў, што яго тэзіс не спадабаецца прафесару, няясна адчуваў нейкую супярэчнасць у цытаце, але рашыў пачакаць. Было толькі незразумела, нашто прафесару прыкрывацца чужой гатовай мудрасцю.

На калідоры, у шумным гурце сваіх калег насілася Ліза Румянок, разгубленая ад уласнага шчасця. Калегі толькі што былі сведкамі паспяховай абароны Лізай кандыдацкай дысертацыі. Лізу віншавалі, а яна ўдзячна і шчодра рассыпала запрашэнні: «То калі ласка ж, прашу вас на сем гадзін у рэстаран «Васілёк»... На сем гадзін у «Васілёк»...

Хлопцы зусім і не думалі, што інерцыя шчасця занясе Лізу і да іх. «Прыйдзіце, хлопчыкі, хоць маладых трохі будзе, я і аспірантак сваіх паклічу, каб вам весялей было».

Да Лізы падышоў важны прафесар, відны нестары мужчына, які па Лізінай задуме павінен быў стаць галоўным упрыгожаннем застолля. Паклаўшы руку на Лізіна плячо, прафесар пачаў перапрашаць за тое, што ён не прыйдзе на банкет — вельмі заняты. Ліза спачатку здранцвела, пасля моцна зморшчылася, быццам хапіла воцату, слёзы замжылі вочы, і яна раптам ледзь не загаласіла:

Авой, авой, прафесар мой
Да мяне не хоча йсці.
А каб жа ды я тое ведала-а-а...

— Я прашу вас... перастаньце... выбачайце... я прыйду,— узмаліўся прафесар на кароткай паўзе, і Ліза паспела пачаць толькі адзін новы радок: «Мая мамачка-а, мая рыбачка-а...» Што яна яшчэ хацела вымучыць — невядома.

З некаторага часу на дысертанцкія банкеты найшла цэлая бяда. Афіцыйна яны не былі забаронены, але прайшла чутка, што балявадь калектыўна не рэкамендуецца — пачалася барацьба з п'янствам і алкагалізмам. Рознае баялі. Ну, вядома ж, непрыгожа — разлад у сем'ях, рубрыкі ў газетах «П'янству — бой» і ўсё іншае дрэннае.

Але быў чэрвень, апошняе перад летам пасяджэнне вучонага савета, блізкасць канікулаў, і настрой Лізіных сяброў быў вясёлы, таму многія рашылі ісці на банкет.

Да «Васілька» прабіраліся па адным, неўпрыкметку, шкадуючы, што цяпер не зіма і прыцемкі надыходзяць позна.

— Слухай, а мы з табой, можа, уссунем навагоднія маскі ваўка і лісіцы? Возьмемся пад ручкі і пойдзем,— рэкамендаваў Толя, прасуючы штаны.

— Ніякай цярплівасці не хапае,— злаваўся Саша. Ён ушываў гузік, а іголка востра торкала ў палец.— Дзіва што людзі жэняцца, з-за гэтых гузікаў і ў прымы пойдзеш.

У дзверы нехта пастукаў. На парозе ўзнік Бацька. Няўжо адпусціўся пасля гісторыі з пшаніцай?

— Ну, дык як вы, скора пойдзеце? — спытаўся ён.

— Ідзём, ідзём! — зарадаваліся хлопцы.

Не быў бы гэта Бацька. Акуратны, чысценька

паголены, наваксаваныя туфлі проста адбіваюць сонца, само цвіценне ранняга лета іграе ў памаладзелых вачах.

— Праз тыдзень,— кажа ён,— еду адпачываць на Нарач.

«Няўжо і праўда адпусціўся?» — не верылася хлопцам.

— Пойдзем, пакуль што там якое, півам пачастую па дарозе,— кажа Бацька.

Пакуль хлопцы дзівяцца, Бацька развaжае прыкладна так: «Якія б ні былі, а ўсё-такі ж свае, зіму разам перажылі. Невядома, што зробіцца з намі ўсімі за лета. І, можа, дарма я пра іх у дэканаце нагаварыў?»

Аднак Бацька не прызнаваўся сам сабе, а можа, і сам не ведаў: да хлопцаў ён палагаднеў толькі з-за таго, што адчуваў — яны панеслі ад начальства заслужаную кару.

Згода трывала не больш пяці хвілін. У вестыбюлі завяліся між сабой камендантка і вахцёр. Трасучы адзін перад адным акулярамі, кожны з іх даказваў сваё:

— Ну што ты мне, бабка, гаворыш, у мяне ад тваіх слоў як бы жаўранкі ўвушшу звіняць,— далікатнічаў вахцёр, якому хацелася сказаць больш проста: «Брала б ты, што хочаш, ды адчапілася».

— Не кажы, мае акуляры ў цябе. Я гэтыя як надзела, то аж села на голы ганак, так галава закруцілася.

— Можа, яно і так, але вунь жа хлопцы йдуць, я пазычаў, і яны толькі што аднеслі.

— І я пазычала Змітраку. Змітрок, чаму ты мне не мае акуляры аддаў?

Бацька і сам не ведаў, што зрабілася з гэтымі акулярамі, але, пачуўшы, што і хлопцы пазыча-

лі, насцярожана зыркнуў на іх. І сорам, і злосць апанавалі Бацьку.

— Разбярыцеся тут самі, не надта мудрая арыфметыка. Плюс на мінус, мінус на плюс.

— Мы пазычалі толькі тэлевізар глядзець,— схлусіў Саша.

— Ага, каляровую праграму,— памог Толя, і хлопцы шмыганулі ў дзверы.

— Таварышы! Я прапаную тост за паспяховы фінал распрацоўкі такой важнай мовазнаўчай праблемы, як прэдыкатыўнае ўжыванне назоўнікаў са звязкай **быць** і за яе распрацоўшчыцу! — сказаў, узняўшыся ў цэнтры застолля, той самы прафесар, якога Ліза доўга ўпрошвала прыйсці на банкет. Ён паднёс свой бакал да Лізінага, і выразны звон, як удар гонга, абвясціў пачатак навуковага раунда.

У старыя добрыя часы прафесар сказаў бы прасцей: «Вып'ем за нашу дысертантку Лізу Румянок!» Але разбураныя сем'і, рубрыкі «П'янству — бой!» ускладнялі ўсю абедню.

Відаць было, што ўсе зразумелі і так, бо чаго ж інакш дружна пілі, бразгацелі відэльцамі?

«Наша дама застанецца сёння галоднай, бо ў яе два кавалеры,— думаў Саша.— І кожны спадзяецца, што заляцацца да яе будзе другі». Дамай была Іна Валынец, якую пасадзілі між Толем і Сашам. Сур'ёзная Іна, якая помніла на памяць усе студэнцкія падручнікі і з-за іх не навучылася яшчэ цалавацца з хлопцамі, проста дрыжала ад вялікай адказнасці: ролі госці на гэтым банкеце.

«І ён, як добры балбес, вінегрэт суне,— назіраў Толя.— Я ж ёй паклаў ужо».

— Дзякую,— сказала Іна Сашу.

— Ну, Іна, цяпер ты вінегрэтам на ўвесь вечар забяспечана,— знайшоўся Толя.

— Дзякую,— адказала Іна са смехам.

Насупраць ззялі сваімі ўборамі Зіна і Яніна, з'ядаючы вачмі гасцей. На стале было многа кветак, якія шмат каго таемна засланялі. Бацька атайбаваўся недзе блізка каля Лізы.

Усяго два чалавекі — маці і бацька Лізы — хоць і прыгубілі трохі, зусім не зразумелі прафесарскага тосту. Старыя прыехалі з далёкай вёскі, доўга трэсліся ў аўтобусе і цяпер не ведалі, куды сябе дзець. Вясновы загар на іх суровых тварах, вузлаватыя спрацаваныя рукі выдзяляліся сярод гарадскіх строяў, нежывой белізны настольнікаў і сурвэтак, тонкага, марозна-ігольчатага бляску крышталю. Стары быў жвавейшы, а маці зусім унікла. Найбольшае гора было ёй з рукамі — не трымаць жа іх, такія парэпаныя, на стале, і яна камечыла насоўку. А яшчэ баялася яна за старога, хаця і давала ў дарозе настаўленні: «Ты ж глядзі, у вялікія людзі едзеш, а то ляпнеш там што, не раўнуючы, як карова ў хадак».

— Ліза! Хай скажа Ліза! — ажывілася застолле.

— Я вельмі ўдзячна вам, дарагія сябры, хто прыйшоў адсвяткаваць маю сціплую ўрачыстасць. Я хачу падзякаваць майму кіраўніку, паважанаму Антону Сямёнавічу, за нязменную ўвагу да мяне, а таксама паважаным апанентам, якія знайшлі час, каб прачытаць маю работу і даць ёй такую высокую адзнаку.

Маці сядзела і думала: «Во, ужо і Лізачка мая гаварыць навучылася, не тое, што мы. А гэтак жа цяжка было, каб дайсці да ўсяго. Як у школку

пайшла — вёрст сем туды і назад штодзень. І хвойнік, і бярэзнік, па калена ў снезе».

— І наша кафедра асабліва, Лізавета Андрэеўна, віншуе вас і жадае вам самага вялікага шчасця,— гаварыў Цвыркун.— Маючы жыццёвы вопыт і іншыя розныя непрыемнасці, можна сказаць, што ў вашым жыцці адбыўся вельмі станоўчы факт.

Маці не чула Цвыркуна і ўсё думала сваё:

«А як паступаць сабралася, то і ехаць не было з чым, ведама, вайна — пагарэлі, будаваліся. Павялі з Андрэем цялё прадаваць. Пайшлі, нанач гледзячы,— далёка. А карова як бы і чула, што цялётка павядуць — усю ноч перад гэтым раўла. Так добра тая дарога помніцца — лёгка на душы было, аж сэрца зашчымела. Жыццё жылі — часу не было думаць пра яго. А тут — вёрст трыццаць ісці з Андрэем удваіх... Што тады думаў Андрэй — хто ведае? — але як селі перадыхнуць, то сказаў: «Вось, маці, і дачка вырасла». Так свяціліся бярозы пры дарозе — днець пачынала».

Раптам ад імя маладога пакалення вучоных, як Піліп з канапель, выскачыў Фанатык. Ён так і пачаў:

— Мы, маладое пакаленне вучоных, дзеці рабочых і сялян, рады бачыць, што на нашых вачах, можна сказаць, мужнеюць старэйшыя таварышы. Гэта і нам надае нямала творчых сіл.

— У мяне бацька шышка, а маці інжынер,— прашаптала ўражлівая Іна.— Але і мне гэта дадае творчых сіл. Што ж цяпер рабіць?

«Каб Лізачцы ды чалавек які па яе грамаце знайшоўся, то і добра было б,— думала далей маці.— І так усохла ў гэтай навуцы, з чалавекам аджыла б. Я і дзяцей падгадавала б».

Пасля таго, як выпілі за бацькоў, удзячны, расчулены Лізін бацька не вытрываў і, малайцавата разгладзіўшы рукой сівыя пасмы, таксама ўзяўся гаварыць. Маці толькі ўмольна глядзела на яго — не ўсцерагла.

— Усе друззя! — пачаў стары.— Я чалавек не такі вучоны, як вы, і не ведаю, можа, чаго гэта людзі ў будніцу свята залажылі, але і я панімаю, што калі людзі разам сабраліся, то ім і выпіць трэба. Я перапрашаю, бо не так ужо і вучаны, хоць сам цаню вучоных. У нашай вёсцы некалі даўно была такая Манька Бадзюля, так звалі, што бадзялася па ўсім свеце, дык і яна, нашто ўжо непуцёвая, і то, помню, хоць і галаштонікам быў, прыпеўку пела: «Грамоты немножко знаем — во швейцары попадем».

Невядома чаму, але на гэтым месцы стары ўзмахам рукі і лёгкім кіўком зрабіў выразны, з нахілам галавы, старамодны рэveранс у бок важнага прафесара і яго магутнай жонкі, якая адразу заззяла.

— Дык я кажу,— працягваў ён,— што пры вашай грамаці не тое швейцарам — старшынёй у калгасе можна стаць. Мне, праўда, цяжка дакумекацца, ці падойдзе вам такі чын, але ўперад — рыхт бы падышоў — вы ўсё з паперкамі, і тады ўсё на паперках было — пасеяў — не пасеяў, зжаў — не зжаў — абы на паперы складна ў раён адпраўлена. Дык калі такая інтанацыя ў гэтым дзеле пайшла, то я ўспамінаю, як вучыўся па лемантары, вершык Цёткі, паэтэсы нашай: «Сталі папер ткаці, літар насадзілі». То, відаць, і папера працы каштуе, дык мо давайце вып'ем, каб шанавалі яе.

Стары паківаў пальцам перад Лізай, як бы даючы настаўленне, і ціха сеў.

«Ізноў улез мой Андрэй, куды яго не прасілі,— думала маці.— Не ўтаймуецца».

Госці выпілі без вялікага энтузіязму і доўга моршчыліся, як бы ад гарэлкі.

А потым усе хорам яны спелі два разы задушэўную песеньку:

Ой, ты, Ліза-Лізавета,
Я люблю цябе за гэта,
Ні за тое, ні за гэта,
Што завешся Лізавета.

Хто ведае, як жыццё можа пакіраваць людзьмі? Хто б спадзяваўся, што ў гэтую напаўзапоўненую залу, дзе воддаль заставаўся яшчэ цэлы рад сталоў для прыхожай публікі, можа прыйсці старавата сівы чалавек. Гэты дзядзька пакутаваў ад язвы і, прагульваючыся, штовечар заходзіў у «Васілёк» з кіслай мінай папіць мінеральнай вады. Ён быў інстытуцкі дацэнт-палітэканом, які, дарэчы, і язву нажыў з-за сваёй палітэканоміі. Не гледзячы ні на кога, дацэнт прайшоў на сваё звыклае месца ў далёкім куце, з якога, як на далоні, быў відаць увесь рэстаран.

На адлегласці яны пачціва кіўнулі адзін аднаму галавой — уплывовы прафесар і дацэнт-палітэканом. Прафесар тут жа выразна паглядзеў на Лізу. Ліза злавіла ўсё на ляту і стала белая, як хрызантэма на труне.

Бацька таксама ўсё ўлавіў. Ён каўтануў сліну і таропка выпаліў:

— Цяпер нам крышка, папаліся!

Палітэканом быў старшынёй народнага кантролю інстытута.

«Ляснецца ўся мая дысертацыя, усе мае намаганні»,— паніхідна падумала Ліза і раптам шуснула пад стол.

Палітэканом і не думаў нікога кантраляваць.

Ён піў мінеральную ваду і кляў сваю язву. Але ж Зміцер Апанасавіч не ведаў гэтага. Ён таксама борздзенька, хоць з-за жывоціка досыць і нязграбна, падаўся ўслед за Лізай.

«А, чорт з ім,— падумаў важны прафесар.— Баяўся я гэтага кантролю і кантралёра».

«Вот дзівы ў гэтых вучоных людзей,— разважала сама сабе Лізіна маці.— Выпілі трошкі, а цяпер так смешна забаўляюцца».

«Кантроль... кантроль»,— пранеслася па застоллі.

Праз мінуту зніклі Зіна і Яніна. Застолле радзела на вачах.

«Што мне той кантроль? — меркаваў Лізін бацька.— Не выганяць жа з калгаса».

Хлопцы сядзелі спіной да палітэканома, таму адчувалі сябе ў поўнай бяспецы. А хто ўжо зусім нічога не заўважаў, то гэта два старыя вучоныя — Лізін кіраўнік дысертацыі, а з ім і апанент. Яны ўжо з гадзіну спрачаліся пра гэту самую няшчасную прэдыкатыўнасць, якая заняла ў Лізы дзвесце старонак машынапісу і якой з гэтага дня было суджана заняць сваё месца на могілках дысертацый — у інстытуцкай бібліятэцы.

— Ды вы, Антон Сямёнавіч,— насмешліва дапытваўся сухенькі дзядок-апанент,— разглядаеце ўсё ж звязку **быць** як асобную адзінку мовы? І думаеце, што яна выконвае службовую ролю ў сказе? Га?

— Так, разглядаю,— з пакрыўджанай годнасцю адказваў Антон Сямёнавіч,— бо хаця яна поўнасцю і страчвае ў гэтай функцыі сваё лексічнае значэнне, але ўсё ж захоўвае пры гэтым фармальныя прыкметы дзеяслова.

— І якія ж прыкметы? — назаляўся дзядок.

— Ну, катэгорыі часу, ладу, яна, зразумейце, своеасаблівы мост далучэння выказніка да дзейніка.

— Вось вы і гаворыце проста з моста. А чаму ж тады часамі дзеяслоў-звязка быць не спалучаецца з назоўнікамі ў форме назоўнага склону?

Час спыніўся для іх.

— Ой, як цікава,— прашаптала захопленая Іна.

— Вельмі цікава,— прастагнаў Толя і падміргнуў сябруку: — Палезлі пад стол ад гэтай цікавасці, папілі-паелі... досыць...

— Палезлі!

Пад сталом, у паўзмроку, было цесна, чулася нейкае соўганне, пярэшапты.

— Не плач, Ліза, нішто ў навуцы без цяжкасцей не даецца,— суцяшала Яніна.

— Гы... гы... гы...— хліпала Ліза.— У апошнюю ж мінутачку...

— Янька, пасунься, у мяне з-пад стала ногі тырчаць,— горача прасіла Зіна.

— Ага, баішся, што па нагах пазнае? Падгульвала, значыцца?

— Бойся бога! Ён жа стары пень! Пасунься! За цябе, калі што, і мужык заступіцца можа, а мой такі мужчына — ні трэскі, ні лучына.

— І добра, калі вас выпруць, хітранькая надта, упёрліся з мужам сюды, у горад, з нейкай цемені. Не пасунуся!

Найлепей прыстроіўся Гайдук — ён сядзеў, прыпёршыся да шырокай папярэчыны стала. Перад ім поўзаў ракам Цвыркун. Цвыркун не палез бы пад стол, але хадзілі чуткі, што цяперашняга дэкана некуды пераводзяць, і Цвыркун лічыў сябе самым дастойным пераемнікам, пад сэрцам гуляў халадок прадчування блізкага

размаху кар'еры. «Каб з-за такога глупства ды паляцела к чорту ўся задума — не-е»,— меркаваў ён, саслізгваючы з крэсла.

— Таварышы! Цішэй... цішэй...— мітусліва супакойваў Бацька.— Давайце лепш правядзём наш сход.

— Сход... сход...— усхліпнула Ліза.— Зараз нас усіх пад канвоем павядуць. Тады сойдземся.

...Важны прафесар занудзіўся ў застоллі без вялікай кампаніі, ён хацеў бы бачыць і чуць хоць нейкую весялосць, але застолле было амаль пустое. І яму ўсё больш шкада рабілася калег, якія хто паразбягаўся, а хто і пакутаваў пад сталом.

Нарэшце прафесар не вытрываў — рашучай паходкай папраставаў да палітэканома.

Здалёку можна было бачыць, як ветліва яны спаткаліся і прафесар падсеў да століка.

Вось ён састроіў спагадную міну і задуменна паківаў галавой, нахіліўшы яе над сталом, а палітэканом прыплюшчыў вочы і з пакутным выглядам правёў рукой па жываце.

Прафесар ківаў-ківаў галавой, а пасля бадзёра ўзняў яе і з хітраватай усмешкай зрабіў шырокі гасцінны жэст, пры якім рука яго апісала дугу ад палітэканома ў бок застолля.

Дацэнт устрапянуўся, адкінуўся на спінку крэсла і спуджана замахаў перад сабой далонямі, як бы бароначы твар ад восаў ці мух. Пасля ён з безнадзейным позіркам нешта тлумачыў, паказваў на бутэлькі мінералкі і ўсё пастукваў пазногцямі па іх.

Урэшце такі палітэканом узняўся і, паклаўшы руку на плячо прафесару, чуўся з ім, як з родным братам. Яны пайшлі да выхаду, дзе міла, з усмешачкамі, развіталіся.

Прафесар вярнуўся да застолля.

— Эй вы, вылазьце! Я прыйшоў даць вам волю! — выгукнуў ён словамі Сценькі Разіна.

Першая выскачыла Яніна, ляснула абцасікам і крыкнула:

— Аркестр! Польку-бабачку!

## X

Толя з Сашам стаялі перад сталом старшыні Забродскага сельсавета. Старшыня ўжо не першы раз вывучаў інстытуцкую гербавую паперу, на якой была надрукавана слёзная просьба да мясцовых уладаў памагаць маладым фалькларыстам.

За свой клопатны век гэты мажны дзядзька першы раз бачыў такое дзіва. «І якога д'ябла не выдумаюць у гэтых гарадах? Здаецца ж, і сваіх песняў там шмат, радыё не сціхае. Але, мусіць, такі быт пайшоў — трэба штодзень свежую,— думаў старшыня.— Дзе ж іх рассяліць?»

— То што, гэтыя бэйбусы таксама будуць песенькі слухаць і запісваць? — кіўнуў ён на студэнтаў, якія ганялі мяч перад сельсаветам.— Ды ім косы ў рукі і дысцыплінку ваенную, а вы з песнямі. Ну што ж, пайшлі ў Грэбелькі, а там паглядзім, як вас да дзела прыстроіць.

Грэбелькі — рэдкая лясная вёска двароў на восемдзесят — жывуць недалёка ад Заброддзя і з трох бакоў абкружаны Віліяй. Яна робіць тут вялікую лукавіну з мелкаватай плынню, надзейнымі брадамі. Усе завілляне трымаюць шлях праз Грэбелькі то на станцыю, то ў магазін — і гэтая вёска гаманкая — тут усё ведаюць і пра свой, і пра другі бераг. Невялікім дзівам для Грэбелек была спярша і гурма зблажэлых, але

вясёлых пасля сесіі студэнтаў. У хаты бралі ахвотна.

— Перакачаецеся неяк...

— Ды ўжо ж, не на двары моладзежы начаваць.

— А дзяўчаты! Як таполі! Каторая ж да мяне? Двух дзецюкоў маю — самыя тыя джыгуны,— зазываў з раскошы густога саду дзядзька.

Тыя, перасмейваючыся, шнуравалі па вёсцы.

— Дык вы, дзеткі, практыканты? Што, сена будзеце зграбаць ці на ферму?

— Песні збіраць будзем.

— Ат, не смейцеся са старой. Каму яны патрэбны, нашы песні?

Назаўтра раніцай — як і ўсе людзі, што першы раз прачынаюцца ў чужой хаце,— нейкі момант хлопцы не маглі даўмецца: дзе гэта яны? Гаспадыня — старая адзінокая цётка ці нават бабуля — Юрчыха аддала ім чыстую палавіну і рада была хлопцам. Проста і хораша мелася ў пакоі і, здаецца, нават знаёма — зацемненыя бэзам вокны, нізкая пабеленая столь з частымі бэлькамі, шырокія масніцы выбітай падлогі, стол, накрыты каляным абрусам у пярэстыя светлыя шашачкі. На сцяне — вялікая, у рамцы, фатаграфія маладой стройнай пары. Ён — салдат даваеннага польскага войска, у фрэнчы са стаячым каўняром, пазументамі на ім, упэўнены мускулісты твар беларускага хлопца ад касы і цэпа. Побач з ім — маладая дзяўчына — утрапёначка, неспакойнага, па вачах відаць, заводу, у сукенцы з белай гіпюравай устаўкай на грудзях.

Толік таўхануў Сашу пад бок:

— Фалькларыст, песні астынуць.

Юрчыха нямала патапталася ля дзвярэй, перш чым увайсці да хлопцаў. Няўжо старая, худая

бабуля, з сівымі, ажно шызымі валасамі, што радасна, нібы на сваіх сыноў, глядзіць на іх, і сапраўды была некалі той маладой жанчынай, якая знята на фатаграфіі? Па ўсім відаць — гэта бязлітасная праўда. Ёй усцешна цяпер бачыць у сваёй хаце вясёлы гармідар, адчуваць дух вандроўнага жыцця.

— Досыць, хлопцы, спаць,— Юрчыха спагадна ўсміхаецца.— Лета на двары.

Яна чамусьці адразу, яшчэ ўчора, вельмі проста здружылася з хлопцамі, распытваючы, у каго якая сям'я. Дазнаўшыся, што яны маюць і род, і племя, таксама старых бацькоў, Юрчыха даверыла хлопцам свае клопаты:

— А я меншага свайго з войска чакаю. Пакуль што адна — як гарох пры дарозе,— нібы саромячыся сваёй прастаты і адзіноты, сказала яна.— Старэйшы ў горадзе жыве з сям'ёй. Не дала б я рады там дыхнуць — як у мурашніку, усё лятом ды лятом. У тралейбус сядзеш — едзеш, едзеш без канца, здаецца, зямлю глытаеш. А яна ж жывая...

Студэнты ўжо бегалі па Грэбельках, больш здагадлівыя падаліся на поле, дзе жанчыны палолі. Гэта дзівіла дабрахочую на слова Юрчыху:

— І я вам, можа, што ўспомню, некалі ж пела. Чалавек пяе ці з гора, ці з радасці, а ў мяне ні гора вялікага, ні радасці. Ціха жыву. У нас найболей з гора пелі, і сама я ці раз. У сорак пятым годзе недзе такой парой вярнулася я са сваім старэйшым з Нямеччыны. Галодная, змучаная, а тут — ні кала ні двара, чалавек мой на вайне. Шмат нас такіх было па зямлянках, і ўсім есці хочацца. Быў тут за вёскай нейкі клін жыта азімага, волкае яшчэ, ледзьве зашчырэлася. Што зробіш — пайшла я, жну паверху каласы зялё-

ныя, каб пахлёбкі якой зварыць, зярняткі яшчэ слабыя. І што са мной зрабілася, такі жаль агарнуў, што і сама не помню, як запела на ўсё поле: «Ой, баліць мая сярэдзінка, перабіла мне бярэзінка, тонкая, высокая, лісцейкам шырокая...» Усе бабы, што на полі былі, пасталі і слухалі, мне і самой дзівам было свой голас чуць. Усё ж вайну не пелі...

Чэрвень ветраны, хаця і цёплы, пачыналася касавіца, і выгодна было хадзіць па ваколіцах вёскі, дзе на ўсе дарогі прыносіла п'янлівы пах лугавой травы, які дзіўна перамешваўся з моцным, векавым настоем мелодый і гукаў пачутых песень.

Цяжка сказаць, ці адчуе хто больш тугі, чым той, хто сваёй воляй едзе збіраць фальклор у мясціны, дзе прайшла бурнымі шляхамі вялікая гісторыя. Прайшла, перайначыўшы лёсы людзей, павярнуўшы іх на іншы лад. Дзве сілы — лірыка і трагедыя — як маланкі, перакрыжаваліся ў простых песнях гэтых людзей. Усвядоміць іх можа толькі жыццёвы вопыт, слухаючы быль пра забітага сына, што «па-над сынам салавей спявае, а над маткай чорны воран лятае». Альбо той запеў, дзе гаворыць сама зямля, дзе ўжо зліліся галасы жанчыны і зямлі, якую жанчына прымусіла гаварыць вось так: «Нашто ж мне цябе браці? Лепей долю табе даці. Долю даўшы — жыці будзеш, цябе ўзяўшы — гніці будзеш». У песні нават зямля заступілася за жывога чалавека. Можа, нават зямлі сорамна за тое, што рабілася на ёй?

Чуючы гэты востры боль амаль у кожнай песні, верылася, што нічога на свеце не знікае без следу. Боль стаў сам такі высокі, што ўмее гаварыць і так: «Дзе матулька з дачкой пастаялі,

там забіла вадзіца ключавая, дзе матулька з дачушкай расставаліся, там вырасла яблынька садавая». Не якая-небудзь дзічка, а іменна садавая, салодкая, цёплая свойская яблынька.

«Нашы казкі — саломы вязкі»,— як бы пра нешта нязначнае сказала хлопцам адна бабуля. Сказала, але нябось не сабе гаварыла, а хлопцам.

Усе яны верадь і песням, нават тым, што данесены сюды вятрамі з крыжавых дарог.

Што значыць людская даверлівасць... Бабы спяваюць што-небудзь далёкае, разгульна-лжывае, напрыклад: «О чем, дева, плачешь, горьки слёзы льешь?» і ажно мярцвеюць ад страху за тую дзеву, якая быццам бы і сапраўды загіне «в день свадьбы своей».

За першыя дні хлопцы пераканаліся, што не надта добра пасылаць запісваць фальклор студэнтаў-першакурснікаў. Дзяўчаты, як дзікія казачкі, улятаюць у хаты і ні з таго ні з сяго кідаюцца на людзей: «Праспявайце нам, калі ласка, якія-небудзь песні». Гэта прыкладна тое самае, што спыніць на вуліцы чалавека і папрасіць: «Ну, патанцуйце, калі ласка».

Вось яны нешта запішуць, паедуць і забудуцца. У прынцыпе — песні — той інтым, куды і лезці як бы сорамна нават, інтым, які патрабуе — умейце быць далікатнымі адзін да аднаго.

І ўсё-такі трэба слухаць, запісваць не толькі па абавязку. Юрчыха была зноў у тым жыце, калі расказвала хлопцам, яе чакаў у зямлянцы галодны хлопчык, ад каласоў дыхала маладой зялёнай сілай. Але як адчуць да канца яе жаль, скаргу зялёнага жыта, калі б не гэтыя два кароткія радкі песні з зычнай рыфмай? Ніяк. Можна проста ўведаць толькі яшчэ адзін факт. І што наогул ведалі б мы пра мінулае, акрамя голых

фактаў і дат, калі б не засталося таго, што асвятляе іх святлом мастацкай памяці? Мала ведаць, што некалі было тое і тое, трэба ведаць, як гэта было, як успрымаў, што думаў тады чалавек.

У раздоллі жытнёвага поля Саша расказваў Толю:

— ...Некалі, яшчэ ў восьмым класе, я аднойчы здранцвеў ад бяссільнага адчаю. Мы каталіся на лыжах з высокай палогай горкі, на версе якой былі старыя могілкі, а дакладней, засталіся сляды даўнейшых магіл. Я стаяў, абапёршыся на палкі, і гледзячы на парослы хмызам пагорак, дзе гарбякамі выступалі пад снегам надмагільныя каменні, успомніў, што тут пахаваны мая прабабка і прадзед. Так казала мне бабуля. «Што, няўжо і ўсё?» — скаланула мяне тады на холадзе ад безвыходнасці самой думкі, што амаль нічога не засталося нават ад памяці маіх продкаў, і няўжо я не магу нават знайсці іх прозвішчаў на сляпых каменнях. Пройдзе пару год — і нават іх, беднае каменне, глыне зямля.

Пару хвілін, пакуль мяне не падхапіла лыжня, мне было вельмі балюча, магчыма, што тады я і ўпершыню пакутаваў духоўна, а голы хмызняк гайдаўся так адзінока і безнадзейна.

Аднойчы, стаўшы ўжо студэнтам, я папрасіў бабулю нейкім святам паспяваць. Яна пачала, агаварыўшыся: «Як мая матка некалі пела». То быў мясцовы варыянт «Карабейнікаў»: «Ужо ж, ужо ж паўна мая каробушка, плеч ня рэжыць рамушок». Тады неяк раптоўна для мяне стаў больш зразумелым воблік, склад характару той далёкай сялянкі, маёй прабабкі. Яе ненаўмысна вольнае абыходжанне са словамі славутай песні, замена вясёлага, удалага пачатку яе на самавіта-сялянскае, па-свойму гаспадарскае «ўжо ж,

ужо» здавалася мне поўным сэнсу. Яно выдзяляла фігуру чалавека з цэлых пакаленняў, якія ўжо адспявалі сваю песню.

Цяпер было соладка і шчымліва знаць, што ніхто толкам не ведае, колькі іх — юраўскіх, купальскіх, пятроўскіх, жніўных, валачобных, сіроцкіх, радзінных і бог ведае якіх яшчэ жыве ці жыло на свеце.

Жывы голас простага чалавека просіцца ўвайсці ў гісторыю, нават і з такой, досыць фантастычнай песняй грэбелькаўскага дзядка, што пеў учора пра першую сусветную вайну — «Гарманскія снарады ляцяць, як чамаданы».

...Юрчыха адразу вызначыла, што хлопцы нежанатыя, і, успомніўшы сваё, маладое, сказала: «Нічога, ажэніцеся, а калі вам усё старое трэба, то можаце на гарышча злазіць, там усяго-ўсякага ёсць».

Ёсць свая душа, свой характар у кожнай хаце, яны спазнаюцца па самім ладзе жыцця — як дагледжана хата, як з вамі павіталіся, пра што, напрацаваўшыся, гавораць за вячэрнім сталом. У кожнай хаты ёсць і свая гісторыя, яна не адразу становіцца нечым бесцялесным, застаючыся толькі ў зыбкай плыні ўспамінаў гаспадароў, суседзяў. Большая частка яе — на гарышчах; гарышчы дыхалі на нас у дзяцінстве загадкавым дыханнем розных дзівосаў, якія, трохі падросшы, мы раўнадушна, з-за эгаізму сваёй маладосці, называем хламам. Нічуць не задумваючыся, мы толькі здзіўляемся, на якога д'ябла трэба было старым усцягваць на гарышча ўсе гэтыя прасніцы, кросны, якія-небудзь чуні ці лапці, старыя кнігі і іншае, некалі вельмі каштоўнае. Мы з паблажлівай усмешкай абмінаем залы з такімі рэ-

чамі ў краязнаўчых музеях і мала прадбачым, што пройдзе не так шмат часу, і недзе побач з усім гэтым販 станкі, прыборы, якія мы сёння самі называем нечуванымі дасягненнямі тэхнічнай і навуковай думкі.

Саша дзякаваў Юрчысе, якая дазволіла злазіць яму на гарышча, дзякаваў за гэты ранак, які дапамог яму знайсці патрэбны згублены гук.

Усё, што кожны раз хвалявала яго, было злучана з пэўным гукам, які прагучаў тады, калі гэтае хваляванне ўстрывожыла ўпершыню. Так, моцны пах бэзу выклікаў у памяці глухаваты кароткі стук даланёй у раму акна, якое ён расчыняў у маі насустрач буйным ліловым гронкам, у іх патанаў увесь дом. Пругкі халадок бярозавіку напамінаў пра далікатнае цюканне сякеры па шурпатай вясновай кары. Нават дым з комінаў, які, здаецца, стойма стаяў у зімовым небе, самой зімой быў звязаны з рыпеннем прамёрзлага снегу на саннай дарозе.

Гукі — нібы сігнальныя агеньчыкі памяці, якія ўспыхвалі кожны раз пры новым хваляванні і прыгадвалі, калі, пры якіх акалічнасцях хваляванне ўвайшло ў свядомасць. І калі Саша ўзяў у рукі вянок медна-латунных вясельных званочкаў, якія ў розных мясцінах завуцца па-рознаму — бомы, бразгаўкі, шаргуны,— іх звон загрымеў громам прасвятлення, хаця быў не такі і гучны. Гэты звон застаўся назаўсёды прадспевам святочнага хвалявання ад зусім простых вясковых песень, застаўся яму з дзяцінства, калі выдзыгваў з гурмой равеснікаў ля чыёй-небудзь вясельнай хаты, калі натоўп раптоўна сціхаў і ўслед за мітуслівым пярэшыптам: «Едуць! Едуць!» — усё нарастаў звон гэтых званочкаў вясельнага абозу. Звон шырыцца вуліцай вёскі, якая занята сёння

адным — вяселлем, а між іншым, і чаканнем, хто пад якім плотам пераспіць. Маладыя едуць наперадзе, у лёгкай брычцы, і дзіўна выглядаюць яны — такія знаёмыя, як і ўся вуліца сяла, і раптам такія прыбраныя і незвычайныя — ён, ужо трошкі «пад газам» і па-абалваненаму бясклапотна-шчаслівы, і яна, якая-небудзь суседская Гэля ці Анюта, сарамлівай павай, трымаючы пад руку свайго жаніха, сыходзіць на падвор'е і рассыпае поўнымі прыгоршчамі цукеркі. Тут і грымнула чарада баб з высокай праніклівасцю, трагічнай глыбінёй галасоў, па-асенняму звонка і выразна: «Дубовы лісточак за яр пакаціўся, малады малойчык узяў ажаніўся». З падвор'я добра відаць, як ён узводзіць яе на ганак. Пранікліва і адчайна — ажно мароз па целе — гучала песня, узвялічваючы вялікі міг новага, што ішло ў вёску. Песня асвятляла натруджаныя твары жанчын, убраных у простыя строі паваеннай раскошы — хрупасткія хусткі-цыганачкі, плюшавыя паўпальто, а таксама і мужчын з перасмяглымі на ветры і сонцы вуснамі. Яны, прыбраныя, у наваксаваных ботах, як быццам не ведалі, што тут і рабіць. Але «дубовы лісточак» магутна калыхаў тое паветра.

Неахвотна, марудна, як і сама песня, заміраў у званочках звон ля самага дыхання развіхраных коней, якіх дазвалялі хлапчукам — за вялікі гонар — распрэгчы і адвесці на стайню, каб потым хлапчукі смела беглі назад, да вокнаў вяселля. Вялікая сіла дыктавала словы «Дубовы лісточак за яр пакаціўся...».

Саша, маўкліва радуючыся знаходцы гуку, прысеў на бэльку і цяжка прывыкаў да земляністага паху зляжалага пылу. Цьмяны, мутны паўзмрок на гарышчы рэзка пераразала паласа пра-

меннага святла з невялічкага акенца ў шчыце. Яна падала на вялікі, але такі бездапаможны ў сваёй старасці і непатрэбстве запылены калаўрот. Астатняе бачылася пакуль што цяжэй.

«Вось гэта ўжо сапраўдная рэальнасць,— падумаў Саша,— а не нейкі выдуманы Бацькаў таямнічы калаўрот дзён, пра які ён прадуднеў вушы. Можа, для цяперашняга Бацькавага жыцця бег часу — і зачараванае кола, але ўсё-такі аднолькавых дзён у жыцці не бывае».

Саша крутнуў кола калаўрота, як і сотні разоў круціў яго некалі цішком ад маці, бабулі. Лёгка ўзняўшы пыл, кола загуло гудам майскага жука. Вось і можна, як і ў дзяцінстве, складаць сваю казку, цяпер, мабыць, яна будзе меней крылатая, яе абцяжыць і некаторы вопыт жыцця, але ўсё ж гэта будзе казкай.

Круціцца, круціцца кола, і на шпульку лёгка намотваюцца залатыя ніткі праменняў шчодрага сонца. З гэтых ясных нітак, пераматаных у вялікія, як сонца, клубкі, жанчыны саткуць доўгія-доўгія пругкія палотны. Іх будуць выбельваць на золкай маёвай расе, водгуллі галасоў, як нябачныя жвавыя цялушкі, будуць падскокваць па роўнядзі луга. З палотнаў пашыюць прахалодныя сарочкі, кашулі, і яны так добра будуць далягаць да цела, на першых днях паказытваючы яго пры нялёгкай сялянскай працы. Буйнейшым, чым раса, потам пройме людзей на касьбе, жніве, але ўсё ж аднойчы, сцішаным восеньскім адвячоркам, гляне з падвор'я гаспадар на прыціхлае ворыва і падумае сам сабе: «Лёгка ці цяжка, але дагледзеліся». І вясёлай будзе вячэра ў зямлянцы, дзе ведаюць, што кожны зарабіў на хлеб, што ніхто не папікне другога кавалкам. Толькі нядаўна была вайна, кругом ледзь-ледзь залячыўся рэзрух і

сведкамі таму — гэтая ўсеагульная сямейная каша з рэдкімі, але ж вельмі смачнымі скваркамі, з чаем, закрашаным маліннікам і падсалоджаным чвэрцю драбка цукру. І соладка будзе думацца гаспадару пра новы сасновы дом, крыты гонтай, пра вялікія вокны ў ім да сонца. І над спакойным вячэрнім жыццём, гаспадаровымі думамі будзе свяціць месяц, як свеціць цяпер над калаўротам засунуты пад крокву ржавы серп.

...Намотваюцца і намотваюцца залатыя ніткі праменняў.

Казкі цікавыя і тым, што свабода фантазіі ў іх мае права абмінаць канкрэтныя жыццёвыя рэаліі. Так і Сашава казка не прыняла зацяжкай для яе колішняга беспрасвецця сялянскай працы.

...Юрчыха шчыра дзівілася, убачыўшы бомы, глядзела на іх святлом далёкіх дзён і ўспомніла сваё, маладое:

— Шмат вяселляў адзванілі. Я і сама, як пачула іх у татавым падвор'і, то нагаласілася ў каморцы. Надта ж страшна было ад бацькоў у чужую ды яшчэ ў зарэчанскую вёску — сама я з таго берага, з Перавоза, наш бераг лепшы, зацішнейшы ад войнаў.

Смешна вяселлі тады спраўлялі з тым і гэтым берагам — толькі зімой жаніліся, як Вілля ўмерзне, мастоў блізка не было — адзін у Вілейцы, другі — у Смургонях, сваёй дарогі чакалі. Не гонар вяселлю на лодках з пасагам ехаць ці ўброд ісці.

— Дык што, і дагэтуль у вас так робіцца? — неяк спалохана, аж вочы пад лоб пайшлі, здзівіўся Толя.

— Не, дзеткі, цяпер свет не той пайшоў — цяпер жэняцца і летам, і зімой, і днём, і ночай. Рэд-

кая дзеўка, ад бацькоў адходзячы, слязу ўроніць, хоць ты ім вочы цыбуляй націрай. А другая, здаецца, гатова б і наперад сватоў запабегчы. У нас адзін хлопец прывёз маладую, нетутэйшую, праўда,— то яна на музыцы ўпрысядку ў вэлюме пайшла — кіно цэлае было.

«І такім чынам, мой паважаны прафесар, які дваццаць шэсць гадоў назад апошні раз быў у вёсцы, дазвольце не згадзіцца з вашымі напаўпазычанымі тэорыямі наконт маральных прынцыпаў і пры блізкай нагодзе паспрачацца,— думаў Саша.— Мая новая знаходка не меншая, чым знаходка гуку».

## XI

Не задаўжылася, як хлопцы са студэнтамі ад'ехалі. Юрчыха праводзіла іх за вёску грунтавой дарогай у палавеючым жыце. Хлопцам было як бы няёмка пакідаць адзінокую старую жанчыну. Яна папрасіла толькі на развітанне: «Вы ж, хлопчыкі, хоць пісьмо напішыце, ці добра даехалі, а то ўсякае думацца будзе». Сказала — і ціха пайшла назад.

Нават і прыгарадныя цягнікі могуць ад'язджаць далёка.

Застаўшыся ўдвух у тамбуры, хлопцы зажурыліся. Хутка яны разлучацца да восені, цяжкі і вясёлы год вучобы закончаны.

— Ну што, на дэмбель? — гукнуў Толя.

— На дэмбель.

І ніводзін няўдзячны сын ні гукам не ўспомніў пра Бацьку. Дачакаюцца старасці, пашкадуюць, але позна будзе.

Хлопцы не ведалі, што за добрую сотню вёрст ад іх змакрэлы Бацька ў гэты час імчыцца напе-

рарэз іхняму цягніку. Не проста так, а на новенькім веласіпедзе.

Нялёгкія шляхі і прыгоды ўссадзілі Бацьку на гэты драндулет.

Праз нейкі тыдзень пасля Лізінага банкету Бацька ехаў з пуцёўкай у кішэні аўтобусам на возера Нарач адпачываць. Быў ён вельмі рады, што вырываецца нарэшце з факультэцкага і гарадскога тлуму.

Толькі адна горыч душыла сэрца — успамін пра той Лізін банкет. «Нейкае дурное вяселле»,— думаў Бацька, прыпамінаючы, як папхнулі яго да Лізы і сілком прымушалі цалавацца, а самі пляскалі ў ладкі і прыгаворвалі: «Вось так! Вось так!»

А Ліза, шчаслівая, што застолле канчаецца так добра, разышлася і ўрэзала тады прыпеўку:

Асочанька — высочанька
Над вадой катаецца,
Мілы з дзеўкамі гаворыць,
Пра мяне пытаецца.

Бацька не ўтрываў і адпеў ёй:

Разгарэлася салома,
Толькі пыхкае агонь,
Захацела дзеўка замуж,
Толькі тупае нагой.

І ўсе танцавалі, нават зласлівы дзядок-апанент. Апошні раз падобныя піруэты ён выконваў гадоў пятнаццаць назад.

Але лёгкая гойданка ў аўтобусе паволі супакойвала Бацьку.

Жоўтым спакойным агнём цвілі прыдарожныя палосы лубіну, і толькі калі дарога пайшла з пагорка на пагорак, здавалася, што жоўты агонь хвалюецца, зыбаецца.

«Незайздросная зямля — пяскі, суглінкі, дзе ніжэй — шэры падзол — адны няўдобы. А людзі

тут працавітыя,— меркаваў Бацька.— Па дзецях відаць: самыя старанныя студэнты — з гэтых краёў. Хлопцы, то тыя больш цельпукаватыя, а дзяўчаты баявыя, як сарокі. Мужыкі, відаць, усё то на полі, то ў лесе былі, а жонкі і на кірмаш, і на фэст першыя стараліся. Нешта такое і ў дзяцей засталося».

І раптам — гарох. Цэлае поле маладога зялёнага гароху, які нядаўна адцвіў далікатна-фіялетавым цветам, а цяпер проста рдзіцца зелянінай. Высокія ўчэпістыя сцябліны з густымі лісцямі і струкамі, дужыя, крамяныя, самі напаміналі пра тое, што толькі дыхне першая навальніца — і тады прыйдзе на іх палегліца — з рукамі не ўлезеш на палетак, вуж не пралезе.

— Добрая гарахавіна,— сказаў дзядок, што сядзеў побач з Бацькам, які ўспамінаў пра салодкі смак зялёнага гароху і пранізлівы, як голас маладога пеўніка, посвіст пустых струкоў.

— А што, хай на добрае і спажываецца.

— Некалі ў хлеб дамешвалі,— не сунімаўся дзед.— А цяпер хлеб, як сонца.

На аўтастанцыі нарачанскай курортнай зоны ажно ў вачах запярэсціла ад сакавітых свежых парэчак, трускавак, суніц, якія прадавалі бабулі. Асабліва водарна пахлі суніцы — соладка лясными ўгрэўнымі палянамі; пах навяваў успамін пра салодкія дзіцячыя сны.

Бацька глядзеў услед сваім спадарожнікам. Яны адыходзілі па алеі ўроссып, як авечкі, з сакваяжамі, чамаданамі. І рабілася Бацьку сумна. І яшчэ больш не хацелася ісці за імі — душу саладзіў сунічны пах дзяцінства.

«Ну і дурань жа я,— моўчкі забедаваў Бацька.— Адпачываць надумаўся. І дзе? У доме адпачынку. Паселяць зараз у якое-небудзь кодла.

Да світанку ў карты будуць рэзацца, а пасля храпці да паўдня. Знойдзецца, несумненна, і сарцаед, што, цяжка дыхаючы, будзе прыходзіць на досвітку. Старыя пахабныя анекдоты будуць расказваць. Да́мы ў сталоўцы несусветныя глупствы гарадзіць, асабліва пра калорыі. Звар'яцееш і Нарачы не папросіш. Вось Сашу з Толем добра. Пражылі сабе год, папрацавалі толкам і, відаць, да галавы нічога не бяруць».

Падышоў новы аўтобус. Ягады, якія жанчыны рассыпалі па кулёчках, запахлі яшчэ мацней. Бацька канчаткова рашыў, гледзячы на вымучаных горадам і дарогай пасажыраў: «Не, і з гэтымі авечкамі я не пайду. І наогул, паеду назад аўтобусам».

Пругкай хваляй халадок сапраўднай свабоды ўварваўся ў Бацькава сэрца. Ён адчуў сябе вызваленым ад усялякіх дакучных абавязкаў, нават ад іржавых ланцугоў інфляцыі прыметнікаў. Пасля кароткай вандроўкі, гаворак з рознымі людзьмі ў душу зноў пачало вяртацца далёкае, забытае адчуванне, што свет вялікі і шырокі. Збоку спявала Нарач.

У Мядзелі, пахадзіўшы па пляцы, Зміцер Апанасавіч трапіў у «Спорттавары», бо рабіць усё роўна не было чаго. Пахла металам і гумай. Бацька крадком падышоў да ззяючых нікелем веласіпедаў і так уважліва глядзеў на іх, нібы гэта быў апошні цуд тэхнікі.

«Эх, як вы змяніліся, дарагія,— падумаў Бацька.— Ёмка пастаўлены руль, далікатнае сядзенне, зручны багажнік».

Кожны можа праверыць сябе і пацвердзіць — чалавек не абыякавы да таго, што ў свой час, асабліва ў дзяцінстве і ў юнацтве, было яму ма-

ладаступным. Нават пасля, калі ўсё гэта ён можа мець свабодна. Нашто вялікае — нават, ну, скажам, лёгкі фруктовы пах якіх-небудзь танных цукерак можа шмат што напомніць. Пасля вайны — яны досыць рэдкі цуд для дзяцей — гасцінцы бацькоў у кірмашовыя нядзелі, у дні прыходу цётак.

Цяжка сказаць, чаго больш — горычы, пяшчотнага смутку ці жалю — у нашых сённяшніх паблажлівых усмешках пра тую пару.

Зміцер Апанасавіч даўно забыўся пра існаванне веласіпедаў, іх ролю ў развіцці грамадства. Але цяпер ён быў адзін. І хваля свабоды вельмі лёгка дакацiла з роднай вёскі яго дзіцячы голас на вячэрняй вуліцы. Ён жаласліва просіць у Паўлінага Колі: «Дай праехаць ну хоць да Мулярчыкавай хаты». Мулярчыкава хата блізка, метраў сто не будзе. Але Коля, асядлаўшы веласіпед, жміндзіцца: «Лэбусам няможна» — і, прысвіснуўшы, коціць уперад. Змітрок, наслязіўшыся, цягнецца ў свой панадворак. Маці, якая ўсё чула, кажа ўголас як бы сама сабе: «Дзе нам за імі ўгнацца. На ўсю вёску багатыры». Несвядомы Змітрок усё роўна спачатку смуткуе. А пасля забываецца і носіцца туды-сюды па падвор'і, водзячы палкай па плоце. Палка адрывіста лічыць штакеціны, і ён падпявае ёй: «Тры-ты-ры-ры... Багатыры... Багатыры... Тры-ры-ры-ры...»

З нейкай незразумелай не то павагай, не то захапленнем казалі тады яшчэ ў вёсцы: «Ого, яна ж дзеўка пад часамі» альбо: «Дзяцюк, і ровар мае». Такія дзецюкі асабліва петушыліся ў ранняй маладосці. Абганяючы сваіх равеснікаў, якія яшчэ нясмела ішлі на танцы, яны нахабна крычалі: «Жывей, пяхота!»

Цяпер у Мядзелі, гледзячы на веласіпеды, Баць-

ку агарнуў жаль. І многае пачало ўжо здавацца страчаным, пражытым не так, як хацелася б.

Але нешта падказвала, што ён жа яшчэ не стары, многае можна вярнуць. Унутраная свабода адкрывала нейкую перспектыву. І нечакана для сябе Бацька купіў веласіпед. Узяў дый купіў.

«Да д'ябла ўсё,— думаў ён, націскаючы на педалі,— хоць цяпер пакатаюся. Пакатаюся. Людзі ходзяць, ездзяць, нешта робяць. Сонца унь колькі, паветра цэлы свет. Піянеры атрадамі гойсаюць. Саша з Толем нябось раскашуюцца недзе. Уперад!»

Добрай дарогай, з ветрам, несла веласіпед. Лёгкі, як птушка, спачатку непаслухмяны ў Бацькавых руках, ён праносіў ля шумных бяроз, між featрознакалёрных, у цвеце, палёў.

Бацька прагна хапаў вуснамі салодкае паветра і з імпэтам вязня, які вырваўся на волю, круціў сваю няхітрую машыну.

«Д-р-р-...— заракатаў ланцуг, злятаючы з шэсцерняў, нібы гаварыў: — Разагнаўся ты...» «Сапраўды разагнаўся, шмат чаго было, было-сплыло»,— сказаў Бацька, думаючы пра другое. Нацягваючы ланцуг, ён нечакана, першы раз за апошнія гадоў пятнаццаць, сам заспяваў:

Запрагай, мой брацітка,
Коні вараныя.
Я паеду даганяці
Леты маладыя.

Бацька раптам задумаўся: «Вось гэта песня, што яна такое? Паэзія. Вышэйшы акт чалавечай думкі. А што такое паэзія? Рух душы. Я толькі пачынаю авалодваць ім».

Далей дарога кацілася гладка, бо Бацька ўзяў спакойны тэмп, кіруючыся да Вілейкі.

Налягаючы на педалі, Бацька ўспомніў, што недзе тут ідзе вялікая будоўля Вілейска-Мінскай воднай сістэмы. Яму захацелася паглядзець, як гэта робіцца.

Блізка ад гарадка, на паўночным усходзе яго, разгарнулася нешта вялікае і незвычайнае для гэтых ціхіх краёў.

Бацька загнаў веласіпед у кусты альшэўніку і, трымаючы ў руках чамаданчык, задзіваваўся.

Магутным крылом высокая дамба перарэзала на кіламетры тры балоцістую сенажаць, падступаючы наперарэз проста да Віліі. Дробныя птушкі жалосна крычалі на бетоне дамбы. Уздоўж дамбы — дарога, па якой бясконцым цугам ідуць і ідуць самазвалы, а кругом, найбольш на месцы будучай плаціны, экскаватары, чуваць мернае вуркатанне трактароў. Бацька ішоў наўпрасткі, перасякаючы грунтавыя дарогі і сцежкі, праз невялікія пясчаныя ўзгоркі-валы ў нятопкім балоце, парослым нізкім альшэўнікам і высокімі балотнымі кветкамі — смолкамі, серпарэзкамі.

Добра было відаць, як на другім, стромым, беразе Віліі рабочыя спрытна ўкладваюць жалезную арматуру, а экскаватары рвуць пясчаную беднасць вілейскай зямлі. Вілія яшчэ бегла сваім шляхам быстрацечнай ракі, бесклапотна і лёгка ля той мясціны, дзе хутка яе павінен быў прыпыніць бетон.

У вялізным катлаване, куды пад'ёмны кран апускаў блокі, перапляліся сістэмы труб. Біла ў вочы святло электразваркі, чуцён быў смех, гул маладых галасоў. Раптам адтуль, знізу, як маёвы свежы гром, ударыла па Бацьку хваля захопленых крыкаў: «Змiцер Апанасавіч! Добры дзень!» Бацька ажно чамаданчык свой выпусціў, і той папоўз па сыпучым адхоне. Гэта былі яго

родныя студэнты, якія паехалі на лета працаваць у будаўнічых атрадах. Вечны троечнік Вася Панасюк спрытна ўлавіў чамаданчык, услед за якім і сам Бацька подбегам лучыў у яго абдымкі.

Ніколі не абдымаліся! У студэнтаў — і вымова госць не рэдкі, і стыпендыя часам лясне як бы і нізашто, а ўсё выкладчыкі вінаваты. Лёс прымусіў! Ах, гэты зыбкі, сыпучы пясок!

Бацька з'явіўся. З дзесятак загарэлых студэнтаў у майках і форменных штанах падхапілі яго змучанае цела. Цяжкі прыгнёт філалагічных навыкаў не даў Бацьку і да памяці дайсці, як хлопцы-веселуны загайдалі яго на руках. Заместа таго, каб пакаяцца за тое, што група ў летнюю сесію заняла дваццаць сёмае месца па паспяховасці з трыццаці магчымых, яны крычалі: «Віва, Зміцер Апанасавіч!» Дзяўчаты пляскалі ў ладкі. Вася Панасюк і тут не ўпусціў свайго: Бацька адчуў, што пад шумок нехта балюча таўхае яго ў бакі: «Віва, Зміцер Апанасавіч!»

— Словы іншамоўнай лексікі варта ўжываць толькі ў канкрэтна-неабходных выпадках,— павучальна сказаў Бацька, становячыся на ногі.

У катлаване пачуўся рогат.

— А што такое лексіка? — тут жа здзівіўся Віця Малаховіч.

— Няўжо ты і гэтага...— утрупеў Бацька і не змог крыкнуць далей: — ...не ведаеш, толькі што адхапіўшы ў мяне тройку?

— Ужо ж...— адказаў Віця, чытаючы пытанне інтуітыўна.

— І часта не ведаеш?

— Заўсёды.— Віця скрывіў як бы ад болю свой па-цыганску жулікаваты твар.

— Затое наш Віця ў працы дока,— заступілася кірпаносая выдатніца Каця Задубная.—

З яго прараб не нахваліцца. Ён і з нівелірам, і з тэадалітам ходзіць смела, а мы ўсяго толькі з рэйкамі за ім.

— А ты, Каця, да бацькоў лепш бы паехала, адпачыла, а то вунь якая худзенькая, ці табе тут працаваць,— паклапаціўся Зміцер Апанасавіч.

— Мне даюць, дзе лягчэй. У нас во Ірка — ударная сіла, яна і на цэмент становіцца, раствор фугуе. Магутная бабенцыя,— пахвалілася Каця, абдымаючы дзябёлую Ірку, і абедзве засмяяліся.

— Добра такой,— пазайздросціла весялуха Галя.— Як латынь здаваць ішлі, то ў яе на руках і на лытках канчаткі ўсіх чатырох спражэнняў і пяці скланенняў змясціліся.

— Пастараўшыся, можна і ўсю палітэканомію перапісаць,— сур'ёзна адзначыў ціхманы, гаспадарлівы паляшук Коля Мліўны.

Усе зноў засмяяліся, толькі Коля разгубіўся — ён не ведаў, чаго яны смяюцца.

— Прашу спыніць непрыстойныя размовы! — павысіў голас Бацька.— Ану, на свае месцы!

Студэнты нават не зварухнуліся, адно насмешліва паглядалі на Бацьку.

Толькі нязменны Бацькаў памочнік і актывіст усіх сходаў падліза Яўген Міцуль паслухмяна ўхапіў лапату.

— Ой-вой-вой! Жэнечка працаваць уздумаў,— не вытрывала Задубная.— Адкуль такі спрыт?

Міцуль на момант сумеўся, але фатыгі не траціў:

— А Задубная з Малаховічам любоў круцяць. Штоночы аж да раніцы.

— Не з табой жа, дурнем, ёй круціць,— заступілася за сяброўку Ірка.

— Народ, помніце, што Жэнька плёў на развітальным мітынгу на вакзале? — успомніў Віця

Малаховіч і, ускочыўшы на жалезны бак, пачаў пафасна крыўляцца і гундосіць пад Міцуля: — Таварышы! Мы едзем сёння туды, дзе праца чакае нашых рук, нашага юнацкага парыву! Бацькі і дзяды кроўю ў баях адваявалі нам права на свабодную працу на свабоднай зямлі...

Віця раптам сумна замоўк, а потым сур'ёзна сказаў:

— Адваявалі!.. Спаць падлізам пад кустамі, а на людзях толькі балбатаць, як па друкаваным. Я не Спіноза і тым больш не Гегель, але калі і не ведаю, што абазначае гэтая самая няшчасная лексіка, не буду хлусіць на ўвесь свет, што ведаю. Магу і адкрыта прызнацца! А Міцуль паразіт!

Бацька адчуў, што зараз пачнецца нешта нядобрае, дастанецца Міцулю, дастанецца і яму, таму пад шумок ён ціхенька даў цягу.

На вялікай будоўлі, дзе дыхала вялікай жыццёвай канкрэтнасцю і ўсе філалагічныя абстракцыі выляталі са свядомасці, гэты Міцуль, яго памочнік, сапраўды быў ні к сялу ні к гораду.

І толькі аднаго Бацька не мог дайсці — як гэта троечнік Малаховіч заляцаецца да выдатніцы Задубнай? «І пра што яны гавораць? А мо і не гавораць нічога, а толькі цалуюцца? Хто ведае...»

Сонца кіравалася ў зеніт. Стары пастух з унучкам гадоў васьмі на лузе, на дне будучага мора, заганялі цялят у загарадку. Сытае муканне разамлелых цялят, павады сліны на пысах, а тут яшчэ і распараны, мляўка-духмяны пах сенажаці — усё дыхала на Бацьку далёкім дзяцінствам, а глянуў на босыя хлопчыкавы ногі — і самому ў пятах заказытала.

Бацьку пастухі спаткалі хоць і стрымана, але ветліва, стары ахвотна расказваў, як на старасці

яму будавацца нанова прыйшлося, як вёскі ў пасёлак зносяць («Добра плоцяць, пасабілі, шыферу не пашкадавалі — нязгорш»).

— Унь наша вёска была,— паказаў дзед на альшэўнік,— адны дзічкі тырчаць і таблічка засталася.

— А табе не шкада сваёй вёскі? — спытаўся Бацька ў малога.

— Чаго шкадаваць? — пагардліва натапырыўся хлапчук.— Камароў? У пасёлку дзяцей болей.

— Сады весялей чысціць. Дурное яшчэ,— махнуў дзед рукой і сказаў унуку: — Будзь тут, а я ў Вілейку па хлеб схаджу, табе прынясу абаранкаў.

Яны са Зміцерам Апанасавічам пайшлі па вузкім старым бруку, які цяпер, калі знеслі вёскі, здаваўся нечым недарэчным у гэтых нізінных мясцінах. Каля сваёй былой вёскі дзед запыніўся:

— Я цяпер сена больш кашу, чым пасу. Апошняе лета ў нашай сенажаці рашыў у касу паўпірацца, затопяць пад восень. І, скажыце, дзіўнае стварэнне чалавек — як ведаеш, што навек нешта адыходзіць, тады ўсё ўспамінаецца. Калі тое было, ста травамі зарасло, я думаў — усё забыўся, а пачаў касіць сёлета і бог ведае што паўспаміналася. І як на сенакос некалі ўсёй хатай ішлі, і як два суседскія браты, пажаніўшыся, свае няшчасныя дзялкі дзялілі і біліся да смерці на людзях. На што ўжо драбяза — мокрыя лапці, цяжкія, як кандалы,— успомніліся. У гэтым вось бруку і мая праца ёсць — дзецюком хадзіў з молатам у заработкі.

Ля дарогі стаяў сіні ўказальнік з белым надпісам «Рабуні». Рабунёў ужо не было, толькі рэшткі печышчаў, дзе-нідзе старыя драўляныя студні, дзічкі, як бы прайшоў які злы віхор.

«І ўсё гэта будзе пад вадой? — спытаўся сам у сябе Бацька і сам жа адказаў: — Так, пад вадой».

Але ніякі віхор не праходзіў, перад Бацькам ляжала вялікая будоўля, абнаўленне зямлі, вунь і стары глядзіць так спакойна, не безуважна, але па-гаспадарску на сваё былое селішча, відаць, думае, што можна яшчэ перанесці на новае месца. Дзед пацягнуў жураўля над студняй, той гучна зарыпеў, як бы пазнаўшы гаспадарову руку. Дзед нешта падумаў, а потым сказаў:

— Адмахаў і ты сваё...

Бацька адчуваў сябе ў дзіўным новым свеце, ён не мог пакуль разабрацца — чаго больш у яго душы: здзіўлення ці раптоўнага адчаю. Ад таго, што стаіць перад ім стары чалавек, які на сваім вяку будуецца мо пяты раз, не вельмі збаяўся, як відаць, жыць і на новым месцы. Ад таго, што Бацька бачыць, як магутна чалавек можа змяніць зямлю і сябе, гаспадарыць, а ён даўно забыўся пра гэта ў сваіх мітуслівых, дробязных справах. Такі незразумелы стан, якога Бацька пачынаў баяцца, быў у яго хоць калі вясной, у час абнаўлення прыроды, але ён хаваўся тады ў свой абжыты пакой. А тут жа не пабяжыш па сенажаці з веласіпедам...

А ў вушах яшчэ гучаў смех студэнтаў...

Бацька паехаў далей. Тым часам вечарэла, таму Бацька паехаў узбоч Вілейкі, падумаўшы, што ў якой-небудзь вёсцы працней будзе знайсці начлег. Убачыўшы ў дарозе гурму людзей ля магазіна, Бацька скіраваўся да іх. Людзі чакалі, покуль машына прывязе ў магазін хлеб. Яны — народ у асноўным шаноўнага веку альбо дзеці — людзі, значыць, найбольш цікаўныя, моўчкі сустрэлі Бацьку.

А Бацька, зухавата тармазнуўшы, аж лёгкі пылок з-пад задняга кола пайшоў, сказаў ім: «Дзень добры!» І больш нічога, чым заінтрыгаваў натоўп, які павітаўся хорам. Бацька абтрос пыл з калашын, зайшоў у магазін. Нічога цікавага там ён не ўбачыў і таму выйшаў, патупаў на ганку і нарэшце задаволіў публіку:

— Скажыце, калі ласка, у каго тут хата прастарнейшая, дзе б заначаваць можна было?

Як звычайна ў такіх выпадках, з'явілася процьма дарадчыкаў.

Гаварылі пра нейкіх Кавалёвых, у якіх хата, як пуня, але стары дзед ужо тры гады не ўстае. Ад памяці не адышоўшы, ён можа чалавеку здарожанаму галаву празваніць сваёй гутаркай. Успомнілі і Кур'яніху, у яе хата ад кватарантаў не астывала, але бяда-бяда ў Кур'яніхі: дачка — паскудніца гэта — байструка ў прыполе прынесла. І здалёку, учора з аўтобуса позным вечарам.

Хваля вялікага тлуму ўзнялася ў гурце.

— Каб хоць з-пад свайго плота і то б меншы грэх, а то недзе з засветніцы.

— Ой, трэба было дзеўцы адной пугі пільнавацца, а то ўсё перабірала — і гэткі не так падышоў, той не такі, і на табе — з'ехала ў свет.

Гутарцы не было б канца, але нарэшце адзіны ў гэтай кампаніі мужчына — сівы дзед — дапамог Бацьку.

— А можа, да паэта чалавека выправіць?

Слова паэт дзядуля вымавіў з несумненнай пагардай.

Да Бацькі павярнулася ціхая, уніклая бабуля.

— Гэта — бедная справа. Куды, дзеткі, пойдзеце, там жа ў хаце тайга. А сам трымае процьму козаў, сабак. З жонкай не жыве, яна ў суседняй вёсцы.

Цяпер загаварылі пра паэта.

— Здаецца ж, чалавек так не дурны, як пагаворыш; пры Польшчы месяцы тры і касірам у гміне быў, пакуль не выгналі.

— Узлезе ў клубе на сцэну і, як блазнюк, давай чытаць свае вершыкі. Глядзець брыдка.

Бацька адчуў, што тут ён нешта цікавае знойдзе.

Аказваецца, паэтам быў мясцовы праўдалюбца і знаўца сусветнай палітыкі Мацей Бубен. Ночы навылёт праседжваў ён ля прыёмніка, з-за яго і ў райцэнтр выязджаў толькі разы два ў год — па батарэйкі. За сваё жыццё меў паэт шмат непрыемнасцей, больш, чым любы п'яніца ці злодзей. Неяк гадоў дваццаць назад ён сустрэў першага старшыню калгаса не пляшкай самагонкі, як тады вялося, а пытаннем: «Ты мне скажы, дзе цяпер лінія фронту ў Карэі праходзіць?»

Пра становішча ў ваеннай тады Карэі першы старшыня — удалы знерваваны здаравяк у галіфэ, з былых партызанаў — меў уяўленне не большае, чым пра туманнасці Андрамеды.

— Ты мне, дзядзька, пра Карэю не залівай, а гавары — запішашся ў калхоз ці не? — адсек, напачатку збянтэжаны, старшыня.

Паэт не адступаўся:

— У калхоз я ўступлю, я чалавек, можа, за новую ўладу ёсць пастрадаўшы, але ты мусіш міжнародную абстаноўку знаць.

— А на храна мне тая міжнародная, калі я ў сваёй разабрацца не магу. Гойсаеш днямі па вашых хутарах, а ўсе, як сабакі, па завуголлях тулюцца,— апраўдваўся старшыня.

— І ўсё роўна скажы — як ты думаеш — да перамір'я ці скора дойдуць?

Памацюкаўшыся, старшыня ляпнуў дзвярмі.

Паэт узяў моду наводзіць жах сваімі вучонымі пытаннямі на мясцовых адміністратараў і інтэлігентаў. Падыдзе пры людзях да якога настаўніка і прычэпіцца:

— А скажы ты мне, як звалася мора, што было мільёны гадоў назад, дзе цяпер Палессе?

Настаўнік чамусьці не ведае, чырванее, нешта мыкае, а паэт павучае:

— Герадотава мора было, запомні — Герадотава.

Натоўп рагоча.

Паэт спрабаваў ткнуцца са сваёй дасведчанасцю да мясцовага начальства, але трапіў на аднаго злога і самалюбнага старшыню калгаса. Той два гады падрад не даў паэту сена на карову — і чалавеку прыйшлося заціхнуць, цягаючы асаку з балота. Стаіўшы крыўду, ён дачакаўся пенсіі, стаў незалежным і зноў узяўся за сваё. «Як скула»,— казалі пра яго ў канторы калгаса і ў школьнай настаўніцкай.

## XII

Хутар Юзэфова, дзе жыў паэт,— адзін з тых рэдкіх хутароў, які знайшоўся ў гэтых ваколіцах, усяго на нейкую вярсту ад вёскі. Да яго і даехаў зацікаўлены Бацька.

Здалёку пачулася — паэт клепле касу. Хутар быў вольны, не абгароджаны — старыя яблыні саду шумелі лісцем побач з жытам. Досыць вялікая хата з круглякоў, палову якой займалі сенцы і варыўня, пачынала ўжо ўязджаць у зямлю. За хатай прасторны лужок — там шалелі козы.

— Добры вечар вам!

Паэт устрапянуўся і глянуў паверх акуляраў, потым падняўся з лаўкі і нейкую хвіліну вывучаў

Бацьку шчымліва-сінім, надзіва маладым позіркам.

— Добры вечар... Добры вечар... Добра білі, добра енчыў,— здаецца, як бы незадаволена прабурчаў стары.— Напужаў. У мяне аж сэрца зжыгнулася.

Паэту было год семдзесят. Невысокі рост, грузнасць, шыракаскулы твар і калматыя сівыя бровы надавалі яго асобе адметнасць. Ды і адзеты ён быў па-свойму — шырокая сарочка з сіняга мультану туга падпяразана вузкім тканым поясам, завязаным збоку на бант.

— Адкуль, чалавеча, будзеш?

— Да вас заехаў, спецыяльна.

— Гм... Да мяне спецыяльна толькі паштальён ходзіць. Адкуль жа ты?

— Вандрую па белым свеце. Жыццём цікаўлюся.

— Цікаўны, значыць? Ну і як яно, жыццё? Ці даспадобы?

Бацьку гэтае пытанне з хітраватай інтанацыяй здалося закавырыстым, і таму ён адказаў даволі нявызначана:

— Развіваецца жыццё.

Адказ мала задаволіў паэта, ён адчуў, што перад ім не просты падарожны, і нават касу адклаў.

— А чым я табе памагу з тваёй цікаўнасцю?

— Пераначаваць мне трэба, ды я чуў, што вы і вершы пішаце, так сказаць, фальклор узбагачаеце.

Старому спадабалася дасведчанасць, але ў госця яна была не надта глыбокая, таму паэт жвава ўдакладніў:

— Я, чалавеча, на паперы не пішу, усё ў памяці трымаю. Але ж гэта не фальклор, а, як ву-

чоныя людзі кажуць, творчая індзівідуальнасць.

Гэткая адкрытасць збянтэжыла Бацьку, але стары не сунімаўся:

— То ты, можа, сам вершы пішаш, калі так пытаешся? Мо практыкавацца прыйшоў?

— Некалі пісаў,— чырванеючы, прызнаўся Бацька.— А цяпер не пішу.

— Прачытай хоць і тое, што пісаў. Чытай, не бойся.

— Толькі адзін слупок і помню. Пра тое, як мне не хацелася ўставаць кароў пасвіць:

Пасля сну ён стаў нялоўкі,
Пацягнуўся, як струна.
Эх, каб вы, мае кароўкі,
Ўсе падохлі, як адна.

Паэт слухаў уважліва, нават вочы прыжмурыў, а пасля незадаволена крэкнуў:

— Эх, блазноцце. Каб пугай па голых лытках, пугай. Ці ж можна так брыдка пра каровак?

— Надта ж збродныя былі, асабліва рабая: калі дык і на ўсю ноч сходзіла,— ціха, як вучань-двоечнік, апраўдваўся Бацька перад абураным паэтам.

— Цемната. Калі ўжо цяжка выходзіла, сыпануў солі на лату травы — карова з месца не сышла б — зямлю грызла, а не сышла б,— павучаў паэт, то прысядаючы на лаўку, то ўзнімаючыся. Потым здзекліва спытаўся: — Нябось і ў рэдакцыю нейкія вершы пасылаў?

— Пасылаў,— уздыхнуў, ужо добра напалоханы, Бацька.— Як цяпер помню, такі адказ прыйшоў: «Дарагі Змітрок! Вельмі добра, што ты ўзяўся паэтызаваць працу, але твой верш друкаваць яшчэ ранавата — у ім насцярожваюць моманты грамадскай накіраванасці: індывідуалістычны падыход да праблемы. І гэта ў той час,

калі свет такі вялікі. Раім табе больш чытаць твораў Купалы, Коласа, Маякоўскага і сучасных паэтаў. З сяброўскім прывітаннем літсупрацоўнік Дульскі». Такое вось маркотнае пісьмо было. Нічога я тады не ўцяміў з яго.

— Ты тады, а я і цяпер мала што скеміў. Можа, яно каровам пісалася?

Бацьку апрыкралі ўсе гэтыя ўспаміны, таму ён хацеў перавесці на другое.

— Цікава ўсё кругом,— неяк легкадумна сказаў Зміцер Апанасавіч.

— Не думай, што ты адзін цікаўны, я таксама хачу тое-сёе ведаць. Не такі яшчэ я і згрыбелы старац. Скажы, можа, ты чуў,— усміхнуўся стары,— дзе гэта цяпер кароль Афганістана, пасля таго, як там перавярнулася з манархіі на рэспубліку?

— У Італіі,— адказаў Бацька наўгад, бо прадчуваў, што найбольш гэтая краіна — прыстанішча для экс-манархаў.

— Правільна,— узрадаваўся паэт.— У Італіі. Ён паехаў у Лондан, а Махамет тым часам і закруціў дзела туга. Во паехаў дык паехаў.

Стары задумаўся. Бацька і не гадаў, што ён так хутка заваюе ў яго аўтарытэт. Паэт адразу палагаднеў, нават бровы абвіслі.

— А як жа вы тут жывяцё? Што добрага чуваць у гэтым прыгожым кутку? — пачаў падлагоджвацца Бацька.

Паэт сеў на лаўку і мяккім разважлівым голасам, паводзячы рукамі, пачаў гаварыць:

— Прыйшла касьба, жніво ідзе,
Ідзе гарачае ўжо лета,
З сярпом, з касой яно штодзень
Для беларускага паэта.
Цяпер заўзята я працую,

Палепшыў гэтым дабрабыт,
Бо крэпкім здароўем сябе чую,
Па горла хлебам цяпер сыт.
Паэт у працы ёсць магучы,
І родным краем даражыць,
І другіх яшчэ ён вучыць,
Як на свеце трэба жыць.
Усяго я досыць маю —
Бульбу, жыта, авёс, лён,
Без паноў дамоў збіраю
За труды багаты плён.

На падвор'е з радасным мэканнем ускочылі дзве старыя казы, цягнучы за сабой ланцугі. Яны навыперадкі кінуліся да паэта і пачалі лізаць яму рукі.

— А-а — Красунька і Золатца сарваліся. Дамоў захацелі,— ласкава гладзячы, вітаў іх стары.— Добра, зараз я ўсіх вас прывяду. Мяне пачакайце, калі маеце інтарэс,— кінуў ён Бацьку.— Начаваць хоць месяц начуй, толькі вершы мае наўрад ці табе падойдуць. Бо я найбольш рэалізмам складаю, што бачу, пра тое і складу, нічога не выдумляю, як у вас там вучаныя паэты. Ды ў мяне к таму ж палітычныя вершы на мяйсцовыя тэмы.

Цэлы статак козаў уварваўся на падвор'е. Як белыя чэрці, яны падскоквалі, бадаліся. Паэт уціхамірваў іх лазовым дубцом, заганяючы ў прасторную загарадку ля хлява:

— Катушка і Лявоніха, сюды, а вы, Дырэктарша і Маркотная, у гэты бок.

Пасля паэт даіў козаў, апраўдваючыся перад Бацькам:

— Самому прыходзіцца. Баба ўжо болей як дзесяць гадоў сышла ад мяне. Яно, можа, так і лепей — хоць свабода ў думках ёсць, а то ўсё багамазіць — і дроў трэба, і тое ідзі рабіць, і тое.

Нічога не зробіш — усе паэты былі няшчасныя ў сваёй сямейнасці.

Паэт крэкнуў і зноў зацыркаў у даёнку.

Пасля даення козы жвавелі і разгуляліся яшчэ болей — лезлі на загарадку, бадалі свайго гаспадара, галасней мэкалі, толькі рэха разлягалася ў сасонніку.

Малака сабралася вядры два. Бацька глядзеў і думаў: нашто столькі аднаму чалавеку?

— Гэта я сыр раблю па свайму рэцэпту. Не горшы чым галандскі ці швейцарскі. На ўсю зіму запас маю. Ну, пойдзем у хату, пасядзіце трохі.

Пакуль стары цадзіў малако, Бацька разглядзеўся. Дзіўна і вусцішна было ў старасвецкай хаце. У глухім куце ля парога — закураная печ без засланкі,— здавалася, што нейкае страшыдла раскрыла чорную зяпу; насупраць печы, ля акна — клышаногі кухонны столік, які марозна рыпеў пры кожным дотыку старога. Далей — у міжаконні — вялікая двух'ярусная кніжная паліца, забітая старымі кнігамі, часопісамі, мастацкімі і па сельскай гаспадарцы. Ад паліцы ішоў трохі казытлівы, як бы парахавы, пах старой паперы. У куце на тумбачцы стаяла толькі адзіная рэч, якая напамінала пра былы размах цывілізацыі,— дапатопны батарэйны радыёпрыёмнік.

Ні фіранак, ні абрусоў, ні вазонаў — нічога, што можа дыхнуць утульнасцю, у хаце не было. Відаць, адзінотна і маркотна жылося паэту на хутары ў гэтай запушчанай хаце з сырым кіславатым духам. Але сам стары чуўся бадзёра. Усеўшыся ля Бацькі на драўлянай канапе, ён толькі адзін раз пажаліўся:

— Некалі я склаў «Песню адзінокай бабы»:

Ой, пайду я ў лес па дровы,  
Ой, божа мой, божа.

Сама сяку, сама вязу —
Ніхто не паможа.

Сама еду на муку,
Самой хату месці,
А як бліноў напяку,
Няма каму есці.

Усё роўна як бы пра сябе наперад складаў. Я і ў печы рэдка палю, у коміне ўжо кажаны водзяцца. А некалі тут шмат людзей перавярнулася. У вайну я парцізанаў укрываў, гэтыя пасля вайны спярша прыходзілі, а цяпер рэдка хто зойдзе. Ды нічога, адна бяда, што электрыкі не падводзяць. Кажуць — пераязджай у вёску. Дзе мне перад смерцю туды перацягвацца? Каб далі электрыку, я тэлевізар купіў бы, грошы маю.

Стары зноў задумаўся, закурыў беламорыну, а пасля як бы сам сабе пачаў разважаць:

— Толку з іх, з грошай. Хто цяпер іх не мае? Усе маюць. Грошы здабываюцца скарэй, чым чалавек перарабляецца на лепшае. Ва ўсіх тэлевізары, машыны, што транты мыць, равары, мацыклеты, а спытай у другога — адкуль гэта ўсё? — не скажа, бо не ведае. Ды і ці паразумнеў ён ад гэтага тэлевізара? Глядзіць, як баран,— і ўсё. А ўжо што п'янства, распуста пайшла...— стары махнуў рукой.— Па праўдзе сказаць, мужык любое гора выцерпіць, а дастатак яму цяжка пераносіць.

Разглядаючы хату, ніяк няможна было зразумець, што за збудаванне прымайстравана ўздоўж сцяны ля самай печы. Дашчаны насціл велічынёю з добрыя дзверы быў з чатырох бакоў высока прычэплены тоўстымі прасмаленымі вяроўкамі за бэлькі. Нешта не то палаці, не то гамак, не то вясковыя дзіцячыя качэлі. На насціле ляжалі сяннік, падушка і старая коўдра. Туды можна

было ўзабрацца па прыстаўной жалезнай драбінцы. Бацька моўчкі гадаў — хто там спіць? — і ўсё зіркаў на гэтае дзіва.

— Глядзіш на мой бярлог? Мусіць, смешна, што стары чалавек па драбінцы лазіць спаць у калыску? Гэта я не так проста, я адмыслова зрабіў, мне думаць лягчэй, адарваўшыся ад зямлі. Узношуся над дробнасцямі жыцця.

Табе, відаць, у вёсцы пра мяне ўсякага нагаварылі. Там пра мяне кажуць — нарадзіўся, як сабакі гаўкалі. Ну, няхай, цёмны яшчэ народ, шмат хто злуе на мяне, а я ім толькі ўвесь век дабра зычу. Ты думаеш, мне карціць пусціць на здзек якога-небудзь недавучанага настаўніка, калі я на людзях смяюся з яго? Мне проста хочацца, каб ён сам давучыўся, не калечыў дзяцей. А тыя, што рагочуць з настаўніка, не болей за яго ведаюць. Альбо ўзяць тое, што калі я складна скажу са сцэны пра якую безгаспадарнасць? Ці ж мне бяда, што праўленне ўзлуецца? Затое яны будуць ведаць, што не толькі начальства ў раёне глядзіць на іх, але і свае людзі ўсё бачаць, варушацца.

Паэт Мацей Бубен гаварыў настолькі спакойна і пераканана, што нават і здарожаны Бацька адчуў усю сілу яго недасяжнай логікі.

Пагладжваючы ручку самаробнай нефарбаванай канапы, Бацька зачараваўся стройнасцю ліній драўляных валокнаў. І яшчэ ён думаў, што такія словы Мацея Бубена гучаць найлепей тут, у яго простай сялянскай хаце.

«Калі ўжо ты і браўся што рабіць,— падумаў Бацька пра сябе,— то трэба было працей. Вось просты чалавек сядзіць — паэт і цэлая гісторыя. І з ім лічацца. Добра-кепска, але лічацца. А я?..

З вяроўкамі з даху ляцеў... У булачнай у кнігу скаргаў палез».

Паэт тым часам пачаў успамінаць:

— Яно жыць так, сваёй сілай, найздаравей. Я пераканаўся яшчэ гадоў сорак назад, пры Польшчы, калі дзецюком быў і з папом пасварыўся.

— А як жа вы з духавенствам звязаліся?

— Меў клопату, ды яшчэ якога. Паслухай, што было:

Раскажу я вам, братцы, фантазію,
Пра заброцкага папа і плыцкую буржуазію.

Тут стары прыпыніўся:

— Папраўлюся, гэта ніякая не фантазія, а чыстая праўда пра вёску Плыты, я тады яшчэ не шыбкай грамаці быў, то ў мяне ўсё так выйшла. Ну, дык вось:

Пра заблоцкага папа і плыцкую буржуазію.
Як плыцкая буржуазія прыняла ўсе меры,
Каб як у капліцу уставіць дзверы.
Праз блізкі час і дзверы ест,
Адно асталося устроіць фэст...

Гэта быў доўгі верш з вясёлым сюжэтам, нешта накшталт народных гутарак. «Плыцкая буржуазія» з нагоды новых дзвярэй у капліцы выправіла тады набожнага Андрука ў Вільню па свечкі. Тыя «дзве кілі» свечак ляжалі ў капліцы пару гадоў, а ў ход не ішлі. «Буржуазія» вырашыла «прывязці папа ў капліцу і народ паспавядаць». Абставіны скláліся дрэнна, бо пасланец Донька пад'ехаў да папа на сваёй простай сялянскай падводзе, прыкрыўшы яе звычайнай старою посцілкай. Ах, гора ж вясковае! Донька перад гэтым цэлы дзень вазіў гной, і ці ён вінаваты, што ў яго няма рысорнай брычкі, а толькі калёсы.

Якую меў чалавек падводу, на такой і пад'ехаў. А поп ужо такі пан: «Не сяду, і ўсё тут».— «Ну і хоць скрозь зямлю ты пайдзі,— справядліва адказаў Донька папу.— Ці ж я сам гэты воз загáдзіў?»

Усё скончылася тым, што Мацей Бубен рыфмавана ўславіў гэту гісторыю, зрабіўшы ў канцы даволі выразны вывад:

Бо трэ хітрэй надалей быць,
Па папа не ездзіць, не хадзіць.
Нам-то смех, а папу злосць,
Але праўда ўсё тут ёсць.

Паэт і цяпер гаварыў з інтанацыяй, па-вясковаму самавіта, з той сялянскай смеласцю, якая вуглавата ўмее выйсці на людзі.

— Дык вы, дзядзька, досыць рызыкоўным дзецюком былі?

— Было — сплыло. Вершык я на вечарынцы прачытаў, а языкі па наваколлі разнеслі. Ну і пачалося тады...

— Ці ж пасмяяліся хоць людзі?

— Людзі смяяліся, а матка мая плакала. Мяне тады ад цэрквы адлучылі. Як Льва Талстога.

— І як жа вас адлучалі?

Паэт падумаў: «Гэты, відаць, такі пранырлівы. Усё яму трэба вызнаць».

— Хораша, пры вялікім народзе — на спаса, у нас гэта гадавое свята, фэст некалі быў, службу ў царкве служылі семнаццаць папоў. Тады і выйшаў наш поп з-за царскіх дзвярэй і сказаў на ўсю царкву: «За святатацтва і аскарбленне духавенства жыцель хутара Юзэфова Мацей Бубен с этого святого дня не должен перaступаць парога сего свяшчэннага храма. Госпадзі, памілуй!» І тут тады хор грымнуў услед: «Госпадзі, памілуй!»

Я, праўда, гэтага ўсяго не чуў, але людзі рас-

казвалі. Мне тады маткі толькі шкода было, бо надта ж ужо старая плакала, а я і датуль забыўся ўжо, калі той парог у царкве пераступаў. А на фэст прыйшоў афішкі, ну, значыцца, лістоўкі, у вазы запіхаць — я за гэта дзела тады з астрогаў не вылазіў — сядзеў і ў Лукішках, і ў Вілейцы.

Многа ўсякага ў жыцці было. За вечар не раскажаш.

Стары пільна глянуў на гадзіннік і запрасіў Бацьку павячэраць казіным малаком з хлебам. Елі нядоўга, але апетытна. Бацьку хацелася добра пагаварыць з чалавекам, ды гутаркі вялікай не выйшла. Паэт раптоўна перапыніў:

— Вось што, чалавеча, лезь ты на мае палаці ды кладзіся спаць. А заўтра, калі хочаш, будзем козаў пасвіць і кошыкі плясці. Тады я шмат чаго раскажу, а цяпер мне час апошнія навіны слухаць. Я ўсё ніяк не магу дайсці, дзе там праходзіць лінія перамір'я ў В'етнаме і чаго хоча гэта сайгонская марыянетка Цьхіеу? Мусіць, благі чалавек — столькі часу ўсё ваду муціць. Трэба ўключаць радыё.

Праз пару хвілін у хаце ўжо як бы салаўі вясновыя запелі: паэт круціў гузік прыёмніка і розныя радыёстанцыі цурчалі кожная сваім спевам. Паэт шукаў звестак пра лінію перамір'я. Яго натруджаны твар прынік да асветленага прамавугольніка з назвамі розных гарадоў, які ў цемрадзі начной хаты здаваўся адзіным акном у свет.

Бацька тым часам сіліўся заснуць на палацях паэта, высока-высока, пад самай столлю. Сіліўся, і не мог. Можна, калі б відней было, пачаць лічыць бэлькі, але цяпер відзён быў добра зверху толькі твар паэта, асветлены нияркім святлом дапатопнага прыёмніка. Нейкі раптоўны боль здушыў сэрца Зміцера Апанасавіча.

Твар паэта быў надзіва просты і спакойны, хаця ён шукаў вельмі важную навіну. «Загарэлы, у працы ўвесь»,— падумаў Бацька, гледзячы, як вузлаватыя пальцы старога чалавека лёгка круцяць гузік настройкі прыёмніка.

Бацьку чамусьці падумалася, што гэтак жа лёгка ён махае касой, гэтак жа лёгка сячэ дровы. «Яму ўсё даецца — і жыць і думаць»,— адзначыў Зміцер Апанасавіч.

Паэт тым часам думаў, што заблудзіў да яго чалавек, які не надта хоча гаварыць пра сябе. Выпытваць жа Мацей Бубен не любіў. «Добры чалавек і выйдзе добра, а злы — са злосцю»,— толькі ўсяго і падумаў паэт.

А Бацька меркаваў, пагойдваючыся на паляцах: «Трэба іначыць мне лад свайго жыцця. Хіба ж я не магу жыць па-людску?

Да д'ябла яно ўсё, можа, кінуць горад і паехаць да маці, настаўнічаць у вёсцы? Там народ свой, думкам ясней будзе. Жыве ж вунь паэт... Якая ні ёсць, але ўсё-такі слава ў чалавека. Не будзе ні Цвыркуна, ні Лізіных банкетаў...»

Такое находзіла на Бацьку не першы раз, але цяпер кальнула асабліва востра, відаць, ад перамены месца, незвычайнай цішыні, што магла б супакоіць нервы. У горадзе яму часта было адзінока, Бацька чуўся разгублена, сам не ведаючы па якой прычыне. Хутчэй за ўсё таму, што ў горадзе шмат людзей, яны ў большасці і не ведаюць адзін аднаго. Так і чуеш: «Грамадзянін! Таварыш! Мужчына!»

А дома ўсё іначай...

«Вунь Ігнась зноў п'яны, як корч, паплёўся»,— частаківала галавой маці, гледзячы ў акно.

«То нават вечна п'янага конюха і то па імені

завуць, а тут... Ідзеш ты нікому невядомай кузюркай».

«Мусіць, паеду. Кустоў яшчэ болей у садзе насаджу, вулляў настаўлю. Самадзейнасць можна ў клубе развесці. «Крыжачок» танцаваць будзем. У народзе праславімся. Мясціны нашы прыгожыя, людзі жывуць добра. Кожны мяне за чалавека мецць будзе, а то і памрэш з мянушкай, якую Толя з Сашкам далі».

З такімі думкамі, не новымі для сябе, але цяпер вельмі рашучымі, Бацька заснуў.

...Рана-ранічкай паэт з Бацькам сядзелі на ўзлужку, ля самага жыта.

— То ты, кажаш, хочаш з'ехаць з горада ў вёску? Хто яго ведае. Цяпер болей усе ў горад ірвуцца. Але, як у нас кажуць, кожны жыве паводлуг свайго жыцця.

— Ці ж там ёсць такая прыгажосць? — Бацька паказаў рукой на сасоннік, жыта і лужок, які дыміўся лёгкім цёплым туманком.

— Сасоннік як сасоннік і жыта як жыта,— не згадзіўся паэт.

— Не скажыце. А ціха як, толькі птушкі пяюць. Ні тлуму ніякага, ні грукату. А я за пятнаццаць гадоў учадзеў у горадзе.

— Табе відней. Вось ты кажаш,— вучыш студэнтаў, як правільна пісаць, гаварыць. І ці чуў ты такое: нашы людзі гавораць — слухае, нося, робя, а вунь за тым далёкім лесам — бачыш яго, ён пад Вілейкай,— іначай кажуць — слухаіць, носіць, кажыць. І чаму гэта так? Блізка ж жывём.

— Дыстрыбуцыя гэта называецца,— сказаў Бацька наўгад нейкі лінгвістычны тэрмін.

Стары зморшчыўся.

— Нейкае брыдкае слова... Гм... дрыстрыбуцыя за лесам. І што яна там робіць?

— Не ведаю.

— Эх ты! Людзі там жывуць, добрыя людзі, так як і мы, працуюць, весяляцца, толькі мы іх завём кіці, бо яны гавораць па-свойму — усё **-іць** ды **-іць**: возьміць, пашыіць. Кіці там, а не твая гэта, як яе... пературбацыя.

Расказаў бы ты студэнтам пра кіцёў, яны і запомнілі б і тваё брыдкае слова. Ты што, будзеш і дзецям у вёсцы галовы забіваць такімі словамі?

Бацька сядзеў разгублены. Думалася і пра іншае. Вось ён пераедзе ў вёску настаўнічаць, і ў нейкім пятым класе яму трэба будзе сказаць: «Дзеці! Назоўнікам называюцца словы, якія абазначаюць адушаўлёны або неадушаўлёны прадмет і адказваюць на пытанні: хто? што?» Якая святая наіўнасць і прастата! І гэта ў той час, як ён зазубрыў і ведае, калі не да канца сэнс, то хаця назву такіх паняццяў, як «намінатыўны і эргатыўны лад сказа» і тым больш «антыномію парадыгматычнай ідэнтыфікацыі фанем». Вядома, уся гэта мярцвячына выдумана ў прафесарскіх кабінетах, але якая глыбокая тайна ў самім гучанні слоў. Не будзеш жа гаварыць школьнікам пра квантатыўны падыход да марфалагічнай тыпалогіі моў. Дзеці шызафрэнікамі могуць стаць. І як шкада цяпер гэтых сваіх ведаў. І на што яны тады здадуцца ў жыцці? Вучыў, зубрыў... Так-то яно ўсё так, але што на блізкім свеце кіці ёсць, я дагэтуль і не даведаўся. А шкада... Відаць, цікавыя яны людзі. Чырванеў цяпер перад паэтам...»

— Ну добра,— сказаў паэт.— Памажы мне трохі гаспадарыць. Давай казу выведзем.

На панадворку паэт даў Бацьку ў рукі повад,

на якім была навязана каза з бяздумнымі, як і ва ўсіх козаў, вачамі. Паэт пагладзіў яе і ласкава падштурхнуў: «Го-го, каза, го-го, шэрая! Ідзі, Красунька!»

Бацька не любіў і трохі баяўся козаў. Можа таму, што ў іхняй вёсцы і за чалавека не лічылі гаспадара, які трымаў не карову, а казу. Але цяпер ён мусіў весці гэтае стварэнне на выпас і нават пачаў адчуваць нейкую гаспадарскую клапатлівасць, занепакоенасць.

Спачатку каза ішла спакойна і пакорліва, але каля самага лужка на яе найшло падазронае ажыўленне — яна баданула галавой і радасна забляяла. Невядома, ці казе надакучыла стаяць у хляве і яе асляпіла ранішняе сонца, ці яна была галодная, а мо яе развесяліў незнаёмец. Раптам каза падбрыкнула і радасна пабегла. Бацька — услед. Ён нават і не асмеліўся падумаць, што казу можна супыніць — повад жа быў у яго руках. Праз хвіліны дзве каза ўжо не бегла, а проста імчалася зігзагамі па лужку, а побач з ёю часаў і Бацька. Мора чыстага паветра імгненна запоўніла грудзі, і ў Бацькі соладка закружылася галава. Усяго гэтага марафону з казой на невялікім лужку і не было б, але Бацька адразу дапусціў тактычную памылку — ён пабег. І цяпер каза ўжо ўцякала ад яго, і не было надзеі, што яна спыніцца.

Паэт з панадворка глядзеў на гэтае дзіва і паблажліва ўсміхаўся: «Дарослы чалавек, а як які хлапчук-падшпарак з казой бегае. Давай, давай, Красунька, правучы яго».

У Бацькі ўжо мігцела ўваччу, ён цяжка дыхаў, абрасіўся ледзь не да каленяў, але ўпарта бег, даючы які ўжо зігзаг па лузе. Раптам Бацька знячэўку зачапіўся за купіну і, паслізнуўшыся,

паляцеў потырч носам у вільготную траву. Але ён не выпусціў з рук повада, і цяпер каза, туга напяўшы яго, спынілася, сумна гледзячы на Бацьку. Бацька не абабіўся, не ўдарыўся, але ад нечаканасці зайшлося сэрца і прайшоў налёт ранішняй сентыментальнасці. І птушкі цяпер не спявалі так урачыста, і сасоннік стаў як сасоннік, і жыта як жыта.

Бацька скрывіўся і сумна перадражніў: «Го-го, каза, го-го, шэрая!»

Паэт адзначыў сам сабе: «У яго, як у зязюлі,— палявы розум».

Бацька скеміў, што казу трэба тут і навязаць, толькі трэба адвесці крокаў на пяць, каб не ўлезла і не зграсавала жыта. Ён тузануў за повад, але каза не ішла. «Ну і зараза»,— падумаў Бацька, гледзячы ў яе ўпартыя вочы і тузаючы повад. Раззлаваны, ён натужыўся і з усёй сілы наструніў повад да сябе і волакам пацягнуў жывёліну. Каза трошкі праехала капытцамі па мокрай траве і пала на пярэднія ногі.

Тут Бацька ўжо зусім ускіпеў. Схапіўшы казу за рубчастыя рогі, ён пачаў трэсці яе галаву і падымаць, спадзеючыся, што каза вось-вось падымецца: «Уставай, праклятая!»

Паэт смешна, урасхістку, як і ўсе грузныя людзі, бег па лужку: «Што ты робіш, басурманін? Гэта ж мая самая дойная каза. Красунька мая,— гладзіў паэт казу, а потым узяўся павучаць Бацьку: — Узяў бы жыдзенькі дубчык і ціхенька падняў. А ты як канавал. Гэта ж далікатнае стварэнне».

Паэт сам навязаў усіх козаў і, супакоіўшыся, спытаўся ў Бацькі, ці даўно ён жыве ў горадзе.

— Ды ўжо болей як пятнаццаць гадоў будзе.

— Яно і відаць. Адвыкшы ўжо ад вясковага жыцця. Пойдзем цяпер дроў трохі пасякаем.

На панадворку, ля загарадкі, была накідана цэлая сціртa даволі таўставатай лазы. Балотная, пакручастая, яна выпетрала на сонцы, стала сухой і цвёрдай як косць. Тут жа стаяў стары, пабіты сякерай, корч, на якім паэт сек дровы.

Бацька занёс сякеру за плячо і так гахнуў па лазіне, што паленца высака ўзляцела над панадворкам. Раз! Два! Тры! Чатыры! Бацька набіраў імпэт. Лёгкія, як перыйкі, паленцы пырскалі ў бакі, узляталі вышэй хлява і падалі дзе якое. Паэт, задзёршы галаву, толькі скакаў, як зачумлены, па панадворку, баючыся, каб зверху не агрэла па галаве.

Бацька і тут дапусціў памылку: калі сячэш дровы, асабліва сухія, трэба лупіць сякерай не прама, а наўскасяк. Тады і паленне акуратна ляжа. Бацька забыўся. Раз! Два! Тры! Чатыры! Разгублены паэт крычаў:

— Досыць ужо! Досыць!

— Не! Яшчэ насяку! — упарціўся Бацька.

Раз! Два! Тры! Чатыры! Бацька разышоўся. Невядома, ці доўга б яшчэ ён ляскаў, але пры адным няўдалым удары паленца нікуды не паляцела, а балюча стрэліла Бацьку ў лоб.

«...Не, чалавек, у вёску ты не едзь,— гаварыў з усмешкай паэт. Яны стаялі сярод панадворка, і Бацька цёр лоб, на якім ужо ўскочыў гуз.— Там цябе пальцамі заторкаюць. У вёсцы трэба не толькі дзяцей вучыць, а і гаспадарыць трохі. А пераламаць сябе — не тыя ўжо гады маеш. Я і не ведаю, куды табе ехаць. Можа, лепей назад, у горад, там людзей шмат, не ўсё так і відаць. Я б цябе тут на хутары пакінуў, але баю-

ся — ты ж мне ці хату спаліш, ці казу ўдушыш. Ну, будзь здароў,пературбацыя».

Зміцер Апанасавіч паехаў. На лбе смылеў гуз.

У Вілейцы ён разгубіўся — зусім не помнілася, у які бок ехаць да аўтастанцыі. І ўправа дарога, і ўлева — як тут дойдзеш толку. На аўтастанцыі па схеме руху аўтобусаў Бацька хацеў паглядзець прыблізную карту гэтых краёў.

З павільёна «Вецярок» вываліла трое мужчын. Іх згуртаванасць, дабрадушныя, адкрытыя позіркі сведчылі, што разыдуцца яны не скора.

«Простыя людзі,— падумаў Бацька.— Можна і спытацца».

Яму цюкнула ў галаў ідэя.

Гаварыць «грамадзяне» альбо «таварышы» было б несправядліва — не сход жа; называць сябрамі не выпадала — не скідаўся ж па рублю з імі.

Бацька ўспомніў, што паэт гаварыў пра добрых людзей, якія жывуць тут і ў наваколлях і якіх па-зямляцку называюць кіцямі.

— Эй, кіці, скажыце, як да аўтастанцыі даехаць? — шчыра выгукнуў Бацька.

Кампанія застыла на сходках. У родным горадзе сярод белага дня! Нейкі заезджы чмут з чамаданчыкам! І яшчэ нечага радуецца!

Бацька не ведаў, што паэт утаіў адно: кіць — гэта зняважлівая мянушка, якой ні за што ні пра што суседзі ахрысцілі тутэйшых людзей і смяюцца з іх. Гавораць, што яны лясныя, цёмныя і адсталыя. Пра іх плятуць плёткі, кажуць, што некалі кіці на семафоры хрысціліся — думалі, што крыжы стаяць.

Тутэйшыя ж людзі, вядома, злуюцца з-за несправядлівай абразы.

Бацька не ведаў, таму зусім проста мог трапіць у пераплёт.

Першым ірвануўся са сходак крапчак гадоў трыццаці, выразна вымаўляючы: «Што, пляскатагаловік, зубы лішнія адраслі?»

З ганка патрабавалі:

— Віцька, пад дыхавіцу яму!

— Утрахтуй, утрахтуй, Віцька!

У Бацькі ёкнула сэрца, але ён паспеў здагадацца ціскануць з усёй сілы на педалі. Мала што разумеючы, Бацька імчаў чым далей ад гэтага «Вецярка» і гэтых простых людзей.

Потым ужо, у дарозе, ён зразумеў падвох паэта. Але найбольш балюча было прызнавацца сабе, што даеш цягу з-за сваёй недасведчанасці. Вучыў жа яго адзін разумны прафесар: «У вашы гады трэба ўжо ведаць да драбніц усё, што датычыцца жывой народнай мовы».

«Век жыві — век вучыся»,— спрабаваў цяпер апраўдвацца Бацька сам перад сабой, але не мог — сорам цвяліў душу. І ўрэшце ён вяла і гаротна запеў: «Эх, Вілейка ты, Вілейка, ты мне жалю паддала».

«Куды захацеў — дамоў вярнуцца,— дражніў Бацьку нейкі злы голас з глыбінь свядомасці.— Патрэбен ты там. Цябе вучыцца паслалі. Меркаваўся да конюха Ігнася. Дык гэта ж якая б ні была, але галава — ён і на простай сваёй справе гешэфт знайшоў: коням хвасты абразае і дзеўкам на шыньёны прадае. Конюх, а кемлівы, сітуацыю ўлавіць можа. А ты? Торкаешся толькі».

«Не дапясціся мне назад,— думаў Бацька.— Белабрысы пстрычкамі лупіў, паэт кепікі строіў, а тут яшчэ мудрэй магло выйсці. Лепей ужо як было, хай так і будзе. На сваю кафедру! Там усё

неяк па-свойску, зацішней. Не вырвацца мне з майго калаўрота дзён».

«А захачу,— казырыўся Бацька,— буду разам з Толем і Сашам у бібліятэку штодзень хадзіць. Што я, горшы за іх?»

І ён націскаў на педалі, і імчаў у сіняй майцы і шортах па шырокай роўнядзі асфальту, над якім вісела палоска цёплай блакітнай смугі. Уперад!

Ён не ведаў, што імчыць наўздагон цягніку, у якім едуць Толя і Саша, і што яму ў той цягнік ужо не сесці... дый ці трэба...

1972—1974

# СВІТКА БУЙНІЦКАГА

*Эсэ*

У 1974 годзе мне пшчасціла на Віцебшчыну. І я рады быў знаёмству з ёй.

Можна стаць падданым найвялікшай прыгажосці, гледзячы на сутоку шырокай, думнаплыннай Дзвіны са сваім прытокам, які на карце называецца Дзісна, а ў народзе Дзісенка. Пяшчотна, аж вершам хочацца гаварыць, бо звычайна

Так завуць дачку адну,
Што ёсць у хаце, памагае маці,
І вырасла, і нібыта ўцячэ.
Шкада яе, як бы яшчэ дзіцяці.
Вада паўночная цячэ... цячэ...
Там свет Дзвіны раздольны і шырокі,
А Дзісенка, ты меншанькая ў нас.
Ты найлягчэй пагойдваеш аблокі...

Цікава было слухаць і расказ старога ціхага чалавека. Мы стаялі ў дубовым парку, акаймаваным бярозамі. Чалавек чакаў жонку, якая з суседкай паплыла на лодцы даіць кароў на востраў. Летам каровы амаль усяго вясковага гарадка Дзісны днююць і начуюць без пастухоў на маленькім востраве. Там, дзе зарослыя сакаўной травой руіны крэпасці, якая была, здаецца, пры Пятры I на месцы зліцця Дзвіны з Дзісенкай.

Стары прыжмурыўся, гледзячы ўдалеч на ваду, і прызнаў: «Едуць... Мая ў вёслах». Абвязаныя даёнкі белымі воблачкамі свяціліся ў лодцы. Яна на вячэрняй вадзе не спяшалася — жанчыны гаманілі пра нешта сваё.

Чалавек пайшоў па густой чэрвеньскай мура-

жыне і паклікаў мяне: «Хадзі... пакажу... Хай сабе бабы плывуць». Ён падняў руку пад голле бярозы. Там да жывых валокнаў чарнелі глыбокія выбоіны, незарослыя карой. І так на ўсіх дрэвах парку, як бы хто роўненька намячаў шнурам.

Стары тлумачыць: «Бачыш, гэта іх лёдам пабіла... Вясной у трыццаць першым... Такая высокая вада ішла...»

Я анямеў: няўжо? Калі глядзець са стромага берага — да вады метраў дзесяць. Ну і Дзвіна, ну і нораў! А сёння яна цячэ сабе спакойна, гайдаючы палосы вячэрняй зары.

Пайшлі далей. Каля высокай бярозы — у вершаліне толькі купка лісцяў — чалавек спыніўся і ціха-ціха сказаў:

«А ля гэтай немцы людзей стралялі. Шмат народу ў нас выстралялі. Спіной да дрэва ставілі, а тады ў яму кідалі... Тут магіла...»

Ён не гаварыў больш нічога, пастаяў і пайшоў да Дзвіны. Што ж, у гора толькі два галасы — альбо крык, альбо сцятае маўчанне.

Парашэчаную самотніцу-бярозу і магілу ля яе збіраліся, відаць, абгарадзіць — на траве ляжала куча штыкецін. Цяпер кожнаму будзе бачна, што бяроза — жывое і маўклівае надмагілле над вялікай бядой. У Дзісне да вайны было звыш шасці тысяч чалавек, цяпер — і трох няма. Толькі ў адной магіле за гарадком, на так званых Пясках, пахавана амаль столькі ж...

Такое — і радаснае, і горкае — было маё спатканне з Віцебшчынай. А восенню давялося паехаць са студэнтамі за Глыбокае падымаць лён з-пад вераснёвых рос. Прыехалі мы з песнямі ў вялікую вёску Празарокі, што стаіць між чыгункай і шашой. Нас сустрэлі з кветкамі мілыя першакласнікі.

Я зноў апынуўся ў суседстве са сваім летнім знаёмствам, з Дзісной — грунтавой дарогай да яе ўсяго трыццаць вёрст. Гэта адзін край, і я ўжо ведаў, што ён багаты. Мы слухалі летам сумныя і працяжныя песні пра «беражыстую рэчаньку», якая з трысця-балота не можа выцячы, пра «слезавую і хлебавую долю», пра «недаўменную Амільку» і шмат пра што іншае. У песнях дзівіла высокая паэтызацыя чалавечага гора. Ім адухоўлены лясы і долы, дробныя дажджы і буйныя ветры.

Ездзячы ў фальклорныя экспедыцыі не першы раз, я заўважыў, што тут, як нідзе на Беларусі, песні падобны на паданні, яны, гаворачы па-навуковаму, эпічнага складу. Таму здзіўляе артыстызм іх пабудовы, бо ў песні лірычнай ён можа быць створаны лягчэй: там большая ўмоўнасць. Сам жа эпас заўсёды больш канкрэтны.

У песнях жыве багатая прырода — вялікія, глыбокія лясы і пушчы, з якіх, як казала адна бабуля, перад кожнай вайной галáсам вылі ваўкі. А яшчэ і азёры, векавыя валатоўкі і пагоркі... пагоркі... Па іх надта прыгожа, як бы хвалямі, пераліваюцца даўнія гасцінцы ў бярозах.

Іду надвячоркам па старым, разбітым бруку. Цяпер тут ціха, бо побач — новая шырокая шаша на Полацк.

Палі пусцеюць. Заворана ржышча, і на чорнай раллі стаяць залатымі харомамі сцірты саломы. На ўсходзе зырка займае неба вогнішча Наваполацкай домны. З зямлі набіраецца каляны халадок, паўзе шызаватымі струменямі з нізін на брук.

Настывае дарога пад полаз,
Шызы іней палямі бяжыць.
Качар спуджаны з Ветрына ў Полацк,
Хапянуўшы лядку, дакрычыць.

...Сёння на самоце чытаў пра куміра французскай сцэны Эдзіт Піяф, яе шчаслівы і няшчасны лёс. Піяф спаліў уласны талент. Тым больш што не маючы сталай адукацыі (на вялікую сцэну Піяф прыйшла вулічнай спявачкай, шансаneткай), яна пісала тэксты песень і часам музыку да іх.

Чамусьці асабліва цяпер я пераконваю сябе, што ў нас большасць народных песень склалі жанчыны, простыя сялянкі. Колькі такіх невядомых беларускіх Эдзіт Піяф прайшло нават па гэтым бруку. Сцэнай былі ім і жніўнае поле, і лес, і бераг рэчкі. Яны пайшлі.

Мне могуць сказаць: ну і параўнаў! То ж не збянтэжымся ад водгулля сусветнай славы і іншамоўных гукаў імя і прозвішча Эдзіт Піяф. Яно — як усім вядома, псеўданім, выдуманы на злосць экзальтаванай буржуазнай публіцы, перакладаецца вельмі проста — Верабейка. І песні яе простыя, як і тыя калыханкі, жніўныя, любоўныя песні нашых жанчын, якія ўжо адышлі, пакінуўшы нам узоры вялікага мастацтва.

Засынаючы і ўспамінаючы ўсё, міжволі слухаў, як гаспадыня за сцяной ушчувае свайго мужа. Ён мусіў прывезці, ды не прывёз нейкую гліну, а найлепшая яна ля Буйніцкіх. Пад гэту журботную музыку жаночага голасу і сон знайшоўся.

А назаўтра раніца ў нядзельку пачалася зноў з той самай гліны, якая найлепшая ля Буйніцкіх. Гаспадыня спавядала гаспадара, а той настойліва ўпіраўся.

Каб не быць сведкам чужых спрэчак, я хуценька сышоў на нядзельны Празароцкі базар: ён насупраць хаты. Харошыя яны, гэтыя невялічкія вясковыя базары. Тут хоць тарбахватаў ніякіх ня-

ма. Спакойныя разважлівыя людзі таргавалі і прадавалі парасят, і віскат стаяў на ўсё наваколле; адны бажыліся, што парасяты добра ядуць, а другія як бы і не верылі.

Быў і «інтэлігенцкі» куток базару — жонкі вайскоўцаў з Полацка прадавалі адрэзы вайсковага сукна, нязношаныя боты і лішнія рамяні сваіх мужоў.

Я адчуваў сябе лёгка і свабодна, патаргаваў парачку парасят і, вядома, не купіў іх, паглядзеў, як мужчыны мацуюць пстрычкамі падэшвы афіцэрскіх ботаў.

На базары людзі былі знаёмыя альбо трохі знаёмыя паміж сабой і чулася нейкая сямейнасць: перагукваліся па прозвішчах, гаманілі пра ўсё рознае.

З-за гэтых прозвішчаў я раптам успомніў пра гліну ля Буйніцкіх, прыкінуў геаграфію мясцін, і як бы асвятленне найшло: дык я ж на радзіме Ігната Буйніцкага!

— Так, гэта той самы Буйніцкі, што быў артыстам,— сцвердзіла гаспадыня.— За чыгункай яго фальварак стаяў. Палівачы зваліся. Цяпер там ужо нашы, празароцкія, забудаваліся. Усё Празарокамі завецца. А магіла яго таксама за чыгункай. Калі хочаце знаць, то жыве яшчэ адзін дзед, Голер, які штукаваўся разам з Буйніцкім.

«Нішто сабе штукарства,— падумаў я,— Буйніцкі заснаваў беларускі прафесіянальны тэатр, а тут...»

— Цяжка свой век дажывае Іван Іванавіч,— казала далей гаспадыня.— Каб столькіх дзяцей выгадаваўшы, ды ісці ў дом састарэлых... Маеце цікавасць — прывяду яго сюды, ён недзе па базары ходзіць...

Гэта было амаль неверагодна. Ігнат Буйніцкі

памёр амаль шэсцьдзесят гадоў назад, горы часу прайшлі, а актор яго трупы тут, ля мяне, зусім рэальна на гэтай рэальнай зямлі ходзіць па базары ў Празароках.

Цяжка пераступіўшы з кульбай праз парог, перада мной стаяў высокі дзябёлы дзед, такі сівы, стары, што нават цяжка было вызначыць, колькі гадоў гэтай старасці. Але позірк яго быў цікаўны: я зразумеў, што жыццё на свеце яму не надакучыла.

Здавалася, што гады мала збеднілі і голас, і памяць старога. Ён пакуль што казаў гаспадыні пра нейкія коўдры, якія збіраўся прадаваць, а яна адгаворвала:

— Іван Іванавіч, іх ніхто купляць не будзе. Каму яны патрэбныя? Як адразу па вайне, то, можа б, і ўзялі.

Стары незадаволена круціў галавой і казаў як бы сам сабе:

— Ну, не кажы, коўдры добрыя.

Дзьмухнула грубая проза на ўвесь паэтычны арэол легенды, якая склалася ў мяне даўно, на ранім юнацтве. Легенда простая. Яе можна паставіць і подпісам пад урачыстай фатаграфіяй усёй трупы Буйніцкага, якая ёсць у музеях і ў старой перыёдыцы. Подпіс быў бы такі:

«На пачатку стагоддзя Ігнат Буйніцкі са сваімі дочкамі і таленавітымі сялянамі навакольных вёсак стварылі беларускі тэатр, чым і здзівілі свет. Вось яны стаяць у два рады, задаволеныя і, здаецца, здзіўленыя сабой. Яны аглушаны радасцю воплескаў канцэртных залаў Вільні, Мінска, Пецярбурга, Варшавы, драбнейшых гарадоў і мястэчкаў. Што ж, ставяць п'есы, танцуюць «Юрачку», «Лявоніху», «Вераб'я», і да ўсёй гэтай свежасці так пасуюць іх святочныя касцюмы белага

палатна, вышытыя ў чырвоныя ўзоры. А пасярэдзіне сам Буйніцкі — невысокі, чарнявы, з ранняй сівізной на скронях. Пра яго Янка Купала напіша так: «Важна рэй Ігнат Буйніцкі ў танцах нашых водзіць».

Легенда легендай, але перада мной стаяў дзядуля ў зялёным капелюшы, цёмна-сінім пацёртым пінжаку. Ён цяжка дыхаў, а валасы спадалі на маршчаваты лоб.

«А што ж ты хацеў? — горка пытаўся пасля я ў самога сябе.— Няўжо ты думаў, што вечна маладымі, як на той фатаграфіі, будуць акторы?»

На жаль, я і сапраўды некалі так думаў.

Не!

— Маю, сынок, восемдзесят восем гадоў. Чатыры сыны, як муры, здаровыя. А што я сам сабой век дажываю, то гэта мая бяда. Стаяць у галаве і свая хата, і свой панадворак, ніяк галавы не магу прыгарнуць к весялосці,— плыў журботны голас старога чалавека.

Ён гаварыў-гаварыў пра сваю бяду, а пасля як бы страпянуўся, аж прыўзняўся з крэсла: — Як успомню, што мы з Буйніцкім выраблялі на сцэне, то гэта ж радасць-міласць.— І раптам запеў фальцэтам, падмахваючы ў такт рукамі:

А ты, Юрачка, што не жэнішся?
Прыйдзіць зімачка, дзе падзенешся?
Ні ў мякіну, ні ў авёс не ўкапаешся,
За дзяўчыначку не схаваешся.

Нашто бабе рашато?
Нашто дзеўцы сіта?
Пацалуіць малец дзеўку —
Яна будзіць сыта.

Пераход да «Юрачкі» быў такі нечаканы, што знікла ўся мая збянтэжанасць. Перада мной сядзеў артыст, які, праспяваўшы, паскардзіўся:

— Некалі тонна выходзіла, а цяпер годы не тыя. У Буйніцкага танцавалі найбольш скочныя танцы — «Лявоніху», «Качана», «Мяцеліцу», «Ваўчка». Яны танцавалі і падпявалі самі сабе, а мы, музыкі, таксама памагалі пецъ.

Стары зноў запеў і зноў адчуваў сябе як бы на сцэне: твар павесялеў, а ў стомленых вачах заіграла святло:

А мой жа ты і качан,
Вышэй плота тырчаў.
Я качана паліваць,
Качан мяне абнімаць.
Я качана за лісцінку,
Качан мяне за хусцінку.

У такім узросце, пераяжыўшы на свеце ўсякага ўсяго, памятаць чыста-наіўныя песенькі — не так ужо і мала. Кароткая школа Буйніцкага засталася ў памяці цымбаліста на доўгі век:

— Музыкаў нас траіх было: Адам Шульга, дудар, мой брат Франак на скрыпцы іграў і я на цымбалах. Ну і яшчэ восем танцораў — Буйніцкі са сваімі трыма дочкамі і гімназісты з Дзісны — хлопец і тры дзеўкі. Рэпертувалі ў Буйніцкага ў пакоях. У яго каля дома быў сад вялікі, гектары паўтара, ад пакояў саджонка (алея) ельніку, за елкамі на адзін бок антонаўкі, на другі — ранеты, бэры, дулі.

Мы са сваімі выкрэнтамі паўсвету аб'ездзілі — два разы ў Пецярбурзе былі, у Варшаве, у Вільні. У Пецярбурзе выступалі за Неўскай заставай у Спорцінь-палацы (Спорцінг-палас), уся зала ходырам хадзіла ад нашых танцаў. Па тры разы выходзілі. Буйніцкі танцы аб'яўляў сам, моцна, на ўсю залю.

— Як жа вы з братам — двое маладых дзецю-

коў з вялікай сялянскай сям'і, самыя работнікі — адлучаліся ад гаспадаркі?

— Буйніцкі нас сам нагледзеў, мы яму іграннем прыйшліся. Мама трохі журыла галаву, што ад хаты адрываліся, але бацька быў, сёстры, ды і мы камбінавалі так, каб два дні ў тыдзень можна было з'ездзіць на канцэрт. Буйніцкі плаціў нам няблага — па рублю ў дзень, а касец на дзень каштаваў пяцьдзесят капеек, жняі дваццаць пяць плацілі. Затое ж як урэжам усе на сцэне...

Стары, відаць, не любіў успамінаць пра бытавыя дробязі, бо зноў запеў, «як тады пялялі»:

А ў гародзе рэчка,
Купалася качка.
Любі, любі, мой міленькі,
Хоць я і дварачка.
А я дворка пекна,
Да работы ленка,
Шнуруюся, ружуюся,
Да работы ленка.

І ўсё ж, запісваючы песенны рэпертуар трупы, удалося штокольвечы дазнацца і пра Буйніцкага.

Буйніцкі быў «панок», праўда, невялікага панства — меў пад трыццаць гектараў незайздроснай зямлі. Яго зяць пісаў, што Буйніцкі, «маючы дваццаць гадоў, дастаў ад свайго бацькі кавалачак зямлі-балота і сваёй няўтомнай працай, працуючы ўласнымі рукамі, хутка давёў гэты няўжытак да цвітучага стану».

Вялікага гаспадара з Буйніцкага не выйшла. Ёсць такая вясёлая прыказка: «Умеў бы таньчыць, а працы гора наўчыць».

У Буйніцкага выйшла іначай — працаваць ён умеў, а танцаваць яго навучыла гора.

Якое гора? Тое, што ён бачыў. Вывучыўшыся ў Рызе на каморніка, ён абхадзіў шмат вёсак, лугоў, палёў, мераючы зямлю. Усё багацце песень,

танцаў, узораў народнага адзення, што стане здабыткам яго трупы, Буйніцкі найперш пачуў і ўбачыў сам у штодзённым жыцці. Таму пры яго дары і таленце, здольнасцях яго актораў у мастацтве трупы будзе не стылізацыя пад народнасць, а натуральнасць. Нехта можа зусім слушна запытаць: адкуль вам вядома, што была натуральнасць, а не стылізацыя? Што можна сказаць у адказ? Можна ўспомніць буйную рэакцыю публікі, тую грамадскую агалоску, рэха якой данесла да нас прэса, і сведчанне многіх таленавітых людзей. Такі ўжо ён тэатр — імгненны, у сваім часе. Канчаецца спектакль — і акторы пакінулі сцэну. Жывапіс дэкарацый, тэкст п'есы і г. д. могуць даць толькі прыблізнае ўяўленне пра спектакль. Без жывых людзей гэтага замала. І. Эрэнбург, напрыклад, так ацэньваў гэту расстаноўку сіл у мастацтве: «...спектаклі паміраюць — іх не ўваскрэсіш. Мы ведаем, што Андрэ Шэнье быў цудоўным паэтам, але мы можам толькі верыць, што яго сучаснік Тальма быў цудоўным акторам. І ўсё ж творчая праца не знікае: яна можа быць часова нябачнай, як рака, што адыходзіць пад зямлю...» Вахтангаў пісаў :«Мейерхольд даў карэнні тэатрам будучага — будучае па заслугах і адплоціць яму».

Праўда, асабіста для мяне толькі адна пастава Буйніцкага ў танцы, якую данесла фатаграфія, сказала, што гэта танец народны і вельмі вясёлы. Настолькі выразны там паварот галавы і зухавата ўзнятая рука.

Але цяпер перада мной жывы сведка тых дзён, які яшчэ расказвае і спявае.

Такім чынам, Буйніцкі быў каморнікам. Гісторыя пакінула нам тыповы вобраз каморніка: дробны службовец, які цягне за пана, абмервае сялян.

15*

Буйніцкі не быў тыповы, за што і паплаціўся. Аднойчы, мераючы зямлю ў багатай пані, ён, як кажа Іван Іванавіч, адрэзаў сялянам вялікую пашу.

Буйніцкага выжылі са службы. Але і сваёй гаспадаркай ён не стаў правіць: аддаваў зямлю ў арэнду сялянам і вельмі выгодна для іх. Казаў звычайна: «Табе капя́чка [капа] і мне капячка».

Усё сваё жыццё ён злучыў з тэатрам, калыскай якога стаў яго фальварак у Палівачах, а першымі артыстамі ён сам і тры яго дачкі — Ванда, Алена і наймалодшая Людміла.

Мой госць зусім спакойна (калі тое было!) сказаў:

— Гэрцю [1] я любіў. І яна мяне любіла, але падумаў я, што ў мужыцкіх стасунках жыву. Яда ў нас простая — капуста, поліўка, клёцкі з душой, а яна ўсё ж паненка — ёй і цукерачак трэба, і кавы. Буйніцкія, праўда, не паніліся, але я сам панімаў і да гэтага ўсяго аднёсся халаднакроўна.

«Не паніліся...» Адсюль і пачыналася як мужыцкая слава Буйніцкага, так і яго жыццёвыя беды — амаль традыцыйнае ў беларускім мастацтве на пачатку стагоддзя. Час стварае арэолы, а ў жыцці ўсё было больш празаічна.

Шляхта, ад якой ён адышоў, глядзела спачатку на Буйніцкага, як на дзівака: зайшло нешта ў голаў чалавеку, ніяк сталасці не набярэцца. Кепікаў хапала...

Але Буйніцкі размахнуўся шырока і адзін за адным даваў канцэрты ў Дзісне, Полацку. Наваколле загаманіла... Шляхцюкі пачалі глядзець на яго, як на здрадніка, паўвар'ята. Нечувана — за-

---

[1] Сярэдняя дачка Буйніцкага ад першага шлюбу — Алена-Герменегільда.

пусціць гаспадарку, аддаваць грошы на нейкія мужыцкія скокі.

Гаспадара з Буйніцкага не выйшла, але затое... затое многія афішы трупы падпісаны так: «Гаспадар І. Буйніцкі»

Што там суседзі — Ігната кінула ў той час жонка, шляхцянка з Магілёва. Першая жонка — Францішка — маці Алены і Ванды, будучых артыстак тэатра, была за яго. Яна рана памерла. Гэтая ж сказала: «Zgłupiał pan Ignacy, ja nie mogę patszeć na te chłopskie tańcy» [1] — і з'ехала ў свой Магілёў.

Сказала... з'ехала... Не так яно і проста было, як і ва ўсіх разбураных сем'ях. Былі, вядома, і дакоры, і спрэчкі, і пры ўсім тым абураная радня — бачыце, нават пані пана кідае, а ва ўсім вінаваты ён сам. І недзе садзілася яна з малой дачкой Жэняй на цягнік на недалёкай станцыі Зябкі, каб з'ехаць з Празарокаў назаўсёды. А Буйніцкі напярэдадні першай сусветнай вайны зусім прадасць сваю зямлю. У яго застанецца толькі дом. А ў ліпені 1914 года пачнецца вайна. Тады і загавораць, што Буйніцкі не дурань, ведаў усё наперад. Які толк з маёнткаў, калі трэба ў бежанства падавацца. Так яно ў жыцці бывае...

А на самой справе Буйніцкі прадаваў зямлю, каб знайсці грошы для сваёй трупы, якая да гэтага часу пасля шматлікіх трыумфаў прыпыніла сваю дзейнасць.

Цікавы ён — лёс маладой беларускай інтэлігенцыі на пачатку стагоддзя. Большасць яе — як з сялян, так і з дробнай шляхты. І менавіта яна так хутка адраклася ад векавых саслоўных заба-

---

[1] Здурнеў пан Ігнат, я не магу глядзець на тыя мужыцкія танцы (польск.).

бонаў у імя новага, дэмакратычнага, што падымалася з глыбінь блізкай ім вёскі. Тут быў і прыклад рэвалюцыйнай Расіі, дзе нямала дваранскіх дачок і сыноў пайшлі ў рэвалюцыю.

Шляхта ж у сваім побыце станавілася настолькі коснай, што з яе хацелася смяяцца. Купала з'едліва і пасмяяўся ў «Паўлінцы» з усіх недарэкаў — Быкоўскіх, Пустарэвічаў, Крыніцкіх. Тады ж газета «Наша ніва» надрукавала некалькі дасціпных допісаў пра норавы гэтага згасаючага саслоўя. Яны вельмі каларытныя, і цяжка ўстрымацца, каб не прывесці хоць урыўкі:

У Ігуменскім павеце «...на вялікдзень так шляхты гарэлкі напіліся, што ад розуму адышлі. І, як прыстала на шляхту, не біліся, як мужыкі, але грызліся: Пілатовіч з Гурскім адзін аднаму так паабгрызалі ногі, што і цяпер яшчэ не могуць хадзіць — парабіліся раны на нагах. Школы ніякай няма, і не стараюцца, каб была; страшэнная цемната».

Са Случчыны пісалі: «Тут жывуць шляхты, але гэта такі цёмны народ, што і выказаць трудна. Так, напрыклад, адна дзяўчына пасмяялася кавалеру, што яна яго дужа любіць. Той кавалер (45 гадоў), баючыся, каб не ўлюбіцца ў яе, перастаў хадзіць на вячоркі. Ён вельмі скупы чалавек і ўсё збожжа значыў крыжыкамі ў свірне, каб ніхто не ўкраў; але раз здарылася, што знакі на крупах здаліся яму не такія, як трэба. Тады ён давай усім расказваць, што гэта чары, і тыя крупы аддаў кабыле з'есці; кабыла, наеўшыся круп, пабегла гарцаваць у поле, а дзеці, ведаючы гэту справу, загналі кабылу да тэй дзяўчыны на двор. Кавалер той у плач, што і кабылу зачаравала».

Бог з імі, з той шляхтай, нам важна ведаць толькі, ад каго адыходзіла перадавая інтэліген-

цыя на новыя абсягі жыцця. Важна, бо і Буйніцкі адчуваў час, тэатр не быў для яго пустой забавай ад раскошы.

Трупа Буйніцкага ніколі не была пастаяннай. На першым яе выступленні ў Вільні ў лютым 1910 года на сцэну выпырхвала ў пары з Чэсем Родзевічам і Уладка Станкевічанка, апантаная энтузіязмам часу. Ці ж магла ўседзець у зале яна, энергічная і вясёлая напаўбеларуска-напаўфранцужанка — душа віленскай беларускай сябрыны? Для нас яна навек засталася цёцяй Уладзяй — жонкай Янкі Купалы.

Тады ж яна была не проста звычайная дзяўчына, а яшчэ і апетая паэтам «дзяўчына, кветкалілея». І гэта пасля ўжо яны будуць браць шлюб, і не зусім звычайна — «заручаліся з ёй туманом і агнём», як пісаў сам Купала.

Іван Іванавіч не пра ўсіх актораў мог расказаць, і не толькі таму, што забыўся. Пра некаторых ён і ведаць шмат чаго не мог.

...Што мог рабіць чалавек, выйшаўшы з царскай турмы? Відаць, як у каго склалася. Толькі далёка не кожны браўся з энтузіязмам арганізоўваць народны хор і тэатр. На якія ўжо танцы і песні можа пацягнуць былога палітычнага вязня ды яшчэ ў гады рэакцыі, пасля паражэння рускай рэвалюцыі, калі весела было толькі атупелым мяшчанам?

Але быў такі чалавек. Ён з'явіўся ў сваю родную Вільню летам 1909, праседзеўшы каля трох гадоў у мінскім астрозе. Яго звалі Алесь Бурбіс, і было яму толькі дваццаць чатыры гады.

У Вільні Бурбіс часта галадаў, бегаў вечна ў адным і тым жа паношаным палітончыку, меў голы пакой, куды забягаў толькі нанач. Але сын

дробнага чыноўніка ваеннага інтэнданцтва і да гэтага ніколі не ведаў раскошы. І, здавалася, ён не асабліва бедаваў, зрэшты, нікому не скардзіўся, а калі і сумаваў, то на адзіноце, і наогул быў, як успамінае Ц. Гартны, «заядлы вораг усяго хісткага, палавінчатага».

Па-рознаму паводзяць сябе людзі, выйшаўшы з астрога. Бурбіса ж там не перавыхавалі.

Віхуры першай рэвалюцыі і адкрытых мітынгаў прайшлі. Цяпер Бурбіс прабіраецца вечарамі ў віленскія прадмесці, у гуртках палітасветы ён тлумачыць шаўцам, рамеснікам, грузчыкам пра наёмную працу і капітал, пра сацыяльную няроўнасць.

Пасля астрога энергія Бурбіса, якой ён толькі і жыў, шукала ўсё большага ходу. Знайшла яна сябе і ў згуртаванні хору і драматычнага гуртка сярод віленскіх беларусаў. Бурбісу мы абавязаны тым, што ён заахвоціў польскага кампазітара Людаміра Рагоўскага, чалавека рамантычнай душы, пакласці на музыку верш Я. Купалы «А хто там ідзе?». Максім Горкі дакладна ацаніў у той час гэту пацверджаную жыццём з'яву як «нечто вроде белорусского гимна». У сваіх яшчэ неапублікаваных успамінах Бурбіс пісаў, што Рагоўскі «...вельмі цікавіўся народнай музыкай наогул і беларускай асабліва. Ён першы гарманізаваў па-мастацку беларускія матывы ў беларускім народным духу... Цікава, што на яго музыку словы беларускіх паэтаў (Янкі Купалы, напрыклад) кладуцца зусім добра і без паправак нават. Мусім адзначыць тут, што за тое, што Л. Рагоўскі пайшоў працаваць на беларускай ніве, польскія нацыяналісты абвясцілі яму байкот...».

Дарэчы, Рагоўскі — аўтар першай Беларускай сюіты для сімфанічнага аркестра (1910) — твора,

супернічаць з якім, як сцвярджаюць музыказнаўцы, усім пазнейшым рэчам такога напрамку вельмі цяжка.

(Беларускае грамадства не забылася пасля пра заслугі Рагоўскага. Калі ён апынуўся ў бядзе, лечачыся ад сухотаў у Еўропе, беларускі савецкі ўрад у дваццатыя гады выдзеліў яму пасільную для маладой рэспублікі грашовую дапамогу).

Рагоўскі сам дырыгаваў хорам на першай беларускай вечарыне, а Бурбіс паставіў п'есу «Па рэвізіі» і дэкламаваў вершы Купалы.

Дапамагаў беларускаму мастацтву таго часу, асабліва ў адваёўцы правоў на публічныя выступленні, і прафесар віленскай музычнай школы Ратасэп, фін па нацыянальнасці. Вось ён, сапраўдны інтэрнацыяналізм разумных людзей!

Сам Алесь Бурбіс быў мала падобны на актора — невысокага росту, бледнатвары, з рыжымі валасамі на рана аблыселай галаве. Нездарма ў падпольных гуртках Вільні яго клічка была «Рыжы». Толькі светлыя разумныя вочы падказвалі, што гэта чалавек высокага духу.

На вечарыне ў Вільні Бурбіс пазнаёміўся з Буйніцкім. А ўжо летам трупа вандравала па Беларусі, і драматычным рэжысёрам яе, а таксама выканаўцам галоўных роляў быў Бурбіс. Акрамя аднаактовай камедыі К. Каганца «Модны шляхцюк», беларуская драматургія на той час нічога не мела. Рэпертуарны голад запаўнялі пераробкі з прозы, пераклады. Тады для большай даступнасці прыходзілася мяняць геаграфічныя назвы. Так, у перакладзе п'есы Крапіўніцкага «Пашыліся ў дурні» Кіеў зменены на Вільню, Чыгірына — на Смаргонь і г. д.

Сам Бурбіс іграў характарныя ролі і, як свед-

чаць сучаснікі, іграў выдатна. Тут была свая заканамернасць.

Паглядзім на інсцэніроўку апавядання Элізы Ажэшкі «У зімовы вечар», якая, дарэчы, з'яўляецца беларускай драматычнай пераапрацоўкай, дзе Бурбіс бліскуча выконваў галоўную ролю Падарожнага. Звычайна радавы чытач неахвотна чытае нават добрыя п'есы. Сапраўды, трэба мець немалы талент суперажывання, каб адзін толькі аўтарскі тэкст, разлічаны на ігру актораў, перадаў глыбіню ўсёй задумы. Відаць, з-за разбіўкі на ролі, з-за розных рэмарак пры чытанні ўзнікае пачуццё пункцірнасці. П'есы найлепш успрымаюцца тады, калі яны становяцца спектаклямі. Але ўсё-такі...

У п'есе Падарожны — разбойнік з вялікай дарогі — уцёк з катаргі і ў родных ваколіцах, дзе не ведаюць, хто ён, наводзіць жах на людзей. Некалі ён быў вясковым хлопцам Янкам, гарачым, непакорным. І трапіў на катаргу, бо пайшоў наперадзе хлопцаў з віламі і косамі на высокае начальства. Уцёкшы, ён пачынае свой бунт адзіночкі.

Злачынствы Падарожнага — вынік сацыяльнага зла. Яго маналогі — адчай, ён просіць людской спагады, ён пратэстуе як чалавек, што не мае ніякіх правоў. У самай драматычнай сцэне Падарожны гаворыць: «Годзе? Добра вам, пане гаспадару, казаці годзе. Але ці таму, каго як ліхога звера па свеце гоняць, каб, дагнаўшы, збіць на горкае яблыка, а пасля ў катаргу загнаць, годзе ці не годзе — гэта ўжо ён сам у сваёй душы ведае, свет, людзей, сябе самога і дзень той, у каторы радзіўся, праклінаючы».

Не толькі як актор, але і як чалавек Бурбіс мог сказаць такія словы і сам пра сябе. Той Бур-

біс, што з вясковай беднатой стварыў у 1905 годзе рэўком у мястэчку Майшаголы пад Вільняй і некалькі тыдняў трымаў уладу ў ім (так званая «Майшагольская рэспубліка»). Той Бурбіс, які хаваўся-туляўся цёмнымі начамі па вёсках, выступаў на мітынгах у Мінску, арганізоўваў на Наваградчыне восенню 1906 года «бульбяныя забастоўкі» батракоў. Там жа паліцыя ўрэшце і злавіла яго з фальшывым пашпартам у мястэчку Шчорсы. Але, паўтараем, турма не «перавыхавала» яго.

Бурбіс не быў навічком у тэатры. Яшчэ да турмы на хутары Пятроўшчына пад Мінскам ён з дапамогай сяброў арганізаваў першае ў той час беларускае тэатралізаванае прадстаўленне, якое закончылася «гутаркай» з паліцыяй.

У Бурбіса быў цвёрды голас, незвычайна моцны пры яго малой фігуры. Але сцэнічнае майстэрства Бурбіс спасціг сваім спосабам — на мітынгах першай рускай рэвалюцыі. Цяпер, на сцэне, вопыт прамоўцы чуцён быў і ў яго ігры, і ў чытанні патрыятычнай лірыкі. Бурбіс чытаў толькі патэтычныя, узнёслыя вершы (найчасцей «Ворагам беларушчыны», «А хто там ідзе?» Я. Купалы, «Нёман» Я. Коласа, «Краю мой родны» М. Багдановіча). І тут жа зноў відзён характар. Такія вершы падыходзяць і да мітынгавых прамоў.

Буйніцкі таксама чытаў са сцэны, але чытаў гумар ці сатыру (Коласа, Паўловіча). І па духу гэта стаіць побач з жартаўлівымі танцамі, якія ён паставіў, з «Юрачкам», «Лявоніхай». І яшчэ з самой дасціпнасцю артыста, яго душэўнай дабратой. Буйніцкі і Бурбіс добра дапаўнялі адзін аднаго.

Інсцэніроўка «У зімовы вечар» была тады адзінай драмай у рэпертуары беларускага тэатра. Яна як бы папярэднічала сцэнічнаму жыццю першай

беларускай драмы арыгінальнай — «Раскіданаму гнязду» Я. Купалы. Ад вадэвільнасці тэатр ішоў да суровага драматызму, які меў больш трывалы грунт у самім тагачасным жыцці. Гэтым пазначана нават рэдкая ў еўрапейскай літаратуры камедыйнасць «Паўлінкі» з яе драматычным фіналам.

Артысткай трупы, частай партнёршай Бурбіса ў галоўных ролях была паэтэса Цётка. «Некалісь мы з Цёткай Пашкевічанкай хадзілі па мінскіх фабрыках і заводах, звалі ўсіх работнікаў да забастовак»,— так пазней скажа Бурбіс, успамінаючы пра 1905—1906 гады. Яны сустрэліся зноў на сцэне тэатра Буйніцкага. Гэта таксама няпроста: Цётка вандравала па Беларусі з фальшывым пашпартам.

Акторскаму майстэрству паэтэса вучылася ў Львоўскай драматычнай студыі, калі была ў замежным выгнанні, у Аўстра-Венгрыі. На першы погляд можа здацца, што ў параўнанні з другімі вядучымі беларускімі паэтамі той пары верш Цёткі найменш артыстычны (адвольныя сінтаксічныя канструкцыі, збоі рытму, скарачэнне зваротных дзеясловаў). Але гэта толькі на першы погляд. Раней за Купалу, Коласа, Багдановіча Цётка дастасавала да новай беларускай паэзіі культуру паэтычнага мыслення. Уся ў стыхіі настрою, высокага рэвалюцыйнага рамантызму, Цётка дапускала непазбежныя пры гэтым адвольнасці, але сам лад яе вершаў высокаартыстычны. Нездарма ж яна з такой гарэзлівасцю вясковай дзяўчыны-весялухі і ўпэўненасцю паэта дэкларавала вершаваным радком: «У артысты пэндзаль свісну». Як ніводзін з тагачасных беларускіх пісьменнікаў, паэтэса імкнулася да спазнання мастацтва, яго законаў і таямніц. Яна ездзіла ў Рым, каб падзівіцца на палотны Тыцыяна і Мікеланджэла, паслухаць

італьянскую оперу. Яна даследавала беларускі народны тэатр — батлейку.

Рэвалюцыйнасць і асветніцтва. Як гарманічна спалучаны яны ў дзейнасці і Бурбіса, і Цёткі! Сама паэтэса піша: «Гуляць адно дзеля забавы, быццам матылёк на сонцы, можа толькі народ з вялікай культурай, бо ён мае арганізаваныя тэатры, аркестры, хоры, музыку. А беларус што меў дагэтуль?»

Такім чынам — не для забавы...

Вось перада мной сядзіць Іван Іванавіч Голер, таленавіты музыка-самавук, які зжыў свой век простым жыццём селяніна. І такі ў Буйніцкага ён быў не адзін. А побач вобразы людзей зусім іншага грамадскага становішча, лёсу — Цёткі, Бурбіса, кіраўніка хору, былога царкоўнага рэгента Хвеаціста, студэнта Зыгмунда Абрамовіча і шмат іншых. Як сумяшчаліся яны на адной сцэне тэатра Буйніцкага, як спрацоўваліся?

Гэта яшчэ не адна загадка. У літаратуры і пра Буйніцкага, і пра беларускі тэатр наогул не хапае адной істотнасці. У Беларускай Савецкай Энцыклапедыі чытаем: «...любоў да мастацтва, добрае веданне звычаяў народу прывялі Буйніцкага да стварэння тэатра, спачатку аматарскага (1907), а пасля прафесійнага (1910)». Гады эвалюцыі ад аматарства да прафесіяналізму названы правільна. Такое выданне, як энцыклапедыя, можа і не расшыфроўваць іх. Але нечым туманным адгаворваецца літаратура спецыяльная. Накшталт таго, што пры паступовым развіцці, пры разгортванні дзейнасці тэатр стаў прафесійным. І козырам бярэцца першая вялікая гастрольная паездка 1910 года. Як быццам толькі з-за таго, што трупа паездзіла, яна стала прафесійнай.

Прафесіяналізм прыходзіць тады, калі занятак становіцца ідэяй таленту. Але кожную ідэю трэба канкрэтна рэалізоўваць. У трупе Буйніцкага гэта выглядала так. На першым выступленні ў Вільні ён блізка сышоўся з віленскай інтэлігенцыяй, якая ўбачыла ў яго тэатры з'яву цікавую і патрэбную не толькі для Полаччыны і Дзісеншчыны, але і для ўсёй Беларусі. Тады і вырашана было дапамагчы тэатру, узмацніць яго трупу.

Дарэчы, сам Буйніцкі не толькі таленавіты самародак. Паводле некаторых звестак, ён займаўся ў Вільні (хутчэй за ўсё ў часе першай гастрольнай паездкі) у «Драматычнай студыі вольнага мастака Казіміро», дзе вывучаў тэорыю і практыку сцэны. Сам да сваіх актораў ён быў вельмі патрабавальны, але пры іх удачы і захапляўся, прыгаворваючы: «Каб яго ваўкі — які спрытны!»

Вясной 1910 года Цётка, Бурбіс, Часлаў і Леапольд Родзевічы, Алесь Ляжневіч і яшчэ некалькі чалавек з віленскай інтэлігенцыі прыязджаюць на пару тыдняў у маёнтак Буйніцкага рыхтавацца разам з яго трупай да гастрольнага падарожжа.

Тэатр Буйніцкага стаў прафесійным, калі ў стыхію сялянскіх талентаў улілася таленавітая інтэлігенцыя. Яна ўзняла самадзейнасць да прафесіяналізму, з ёй тэатр знайшоў свой выразны народны профіль, свой асветніцкі кірунак.

Інтэлігенты... Вось што думаў пра іх «божьей милостью» Мікалай II, а значыць і ўся вялікадзяржаўная чэлядзь. Прачытаем урывак з успамінаў разумнага царадворца графа Віттэ, які адзін час, пакуль яго не выжылі за розум, быў старшынёй савета міністраў Расійскай імперыі: «Государь совершенно справедливо считал, что общественное мнение это есть мнение «интеллигентов», а что касается его мнения об интеллигентах, то

князь Мирский мне говорил, что когда государь ездил по западным губерниям..., то раз за столом кто-то произнес слово «интеллигент», на что государь заметил: «Как мне противно это слово»,— добавив, вероятно саркастически, что следует приказать академии наук вычеркнуть это слово из русского словаря».

...«Да гэтых мужыкоў, што возяць дровы на Тальку і Мар'іну Горку». Такім зваротам пачыналася адна з рэвалюцыйных лістовак, якія раскідвалі, развозілі сваім людзям Бурбіс і Цётка ў 1905 годзе.

Цяпер і Бурбіс, і Цётка самі ідуць да гэтых мужыкоў ужо як артысты. Ідуць з Буйніцкім, з яго дочкамі і зяцем па пыльнай летняй дарозе за падводамі. Артысты — дзяўчаты і хлопцы — дзе пад'едуць, дзе і пройдуцца. На падводах, якія Буйніцкі наняў перавозіцца, няхітры рэквізіт тэатра: музычныя інструменты, калаўрот з прасніцай, вяроўкі, сякеры, кій, міска, бутэлька, рэшата фасолі, вузлы з адзеннем і абуткам. Астатняе пазычыцца на месцы — не царскія ж пакоі будуць паказваць.

Рыпяць падводы, шукаючы будучыні. І ў гэты ж час адрыпвае свае апошнія дні Расійская імперыя.

А пакуль што ў краіне разгул чорнай сотні. Ім ужо мала пагромаў, даносаў — трэба стварыць хаця б уяўнасць народнага апраўдання свайго цемрашальства. У ход ідзе прапаганда. Папы ў цэрквах і пісары ў валасці, як і належыць падкупленай цёмначы, бясплатна падсоўваюць чарнасоценныя газеты і брашуры. Мужыкі бяруць — у краме якая-небудзь Сорка ці Гірш за газеціну дадуць аркуш папяроснай паперы, маючы з гэтага

карысць: газеты вялікія, адной з паўпуда селядцоў можна абгарнуць.

А ў мінскай турме месца беларускіх інтэлігентаў ніколі не астывае: у 1905—1906 сядзеў паэт і мастак Каганец, у 1906—1909 — Бурбіс, у 1908—1911 — Якуб Колас («Кін-сцін-цін!» — пакрыкваў на яго турэмны наглядчык Пікулік), пасля зноў сеў Каганец.

Ды перад сапраўдным мастацтвам адступае ўсё. Падводы рыпяць... І найцяжэй выступаць тут, дома, у Беларусі.

Бяздомны прарок у сваёй айчыне...

Першы раз у Пецярбурзе, у 1911 годзе, у зале «Пальма» студэнты віталі Буйніцкага вянком, падарылі залаты гадзіннік. Другі раз запрасіў часопіс «Вестник знания»: ён арганізаваў этнаграфічны вечар народаў Расіі. У знак прыязнасці часопіс потым змясціў фатаграфію Буйніцкага з дачкой. А яшчэ будзе зіма 1913 года ў Варшаве і зала «Швейцарская даліна», упрыгожаная на манер беларускага краявіду — хаткі, студні, снапы. І Соф'я Мікалаеўна — жонка рэктара Варшаўскага універсітэта Яўхіма Карскага — будзе гаспадыняй вечара, падкажа, дзе лепей развесіць на сцэне ручнікі, пасцілкі, аздобіць залу.

Так было ці будзе... Рыпяць падводы... Тут не Пецярбург, не Варшава, нават і не Мінск. Правінцыя заўсёды больш старанная, чым цэнтры. А нешта незвычайнае, новае выглядае для мясцовай улады вялікай крамолай. У Капылі, Слуцку, Ляхавічах доўга правяралі пашпарты, цэнзурныя дазволы на пастаноўкі, забаранялі чытаць некаторыя вершы.

Незадаволена была і слуцкая, нясвіжская шляхта, асабліва пастаноўкай «Моднага шляхцюка» — яна пазнавала сябе ў галоўным героі —

нікчэмным, фанабэрыстым Пранцішку Карчэўшчыку. У часе спектакля яна спрабавала свістаць, тупацець нагамі, быў і націск і на губернскія ўлады, каб прыпыніць гастролі трупы.

Але падводы рыпяць нездарма. Што там тыя згрызоты з начальствам, цёмнымі шляхцюкамі, калі просты люд і за дзесяткі вёрст дабіраецца да мястэчкаў, каб паглядзець на свой тэатр. Дзеля гэтага варта вандраваць па пыльных дарогах, ісці за падводамі, як ідуць цяпер Цётка і Бурбіс. Зрэшты, мала хто нават у трупе ведае, хто яны і што яны. Артысты. Цётка хаваецца пад псеўданімам Крапівіха, Бурбіс выступае пад прозвішчам Алексенка. Змусіла да гэтага не так мода на тэатральныя псеўданімы, пашыраная ў той час, а правілы звычайнай канспірацыі — на абодвух мае нядобрае вока паліцыя. Вось адна дэталь: калі ў праграмах трупы імёны і прозвішчы ўсіх актораў называюцца поўнасцю, то імя Бурбіса схавана за крыптанімамі — пісалася, напрыклад, што «верш скажа п. А. Б.».

Многага не мог ведаць цымбаліст Іван Іванавіч, які шэсцьдзесят чатыры гады назад ішоў за імі па пыльнай дарозе, а цяпер сядзіць перада мной і спявае:

Пайду ў поле жыта жаць,
А дзе буду начаваць?
Хоць у полі пад вярбою,
Хоць і, міленькі, з табою.

«Ну, хопіць,— падумаў я.— Столькі дакучаць старому чалавеку і адразу столькі ўведаць — гэта надта шмат, трэба і перадых мець». І не маючы розуму выдумаць большага глупства, я памкнуўся запрасіць Івана Іванавіча на чарку віна. Многія памылкова думаюць, што віно збліжае людзей.

— Не, дзеткі,— замахаў ён рукамі.— Я не прывык да гэтага, хоць у твае гады пада мной лёд кіпеў. Як жа бы я іграў тады?..

Іграў? Калі іграў? Калі тое было? Гадоў шэсцьдзесят назад.

«...Я ж як вып'ю, то палачкі ўпушчу, і цымбалы не зайграюць».

Гэта быў сон пра цымбалы, пра тыя, далёкія... Сон, які сніўся, можа, усё жыццё і ў нечым кіраваў ім. Пра цымбалы, што ігралі ў аркестры Буйніцкага і былі прададзены ў першую сусветную вайну, калі трупа замоўкла назаўсёды.

Сон пра цымбалы... Ён сніўся чалавеку, які развітаўся з імі і жыў цяжкім заходнебеларускім сялянскім жыццём.

Цымбаліст кахаў дачку Буйніцкага, але ажаніўся з другім, пазнейшым каханнем — сялянскай дзяўчынай. І года не прайшло, як у вайну ён разраджаў міну, што знайшоў на падвор'і. Маладая жанчына, нахіліўшыся, глядзела, і міна была апошняе, што яна бачыла на свеце.

Так з ёю, сляпой, і зжыў свой век Іван Іванавіч. Яна нядаўна памерла. Жылі добра, дзяцей узгадавалі.

Цяпер цымбаліст сядзіць на лаве — і яму як быццам бы ўсё роўна, ён як бы і не хоча ўспамінаць, што перажыў за сваё жыццё. А можа, мне толькі здаецца, бо ён з такім сэрцам спявае наіўную і мілую прыпеўку:

Ой, на сіненькім з'ярку
Вутачка закракала,
А мая міленькая
Пачула і заплакала.

І раптам падумалася: ён пяе пра сваю жонку, якая не бачыла праз усё сваё замужжа ні бяроз каля хаты, ні падвор'я, ні сваіх дзяцей.

А ён расказвае:

— Касцялы́ былі, цэрквы, то на першага акцябра, на ўсіх святых, жабракі, калекія вянком ля іх з торбамі сядзелі. І ўсё прасілі: «Ратуй, божа, ад наглай і неспадзяванай смерці». Упрасілі-такі бога, дзякуй Савецкай уласці, хоць дом старасці ёсць — і кашу даюць, і мяса, і капусту.

А яшчэ ён гаворыць, як амаль сілком жанілі яго сына:

— Заходжу я да Садоўшчыка на панадворак, мы з ім у суседстве жылі, і пытаюся: «Садоўшчык, а дзе мой Франук?» А ён і кажа, бацька такі: «Яны з Гэлькай у пуні». Іду ў пуню, а яны там на сене ўжо на гарачым учынку: ах... ах... Зайца ловяць...

Не, ён па-ранейшаму таленавіты!

Пачынала брацца за полудзень. Распытаўшыся дарогу да магілы Буйніцкага, рашыў ісці туды адзін. Іван Іванавіч развітваўся са мной проста і даверліва. З жалем пацiскаў я яго руку: наўрад ці мы ўбачымся болей.

Іду Празарокамі, а ў галаве стаіць маё амаль неверагоднае спатканне. А тут яшчэ і пошум асенніх дрэў, злы вецер... І ўсё гэта як бы дыктуе мне: «Горка яно, Іван Іванавіч, бачыць усю нешчадзь з Вашымі коўдрамі, Вашу старасць. І адно тэатр Буйніцкага застаўся для Вас светлым успамінам, калі Вам так пашанцавала і таксама, магчыма, адзін раз у жыцці».

А пасля... А пасля пайшло сваім шпаркім ходам і другое, і трэцяе пакаленне актораў — у новым часе. Мы ж ведаем дрыготкі халадок хвалявання, які заўсёды працінаў нас пры спатканнях з купалаўскім тэатрам. Тую залу запомніць не адно пакаленне людзей. О, гэта магічная сіла сцэны, калі павольна гасне святло і ты ўжо не толькі ты, а

яшчэ і раб мастацтва. Мы ж помнім, як зала была пад гіпнозам ігры Глебава, Платонава, Дзядзюшкі... ды ўсіх ці ж пералічыш. Помнім, як публіка проста адходзіла ад сябе, ловячы драўляныя лыжкі. Яны ляцелі са сцэны: гэта захоплены Глебаў у ролі Сцяпана Крыніцкага без аніякай манернасці стукаў па стале, і лыжкі далятаЛі аж да пярэдніх радоў.

Кожнае мастацтва мае свае залатыя легенды. Такая, напрыклад, ёсць у рускай літаратуры пра пярсцёнак Пушкіна, які быццам бы ён перад смерцю аддаў свайму сябру Далю. Пярсцёнак-талісман, як эстафета, мусіў перадавацца з пакалення ў пакаленне вялікім рускім пісьменнікам. Легенда застаецца легендай, даследчыкі даказалі яе супярэчлівасць. Але легенды і слаўныя залатым пылам рамантыкі.

Да каго прыкаціўся ты, пушкінскі пярсцёнак? Зусім магчыма, што апошнім часам ты быў у Аляксандра Твардоўскага.

Ёсць харошая легенда і ў беларускім мастацтве. Вось чытаем у старым часопісе:

«Ацэнкай значэння Ігната Буйніцкага ў беларускім тэатры можа служыць наступны факт: на працягу многіх гадоў світка Буйніцкага, у якой ён выступаў, пасля яго смерці перадавалася актору, які лепш за ўсіх выконваў тыя ролі, якія раней выконваў Буйніцкі».

Дзе ты, світка Буйніцкага? Магчыма, ты павінна быць у нашых славутых купалаўцаў, і час разбярэцца, хто мае гонар на тую сімвалічную світку ў пакаленнях актораў. Чэсць і хвала вам, учарашнія, сённяшнія і наступныя!

А цяпер я іду да магілы Буйніцкага. Злуецца восеньскі вецер. Пачынае цямнець.

Я не ведаю яшчэ, што вясной буду дарэмна шу-

каць у Мінску Старажоўскія могілкі. На іх у 1922 годзе быў пахаваны трыццацісямігадовы Алесь Бурбіс.

Бурбіса з'елі сухоты. Наогул, беларуская інтэлігенцыя на парозе новага жыцця, якога яна так чакала і для якога аддала столькі сіл, пасыпалася ад сухотаў, як лістота з асенніх дрэў. У 1917 памёр М. Багдановіч, у 1918 — К. Каганец, у 1919 — І. Луцкевіч, у 1921 — С. Булат, у 1922 — Ядвігін Ш., А. Бурбіс.

Трызнячы перад смерцю ў сваім апошнім прыстанішчы — голым нумары былой гасцініцы «Парыж» — Бурбіс прашаптаў: «вясковыя настаўнікі», а пачакаўшы, дадаў: «Чырвоная Армія». Мяцежны розум не хацеў давацца смерці і працаваў да спошняга ўдару сэрца. Што за сэнс быў у гэтых, здавалася б, не звязаных паміж сабою словах? Можа, Бурбіс сіліўся сказаць, што Чырвоная Армія і асвета — тая аснова, на якой павінна адгрунтавацца сацыялістычнае жыццё. Яму быў аддданы Бурбіс.

Сакавіцкім днём, на згоне зімы, жалобная працэсія пад гукі пахавальнага маршу пяці вайсковых аркестраў накіравалася на Старажоўскія могілкі.

А ў гэты час для чарговага нумара часопіса «Народное хозяйство Белоруссии» друкары набіралі (як паведамляла пасля рэдакцыя) капітальную працу Алеся Бурбіса «Краткий очерк по экономической географии Белоруссии». Праца здзіўляе шырынёй ведаў гістарычнага, палітычнага, эканамічнага характару, эрудыцыяй аўтара. У ёй даецца цвярозая ацэнка становішча Беларусі, разбуранай войнамі і акупантамі. Нарыс Бурбіса пачынаў сапраўднае навуковае вывучэнне эканомікі краю дзеля яго далейшага росквіту.

Асаблівы націск робіцца на каланіяльны характар гаспадарання царызму. Гэтая праца далёкая ад халоднага ілюстратарства — у ёй адчуваецца гарачы, імпульсіўны характар чалавека, які ад імя свайго народа прад'яўляе рахунак старому часу.

Нездарма ўсё-такі Бурбіс абхадзіў і аб'ездзіў да рэвалюцыі ўсю Беларусь.

У архіве Мінска знайшлася вельмі яскравая тэлеграма спачування беларускага пасольства ў Маскве Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту БССР, членам якога быў Бурбіс. Пра яго ў тэлеграме гаворыцца як пра «лепшага сына бацькаўшчыны..., які сышоў з арэны барацьбы іменна ў гэты час — час будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці...». Далей ідуць вельмі выразныя словы, якія асвятляюць характар эпохі: «Адначасова — вось дэвіз пасольства — чым менш нас засталося, тым большыя абавязкі кожнага, а справа не павінна стаць ні на хвіліну».

Старажоўскіх могілак я не знайшоў. Іх няма, там шуміць парк.

Але цяпер, у Празароках, уражаны сваім знаёмствам, я проста іду асеннім ветрам доўгай вуліцай.

Старыя забытыя могілкі за чыгункай. Надмагільны курганок Буйніцкага паглынула зямля. Толькі адна чэзлая асіна шуміць над магілай...

У кастрычніку 1975 года ў Празароках была адкрыта прыгожая сваёй строгасцю стэла Буйніцкаму.

Стаю на невялічкім пагорку могілак і бачу, як на ўсходзе займаецца вогнішча Наваполацкай домны. Водбліск вогнішча далёкі, хаця і агніста-

зыркі ў цёмным вераснёўскім вечары. Гледзячы на яго, самі сабой аднекуль здалёку наплываюць у памяць словы Блока: «Чтобы по бледным заревам искусства узнали жизни гибельный пожар».

Тут жа недзе гучаць і словы Буйніцкага, якія пераказаў мне цымбаліст Іван Іванавіч: «Я ад танцаў і памру».

Буйніцкі памёр, вядома, заўчасна — яму было пяцьдзесят шэсць гадоў, памёр ад разрыву сэрца, ад «наглай (г. зн. раптоўнай) смерці», як пісаў у пасмяротным артыкуле пра яго Мікола Шыла — былы актор трупы.

Як мала часамі мы ведаем пра людзей, якім абавязаны многім. А маглі б... Але ў лаканічным адказе, які я атрымаў з ваенна-гістарычнага архіва СССР пішацца: «...У матэрыялах архіва звестак пра І. Ц. Буйніцкага не выяўлена. Дакументаў інтэнданцкай роты X арміі ў архіве на захаванні няма». Што ж, у тую далёкую ўжо вайну дакументы маглі і загінуць, але вядома, што ў часе першай імперыялістычнай Буйніцкі быў на вайсковай службе, яго інтэнданцкая рота мела сталую базу ў Маладзечне і развозіла правіянт па наваколлі. Буйніцкі арганізоўваў і сярод салдатаў самадзейнасць, стараўся стварыць нешта падобнае на сваю былую трупу.

Пры раз'ездах ён заразіўся тыфам, што прыкаціўся да салдатаў царскай арміі, якая ўжо дэградавала, і памёр у гарачцы ў шпіталі каля мястэчка Гарадок, што між Маладзечнам і Валожынам, вераснёўскім днём 1917 года і быў пахаваны на салдацкіх могілках ля вёскі Палачаны. Потым дачка Алена перавезла яго прах у родныя Палівачы.

Апошняй вялікай справай Буйніцкага быў удзел у стварэнні ў 1917 годзе Першага тавары-

ства беларускай драмы і камедыі. На аснове яго ў 1920 годзе ўзнік Беларускі дзяржаўны тэатр — сённяшні купалаўскі. У вайсковай форме Буйніцкі спецыяльна прыязджаў тады ў Мінск. Тады ж сябры і бачылі яго апошні раз.

Першым спектаклем купалаўскага тэатра была якраз тая п'еса, з якой Буйніцкі некалі аб'ездзіў шмат вёсак, мястэчак, гарадоў — інсцэніроўка «У зімовы вечар». Толькі называлася яна інакш — «Рысь». Ды і актораў было шмат новых, але былі і паплечнікі І. Буйніцкага — Ф. Ждановіч, У. Фальскі. Не было яго самога.

Але які вялікі і цудоўны шлях — вывесці сваё мастацтва ў шырокі свет, стварыць цэлую эпоху яго гісторыі. Стварыўшы гэтую гісторыю, Буйніцкі адышоў, перадаўшы мастацтва, як эстафету, новым пакаленням.

Што з таго, што мы не ведаем пра акалічнасці яго смерці? Як распадаюцца зоры, паміраюць салаўі, таксама вядома толькі прыблізна. Галоўнае — што застаецца — святло, мелодыя. Так і ў мастацтве. Застаецца прыгажосць, якая вядзе нас да чалавечнасці.

1974—1975

## ЯСЕНЬ

Глыбокі начны сон расхмарваўся, і ў лёгкі ранішні аднекуль здалёк наплывала не то музыка, не то спеўны гул. Гэта было падсвядомае, чуйнае да ўрачыстасці свята душы. У тыя хвіліны Сяргей быццам плыў у сваім любімым — ліловым — колеры. Свята паўтаралася ўжо не першы год і абавязкова напрадвесні. Нават прачнуўшыся зусім, Сяргею кружылі галаву тыя лёгкія і светлыя зводы. Музыка сплывала павольна, і калі прыходзіла рэальная ўсвядомленасць, настрой доўгі час быў самы лепшы.

Але сярод мітусні сталічнага дня неаднойчы шчымела шкадаванне: Сяргей ніколі не мог і прыблізна ўспомніць амаль казачных карцін, якія змянялі адна другую пры мажорным суладдзі гукаў. Помніў толькі, што яны мільгалі, і адчуваў — гэта было станам душы іншага часу, чым той, у якім ён жыў у свае трыццаць год.

Ніякіх цудаў, вядома, не адбывалася. Згон зімы кладзе і на сны таго, каму яна здоўжылася як хвароба, свой асабліва выразны адбітак. Імя яму — чаканне. Сяргей мог дзякаваць, толькі невядома каму, што напрадвесні ўвесь час снілася нешта светлае і добрае. Але ўсё-такі як быццам нечага бракавала — успомніць нічога не мог, і сноў было шкада, як цывілізацый, якія загінулі.

Неспадзявана адгадаць здагадкі дапамог коцік Мур-Мур. З-за яго дзікаватага нораву Мур-Мура

правільней было б называць не коцікам, а сынам сатаны. Але яго любіла маленькая пястушка Верачка.

Адзін паважаны стары чалавек настойліва параіў Сяргею, неяк разгаварыўшыся, узяць дачцэ на забаву кацяня. Ён сказаў, што любоў і прыхільнасць дзяцей да жывога вельмі ўплывае на развіццё іх гуманных схільнасцей. Што ж, старому яно відней, і Сяргей узяў у яго маленькае, на далоню, кацянятка. Падрастаючы, шэранькі Мур-Мур прывыкаў да жыцця: выкотваўся штораніцы са свайго гнязда — аполка старой кажушыны — і жаласна мяўкаў ля ложка Верачкі — будзіў малую. Наогул, спачатку ён быў баязлівы, ласкавы коцік. А пасля ў кватэры пачалося развіццё гуманізму. Сяброўства Мур-Мура з Верачкай стала падобным на вісклівы вэрхал — гульню хто каго абхітруе. «...І не дагнаў»,— свецячыся радасцю, крычыць малая, кулем вылятаючы са спальні, а Мур наровіць драпянуць за ружовую пятку. Або яна бяжыць з плачам: «Мур мяне за сэрца ўкусіў...— і паказвае на плячо.— Кусацель такі...» Коцік гушкаўся на гардзінах ды так весела зіркаў зверху, быццам сам сабе спяваў: «Ля-ля-ля, ля-ля-ля, не дастанеш, ля-ля-ля». А потым ён вастрыў кіпцікі аб сцены, абдзіраючы шпалеры, і пакоі зрабіліся нейкімі кудлатымі. Мала таго, у яго абудзіўся свой інтарэс да пісьменства. Мур прывык скакаць на стол, калі Сяргей пісаў, і, гледзячы на бег аўтаручкі, збіваў яго лапкай. Ці ён хацеў, каб Сяргей пагуляў з ім, а мо загадваў кінуць: і так шмат напісана, а то мае бедныя мышкі яшчэ аб'ядуцца дачасна.

...Сяргей лічы прачнуўся ад далёкага голасу, але яшчэ нібы плыў у сне, і гучала суладдзе светлай вясновай музыкі. Голас зноў азваўся, толькі

больш сварліва. Як у салодкім тумане, Сяргей расплюшчыў вочы, убачыў коціка, які шалеў на сонечным угрэве, і павекі зноў зліпліся. Напаўсонная свядомасць была лянівай: Кацінарбус разгуляўся... трэба ўставаць... няведама чаго валачыся ў школу... так рэдка бываюць нядзелі... Па праву старэйшага, ён, як і звычайна, добра таўхануў нагой Лёньку. За яго спіной на палацях Лёнька бессаромна не чуў, што маці будзіць, і сніў свае сны, стаіўшыся нічком на марыве падушкі.

«Сяргей, ты што?» — ускрыкнула спужаная, са сну жонка.

Сяргей і сам ажно падскочыў. Рэальнасць вярнула да сябе. Іхняя спальня, іх Верачка, праз шчыліну гардзін б'е сонца, і Мур скача на яркай паласе. На суседнім балконе галёкае суседка, якая пакутуе бяссонніцай — перадае ранішнія навіны сяброўцы па няшчасцю з другога дома. Вось чый голас здаўся ў сне знаёмым, але голасам іншага часу. А Мур-Мур так падобен на коціка Кацінарбуса, які быў тады ў іхняй хаце ў Дольнай Руце. Сяргей, аказваецца, пабываў у прадвесняй раніцы, якая гадоў дваццаць таму была звычайнай, а цяпер здавалася святам. Тады...

Кацінарбус імгненна жмурыцца — нешта ажыло на палацях — гэта браты таўхаюць адзін другога пад бакі. Хвіліна — і Кацінарбус пружыніста скочыць на іх. У Кацінарбуса важнае імя, хоць сам ён несур'ёзны і дураслівы — гадзінамі ганяе па падлозе клубок нітак. Ён называецца так у гонар суседа Петруся. Пятрусь — добры майстра і любіць прыфарсіць сваёй прафесійнай нядоляй, асабліва калі настае час браць грошы. Тады ён звычайна гаворыць складана: «Каваль робіць людзямі, а столяр грудзямі». Сёння Сяргей наогул

не верыць у так званыя народныя мудрасці, бо іх столькі, колькі людзей на свеце, а тады ён з паважай глядзеў на худыя грудзі Петруся. Гэты Пятрусь з-за выключнай важнасці свайго занятку часта набіраўся самагонкі і ці то ляжаў у палях альбо лугах, укрыты якім бацвіннем ці вербалозам, ці балэндаўся па вёсцы. Увальваючыся дамоў, ён заводзіў адно: «Еду, еду на камбайне...» — і нікуды даехаць не мог, далей не помніў.

— П'еш, каб тваю кроў вужакі пілі,— нялятала жонка.

— Маўчы, дзіназаўра. Я капцэнармусам[1] быў, знаеш гэта. Я чалавек заслужоны,— казырыўся Пятрусь.

— Знаю, а як жа, добра знаю. Я такому кацінарбусу зараз як ляпну, то і нагамі накрыешся.

— Я цэлае войска карміў, і яно крэпасці без бою брала. А цябе, дурніцы, адной укарміць не магу, каб добра гаварыла.

— Ай, які разумны кацінарбус, бельмы заліўшы.

Так яно і пайшло — Кацінарбус і Кацінарбус, і як знайшлося Сяргею і Лёньку на імя кацяняці.

«Хадзі, каток, хадзі, сырадойчыку табе дам,— кліча маці хітрага Кацінарбуса, якога і клікаць не трэба — пачуўшы звон у бляшанцы, ён даўно ўжо шэрай бліскавіцай сігануў з палацяў і трэцца ля мацерыных ног.— Хай тыя лабідуды качаюцца, хай ім стыдна будзе, што другія дзеці з цёмнага ў школу шнуруюць, вучыцца хочуць».

«Так яны там і шнуруюць,— абыякава адзначае сам сабе Сяргей.— Можа, які падлізняк і цалуе з цямна ў замок».

---

[1] Кантэнармус — унтэр-афіцэр, які загадваў харчовым складам.

«Хоць ты калом іх падымай»,— жаліцца маці бацьку.

Бацька ля дзвярэй як прывід у фантастычных клубах марознай пары, якую нанёс з сабой — дзверы адчыняюцца проста на двор — сяней яшчэ недарабілі. Восенню ляцелі з зямлянкі як жывыя з-пад зямлі, радыя новай хаце. Бацька ўжо не надта і бядуе — большы страх мінуўся, чыстую палавіну ён-то выцацкае гуляючы. Бацька добры, калі пільнага клопату не мае, гэта пад гарачую руку не лезь, бо адпэндзіць, што дзесятаму закажаш.

А так ён і песню можа запець, хоць мужыкі і рэдка ў цвярозасці пяюць, і выціліньквае на языку часам. Маці хоць калі смяецца — дзецюком ён такое вычаўпляў, што старыя людзі хрысціліся. Цяпер бацька паблажліва глядзіць у кут і кліча:

Устаньце, хлопцы, устаньце, браткі,
Устань, ты, наша старана,—
Ужо глядзіць к нам на палаткі
Жыцця новага вясна.

Толькі таму, што пра іх было сказана вершам, і запомніліся тыя палаці ля печы — сяннік, а пад ім пяць дошак — плыт, які гойдаўся на двух морах хлапчуковых сноў.

Сёння Сяргей перакананы, што не менш, чым школа, вучыла дарога ў школу і назад. Іх вёска Дольная Рута выходзіла тады з зямлянак. Цюкат сякер, звон піл, смольны дух ачасаных бярвенняў кружылі галаву. Сяргеева раніца жыцця супала з новай раніцай жыцця старой вёскі, якая стаяла на бойкай дарозе і таму не раз была спалена, і таму ж была практычна бессмяротнай. І гэта раніца была асабліва светлая вясной.

Крылы херувімчыкаў, якія заўсёды стараецца прычапіць дзецям вечна абстрактная і бесталковая педагогіка, як ніколі лёгка абпальваліся тады, пасля вайны, варта толькі было выйсці са школы.

А між іншым самыя ўдалыя караблікі выходзілі з тых старонак сшыткаў, дзе былі выведзены двойкі. Відаць, іх злаславая чырвань надавала караблікам быструю пульсацыю руху. І куды надзейней сплавіць двойкі па ручайках, чым запіхваць сшыткі ў шчыліны зыбкай, да часу, падлогі.

Два дадаць адзін будзе тры? Хаця б. Бывае, што два і адзін ніяк не складаюцца, яны кожнае само па сабе. Двое пастушкоў знайшлі адну міну. Колькі іх усіх разам? Нічога няма. Быў адзін выбух, які страсянуў ваколле і, згасаючы, асеў у балотах. І дзве труны. Сяргей помніць тых сваіх равеснікаў, прыбраных як на свята ў белыя вышываныя сарочкі. А каровы разумныя — у першую ноч раўлі ў хлявах ды так жалосна, быццам людзі душыліся енкам.

Эпоха казак мінулася. Пачаліся сапраўдныя кнігі. Поўнач. За вокнамі лістападаўская золь і слата. Вецер ганяе брамку, і яе рып падобен на карканне вароны. Добра, што хоць акно завешана. На лаве гарыць лямпа, ужо і шкло пачарнела, а чытаць далей і страшна, і хочацца. «Трэцяе пакаленне» Чорнага. Нават па баках азірнуцца боязна — побач цікуе Сцепуржынскі. Страшны тып. Яго Сяргей будзе баяцца ўсё дзяцінства. Так і глядзі, што Сцепуржынскі недзе высунецца з-за цёмнага вугла. Увесь страх ішоў, аказваецца, ад су-

седства «р» і «ж» у прозвішчы. Гэта «рж», як іржавы нож, рэзала слых і калаціла душу.

А Кастусь, напрыклад,— гэта нешта такое, як кіслая капуста; тоўстага ўчастковага, паважанага ўсімі самагоншчыкамі, завуць Макаравіч, бо, відаць, шмат макаронаў есць. А літара «ё» гэта салёнае «е». І яшчэ вельмі падабалася сталіца Лісабон. Не ў нейкіх бог ведае якіх лясах і ў якіх норах, а ў сталіцы жывуць і гаспадараць рыжавогненныя лісы.

Эпоха казак мінулася, але адна казка засталася. Пра цара Салтана. Асабліва хвалявала, як у мора кінулі яго жонку з малым. «Туча по небу идёт, бочка по морю плывёт». Гэта не так сабе — шчыра верыць, што будучы князь Гвідон сапраўды рос у бочцы.

«Ну, у бочку! — падганяе маці, і так бывае даволі часта.— Хто чысты, той расце як на дражджах». Лёнька румзае: «Хай Сяргей першы — ён большы».

У доме часта шмат цёплай вады — гналі самагонку. Трэба будавацца, а хто без чаркі палуднаваць сядзе? А тут яшчэ да сваіх работнікаў то брыгадзір, то ўчотчык які прыпруцца — іх нос чуе. У варыўні пагас ужо агонь пад катлом з брагай, мігціць газоўка. Маці апускае Сяргея ў бочку з цёплай вадой, накрывае яе дзяружкай — і ён ужо ў другім свеце. Першае адчуванне — страх, бо кругом цемень і цяснота. І галоўнае — не пабяжыш нікуды. Пачуццё безвыходнасці. І закрычаў бы, але ведаеш, што побач маці і дзяружку так лёгка прыўзняць. Патрохі Сяргей смялее.

Сёння зразумела, што тыя, хто співаецца, страляецца, вешаецца, вар'яцее, як бы загнаны жыццём у бочку, а дакладней, у замкнутае кола, дзе цёмна і цесна. І галоўнае — не пабяжыш нікуды.

А зверху — не дзяружка, а глухое донца. І маці побач няма.

Ах, як цёпла! Аж галава круціцца. Відаць, малы Гвідон, дужаючы, меў прыблізна такое адчуванне наплыву сілы. Плёхкаючыся ў вадзе, лёгка выдумляць, што ты ў моры і вецер гайдае бочку на хвалях. «А растёт ребёнок там не по дням, а по часам».

Як лёгка запамінаць — «Амудар'я», «Сырдар'я», «Зэя і бурэя», «Уж, замуж, невтерпёж». Так і хочацца складна працягваць сваім, дольнарутаўскім: «А ў полі, на папары, ўсе таўкліся ды па пары — і старыя, і малыя, і падростачкі...»

У школе пасля кожных каляд і вялікадняў піянерскія сходы. Барацьба з рэлігіяй. Пачынае завуч. «Усе знаюць, што бога не было, няма і не будзе. Але сярод нас ёсць адсталыя элементы, у якіх жывуць перажыткі капіталістычнай свядомасці. Так, многія з вас хадзілі са звяздой па вёсках, хадзілі спавядацца ў царкву і на ўсяночнай былі. Гэта ганьбіць вас як піянераў і школьнікаў».

«Набожныя» каюцца, што болей не будуць. Вялікай бяды няма — бацькі выправілі. Сяргей таксама па чарзе сунецца да дошкі, і яму сорамна не так за свае перажыткі капіталістычнай свядомасці, як за падраныя боты. Самы смех, што каецца і Славік Анціпаў — яму б грамату за падрыў матэрыяльнай базы царквы. Дома далі тры рублі на споведзь, то ён паклаў на талерку царскую пяцірублёўку і яшчэ два рублі рэшты савецкімі ўзяў. Пяць рублёў як лёду прыбытку, і ўсе грахі адпушчаны. Два дні Славік душыўся цукеркамі і пячэннем.

А як было прапусціць такі феерверк, як усяночная? Выходзіў крэсны ход, і са званіцы над морам народу лупілі з самапалаў, пускалі сама-

робныя ракеты, запальвалі смаляныя факелы. Весела. Поп вечна баяўся, каб царквы не спалілі, і яго званнік, разгойдваючы вяроўкай язык звана, трывожна лавіў косымі, нервовымі позіркамі палёт іскраў.

А калядным вечарам — звязда. Шнуравалі па іскрыстым снезе ад хаты да хаты, увязаўшыся за тымі, хто пад дзецюкоў ужо браліся. Рознакалёрная звязда круціцца, і толькі рэхам адлятае ад намёрзлых вуглоў і платоў песня. Пелі пятае праз дзесятае. «Волхвы с востока, волхвы с востока пришли со звездою, дорогие дары, дорогие дары принесли с собою». Смаркатыя «волхвы» ніякіх дароў, вядома, не прынеслі, гэта ім выносілі з хатаў усяго смачнага.

Бясплатна ніхто не пяе? Хіба што птушкі ці маці калыханку? Няпраўда. Спяваюць жнеі, ідучы з поля, спявае бяседа за сталом, пяе і вясновы гай, асабліва ў маі трапяткой лістотай.

Першае пачуццё жалю і віны. Памерла, наеўшыся зялёных парэчак, васьмігадовая равесніца Ірка. Сяргей за дзень ад бяды адабраў у яе мячык. Гэта быў яе мячык. Адбіраючы, ён штырхануў Ірку, і яна паляцела на траву. Цяпер няма каму аддаць мячыка, ён ляжыць, і нават падняць яго сорамна.

Летам праходзілі цыганы. Куды, адкуль — невядома. Ды і самі яны ці ведалі, куды ідуць. Свет вялікі — Дольнай Рутай ён не канчаецца. Добра так жыць, калі гоніць вера, што недзе будзе лепей, чым тут. Чорныя худыя цыганяты кішмя кішэлі ў павозках-буданах, з іх яны выпырхвалі, як галкі, і несліся паперадзе свайго абоза, а найбольш цікавалі ля платоў, каб ухапіць які яблык.

Яркія лахманы цыганак не здаваліся рыззём — так ужо тонна былі дапасаваны адзін да аднаго калёры. «Цыганам аддам, хай забяруць цябе»,— страшыла раней маці, а яны былі не такія і страшныя, толькі незвычайныя сваёй смуглявасцю і сварлівымі размовамі, падобнымі на гагатанне гусей. Вялікай варажбы ў Дольнай Руце яны не развялі — у вайну, можа б, і пажывіліся, а тут пабудаваўшыся ці будуючыся, людзі не хацелі бунтаваць свае душы рознымі здагадкамі. Але хлеба і малака жанчыны прыносілі вечарам за вёску, на луг, дзе цыганы запалілі агні.

Яны шумна вячэралі, а пасля спявалі ля агнёў. Спачатку нешта вельмі вясёлае, а чым бліжэй пад поўнач, усё больш працяжнае і задуменнае. Вось ужо сапраўды, што самае тонкае і чысцейшае з усіх відаў мастацтва — музыка, песня — чым больш незразумелыя, тым мацнейшыя. Што за гарачы і безвыходны сум пераліваўся ў напеўных словах, якія раставалі ў лёгкім халодным, з балота, тумане? «Ако дэотэ мамо кхал, пашо маро цыно кхер...» Туга па сухіх і раздольных стэпах? Жальба вандроўніцкага лёсу? Помнячы песню да сённяшняга дня, Сяргей не хоча ведаць яе перакладу — словы незразумелыя, як заклён, засталіся падобнымі на неперакладальныя на мову людзей шум сосен, гул вячэрніх палёў, звон рубінавых бярозавых вугольчыкаў у печцы. «Ако дэотэ мамо кхал, пашо маро цыно кхер...»

Бесканечнасць... Увесь гэты вітраж свеціцца з далечыні, і чым далей, тым зырчэй.

Дзе сшыткі ў косыя лінейкі, што падобны на блакітныя ніткі спорнага майскага дожджыка? Дзе новыя вельветавыя футболкі на бліскучых за-

мочках — форс на ўсю школу? Дзе пярэстыя, чорныя, бурыя цяляткі на тонкіх дрыгатлівых ножках, якіх трэба паіць, запусціўшы руку ў цёплае пойла з ільнянога семя, а яны казытліва смокчуць пальцы шорсткім язычком?..

Дзе? Як быццам і сам не ведаеш. Бег часу. Адчуванне яго рознае. Сяргею смешна каму прызнацца, але гэта было так, і тут нічога не папішаш — у гадоў дзесяць — дванаццаць яму здавалася, што ён ужо жыў да гэтага на свеце, бачыў гэтыя дрэвы, аблокі, дарогі і іншае. Сёння так не здаецца. Што ж адбываецца? Відаць, нічога незвычайнага — у рэшце рэшт спадчынная сіла крыві і памяці тут ні пры чым. Хутчэй за ўсё гэты час у свядомасці адбывалася канчатковае замацаванне сутнасці ўсяго зямнога. Ранейшыя зыбкія ўражанні афармляліся ў адчуванне існасці свету.

Памяць, зрок не мацнейшыя за бінокль, скажам, з цэйсаўскімі шкельцамі, але ў іх адна асаблівасць — бінокль памяці набліжае мінулае агулам, зліваючы паасобныя кадры ў стройнае цэлае, якое падобна на вітраж. Гэта ўжо мастацтва. Зменлівасць, рознакалёрнасць.

У Сяргея магія ліловага колеру пайшла ад першага ўспаміну пра сябе. Колькі яму год? Тры? Чатыры? Маці нясе Сяргея на спіне, ён чагосьці румзае, а маці суцяшае. Вечар, асабліва на захадзе, у які яны ідуць, ліловы. Маці, відаць, гаварыла, што яны будуць разам даіць кароўку. Гэта суцешыла і засела ў памяці. Карова ела ліловы лубін. Першыя струмені малака зацыркалі ў даёнку, а ён крычаў на карову, як і сказала маці: «стой, стой», хоць яна нікуды і не ішла. Вечар, у які ён упершыню адчуў сваю значнасць, быў ліловым.

Бег часу. І святочна-ўрачысты вітраж памяці ў намітцы рамантычнага туману. Галоўнае суцяшэнне — у адчуванні трываласці грунту — за табой не цёмная прорва.

Сяргей здагадаўся: яму снілася дзяцінства, а наплывала тая вясновая музыка, якая была і ў звоне капяжу, і ў булькаценні ручайкоў, дзе мчалі першыя караблікі, і ў пошуме набрынялай бярозы, што свяцілася ля самага акна пад высокім крынічным небам. Гул мінулага ператварыўся ў музыку.

Дураслівы, задзірлівы Мур, так падобны на коціка Кацінарбуса, з Дольнай Руты, табе можна дараваць усё тваё свавольства. Бяздумна скачучы па палосцы вясновага святла, ты зрабіў яе больш яркай, ажывіўшы такім далёкім і такім блізкім.

Адыходзячы, сакавік яшчэ круціў норавам: адліга змянялася вільготнымі калючымі завеямі, але ўсё роўна на драўляных ускраінах горада, якія са страхам пазіралі на няўмольны поступ мікрараёнаў, як нідзе, чулася вясна—запелі куры.

Свет рабіўся задольным і шырокім. Такой далягляднай парой Сяргей неяк забіраў пошту. Рука намацала ў скрынцы пісьмо. Бляск эпісталярнага жанру ў нашу эпоху незваротна пабляк, з-за чаго, дарэчы, пасля выявяцца правалы ў гістарычнай памяці грамадства. Атрымаць вялікіх цудаў-навін Сяргеў не чакаў.

Ад маці? Няўжо? Яна амаль ніколі не пісала, як і Сяргей, якому лягчэй было б разгрузіць вагон з мяхамі цэменту, чым напісаць каму-небудзь пісьмо. Вучы пасля гэтага дзяцей. Адно зыбкае апраўданне, што маці жыла недалёка. Былі пісьмы два-тры са сталіцы ў вёску і з вёскі ў сталіцу,

а так найбольш паштоўкі на святы, у якіх жадалася вечнага здароўя і шчасця. Свет заўсёды кампенсуе пажаданнямі тое, што век не хапае.

«Добры дзень, мае сынок, нявестка і ўнучачка,— ці здаровенькія вы там? Вот, сынок, і нажылася я ў сваёй хатцы,— як успомню, як мы з бацькам бярвенні валачылі ўдваіх, як усе яечкі на базар насіла і як булён здорам засквapвала, сала прадаўшы,— слёзы як боб з вачэй сыпяцца. А мы думалі, што вы тут векаваць будзеце, а вы разляцеліся бытта птушкі, і цяперака мушу хату прадаваць — як няма гаспадара, бабе старой надта баляць рукі. Надзя да сябе кліча, і не ведаю, што рабіць — ісці да іх у кутнікі ці ня йсці. А як — я падумала — у вашай кватэры жыць, калі ў мяне боты кароўім гаўном пахнуць ды вы з усяго купленага самі жывіцё. Надзя нашая добрая — яна ж першая ў мяне. Але Надзін Пецька сам знаеш які стрэнтны, сёння ён мякка сцеле, а спацца будзе мякка ці мулка — ня ведаю. Радня ў іх ўся такая — ягоны дзядзька як паміраў, родная сястра прашчацца прыйшла, дык ён са злосці, што яна некалі з хаты пасаг узяла, за палец яе ўкусіў. (Далей у пісьме два радкі закрэслены так, што нічога не разабраць.) Але што я пра ўсё сваё ды пра сваё. Зіма ў нас адстоіла лютая, сівер быў такі маразяны. Дай бог здароўя Надзі, што драўмі абяспечыла. Бульбы на насенне маю, усяго маю, толькі цыбулі няма — уся выпшыкалася. Прыязджай і сваіх вазьмі з сабой, а то ад калядаў не былі — мы тутака ўбуялі, а вы, мусіць, высахлі як верацёны. Накажы, хай і Лёнік прыедзе — хоць ён і дурнаваты, але сваё дзіця — на ім завязаўся мой век. Я і адрасу яго добра не знаю — недзе ўсё бадзяецца. Пакуль матчыну печ не за-

быўся, то быў яшчэ прытулкі хлопец. Твая матка Зося».

Сяргей пазнаў і мацерын тужлівы няроўны почырк і ведаў, пра каго яна піша — пра сястру Надзю, брата Лёніка і швагра Пецьку. У пісьме чуўся мацерын голас, яе нетаропкая, развалслівая гаворка. Але сам змест быў настолькі нечаканы, што спатрэбіўся нейкі час усвядоміць гэту раптоўнасць. Сяргей ужо не ўпершыню з горыччу заўважыў: з-за свайго пастаяннага ветрагонства ён не толькі непадрыхтаваны да нечаканасцей, ён успрымае як нечаканасць тое, што па логіцы рана ці позна павінна было адбыцца. Так сталася і цяпер. Як быццам бы ён і не ведаў, што маці ўжо даўно за шэсцьдзесят, што яна адным-адна. У рэшце рэшт, ён не такі і маладзён, каб не разумець, як лёгка старому чалавеку аднаму асеннім ці зімовым вечарам, калі за вокнамі цемень, як прорва будучыні, а ў чалавека засталіся толькі адны ўспаміны і трывога.

Сяргей уявіў, як шмат чаго перадумаўшы за доўгую зіму, маці сакавіцкім поўднем, калі суседаў унук прымчаўся са школы, пайшла пазычыць ручкі і папрасіць паперы. Такія пазычкі не былі ёй не ў гонар, і, відаць, на смяшлівае здзіўленне суседкі: «Во грамацейка знайшлася», маці адказала: «Трэба ж напісаць свайму гарадскому басячку, калі сам духу не ўказвае». Але свой найбольшы клопат маці стаіла і перад суседкай — мала чаго можа пасля наплесці вёска. Суседчын унук недзе з радасцю распатрашыў свой самы невыгодны па ўзроўню адзнак сшытак.

Відаць, ёй цяжка было пісаць — усё роўна што Сяргею, сялянскаму сыну, ісці б цяпер за плугам. І напісаць хацелася шмат пра сваю долю і нядолю — але як жа, здаецца, крыўдзіцца, калі ў ха-

це цёпла і нястачы як быццам няма. Ды і як расказаш пра жыццё, тым больш у пісьме. Сяргей адразумеў — гэта тое самае, што двума словамі адказаць на ходкае неразумнае пытанне, што не сходзіць з вуснаў кожнага стрэчнага-папярэчнага: «Як жывеш?»

Трэба было не адкладваць і ехаць. Ледзь дазваніўся да брата — яго ўсё не маглі ўпалявацьна таямнічых аб'ектах яго складанай арганізацыі «Будмантажводаканал» ці неяк так, наогул вельмі доўга і для Сяргея далёка.

Дзіўныя адносіны склаліся між братамі, наогул нестандартныя — ні ў госці адзін да аднаго на выхадныя ці на святы, ні дэбатаў наконт вартасці новых пакупак. Так, усё выпадкова — на жартачках, смешачках, як і ў дзяцінстве. І, можа, таму, што Лёнька быў халасцяком, бачыліся яны амаль на бягу. Але ў адрозненне ад усёй радні, Сяргей любіў брата, пра што ніколі яму не казаў. Асабліва за туманны меланхалічны погляд — першы знак душэўных перажыванняў, пра якія мала хто ведае. А так, пры першай размове Лёніка можна палічыць і чалавекам са схільнасцю да цынізму.

Нарэшце адбыўся тэлефонны дыялог.

— Прывет, брат мой. Давай новыя ідэі.

— Лёнька, не прыдурвайся. Трэба паехаць да маці. Там нейкая валтузня, прадаваць хату намячаецца.

Маўчанне. А потым:

— Ну і жыццё. Як у казцы. Чым далей, тым страшней.

— Казкі хоць шчасліва канчаліся.

— Можа, і тут усё абыдзецца. Хаця ж не да казачных лісаў і мядзведзяў трэба ехаць. Ды лі-

сы ўжо яўна выводзяцца, а мядзведзі фактычна прыйшлі да дэградацыі. Ну, заўтра раніцай на вакзале. Я табе, цёмнаму, талковыя джынсы купіў. Загоніш хату і адкупіш у мяне.

І гэты малатня паклаў трубку.

Сяргей ехаў на вакзал з пачуццём нейкай незразумелай віны перад маці, перад сабой. А брат спакойна сядзеў на прывакзальнай лаўцы і кідаў цікаўныя зіркі на дзяўчат.

— Здароў! Пайшлі.

— Пачакай. Я асіміліру абстракцыю.

— Што-о?

— Кожны крытычна мыслячы індывідум асіміліруе абстракцыю.

— Знайшоўся мне філосаф. Спіноза, Гегель і Лёнька. Ці гэта цябе ў тваіх пустынях навучылі?

Сяргей намякнуў, што Лёнька два гады быў у заграцічнай камандзіроўцы. Ён арашаў у тых краях, дзе зімой і летам горача, нейкую пустыню. І прыехаў не так, як паехаў — з грашмі ды яшчэ і ўслед за ім прыбылі новенькія «Жыгулі». Грошы ён распатэрыў скора, нешта, праўда, выпала і на матчыну долю. А з «Жыгулямі» была шумная гісторыя, пасля якой Лёнька праслыў на ўсю акругу дурнаватым. Ён быў, вядома, інакшай думкі пра сябе і дома стаў паказвацца рэдка. Сваімі «Жыгулямі» Лёнька наладзіў аднойчы вёсцы феерверк. Неяк вясновым адвячоркам ён па слізгаце ўрэзаўся ў мур аўтобуснай пачакальні ў Дольнай Руце. Урэзаўся так, што ўшчэнт разнёс матор машыны, якая на сваю пагібель нямаведама чаго вандравала сюды ажно з Афрыкі. Нейкім цудам, вядомым толькі аўтаінспекцыі ды яшчэ і міфічным багам дарог, з Лёнькавай галавы і воласа не ўпала. Гарачую машыну адкінула ў кювет,

а ён, выскачыўшы, у шоку, амаль без памяці, пабегаў ля знявечанай кучы жалеза і шкла, абліў яе бензінам і чыркнуў запалку. Ім кіравала безнадзейнасць. Вогнішча было грандыёзным і смуродлівым.

Што было пазней — Лёнька не любіў успамінаць, але цяпер намёк зразумеў і паведаміў рамантычна:

— А я, між іншым, зноў еду на два гады ў пустыню.

— Бог ведае чаго.

— Ты сумны, як асенні дождж. Я палюбіў толькі адну жанчыну — свабоду.

— Гэта таксама яшчэ не асіміляваная табой абстракцыя?

— А ты што думаеш — як мне, то ўжо адны абіркі?

Лёнька выдурняецца. Сяргей аднойчы пабыў у рэстаранай кампаніі яго сябрукоў. На стале стаялі віны, а за сталом сядзелі такія «фрукты», што, калі б тут была жанчына, яна б толькі ад адных іх размоў зацяжарыла.

Да таго ж Лёнька калі бываў у Сяргея, то ніяк не могучы запомніць імя пляменніцы, называў яе то Соня, то Света, то яшчэ як-небудзь, нядаўна нават называў Верачку нейкай Туняй. Усе гэтыя імёны былі, канечне, імёнамі чарговых дам сэрца.

Лёнька прызнаўся ў электрычцы:

— Ты знаеш, я ў гэтыя гульні не буду гуляць зусім. Што я магу прапанаваць маці? Толькі грошы. А сам вось з'язджаю за граніцу, мой пакой будзе голы, але ж яна ў ім не ўседзіць. Там жа і жывёліны ніякай няма, толькі пару мухаў, ніхто не зарыкае, хіба толькі суседка. І наогул, усё канчыцца даным, пра што дзесяць разоў гаворана — збудзецца адвечная мара нашага дарагога шваг-

руся Пецькі. Прададуць хату, і маці пойдзе да іх, а яны думаюць купіць машыну і купяць яе. І мы сёння патрэбны для нейкай так званай сямейнай рады, маці ж не можа проста — трэба ўсё як у людзей, сямейна. А што радзіцца — прадаў ды купляй машыну. Паглядзіш, будзе самая звычайная п'янка. Ну і папарыгаем на платы. Давай самы даўжэйшы адвядзём Пецьку — ён здаровы, як бык — у яго многа ўлазіць.

— Цынік ты. Табе смешачкі.

— Цынік, меднік і бляшанік. А табе што — маркотна?

— Ты падумай: у нас не будзе дому, Дольнай Руты.

— Ён даўно ўжо не наш, той дом, а Дольная Рута з месца не збяжыць. Калі хочаш, едзь туды і жыві. Хто трымае? А мой дом — уся планета. І наогул, хочаш сухога віна? Вып'ем — і я падрамлю. Я еду толькі ардынарцам пры табе. І яшчэ — каб угледзець малога...

— Не хачу віна.

— Як знаеш,— Лёнік адкаркаваў бутэльку сухога, спакойна выдундзіў і задрамаў.

«...Каб угледзець малога». Сяргей не ведаў і прыблізнага часу, калі брат палюбіў абстрактную жанчыну па імені Свабода, але што ён быў жанаты з жанчынай канкрэтнай — гэта ўжо дакладна. Як і тое, што ён развёўся, а сына забрала жонка. Яны жылі ў райцэнтры, і Лёнька зрэдзь часу ездзіў да іх. А часцей, пры кожнай нагодзе, хадзіла маці з гасцінцам адведаць унучка, які жыве сіратой праз дурнога бацьку, і былую нявестку, якую любіла. Часта казала: «Такая добрая, гутарлівая бабка, і з віду нічога, і пры грашах — у сталоўцы робіць. Чаго ты, дурань, носам рыў і чаго жаніўся — сірот на свет пладзіць? І бабе свет

завязаў. А цяпер яшчэ мудрэй — машыну спаліў на людскі смех. Пецька Надзін якія гайкі падвінціў бы — і можна было б катацца. Скруціць галоўку...»

Сяргей і не ўхваляў Лёньку за развод, і не асуджаў. Чужое жыццё, ды сямейнае, як поцемкі — тут і з родным братам не разбярэшся. А што трымае цяпер аднаго пры другім? — не хочаш жыць разам — развядзіся. І гэтак лепш — іначай як двое звыл сабак у адной будцы, якіх раней трымаў такі ланцуг, як жончын пасаг ці дабрабыт яе мужа.

Толькі адзін раз Сяргей пачуў ад брата хоць прыблізна канкрэтнае прызнанне. Памешваючы качарэжкай вуголле ў печцы, у матчыным доме, ні з таго ні з сяго (а хутчэй за ўсё з-за таго, што толькі адведаў сына) Лёнік сказаў: «Уся бяда, што абсалютная большасць жонак выхавана так, што думаюць: муж — гэта яе ўласнасць. Прыватная ўласнасць, прытым нерухомая. Рухацца можна толькі на працу і адразу дахаты. Можна і трэба энергічна рухацца яшчэ ў пасцелі. Усё астатняе — па дазволу. Якая сумота!»

Цяпер Лёнік спаў. Сяргей любаваўся маладым спакойным тварам брата і думаў: «А што, калі б яму даў цяпер чуллівы пасаж: «Дзе сшыткі ў косыя лінейкі, якія падобны на блакітныя ніткі спорнага майскага дожджыка? Дзе новыя вільветавыя футболкі на бліскучых замочках — форс на ўсю школу? І г. д.». Лёнька, відаць, проста б зарагатаў: «Які там майскі дожджык? Мяне ад косых тых лінеек і цяпер нудзіць — яны былі падобны на краты — ніяк пяром не ўкіруеш, каб не вылезці за іх, а пасля — двойка ці якая здохлая тройка. Ну а футболкі знасіліся і сталі рыззём».

Рашучы Лёнькаў падбародак, хоць ён і спаў, без слоў пацвярджаў гэта. Лёнька — інжынер... Хай спіць...

Сяргей падумаў: «Перавезці маці да сябе, а хата хай стаіць — летам можна наязджаць... Але нічога з гэтага не выйдзе... Маці не паедзе жыць у горад ды яшчэ не ў свой гарадок, а ў вялікі, сталічны. Ды і сам Сяргей ёй такой долі не надта жадаў, хаця і выдумаць лепшай не мог. Не жадаў, бо сам пазглядаў штодзень на жыццё суседавых мацярок. Па-першае, яны адразу пасля вёсак пастарэлі. Ад выгод, ці што? Асабліва цяжка было бачыць вясной.

Сяргей узяў газету, і ў вочы знянацку кінулася адна з аб'яў, якая паведамляла: «Саўгас «Дэкаратыўная культура» прадае ў неабмежаванай колькасці саджанцы дэкаратыўных дрэў і кустарнікаў па наяўнаму і безнаяўнаму разліку наступных парод: ясень пенсільванскі — 63 кап.; дуб чырэшчаты — 2 руб. 25 кап.; таполя — 1 руб... Гэтыя дэкаратыўныя пароды аздобяць вашы двары, зробяць іх больш прыгожымі».

Ён быў разгублены з-за нядаўніх размоў з братам і таму, чытаючы, спачатку ўсё ўсведамляў своеасабліва. Закруціліся нейкія дурныя пытанні следам за дурным сваёй катэгарычнасцю тонам аб'явы, які і павінен быць у кожнай рэкламе. «Саўгас прадае». Чаму прадае?

«Дэкаратыўных дрэў і кустарнікаў...» Чаму толькі дэкаратыўныя, а дзе купіць самыя звычайныя? Чаму за такі бясцэнак?

Электрычка імчала, і рытміка яе бегу трохі супакойвала. Праз нейкі час ранейшыя пытанні пачалі здавацца смешнымі: «А што рабіць таму

саўгасу, на тое ён і ёсць, каб прадаваць у неабмежаванай колькасці». Электрычка імчала, мільгалі прыдарожныя кусты, і ўсё ж памяць свідравала падсвядомая і недаўменная думка пра ясень, які каштуе ўсяго 63 капейкі. «Ясень... ясень...— думаў Сяргей,— аздобіць вашы двары...»

Электрычка імчала. За акном сонца палыскалася ў воблаках. Ён глянуў на гадзіннік. Хутка поўдзень. Праз нейкую хвіліну ўспышка болю ў свядомаці ўсё праясніла. Прычынай было апошняе пытанне: «Чаму за такі бясцэнак?» У памяці ярка высвеціўся далёкі восеньскі поўдзень маленства. Той поўдзень...

«Гэта ясень, ясны ясень быў»,— так некалі светла напісаў адзін крыклівы і не вельмі разумны паэт. Але ясны ясень — гэта хораша.

Ясны ясень рос і ля бацькоўскай хаты Сяргея. Як і ўсе клапатлівыя гаспадары, бацька збудаваў хату вокнамі да сонца, была глухой толькі заходняя сцяна. Ля яе і рос ясень, яму добра было раскашавацца ў вільготным зацішку. Як крыллямі, ён лапатаў галінкамі, забіраючыся вершалінай ледзь не да ўзроўню вільчака. Ясень, калі мераць узрост дрэва чалавечым векам, быў маладым дзецюком. Невядома, якім цудам ён ацалеў у вайну, бо, апроч чэзлага вішанніку, які пайшоў у дзік, ды старой грушы на ўзмежку, нічога не ацалела. Відаць, ясень быў самасейка, такія дрэвы найбольш жывучыя.

Сяргей любіў ясень — ці то таму, што гэта было адзінае дрэва на панадворку, а можа, таму, што, пакуль будавалі хату, сядзібу дакладна можна было адгадаць здалёку па ясеню-арыенціру — не пазнаеш жа па зямлянцы. На гэтым дрэве гайдаліся качэлі, зрэшты і на голлі самога ясеня па-

гушкацца было няблага. Пра ясень склалі песні і спявалі на самым святочным у вёсцы — на першых сапраўдных, бо пасляваенных, вяселлях. Прыбраныя бабы пелі працяжна, велічальна:

Паедзеш, Колечка, жаніціся —
Не стаўляй коніка пад рабінаю,
Рабінава дзераўцо нешчаслівае,
А стаўляй коніка пад ясенем.
Ясенева дзераўцо шчаслівае —
З сярэдзіны ясеня віно цячэць,
А ў вярху ясеня салаўі пяюць.

Ясень аднойчы дапамог маленькаму бусліку. З высокай суседавай буслянкі, дзе летавала бусліная чародка, маці-бусліха скінула малога бусліка. Гэта азначала: «Ляці, вучыся», бо дагэтуль ён днямі стаяў на краі, і відаць было па яго дрыгатлівых ножках, што прастора здаецца яму страшнай прорвай. Буслік нейкае імгненне ляцеў каменем, але адчуванне крылляў перамагло, ён няўклюдна ўзмахнуў і паплыў, хістаючыся, не ўверх, не наперад, а ўніз. Яго адвагі і сіл хапіла толькі ад самага краечку чарапічнага даху Сяргеевай хаты, але зачапіцца за чарапіцу ён не змог і паляцеў проста ў ясенева голле. Сяргей быў перакананы, што толькі ясень яго і выратаваў.

Калі ўздымаўся вецер і ясень пачынаў біць голлем у сцяну, здавалася, што ён просіцца ў хату — дрэву холадна і маркотна. І было яшчэ страшна, што вецер сарве яго і ясень паляціць далёка-далёка. Ну, куды-небудзь за сваім буслікам у таямнічую Афрыку шукаць цёплага сонца. Буслы лятуць туды павольна, як бы нехаця. І клін іх з зямлі падобны на вялікае «А» ў букварь. Ясень будзе ляцець зялёным воблакам услед сваёй зямлі. Як цікава — туды, дзе жырафы, ільвы,

сланы — гэта ж не нейкія бясхвостыя сучкі, што цэлы дзень гайсаюць па вёсцы.

Але Сяргей даведаўся, што ў Афрыцы не толькі грозныя львы і сланы.

Вечарамі маці часам спявала. Найчасцей яна пела прадучы. Гудзеў пазычаны калаўрот, першы і апошні, што бачыў Сяргей у хаце. Маці пачынала раптоўна, але пранікліва-ціха. Адну песню Сяргей найбольш запомніў: «Трансваль, Трансваль, страна моя, ты вся горишь в огне...» Хто ведае, чаму гэта Трансваль (і дзе яна?) наплывала на памяць маці. Мо напамінак пра нейкі вялікі агонь?

Маці спявала і шыючы, нізка нахіліўшыся над новенькай ручной машынай. Гэта быў мацерын гонар, адзіны скарб у хаце. Паліраваная, з нікелем, аздобленая рознымі ўзорамі, машына мела нават сваё імя — на ёй былі напісаны нейкія незразумелыя літары. Сяргей дазнаўся, што гэта па-нямецку напісана «Singer», так завецца славутая нямецкая фірма «Зінгер». А ён назваў машыну проста «Зінкай».

«Зінка» была нечым святым у хаце — Сяргею чапаць яе пад карай вялікай лупцоўкі не давалі. Яе аберагалі, ахінаючы як паню, у куфры. На машыну можна было толькі глядзець, і Сяргей узненавідзеў «Зінку». Іншая рэч калаўрот — круці колькі хочаш і вушы будуць цэлыя. Ён быў нейкі і больш свойскі між лаў і зэдляў.

Машына трапіла ў хату не зусім звычайна, не адкуль-небудзь, а з нямецкага бункера.

...Бункер займаў сотак пятнаццаць. Ён узнік у вайну ля чыгункі для аховы яе, на карчэўі былога бярэзніка. З карчоў гналіся да сонца новыя га-

лінкі так зелена, ярка і весела. Як добра, што дрэвам дадзена толькі шумець, можна стагнаць у буру, а не крычаць, разумець.

Баючыся партызанаў, немцы рашылі знішчыць бярэзнік ля чыгункі. З гарадка прыгналі нашых палонных, а вяскоўцам было загадана навастрыць і сабраць сякеры. Вяскоўцаў да бярэзніка не падпускалі. Заякаталі сякеры, і за пару дзён са стогнам злегла гектараў пяць шумлівых вясёлых дрэў, якія зялёнай пенай кіпелі ля вёскі.

Бярэзнік быў цнотай і пашанай бязлеснай Дольнай Руты. З яго неслі бярэмамі май — духмяныя маладыя галінкі — умаіць хату на сёмуху. Галінкі засоўвалі пад бэлькі, за рамкі партрэтаў, і ў хатах струменілася шчымлівая, зялёная прахалода. У бярэзніку збіраліся на маёўкі, спявалі, весяліліся, рассцілалі абрусы на яркую траву і пасуседску пускалі чарку па крузе, успамінаючы, што было, і гадаючы, што будзе.

Што будзе? Як ад бярэзніка, то засталося толькі голае гала. Вёска як бы асірацела, агалела сярод роўных палёў і лугоў. Яна стала падобнай на расцягнуты гармонік, які замоўк і невядома калі падасць вясёлы гук.

Немцы дазволілі ўзяць высечанае. Пацягнулі людзі жніўеньскім днём свой май і адразу столькі шмат, што на сотні маяў хапіла б.

Бункер быў паспешліва і, здавалася, фундаментальна заснаванай цытадэллю. Першы паверх быў цёмны, нябачны, у высока насыпаных валах, якія акружаў глыбокі роў. Другі, драўляны, быў казармай — з вокнаў часта несліся гарлапаністыя песні, крыкі, віскат губных гармонікаў. Бункер быў высока абнесены сеткай і абгароджаны калючым дротам, на якім віселі сігнальныя бляшанкі. Бункер злой зданню глядзеў на ваколле чатырма

крытымі вышкамі на вуглах, на якіх вечнай старожжу дзяжурылі салдаты. Кране заяц сігнальную бляшанку, то як пачнуць страляніну — усе хаты і гумны былі ў кулях.

У бункеры стаяла ахова чыгункі. Чыгунка мела немалое стратэгічнае значэнне. Салдаты паходжвалі на метрах пяцьсот адзін ад другога.

Тая ноч была ціхай, хоць парушынку здзьмухні. Дольная Рута спала. Яе, прывыклую да гулу цягнікоў, не ўстрывожыў і гэты, што ішоў з захаду на ўсход. Але раптам вёску страсянула так, быццам была яна мостам грамоў. Усё відней і відней рабілася ў хатах, і, паўскокваўшы, спужаныя людзі ўбачылі, як па чыгунцы распаўзаецца вялікая і высокая паласа ядавітага агню. Пылалі цыстэрны з бензінам. Першыя з іх як бы памыкаліся стаць на дыбы. Было страшна ў хатах, а тут яшчэ, як пасланец агню, да вёскі бег салдат, відаць, прыдурнеўшы ад жаху. Спалі толькі меншыя дзеці, але цяпер ім можна было пажадаць толькі сноў пра вясёлае дзяцінства.

Уранку нахлынулі эсэсаўцы. Над ваколіцай яшчэ віўся смуродны дым, ад якога ажно голас пачынаў сіпець. Нізка гайдаючыся над зямлёй, паляцелі некуды з буслянак учадзелыя буслы. Шмат зялёных крытых машын, равучы, пайшло далей, і можна было спазрыць, што нешта нядобрае будзе не толькі ў Дольнай Руце.

Людзі не ведалі, што прыехалі іменна эсэсаўцы, але гэтыя вайскоўцы былі мала падобнымі на бункераўскіх немцаў. У чорнай форме, якая ажно ззяла, як панцыры жукоў-гнаевікоў, падцягнутыя, яны пружыніста саскоквалі на брук. Ля той машыны, што спынілася на ўездзе, стаяў іх старэйшы і як рэгуліроўшчык энергічна ўказваў у розныя бакі.

Андрэй Сакольскі на панадворку пад ліпай кляпаў касу. Яму, старому, апошнім часам круціў спіну раматус, нават цяпер, летам, ён адзяваў суконную світку. Бывалы чалавек, разважлівы і спакойны, ён быў адным з нямногіх мужчын, якія засталіся ў гэтым канцы. Да Андрэя і ішлі жанчыны са сваімі клопатамі. Цяпер, напроць сенакосу, хацелася выкасіць хоць лужок ля хаты, і яны неслі давесці да ладу косы. Андрэй не аднекваўся, толькі казаў з добрай усмешкай: «Кажаш, і я б касэрыў, каб хто касу майстэрыў», а потым уздыхаў: «Эх, няма касцоў».

Калі над Андрэем металічна празвінелі чужаземныя словы, ён не ўздрыгнуў, і толькі таму, што быў чалавекам бывалым. Ён адно, ускінуўшы галаву, прыжмурыўся ад бляску ботаў. Чатыры пары вачэй глядзелі на Андрэя так люта, быццам бы ён быў вінаваты, што ўзарваўся цягнік і велізарнае ўзвышша абгарэлага жалеза ляжала на палатне чыгункі, паралізаваўшы яе. Андрэй зразумеў, што гыркнуў немец. Як-ніяк ён прайшоў праз першую сусветную вайну, і шмат нямецкіх фраз засела ў памяці. Ён зразумеў, але падумаў: «Нашто мне спяшацца?» — і ў свядомасць прыплыло зусім другое: «А высокія, хоць ты на іх сабак вешай».

«Пан афіцэр пытаецца, дзе ты быў сёння ноччу і ці ведаеш, дзе партызаны?» — пераклаў чалавек ля афіцэра, стараючыся падладзіцца пад манеру немцаў гаварыць адрывіста. Выйшла зусім недарэчна і смешна.

«А, Байструк, і ты тут,— пазнаў Андрэй і падумаў: — Граматны. Я правільна падазраваў, што ўсё так і кончыцца. Лёгка ты дарогу да іх высталбаваў. Праўда, адзелі цябе трохі горш, нейкі ты пакамечаны, але нічога, даслужышся».

Перакладчыкам быў малады чалавек, не сказаць, што брыдкі, але вельмі блізкі нечым да жывога трупа — нездаровая белізна скуластага вузкага твару, вочы тырчаць, як усаджаныя.

Не выпускаючы з рук касы, Андрэй выразна адказаў: «Ночай я спаў, як спалася, а дзе партызаны — ці ж я ведаю? — у нас іх не было чуваць».

Андрэй казаў праўду. Што ім тут рабіць у палях? Партызаны былі ў лесе, за балоцістымі сенажацямі. Пра іх чулі, ведалі, што некаторыя хлопцы і мужчыны там. Ноччу стала ясна, што не так 'яны і далёка.

Андрэеў адказ узлаваў афіцэра — гэта злое маладое ваўчаня, якому так хацелася адразу ж, з налёту, стаць героем дня.

Андрэй зразумеў, і калі афіцэр пачаў нешта паспешліва гарлапаніць, паказваючы на яго, Андрэй са здзекліва-паблажлівай усмешкай паглядзеў на галаву афіцэра і падумаў: «Так яно і ёсць. У яго мала розуму. Хіба можа быць дастаткова разумным чалавек з выпуклай патыліцай?»

«Пан афіцэр загадвае ўстаць»,— адчаканіў Байструк.

Калі б Андрэй не быў чалавекам бывалым, калі б тут не было Байструка, ён, можа б, і падняўся. Але ў першую сусветную ён тапіўся ў праклятых мазурскіх балотах, пры Польшчы яго выгналі з гімназіі — дзецюком ён сапануў нажом правакатару падполля і сядзеў у адзіночцы.

Мінулае перамагло. Яно не было для Андрэя цяжкімі крагамі памяці, наадварот, толькі давала сілу і ўпэўненасць.

«Я ўжо нездаровы чалавек, і я не салдат. Ды і вы абодва, каб скласці вашыя гады разам, маладзейшыя за мяне».

Байструку горла сціснула злосць: так упэўнена прагучалі нягучныя словы Андрэя. А ў штодзённым крыку немцаў было толькі адчайнае бяссілле. Гэтыя крык і страх фатальна спусташалі іх. Да таго ж ён сам баяўся перакладаць такое і толькі мацюкнуўся праз зубы. Ён з палёгкай уздыхнуў, калі ў афіцэра закалаціўся падбародак, і, не вытрываўшы, афіцэр вырваў з Андрэевых рук касу і шпурнуў яе на плот.

«Немец гаспадарлівы. Байструк кінуў бы на зямлю — не збіраецца ж ён касіць»,— мільганула ў свядомасці адным імгненнем, бо ад рэзкага штуршка ў плечы Андрэй ніцма паляцеў на зямлю. Падаючы, ён паспеў засланіць рукою твар, каб не абабіцца.

Ён не ўдарыўся, толькі вострыя боль працяў хворую спіну. «Нічога, кепска, калі падаеш сам, а калі сілком папхнулі, то ўстаць знойдзеш моцы»,— падумаў Андрэй. Ён пачуў тупаценне ботаў па гулкім ганку — салдаты ўваходзілі ў сені, а афіцэр нешта закамандаваў Байструку.

«Уставай, ляжыш як вываранень»,— бадзёра загадаў Байструк. Злосць, якая толькі што вар'явала ў яго вачах, змянілася дзікай радасцю. Падняўшыся, Андрэй адразу ўлавіў нейкую жвавасць ва ўсёй постаці Байструка, які забегаў па панадворку. Яго адухоўлены нядобрым духам позірк нечага шукаў, а сам ён стаў падобным на жывога. «Ага»,— аж заенчыў Байструк, хапаючыся за касу, наступіў абцасам на лязо і — хрась! — у руках засталося касільна з ручкай, якую ў Дольнай Руцэ называюць жураўка. Тут далося ўжо прасцей — ён шмаргануў касільном па прасліне, і жураўка зляцела на траву. Шчаслівы і дзелавіты, Байструк узняў і распасцёр Андрэевы рукі і, сапучы, пачаў заганяць касільна ў левы рукаў

прасторнай світкі. Адшліфаванае мазалямі, яно лёгка слізгацела, ішло па сукне. Андрэй здагадаўся, што з яго будзе жывы крыж — гэта было любімай забавай Байструка. Не гнеў, не адчай, а толькі маркота агарнула Андрэя. Бо калі касільно ўпёрлася ў локаць і пачало распрамляць яго, з трэскам шчоўкнулі суставы, а жылы напяліся, як тугія стужкі гумы. Тады ён падумаў: «Я зусім старэю, вапнуцца косці». Ён толькі дзякаваў лёсу, што Байструку трапілася пад рукі каса, а не якая-небудзь шурпатая палка. І ён па-добраму ўспомніў Васіля. Гэта яго мазалямі касільно нацёрта да бляску. Васіліха ўчора прынесла накляпаць, бо, як яна сказала з плачам, Васіль немаведама дзе, хаця Андрэй даўно здагадваўся, што ён у лесе. Яны былі суседзямі па балоце — іхнія сенажаці спераліся. Як і да ўсякай працы, Васіль быў драпежны да касьбы — толькі кіне ў пракосе галаву ўверх на сонца — і далей. Зрэдзь часу пагуквaліся на перакур — кожны торкаў касу касільном у балота, і сыходзіліся. Гэтым самым касільном, што паўзе цяпер па Андрэевай спіне.

Байструк стараўся ля сутулай спіны.

Тут Андрэю кінулася ў вочы адзінокая жураўка, яна ляжала проста ля ног — непатрэбны драўляны трохкутнічак.

Жураўка... жураўка...

З-за яе Андрэй не адчуў болю і толькі таму, што ўспомніў, як бралі з жонкай на сенажаць сына, калі яму было і шэсць, і сем, і восем гадкоў. Малы нешта лепятаў; бегучы паперадзе, губляўся ў душнай парнасці чэрвеньскай сенажаці. Толькі віхрастая галава, светлая, як спелая макаўка, мільгала між высокіх птуркіх траў і размаітых кветак. З лазы і вольхі малому рабілі стрэшку-будан, там ён і гудзеў, гуляючы сам з сабой. А калі

бацька касой ці маці граблямі ўспорвалі ў якой купіне гняздо дзікіх пчол, малому былі папраўдзішнія мяды. Тут яго губы ўпіваліся ў рудыя спарышыкі-ячэйкі, і малы смактаў. Потым у будане піў крынічную ваду — глынеш — і ў галаве загудуць халодныя званы — кіславатую — для смаку ў збан кідалі акрайцы хлеба. Іх, што, як ветахі, залацілі ваду, хлапчук лавіў дубчыкам і, суслячы сам, нёс яшчэ і маці — пакаштуй! І маці, якая ўдосталь насмакавалася за жыццё гэтых мокрых акрайчыкаў, як бы ўпершыню глядзела на іх, а больш на сына і цешылася: «Мой маленькі жуpавок падвячорачак валок».

«Жураўка ляжыць ля ног... Той жуpавок... сын... вырас... недзе на фронце...»

Андрэй праз маркотнае здранцвенне здзівіўся, што ён можа, і з такой удзячнасцю, успамінаць пра зусім далёкае. А здавалася — усё забыта.

Касільно ўжо ўвайшло ў правы рукаў, ледзь не вылезла наверх на прашмараваным локці. Але пільны Байструк, мацюкнуўшыся, скіраваў касільно, як яму трэба было.

«Неразумныя бабы дзіваяцца: «Немцы дык ясна, яны чужыя, але адкуль свае юдашы бяруцца?» Як бы яны не помняць».

Вось і ўсё. Распасцёртыя рукі павіслі на касільне ў світцы. Байструк зарагатаў: «Ну во, цяпер ты як крыжык, ідзі пастой на прысадзе. Ты ж разумненькі, ты ж добранькі»,— і падштурхнуў Андрэя ісці ўперад.

Знаёмую зласлівую інтанацыю, трохі пагрубелую ад часу дзіцячых і падлеткавых гадоў, пачуў Андрэй у голасе Байструка.

Гэты малады чалавек не быў ніякім байструком, у яго былі бацька і маці, гадаваўся ён у досыць заможнай сям'і. Цяпер бацькі выракліся яго,

а ён без ніякага жалю адцураўся ад іх. Ды і мянушкі такой, такога слоўца да нядаўняга часу ваколле не ведала. Калі б яно было так, то проста сказалі б, што матка нарадзіла яго ў дзеўках. Слова прывалаклося з падарожнымі людзьмі з далёкіх ці блізкіх гарадоў, у якіх заўсёды немаведама што робіцца. Яно здалося дзікім і першым прыліпла да яго, дзікаватага падшпарка.

Для забойства сябе ж прырода дала промах, даўшы свет гэтаму дзіцяці. Атрымалася так, што доля садызму, якая ёсць у натуры многіх людзей ад нараджэння, у яго была завялікай і не згасла з часам. Наадварот, ён станавіўся ўсё больш лютым, рос унурысты і адзінотны, як бы не адчуваючы, што такое людскасць і да якой мяжы магчымае можна чалавеку. Квакае дзе жаба на купіне, а ён ашчэрыцца і, спружыніўшыся, цэдзіць праз зубы: «Крэмкаеш, ну крэмкай, крэмкай, зараз я цябе з'ем». І з'ядаў. Тапіць катоў, душыць сабак — было любімым заняткам Байструка. Яго гідзіліся дарослыя і баяліся дзеці. Сына маці і ўпрошвала, а бацька і цэпам біў — нічога не памагала. На сваю новую мянушку ён не крыўдзіўся, можа, нават і ганарыўся, што яна адзіная ў наваколлі. Звычайна любому адказваў спакойна і здзекліва: «Байструк з божых рук, а ты з кабылляй с...» Толькі аднойчы дзецюком ён прызнаўся матчыным слязам: «У душы нейкі д'ябал сядзіць. Такая натура. Хоць бяжы з ночы да раніцы кастры на горках паліць».

Але вучыўся ён надзіва ўсім заўсёды добра. І хутчэй за ўсё верх тут брала не так цікавасць ці ахвота, як злосць на невядомае. І ён часта даводзіў да слёз малодшага брата, ціхманага Мацейку, якому навука давалася туга: «Мацейка, скінь боты, лягчэй пісаць будзе».

На радасць сабе і на ўцеху вёсцы бацькі паслалі сына на вучобу ў Вільню, і Дольная Рута бачыла яго досыць рэдка. У Вільні ён хутка сплыціўся з малойчыкамі са «Strzelca» [1]. Байструк трапіў у свой рай, хаця яму было напляваць на ўсе патрыятычныя прамовы сваіх сябрукоў. Ён быў ударнай, лабавой сілай, і ўсё роўна калі — ці то патрабавалася за ноч перагасіць каменнямі вокны рэдакцый заходнебеларускіх выданняў, ці ўзняць вэрхал у літоўскім касцёле ў Вільні.

Тым большае раздолле даў ён сваім рукам цяпер, калі нечакана вярнуўся ў родныя краі пад новай апекай.

Папіхаючы Андрэя, ён давёў яго на прысаду і загадаў: «Стой тут, хай моляцца на цябе, дальнарутаўскага мучаніка. Можа, хто і ручніком абвяжа. Святым станеш».

Немцы ля машын рагаталі.

І тым часам, калі ў хатах, гумнах і скляпах эсэсаўцы ставілі ўсё колам-ломам, шукаючы партызанаў, сапраўды адна бабуля Сілашыя пачала хрысціцца. Да яе толкам не даходзіла, што тут робіцца і дзе робіцца — на гэтым ці на тым свеце.

Сілашыя жыла на свеце толькі ўмоўна, хаця была пры сваім розуме, старэчым, дзівакаватым. Ёй здавалася, што яна прайшла ўжо праз смерць і ніяк зразумець не магла, чаму яна яшчэ тут, дзе ўсё такое знаёмае. Адзінокая бабуля, якая жыла з ласкі суседак, яна днямі лунатычна хадзіла па панадворку або сядзела ў хаце і ўсё чакала, калі яе паклічуць у рай. Там — думала яна — цёпла, хораша, есці даюць салодкае і мяккае. Але сён-

---

[1] «Strzelec» («Стралец») — у перадваеннай Польшчы напаўваенізаваная маладзёжная арганізацыя нацыяналістычнага характару.

няшняя ноч так упужала, што Сілашыя заплакала, хаця, здавалася, усе яе слёзы даўным-даўно выплаканы. Калі зямля з трэскам правалілася ў нейкае палаючае бяздонне, яна бачыла блізка-блізка прывід пекла. Пекла бушавала языкатым полымем, паўзло да хат, а бабуля плакала і пыталася ў самой сябе і немаведама ў каго: за што? Сілашыі здавалася, што яна заслужыла той рай, які ўяўляла. Гэта маглі засведчыць і яе счарнелыя рукі, і яе згорбленая постаць, магла засведчыць уся вёска. І пралля, і ткалля, і жняя, а калі трэба, і касец, і ратай. За што ж? Калі агонь увайшоў у зямлю і развеяўся чорны дым, яна ўбачыла на прысадзе не то крыж, не то Андрэя Сакольскага, але хутчэй за ўсё гэта быў крыж. Ад яго шпаркай хадой, як бы ўцякаючы, ішлі нейкія ў чорным, ішлі да яе панадворка. Спачатку Сілашыя нічога не магла ўцяміць — і раптам дайшло: гэта д'яблы, яны ўцякаюць ад крыжа, яны ідуць па яе душу і пацягнуць у пекла. За што? Старая так хацела раю, але чорныя д'яблы пераступалі парог. Плачучы, яна пачала хрысціцца на крыж у заваконні. Калі перад Сілашыяй вытыркнуўся самы галоўны Люцыпар, яна ўжо толькі хліпала: «Я ў госпада бога за сямю замкамі... Адступіся, анцыхрыст...»

— Капайце яму большую, шырэйшую, а то ўсе не ўтоўпіцеся,— камандаваў Байструк двум хлапцам і мужчыне. Здрыганулася, укамянела сцяна вяскоўцаў, сагнаных на ўрок смерці.

Аднаго з траіх пазналі, хоць цяжка было паверыць, што гэты збіты да чорнага станісты хлопец і ёсць Сенька з Дольнай Руты. Той самы весялун і звадыяш, які праславіўся яшчэ ў маленстве, выдумаўшы для сябе і равеснікаў нязлосную

забаву. Нядзельнымі надвячоркамі праз Дольную Руту цягнуўся з горада ў свае далёкія вёскі цуг кірмашовых падводаў. І тады з прысадаў вылятала знянацку гурма падшыванцаў, а наперадзе Сенька. Скачучы ля якой падводы, з жахам крычалі возчыку: «А-е-я-ей! А дзядзечка, глянь, глянь!» Адны паказвалі пальцамі на колы, другія за галовы хапаліся: «А дзядзечка, паглянь толькі!»

— Што? Дзе?

— А дзядзечка, а родненькі! Вой-вой!

Перапужаны дзядзька выкульваўся з драбін.

— Што? Што?

— Вось у калясе,— крычалі і аж раслі, заходзячыся ад смеху, жэўжыкі.

Дзядзька спачатку разгублена міргаў, а потым хапаўся за пугу: «Вон, недавяркі!»

Сенька, заскочыўшы наперад, танцаваў на адной назе і, маючы звычку канчаткова вывесці з сябе чалавека, прыпяваў: «Нашы едуць, вашы йдуць, нашы вашых падвязуць».

І цяпер ён побач, той жа брук. Ля яго Сенька капае з таварышамі магілу ў прысадзе, нават не магілу, а яму. Самі сабе далакопы, партызаны прайшлі ўжо дзёран, падзол.

«Дажыліся, маеш табе — нашы едуць, вашы йдуць,— падумаў Андрэй Сакольскі, які глядзеў праз дарогу ад сваёй хаты.— Ніхто з гэтых трох нікуды не пойдзе і не паедзе...» Андрэй сёння першы раз узняўся з пасцелі, увесь гэты тыдзень ён не мог знайсці ні рук, ні самога сябе, толькі ногі былі цвярдзейшыя. Цяпер, гледзячы на акамянелы натоўп аднавяскоўцаў, ён думаў: «Наш народ не ваяўнічы. Але жыццё прымусіла яго стаць такім. Вось і гэтыя хлопцы,— яны сталі ваякамі, добрымі ваякамі...»

Зноў Андрэя, як лязом, паласнула ў паясніцы, і ён адчуў, што пачалі дзеравянець рукі. Але позірк не стаў нават замглёным і ўлавіў, што Сенька выкінуў з ямы, відаць, цяжкую яму цяпер ружовую сарочку. Яна вылецела падбітай, спісяганай птушкай.

«Упацеў»,— зазначыў Андрэй і ўспомніў тое, пра што цяпер, відаць, і не мог думаць і помніць Сенька.

Некалі даўно, хлопчыку было гадоў шэсць, хавалі яго бабулю. Той маразянай зімой, калі да жывой зямлі цяжка дастуціцца, Андрэя, як суседа, папрасілі быць за далакопа. Пахаванне, можа б, і сцерлася ў Андрэевай памяці, калі б не малы Сенька, для якога час яшчэ не меў граніц. Ён па дарозе назад не адставаў ад дарослых, ціснуў за імі, паспяваючы падбіваць яшчэ і грудзякі снегу. І раптам гэты хлапчук ухапіў Андрэя за палу: «Дзядзька, а знаеш: наша баба заўтра прыйдзе, і я скажу ёй, сколькі шмат людзей для яе сабраліся»,— і зноў памчаўся падбіваць снег.

Тады Андрэй толькі пагладзіў хлопчыка. Цяпер ён бачыў яго зноў такім блізкім, на адну хвіліну да смерці, юнаком.

«І сам ты бачыш, Сенька, колькі народу на тваім пахаванні, і табе не трэба будзе расказваць — ты ўжо шмат чаго знаеш».

А потым Андрэй помніў, што стралялі хлопцаў, а людзі разбегліся, а не разышліся, бо палілі вёску. Водсвет пажараў стаяў над Дольнай Рутай. А ён, адзінотны, падышоў да магілы, і падсвядомасць адзначыла — гэтыя Байструкі ўсё ж не перашкодзілі хлопцам выкапаць сабе магілу палюдску — не ўздоўж дарогі, а ўпоперад да яе, і яны злеглі галовамі на поўдзень сонца.

Пасля, калі едкая гара ад хатаў заклубілася

і над магілай, розум Андрэя прасвятлеў: «Нашто жыву я,— старая надломля, а маладыя там?»

Дым гусцеў, ён пачынаў выядаць вочы, і Андрэю памроілася, што ён зноў жывы крыж і цяпер ўжо над свежай магілай.

Пажар едкім дымам, як цёмначчу, заслаў дрэвы і травы.

Старасту Ганталіку загадана было паказваць хаты даваенных актывістаў, падпольшчыкаў пры панскай Польшчы і тыя хаты, з якіх пайшлі ці, магчыма, нават пойдуць у партызаны.

І ён паказваў густа. Людзі насцярожанай хмарай сачылі за сутарглівымі торканнямі яго рукі то направа, то налева.

Ганталіка, ад малесця закажанелага мужчыну, першым нагледзеў, а пасля і ўстрашыў Байструк, які іншых мужчын збаяўся. У першыя дні новай службы ён прыйшоў да Ганталіка і як быццам між іншым меланхалічна спытаўся: «Ну, як жывеш, дзядзька?»

Але Ганталік адчуў тон гэтага гіцаля, кім ужо ў наваколлі пачалі пужаць дзяцей.

— Ды добра, добра жыву, і булачка к душы кладзецца, і курачкі сколькі зярнятак склююць, столькі яечак знясуць,— заенчыў Ганталік.

— Добра, дык добра, старастам будзеш,— адсек гэты змрочны малады.— Свае булачкі можаш есці сам, у мяне ад іх жывот праймае вольнасць. А яйкамі трэба будзе падзяліцца са мной і з немцамі, ды яшчэ і аполец сала ўрэзаць.

Пускаць нешта на долю Ганталік не хацеў, ён не прывык да гэтага. Ды і само слова «староста» здалося яму хоць і шаноўным, але ў такі час страшнаватым. І ён зноў заенчыў:

— А я ж цёмная бутэлька, нічога не панімаю,

далей мястэчка нідзе не быў. Ды і то, як хадзіў, усе падэшвы ў хромавых ботах пазбіваў.

Байструк спачатку мала слухаў, пасля мацюкнуўся, аж рэха ад зубоў пакацілася, і адсек:

— Глядзі, дзядзька, каб ты ў тых ботах чысценькі і прыбраны не ляжаў. З немцамі жарты малыя, гэта не тое як пры паляках — на галовах хадзілі.

У Ганталіка адняло мову, хаця калі б ён быў смялейшым, то мог бы параіць гэтаму смаркачу, раз ён ужо звязаўся з немцамі, самому ісці за старасту.

Першае, што падумаў Ганталік, калі нечаканы госць пайшоў, было такое: «На ўсё боская воля, але калі і дам сала, то трасцу сёлетняга, недзе кубел і з'ялчэлага залеташняга ёсць».

Але салам усё не скончылася. Ганталік — адзіны з вяскоўцаў, які меў права хадзіць у бункер — вунь якім важным стаў. Там яго разы тры накармілі для прыліку нейкай баландай, налілі сцэдкаў з салдацкага катла, і гэта паддало гонару:

— Мы і на вялікдзень такога не ядзём, як яны там на штодзень.

Людзі ведалі апетыты салдатаў, калі тыя ўрываліся ў хаты, чысцілі і так ужо згалелыя кублы, таму толькі пасміхаліся:

— Ага, і варанага, і паранага, і так living кускамі было.

Нічога вялікага Ганталік, вядома, не вырашаў — разносіў розныя павесткі, наказваў, калі каму везці падаткі. Ведалі, што ён нецікавы чалавек, і пакеплівалі, калі ён плінтаў туды-сюды па хатах.

Але цяпер усе гэтыя Ганталікавы вялікадні ў бункеры звярнуліся агнём і дымам, большымі, чым яны маглі быць.

Ганталіка ахапіў самы звычайны страх, што і яго самога могуць застрэліць. І ён, ашалела пазіраючы то налева, то направа, як загнаны заяц, скакаў па гасцінцы. Нехта некалі не пазычыў Ганталіку калёс, нехта на локаць лішне зайшоў на яго дзялку на сенажаці, нехта не так сказаў — усё гэта, хай сабе і падсвядома, адбілася на яго паводзінах.

Байструк ішоў за Ганталікам, як гаспадар за парабкам, і зласліва ўсміхаўся.

Доўга не наступала начная цемень, а ночы і зусім не было. Выпалілі недзе трэць вёскі і найболей каля бруку, тую яе, што звалі палявыя — відаць, некалі людзі адсяляліся на поле. Корань Дольнай Руты застаўся цэлым — можа, Ганталік баяўся, каб агонь не лізнуў і яго сядзібы, а можа, немцам у іх бліскучых ботах зручней было выкрэсваць іскры з бруку, чым цюпкацца і слізгаць там, дзе пачыналася гразкая вулка. Па ёй і пайшлі пагарэльцы ў закутнікі хто да радні, а хто да блізкіх прыяцеляў.

Вёска анямела, хоць галасі ў ёй, знікла тое апошняе вясёлае, што і жыло.

Ранняй вясной сорак чацвёртага мужчын пагналі на працу, якой ніхто не чакаў. Было загадана пафарбаваць у мястэчку касцёл і царкву ў зялёны колер.

Касцёл і царква высіліся на мястэчковым базарным пляцы. Яны стаялі насупраць — белыя, з сінімі макаўкамі-вярхушкамі царква і вышэйшы за яе чырвонай цэглы касцёл, што страляў у неба строгасцю абрысу і псеўдаготыкай. Іх аседласць як бы падкрэслівала варожасць дзвюх рэлігій, што з вялікай моцаю згрызліся асабліва на гэтай зямлі.

Вось і напаткаў і царкву, і касцёл аднолькавы лёс, сталі яны менш прыкметнымі, колеру травы, дрэў. Усе роўныя перад бядой. Кожнаму, нават жабрачкам, якія хадзілі і выдумлялі, што і ксёндз, і поп мусяць цяпер адзявацца ў зялёнае, стала зразумела, што надыходзяць нейкія перамены. І можна было ўсведамляць, што зялёны колер — адзін з лепшых колераў жыцця — немцам цяпер не паможа. Сапраўды, смерць не можа ўзбройвацца лепшымі сімваламі жыцця. Таму што самі яны — верх прыроднай справядлівасці, імя якой зноў жа толькі жыццё.

Яно ды ясны месяц свяцілі дальнарутаўцам, калі ліпеньскай ноччу ўцякалі ў хвойнік. Яго невялікі пасак цямнеў на ўзгорках за вярсты тры ад вёскі. За ім была вёска Горная Рута. Вырушылі туды нездарма і ў час. Ужо трасло зямлю — ішлі баі за блізкі горад — важны чыгуначны вузел, і водсвет пажараў заняў паўнеба.

Уцякалі дзвюма вузкімі дарогамі, блоцячы і не маючы шкадавання да выспелага жыта, сакаўной канюшыны, якія, паклумленыя, запахлі яшчэ вастрэй. Сярод яснай роўнядзі даспелых палёў негусты хвойнік у месячным сяйве здаваўся лесам.

Калі займала на зоры, уся вёска была на горках, знайшоўшы прытулак пад кустамі вязкіх арэшын ці настылых ад рос хваін. Укладалі спаць звялых дзяцей — хто на фурманку, хто проста на хатулі. Раўлі не прывыклыя да лесу каровы.

Дольная Рута занялася раніцой, калі горад ужо не трэсла, а лавіна агню і дыму пакацілася далей на захад. Людзі да ўсякага прывыклі, але ўсё роўна, збіўшыся ў кучу, кожны лавіў позіркам сваю сядзібу. Пажары сачылі моўчкі, і ўсё ж калі яны сталі суцэльным вогнішчам, пайшлі і галасы. Першымі залямантавалі жанчыны:

— Там жа наш дзядульнік, наша бацькаўшчына.

Андрэй Сакольскі, прыжмурыўшы вочы, зусім спакойна адказаў:

— Нічога, вернемся.

— На галавешкі.

— Лепей сем разоў гарэць, чым раз памерці. Вунь маладыя ў магіле ляжаць пад бярозай.

— Яно-то так.

Было страшна, але страх быў не такі ядавіты, калі вёску палілі першы раз. Можа, і таму, што людзі здагадаліся ў час знайсці сховішча. Але раптам сярод напятай цішыні жудка і пранізліва прагучаў сіратлівы, нізкі, як з трубы, голас Сілашыі. Яе не пакінулі добрыя людзі. Уздзябурыўшы на сябе ліняды плюшавік, яна сядзела пад кустом і вось не то запела, не то загаласіла: «Ой гарацць агні пякельныя, ой кіпіць неўтамімая...»

Нехта не вытрываў: «Сціхніце, цётка. Без вас моташна».

Тым часам Ганталік, крута ашываючыся то ля адной, то ля другой купкі вяскоўцаў, палахліва звягануў:

— Паляць, зладзеі.

Ён не ведаў, з кім загаварыць, і неўпапад падаў свой голас, на які адказаў Андрэй Сакольскі:

— Ты б памаўчаў ужо, страхалюдзіна.

— А што, а што, і маё гарыць.

— Як бы ты лепшы, чым другія. Думаў, пашкадуюць цябе, такую грасшышку.

Ганталік адчуваў, што яму найвыгодней маўчаць, але душу валтузіў і страх перад вяскоўцамі, і жаль свайго дабра. Гэта зацямняла яго бедны розумчык непатрэбшчынай слоў. Ён сам навёў паляцаў на той успамін, што і дагэтуль вярэдзіў іх памяць, але цяпер на нейкі міг мог бы адступіцца.

Мог, але Ганталік сам жа пачаў:

— А што, і без мяне немцы не палілі б тады?

— Палілі б, а як жа. Ды не столькі б выкацілі, каб ты не пастараўся.

Тут загаварылі і другія:

— Праз хату паказваў.

— Скуру ратаваў, баяўся, што і табе задніцу апячэ.

— Якая я ўжо парцізанка была,— пажалілася нядаўна аўдавелая Сымоніха.— Толькі дзяцей як бобу.

Ганталіку хацелася адхрысціцца:

— Я сам усё жыццё гора пекаю. Усё сваім мазалём крывавым.

— Надта ж сваім,— намякнуў нехта з тых, каму прыходзілася быць у Ганталіка напаўпарабкам.

Ганталік зразумеў і з гарачкі таропка панёс нейкую нясcкладзіцу:

— Толькі на жытняе жніво бралі работнікаў, а з ячмянём і пшаніцай самі ўпраўляліся. Што там у мяне ёсць — нейкіх пару гектараў аблізаных. А кармілі людзей добра — як нарэжам, як накрышам.

— Ай, сціхні, табе з калясьмі ў рот не ўедзеш. У цябе і сваё колам у горле стане.

Хаты гарэлі хутка, як тонкая свечка. Пад вечар, калі стала відаць, што па шашы пайшлі савецкія войскі, змучаныя людзі пацягнуліся назад, і ў душы ныў холад цёмнага прадчування папялішчаў.

Ад вёскі засталося хат пятнаццаць, цэлымі былі і хутары.

Бункер разнеслі па бервяну на трэці дзень пасля вяртання, калі вясёлы хлопец з заклапочанай каманды мінёраў кінуў кліч, што ісці можна.

Амаль на кожную сям'ю дастаўся жалезны салдацкі ложак, астатняе — хто што ўхапіў. Бабы рынуліся на кухню, і там стаяў несусветны грукат.

Ашалелы ад хваляванння Ганталік баяўся трапіць каму пад гарачую руку, але і яму хацелася нешта мець. З перапуду ён невядома на што ўхапіў першае — паўмяшка новых падкоў. Гэта быў запас для стаеннікаў коннай аховы чыгункі. Суглобіўшыся, Ганталік праз поле паджгаў з падковамі да сваёй пуні. Адтуль адразу пачуўся лямант: «А людцы, а сястрыцы родныя, усе дабро цягнуць, а мой недапечаны жалеза».

Тады, у бункеры, і пашанцавала Сяргеевай маці — яна наляцела на ручную швейную машыну. Толькі гадаць можна, як апынулася швейная машына ў бункеры, хто там на ёй што шыў. Немцы, вядома, не цягнулі яе з Германіі, хутчэй за ўсё гэта быў трафей. Але ўсё роўна ў хаце яе звалі нямецкай машынай, акрамя Сяргея, які даў ёй мянушку «Зінка».

І вось «Зінка» стракоча ў новай хаце. На двары вечаровая восеньская цемень, бушуе ў ясені паўночны вецер, а ў хаце цёпла — смольнае дрэва ўжо ўкамянела ды і зруб сымшылі добра. Бацька, паспакайнелы на прызім'і,— здаецца, угрунтавалася сям'я — сучыць дратву, латае і падшывае хамут. Маці круціць сваю машыну і пяе. Там, дзе пра жніва, пра розныя зорачкі, пра лужочкі і беражочкі, на якіх штодзень гойсаеш,— Сяргей мала прыслухоўваўся. Але маці ніколі не прамінала песню, пры якой Сяргей сцішваўся. «Трансваль, Трансваль, страна моя, ты вся горишь в огне». Тут было нешта таемнае і грознае — невядомая, гучнай назвы Трансваль.

Сцішваўся нават меншы Лёнька. Сёння, больш

чым праз чвэрць стагоддзя, ён, канешне ж, не мае патрэбы помніць тых вечароў — яго думкі непрыручана блукаюць недзе па далёкіх пустынях. І цяпер, ужо прачнуўшыся, ён недаўменна глядзіць на Сяргея:

— Чаго ты нейкі, як з крыжа зняты? Я мінут пяць ужо гляджу на цябе, а ты хоць бы што.

— Чаму я любіў, калі мама пела?

Лёнька падумаў, што вар'яты ціхія куды больш небяспечныя, чым буйныя, але як сапраўдны філосаф, ці, як ён сам сябе называе, мыслячы індывідуум, знайшоў адказ:

— Калі мама пяе, у хаце заўсёды светла...

Гэта было так, хаця сама маці, часта падкручваючы кнот у лямпе, казала: «Лямпа гарыць, як сляпы глядзіць».

— ...але гэта стала заўважаным нядаўна, калі маці пяе вельмі рэдка.

— А мы баяліся, калі прыходзілі жабракі і адным тонам вялі ў парозе што-небудзь такое — «Братачка-браце, лата на лаце».

— Нас пужалі не тыя песні, а самі жабракі. І ў іх галасах, самае галоўнае, не было надзеі, галасы былі халодныя, як цёмная восеньская вада. А маці была маладой.

Маці была маладой, і цяпер Сяргей можа паўтараць за паэтам: «Сукенка чорная на ёй, як мора Чорнае, каля мяне шумела».

— Так, у маладосці заўсёды вялікія падзеі. Але якая можа быць падзея ў суровай і сумнай песні «Трансваль, Трансваль...» і чаму маці так часта спявала яе? Не ведаю, як ты, а я проста заміраў, калі яе голас пераходзіў на высокую ноту і набліжаўся сваім тонам ля трымцення ці скаргі. Памятаеш — гэта былі як бы і звычайныя словы: «А сам уехал на войну в чужую сторону»?

— Нямала значыць і сіла выразнасці. А заціхалі мы з той самай прычыны, з якой маці пела. Адгадка зноў жа ў надзеі. Відаць, нешта выклікала гэту надзею?

Што помніў Сяргей?

Клубок розных вялікіх і малых фактаў быў вельмі тугі.

Моўчкі паўтараючы словы песні, Сяргей дайшоў да таго незнаёмца, які паехаў кудысьці далёка на вайну.

Хто паехаў? Ён вярнуўся ці не? Песня наогул-то нічога толкам не адказвала. І ў гэтым была яе таямнічая сіла. Ён паехаў — і ўсё.

Але маці часта пры сваіх нягодах прыгаворвала: «Каб быў мой Сцёпачка...» І не раз, найбольш раніцой у святы, наслязіўшыся, даставала з камода паперу, якую некалі прыслалі бабулі. Паперка — пра тое, што мамін брат, наш дзядзька Сцяпан, «прапаў без весці». Паведамляў пра гэта раённы ваенком падпалкоўнік Бражнікаў.

Сяргей ведаў воблік свайго дзядзькі толькі па фатаграфіі, і таму ён быў для яго напаўрэальным, хаця не стаў і святым. Фота давала адно — разбег уяўленню: статны дзяцюк у высокім фрэнчы стаіць, прыбраўшыся, як перад фэстам — вось і ўсё.

Сяргей неўзлюбіў таго невядомага райваенкома, начальніка 2-й часці Бражнікава, які падпісаў паперу пра лёс дзядзькі. Бражнікаў уяўляўся яму чалавекам, які толькі і робіць, што цішком ад сям'і пацягвае яшчэ не перагнаную на самагонку, нявыхаджаную брагу. Кіслую, што пахне аўчынай, яе заворвала маці — трэба будавацца, талаку часам справіць. А Кацінарбус, які і талакі не абмінаў, і столярам быў добрым, прыходзіў і, шмор-

гаючы шызым носам, выпіваў, як сваё законнае, літры са два той бурды. Маці злавала, спачатку хлусіла, што няма нічога, але Сымон і да галавы не браў, а казаў, што прыйдзе талачыць. Маці адпускалася, а ва ўяўленні Сяргея Кацінарбус з брагай і нейкі далёкі Бражнікаў сталі двайнікамі. Ён не любіў іх і, можа, перш за ўсё з-за лямапту маці, які пачынаўся пры з'яўленні ненасыцонага, як яна казала, Сымона. Да таго ж, навялікае расчараванне Сяргея, усё заўсёды канчалася даволі міралюбна. Сяргей чакаў буры, але буры не было.

Упершыню Сяргей цвёрда паверыў у існаванне свайго дзядзькі аднойчы восенню перад нейкім святам, калі шэры прымаразак ужо халадзіў зямлю. Была субота, прыйшла бабуля з кулёчкам падушачак. Яна прытэпала нанач, заўтра яны з маці пойдуць у местачковую царкву. Сяргей быў рады, што ў іх бабуля, і аж вішчаў перад ёй са сваімі пяцёркамі ў сшытках, прамінаючы тройкі і двойкі на старонках. У бабуліны казкі, што пачыналіся на цёплай печы, ён яшчэ верыў. І бабуля была такой, як і заўсёды,— добрай, цёплай, і голас яе быў такім жа добрым: «Вучыся, унучак, вучыся, мы цёмныя...»

Маці, як заўсёды, загадвала пісаць на лісціку святцы.

— Чуеш, бярыся і пішы.

Слінячы аловак, Сяргей пісаў на клетачках пад дыктоўку імёны ўсіх сваіх блізкіх родзічаў па бацьку і па маці, якія адышлі на той свет і якіх ён зусім не ведаў. Гэта за супакой іх душ будзе заўтра маліцца бацюшка ў яснай рызе і таксама выводзіць магутным голасам: «...помолимся также за воинство, отдавшее жизнь свою на поле брани».

— Ну дык так.— Маці перабірала ў памяці

імёны.— Пішы. «За упокой душ рабов грешных Михаила, Александрины, Юлии, Ничипора, Антона...» Імёнам, здаецца, не будзе канца, але Сяргей дранцвеў ад важнасці сваёй задачы, якая звязвала яго з невядомым светам, і паслухмяна пісаў.

— Здаецца, усе,— забірала маці паперку.

Тут не магла ўтрываць бабуля:

— Хай жа бы ты Сцёпачку ўпамінула. Ці ж ён не хрышчоны?

Маці спалохана аглянулася:

— Мама, ты што? Можа, ён недзе жывы. І ў паперы напісана, што прапаў без весці. А вядома, як цяпер, па вайне, весці знаходзяцца. Будзе скора дома.

— Ой, не будзе, дачушка — сэрца маё чуе.

— Не кажы, мама. Усяк жыццё пакруціцца можа, а хаваць яго не трэба.

«А сам уехал на войну в чужую сторону...»

Бабуля заплакала.

Сцяпан быў любімым мацерыным братам. Больш старэйшыя пайшлі жыць сваім жыццём, сваімі сем'ямі, а Сцяпанава дзяцюкоўства супала з раннім дзявоцтвам маці. Ён, калі што, і на вечарынцы заступіцца мог, і ў працы пасабіць. І ўсё ў іх выходзіла з перасмешкамі і лёгкімі кепікамі. Сястра любіла вышываць брату хітрамудрымі ўзорамі сарочкі, мыць і адбельваць іх.

Як свята, той дзень, калі Сцяпан прынёс з мястэчка фацэтныя белыя туфелькі — яе першыя туфелькі на вылюддзе. Яны здаваліся тады маладзенькай дзяўчыне — хлапечаму гору на ўсё ваколле — белымі галубкамі ў загарэлых мазолістых руках брата. Ён зарабляў на туфлі, крышачы молатам камень на брук.

Гэта Сцяпан два разы сваім і сестрыным одумам адносіў назад сватам іхнюю гарэлку, што

абазначала: хата адмаўляе ім. Да сястры сваталіся багатыя — першы раз няўклюдны слінкач, які, дажыўшы да трыццаці год, здзіўляўся нават пасвісту ветру за акном: «А мамачкі, а божачкі...» Потым сватаўся нейкі ўдавец з кагалам дзяцей. Бацькі за сталом маўчалі: шкада-то шкада дачку, але як-ніяк гонар — вясковыя багатыры прыйшлі да голі кланяцца. Тады Сцяпан толькі пакусваў губы, гледзячы, як халаднелі і нежывелі сестрыны вочы, рабіліся вялікімі, як дзічкі. І першы, і другі раз Сцяпан, не пытаючыся бацькоў, сваім одумам, аднёс гарэлку па маўклівай просьбе сястры. Ён ведаў, што вечарамі яна плакала ў садзе пад халоднымі зорамі. У чужых хатах ён пачуў за сабой нешта такое: «І гэтыя тарбэчнікі яшчэ нечага хочуць». У сваёй жа хаце хапіла матчынага лямanту і бацькавай злосці — дзеці выходзілі з паслушэнства. Але рашучы і ўжо незалежны Сцяпан, адпэндзіўшы сватоў, толькі пасміхаўся — не пабягуць жа бацькі да іх.

Дзе цяпер Сцяпан — хто ведае.

«А сам уехал на войну в чужую сторону...»

Маці шые і пяе. Яна будзе шчыраваць доўга і толькі перад поўначчу скажа: «Пара і на куросанне».

Няма, здаецца, канца і песні.

— Мама, а дзе Трансваль? — не вытрымаў аднойчы Сяргей.

Машына заціхла, і маці здзіўлена паглядзела на Сяргея.

— Адкуль жа я ведаю, сынок? Недзе, мусіць, далёка.

Такі адказ расчараваў Сяргея — нашто спяваць, калі не ведаеш?

Сёння Сяргей разумеў, што ў песні перапліта-

лася ўсё — і нядаўняе вогненнае мінулае, і надзея маці, а ці Румынія, дзе прапаў дзядзька, ці Трансваль, для яе было ўсё адно: далёкае, невядомае...

Разгадка пра далёкую краіну нечакана знайшлася ў школе — разабранай чуйнымі перагародкамі былой ксяндзоўскай плябаніі. Яна была цеснаватая на васьмігодку, вельмі гулкая і па-свойму цікавая. Хадзіць у сёмы клас, напрыклад, знайшлося толькі тры хлопцы-пераросткі, якія яшчэ перад вайной скончылі пару класаў. У вёсцы пасміхаліся: у падпуп'і ўжо дзеці вішчаць, а яны ў школу кінуліся. Хлопцаў пазмясцілі разам з чацвертакласнікамі, давалі асобныя заданні. Ніякай вучобы з іх, вядома, не было — усе трое корчылі дурня, ласкавым вокам пазіралі ўжо на маладую настаўніцу. Ніна Іванаўна — перадваенная выпускніца дзесяцігодкі, тонкая і высокая, як сцяблінка, чырванела і трапянела перад імі. Горкім быў ёй смак навучання гэтых Чэся, Яся і Антося нямецкай мове. Яны разбіраліся ў ёй, як бараны ў аптэцы. Хаця ж добрая Ніна Іванаўна і сама даходзіла да правільнасці гучання далёкіх літар так-сяк, чытала назву падручніка не «дойч», а так, як і было напісана — «deutsch» — «дэуч». Да таго ж, ад школы не адступала паласа непрыязні да нямецкай мовы — вучні проста байкатавалі ўрокі,— і тут лянота і блазненства перамешваліся з прысмакам ваеннай горычы. Урокі ператвараліся ў пекла, дзе ніхто і не сіліўся нічога рабіць.

Ніна Іванаўна нешта адзначае ў журнал, і раптам папяровы самалёцік ляціць ёй проста на плячо і садзіцца ля гіпюравага каўнерыка. Усе перапуджаныя чацвертакласнікі ведалі, што пілатаж вышэйшага класа браў шлях ад той тройкі

старэйшых, якія, наёжыўшыся, з цікавасцю вычэкваюць.

Настаўніца спярша разгублена глядзіць на клас, як бы не разумеючы, а пасля выбягае з поўнымі слёз вачамі. Белы самалёцік, зляцеўшы з пляча, сіратліва пікіруе. У клас уступае дырэктарка, паважная і грозная гістарыца. Ва ўсіх школах якім свавольным ні быў бы вучань, ён калі не паважае дырэктара, то пабойваецца яго, само слова дырэктар — сінонім улады. А ў гэтай дырэктаркі была і слава адважнай партызанкі. Акрамя таго, яна дыміла «Беламорам», здзіўляючы вучняў і наводзячы страх на іх маці.

Дырэктарка была вопытным чалавекам: крутанулася на абцасах, і гэта абазначала, відаць, што і нечы настрой зараз пераменіцца; загадаўшы: «Сямікласнікі, за мной у настаўніцкую», яна дадала як павучанне, больш спадзеючыся на ўвагу меншых: «І запомніце: таму, хто сам нічога не хоча ведаць і другім не дае, у школе не месца».

Тады Сяргей упершыню адчуў, што ён усё-такі хоча нешта ведаць і што ў школе яму цікава. Школа навучыла чытаць і пісаць, кнігі давалі разбег уяўленням. Не, Сяргей не зважаў на незалежнасць сямікласнікаў-перастаркаў. Ён ніколі, праўда, не быў прыкладным вучнем, проста флегматычны чацвёрачнік. Але пасля слоў дырэктаркі адбыліся дзівы дзіўныя. Выходзячы ў той дзень са школы, Сяргей нечакана сам для сябе ўвязаўся за грознай дырэктаркай: «А вы не можаце сказаць, дзе ёсць Трансваль?» Яна расчулена паглядзела на дасведчанага шпанюка, а потым пагладзіла надзіва лёгкай рукой па шапцы і спытала: «Нашто табе? Будзеш вучыцца і дазнаешся... Трансваль у Афрыцы».

Пасля нехта з сябрукоў даў Сяргею пэндаля пад зад, і ўслед балюча прагучала: «Падлізнік!»

Але ён знаў галоўнае пра краіну — месца трызненняў маці. Туды ж адляцеў буслік, якога выратаваў ясень. Якраз па задуме Сяргея і ясень мусіў шумець-шумець за сцяной, а потым з ветрам далёка адляцець услед бусляняці.

Але ясень да часу ні на што не зважаў і нікуды не адлятаў. Маці шыла вечарамі, спявала, Сяргей прывык да строкату «Зінкі» і пошуму дрэва.

«Гэта ясень, ясны ясень быў...»

Быў да сярэдзіны кастрычніка. Сяргей ішоў са школы і, гледзячы на сваю сядзібу, не пазнаў яе — ля сцяны дома svіціўся прагал пустэчы. Дом быў адзінокі сярод маленькіх яблынек-прышчэпак. Сяргей адчуў калючыя іголкі дрыжыкаў на спіне: не было ясеня. Але раптоўна пачуццё адчаю пераблыталася з другім — саладкаватым пачуццём радасці. Збылося тое, што ён задумаў — ясень адляцеў за сваім буслікам у Афрыку, у краіну Трансваль.

Лунатычна ступаючы, Сяргей перайшоў праз брамку і апынуўся каля свежай яміны — святло ясеня вяло да месца яго выраю. Ямка як ямка, толькі ў сырым грунце віднеліся тонкія абрэзкі аджылля. Значыць, ясень не адляцеў увесь, хаця і незразумелы быў тор грузавіка на пяску. Сяргей сіратліва — аж вочы сталі халоднымі шыбкамі — глядзеў уніз. Але казка была пакуль што казкай.

Маці мыла ля печы посуд, яна была вясёлай і ўсцешанай, адразу пахвалілася: «Пашанцавала нам сёння, дай бог здароўя Юзюку. Ні ў кога не падрадзіўся купіць, а нас уважыў. Сто пяцьдзесят рублёў як лёду дадуць за ясень, за нішто. Дрэва дрэвам, тырчэў толькі за сцяной».

Сяргей нічога не разумеў. Юзюк... Сто пяцьдзесят рублёў як лёду... Ясень...

— Дык дзе ён дзеўся?

— Прадалі ў горад, у зелентрэст. Юзюк там закупшчыкам.

Сяргей помніў Юзюка з-за яго таямнічага трэста, якім ён хваліўся, зрэдзь часу заходзячы ў хату. Ён асабліва націскаў на гэта калючае слова «трэст». Юзюк, відаць, думаў, што адно яно дае яму права смачна высмаркацца на падлогу і расцерці бахілам.

— Гэта той такі худы і доўгі, як жэрдка? — паўтарыў Сяргей бабуліны словы пра Юзюка.

— Ты прышчамі язык. Рана пабратаваўся,— узлавалася маці.

Казка пра ясень памерла. Яе душа знікла, прабіўшы столь, якраз тамсама, як па расказах бабулі, некалі душа нябожчыка-дзеда.

Дзіцячыя крыўды самыя балючыя і жывучыя. Пасля могуць крыўдзіць, каціць на вас бочкі з бензінам і, як падтыкнуў адзін друг Сяргея, з агнём, дзярмом і трацілам, але панцыр душэўнай самаабароны загартуецца. У дзяцей ён слабы.

Сяргей не мог дапетрыць, нашто спатрэбіўся ясень. З дому мала што прадавалі — ну цяля, мех жыта, яшчэ тое-сёе. Але ясень...

Яго ўжо не было.

Гарачынёй пад сэрца падкаціўся боль. Казка была знішчана — груба і неспадзявана. Ён шваргануў на лаву сумку. Маці адчула сынаву прыкрасць і яшчэ больш узлавалася:

— Каранжа яшчэ, ад зямлі не адрос, а ўжо псіхуе. Будзеш голымі датамі свіціцца. Радуйся, што хоць у бацькавых абносках ходзіш.

— Хаджу, хаджу.

Сяргей наслязіўся. Ён не быў плаксівым з-за сваёй упартасці. Аднойчы, не разумеючы цаны словам, ён загнуў на ката доўгім матам, якім так лёгка было прычасціцца на вуліцы. Бацька загадаў: «У кут! На калені!» Сяргей паслухмяна павалокся і раўнадушна стаў. Бацька са злосцю, а маці з дакорам паглядалі на яго. Праз нейкую гадзіну маці не вытрывала і шапнула, каб чуў і сам бацька.

— Папрасіся, скажы: «Татка, болей я так не буду брыдка гаварыць». Можа, адпусціцца.

— А я і пастаю,— спакойна адказаў Сяргей.

Пад бацькам аж хадуном захадзіла табурэтка:

— Жвіру пад калені!

Але цяпер было другое. Сяргей замоўк і насупіўся. Вечарам прыйшоў узвясёлены бацька, прынёс вязак абаранкаў і кулёк цукерак. Моўчкі, як ваўчаня, Сяргей рашуча забраў усю сваю долю, і то толькі наперакор Лёньку, які цэліўся ўхапіць болей.

Ён рана лёг, адвярнуўшыся ад сцяны, за якой падвываў вецер і хліпаў дождж. Заўтра ямка будзе поўнай да краёў. Сяргею стала шкада сябе: «Вось памру, і хай тады яны паплачуць».

Маці таксама шкадавала хлапчука, але покуль маўчала, і гэты жаль, і шум ветру, дажджу навялі яе голас на ціхі працяжны матыў:

Маё нізкае падвор'е,
Чаму вадою заплыло?
Ці на цябе ветрык не веяў?
Ці на цябе сонца не грэла?..

Гэта была не проста песня, але яшчэ і знаёмая Сяргею праўда — калі глядзець з бруку, сядзіба месцілася нізкавата. Зімой упадзіна на агародзе рабілася горкай, і можна было зухавата пракаціцца. Некалі даўно, пры цары, калі тут праклада-

лі гасцінец, сяляне прадавалі казне зямлю са сваіх малых, як аплаткі, панадворкаў і гародаў. Тады і дзед зрабіў нечакана выгадны гешэфт, хаця гарод даводзілася садзіць позна, бо зямля стала нізкай, ніжай слёз. «Маё нізкае падвор'е...» Сяргею здавалася, што сёння падвор'е яшчэ больш панізіжала.

У хаце зноў залегла чуйная цішыня, якую адчуў бацька, глухаваты да яе з-за сваёй весялосці.

— Чаго ты сцішылася, як вады халоднай на цябе лінулі?

— Малы вунь узлаваўся, што дрэва прадалі.

— Ён дзіця дурное, і ты з ім здзяцінела. Нейкія песні, як старцы пад касцёлам, развяла.

Ён бразнуў дзвярыма.

— Піць недзе пайшоў,— сумна сказала маці сама сабе.

Гара з гарой не сходзіцца...

З бегам дзён ясень успамінаўся ўсё радзей.

Вясной і летам Сяргей насіў у гарадок малако у які-небудзь дом. Ён быў толькі за дастаўшчыка — пра збыт маці дагаворвалася наперад сама. Яна не любіла сваіх кліентак гарадскога цэнтра, называла іх гультайкамі: «Гэтыя сюры лупы пафарбуюць і шпацыруюць сабе». Але перамагла даўняя сялянская пераконанасць, што ўсе грошы ў горадзе, а яны былі вунь як патрэбны.

Несумненная перавага горада над навакольнымі вёскамі была ў магазінах, сталоўках, строгіх камяніцах і асабліва ў масіўнай цаглянай арцы пры ўездзе ў дагледжаны квартал, дзе да вайны жылі ўжэнднікі — вярхушка польскага павятовага чыноўніцтва. Ля абодвух бакоў аркі грозна драмалі на невысокіх пастаментах з дзікіх каменняў — валуноў і глыжакоў — вялікія цэ-

ментныя львы. І яшчэ дзівіла, што горад так шумна таргаваўся і прымаў на вялікім базары такі, здавалася б, няхітры спажытак, як бульбу, яйкі, садавіну, калі ў магазінах было столькі кансерваў з прыгожымі наклейкамі, абаранкаў, цукерак, звязкаў чырвонай духмянай каўбасы. Лёнька аднойчы сказаў, рамантычна гледзячы з панадворка ў бок горада, што ён за адзін раз з'еў бы цэлую скрынку такой каўбасы, хаця яна скрынкамі і не прадавалася.

Для Сяргея гарадок быў пакуль што сталіцай свету. Хаця на сённяшні розум тыя львы, зляпленыя ў псеўдакласічным стылі, былі больш падобнымі на бегемотаў.

Аднойчы Сяргей ішоў, пагойдваючы пустым ужо бітонам, якім ён перацягаў у горад, можа, з цыстэрну малака. Мінуўшы арку, палюбаваўся на львоў, потым для свайго заспакаення паказаў ім язык і пашпарыў далей. Быў канец красавіка, глыбока пачынала дыхаць зямля, і вальней дыхнулі людзі. Дзяўчаты, жвавыя, як стракозы пад сонцам, рыхлілі на газоне чарназём. Сяргей раптам стаў як укопаны. У шнуры алеі калыхаў голлем яго ясень. Гэта быў ён, хоць і нязвычны сярод гарадскога тлуму — той жа стромкі разбег галін, толькі адвісаў, як і некалі, сук, на якім Сяргей гушкаўся. Боль, што задаўніўся, пакрываўся лядком забыцця, лёгка прабіў гэты бар'ер і сцяў сэрца. Ён жа і павёў Сяргея проста да дрэва. Нават дрэва можа мець над дзіцем наймацнейшую форму ўлады — маральную.

Гарачая рука адчула гладкі халодны ствол, і здалося — не кроў шыбка пульсуе ў ёй, а чуваць, як пад карой бродзяць вясновыя сокі. Ён быў тут, стары друг, жывы і вясновы. Усё навакольнае адступіла, і на хвіліну Сяргей адчуў, што яны з ясе-

нем як бы ў прастрацыі. Дзве роднасныя жывыя душы — і навокал нікога больш на свеце. І гэтак сама найлепей. Калі пакутуем ці проста сумуем, хіба паверыцца, так яно не можа быць, што твайму другу весела. Адухоўлены Сяргеем ясень таксама расчуліўся сустрэчай, і пасвіст ветру ў галінах быў мажорнай мелодыяй яе.

Ён не помніў, ці доўга стаяў каля дрэва, але калі пайшоў, то часта азіраўся.

Пасля, у юнацтве, ён проста забыўся пра гэта, перайшоўшы праз яго, не раз паблажліва ўсміхаўся ў душы са сваіх дзіцячых бедаў, нават з таго, што, бываючы ў горадзе, рэдка калі абмінаў сваё дрэва.

Але сёння зразумела адно: увесь боль, які нясуць разлукі з дарагім, пачаўся тады. З гадамі боль перарастаў у адчай пры адной толькі думцы: няхай сабе не вечны ты, але няўжо ўсё, што любіў — іскрыстую сінечу любімых вачэй, захопленую ўсмешку дзіцяці, цёплы поціск рукі друга — няўжо і гэта паглыне прорва часу? З гэтай безвыходнасцю нельга было зміръцца, але прапанаваць нічога іншага ты, на жаль, не можаш.

Можна было б папасміхацца і цяпер са сваіх дзіцячых бедаў, але ў кішэні ляжала пісьмо маці і адчай працінаў свядомасць: «Учора ясень, заўтра хату, а пазаўтраму што прадаваць будзем?»

Ён быў упэўнены, што падумаў гэта, і здзівіўся, што сказаў услых.

Лёнька вытрашчыў вочы. Ён усё зразумеў. Можна было не сумнявацца, што пры яго памяці ён бяскрыўдна помніў нават справядлівую дзяліцьбу абаранкаў і цукерак, якія прынёс бацька, прадаўшы ясень.

— Слухай, давай адслужым паніхіду.

— Яшчэ хаўтураў не было.

— Я сто разоў чуў тваю легенду пра ясень і разам з ім пра ўвесь белы свет. Не вярні ты іх хоць сёння ў адну кучу з рэальнасцю — прывабная яна ці грубая. Не хлусі хоць сам сабе — ты не ведаў, што любіш ясень. У дзяцей ёсць хутчэй за ўсё толькі прывязанасць.

— Я ледзь не заплакаў, калі дрэва прадалі.

— У цябе адабралі цацку. Дрэва было тваім, як мячык, як рагатка ў кішэні. А наогул, пачуццё любові робіцца ўстойлівым толькі ў юнацтве, калі яно ўжо ўсвядомленае.

— Сёння я не плачу і не смяюся.

— Ты проста разгубіўся перад непазбежнасцю. А народ заўсёды быў вялікім аптымістам. Адно прадаецца, другое купляецца. Машына ж таксама каштоўнасць.

— Гэта куча жалеза каштоўнасць?

— Для цябе і мяне, можа, і невялікая. Проста сродак перамяшчэння. Ты ў сталіцы ўляпіўся ў тую бацькаўшчыну, якую пакінуў гадоў пятнаццаць назад. А яна даўно ўжо не тая ды і ніколі не была такой, якой табе здавалася.

...Можа быць... можа быць...

— Я люблю псіхалагічныя доследы. Ты думаеш, на мяне проста бзік напаў, калі я паліў сваю машыну?

Сяргей ніколі так не думаў — не порсценькім дурнем, якога ён любіў корчыць, быў яго брат. Гэта добра ўсвядомілася яшчэ ў дзяцінстве, ад агульнай сямейнай кашы. Маці звычайна ставіла сярод стала вялікую місу, у якой высілася горка бульбянай кашы. Хапала на ўсіх — напіцуешся з салёнымі агуркамі, з кіслым малаком — ледзь да палацяў дапаўзеш. Лёньку гэта было мала — ён капаў лыжкай у кашы норы, цікаваў,

каб не проста ўзяць, а абавязкова знайсці і скварку.

— Лёнік, бяры, як усе, падпарадак,— папярэджвала маці.

— Гэта я тунель раблю,— хітраваў Лёнік.

— Перастань, табе кажуць.

Лёнька і вухам не вёў.

Трах ложкай па лбе.

«Бэ-э-э»,— раве Лёнька.

І так амаль штовечар.

Палячы машыну, Лёнька, хоць і быў у шоку, адчуваў падсвядома, што з той разваліны вялікага спажытку не будзе, толькі клопату не абярэшся. Але цяпер ён бае байкі, што хацеў правесці нейкі псіхалагічны дослед — ён проста ўзлаваўся.

У тамтэйшых краях гарэла ўсё — і неба, і зямля. Гарэлі і машыны, але вось так раптам — ні з таго ні з сяго — гэта было рэдкае відовішча. Лёнькавы «Жыгулі» палалі на бойкім месцы, і адразу наплыло шмат людзей.

— Ты ведаеш, хто мяне пашкадаваў тады? Адны старыя. А на фізіях маіх равеснічкаў было напісана зусім другое. Спачатку яны як бы і спачувалі. Я стаяў як пень, збялеў, здранцвеў і маўчаў, не бегаў, не плакаў, не рваў на сабе валасы. Тады і пачалося. «Гэта ён снег з колаў абіваў». «Лёнька, можа, давай тушыць будзем?», «Не трэба, ён хоча пагрэцца».

— Акрамя таго, што яны радаваліся, яны цябе і ўзненавідзелі, асабліва ўладальнікі аўтатранспарту. Не толькі з-за таго, што ім не дасталося запчастак.

Лёнька спаліў ідала, копіям якога яны абіваюць пакланенні. У часы язычніцтва за спаленне ідалаў вешалі. Цяпер прыйшла пара абыхо-

дзіцца цывілізаваней, але ўсё роўна не так сабе. На галовы дальнарутаўцаў, напрыклад, пакаціўся пыл пагалоскі, што Лёнька зрабіў так нездарма — яго ж дурны поп хрысціў. З нетраў вясковых падзей не прамінулі выцягнуць і доказ. Лёньку хрысціў бацюшка, які цяпер дажывае век у райскіх садах пенсіі, з'ехаўшы ў свой Кіеў. Замест таго, каб акрапіць новае немаўлятка (яно яшчэ адзавецца свету сваім голасам!) свянцонай вадой, ён спрыснуў яго сіняватай газай. Як сам яе глынуўшы, стары, але ніякі не дурны, бацюшка зморшчыўся, зашморгалі насамі і кум з кумой. Толькі царкоўны стараста, няўдалы свянчуля, з жалем дапетрыў, што наліў не з той бутэлькі — не ваду, а газу, якой распальвалі кадзіла.

Тады ўсе пасмяяліся і забыліся, а цяпер гэта выплыла зласлівай пагалоскай.

Сяргей не чакаў, што тут, у электрычцы, Лёнькава крыўда і наогул злосць рыкашэтам пройдзецца па ім ды такой нечаканай помслівасцю. Лёнька нажыліўся, ажно грудзі захадзілі: «А ты не забыўся, як аднойчы і сам збялеў і здранцвеў немаведама чаго? Кацярыну хавалі...»

Лепш было б не помніць. Летась на згоне зімы хавалі Кацярыну — стрыечную братавую. Раптоўна, толькі пераждыўшы сорак, яна пайшла ў цёмнач, пакінуўшы беламу свету гора горкае — трох сірот. Гэта былі дзве дачушкі, адна яшчэ зусім недаўменная першакласніца, і аднарукі муж Пётра. Калецтва зрабіла Пётру нястомленым рухавым жыццялюбам, за што яго і празвалі аднакрылым.

Не змаўляючыся, па вокліку тэлеграм, Лёнік і Сяргей паехалі тады ў Дольную Руту. Спалоханыя пляменніцы ўцапіліся за падолы цётчыных спадніц, а Пётра як ачумеў ад жорсткай раптоў-

насці. Ён то насіўся ўзад і ўперад, гладзячы дачок: «А мае дачушкі, а мае ластавачкі», то маўкліва, без слёз, стаяў, прыпёршыся да вушака, і невідушча глядзеў у заваконне. Сяргей дарма стараўся яго ачомаць, Пётра адно толькі шаптаў: «Браток... браток...»

Пабыўшы ў самотнай хаце да позняга вечара, Сяргей рушыў услед за старымі, якія кіраваліся ў іх панадворак. Гэта былі цётка з мужам і сусед. Усе маўчалі, не сціхала толькі цётка. Яна пару словамі пашкадавала бедную нябожчыцу: «Самі сабе людзі гора склалі. Нікому не было памагчы».

Сяргей ведаў, што цётка была ў хаце племенніка найбольш разы тры. Яе голас гучаў па-старэчаму зазвонка: «Гэта як у каго доля павернецца. Мая Настачка дык як у вянку жыве».

«Ну, завялася,— угадаў Сяргей.— Зараз зноў пачне выводзіць гнасеалагічныя карэнні доччынага шчасця».

— Мы нацярпеліся, то хоць нашы дзеці пажывуць. Настачка як купіла машыну, то такая радая была і ўнукі рады,— расказвае цётка і, здаецца, аж расце.

Мог бы памаўчаць хоць цётчын муж, але за сталом і ён не адставаў ад жончыных высцігаў.

— Гэта не тое, што некалі — змуліш ногі да касцей. Добра людзі жыць сталі, было б толькі здароўе. Вунь у дочкі як збяруцца на свята маладыя пары — люба глянуць. Дзеткі сабе гуляюць, а яны сядуць, гавораць. Мужчыны найболей пра паліціку, а дамы пра сваё, бабскае. У іх такая кампанія, сваё кулэчка. І віна пакупляюць. Яны-то, праўда, і не п'юць яго, але купіць купяць.

Ашаломлены сусед Мікіта, які па бутэльку віна мог перці, не аглядаючыся, праз усе туркі-бары, аж рот разявіў. Хвіліну ён так і сядзеў акамянелы, а потым зусім рэзонна здзівіўся:

— Дык нашто яны купляюць, калі не п'юць?

Стары быў загадкавы і важны:

— Фантазія ў іх такая. У іх сваё кулэчка.

Мікіта не разумеў такіх фантазій і, пагойдваючы галавой, здзіўлена прамармытаў: «А маць іх за нагу».

Сяргей адзін раз быў у гэтай кампаніі, як гаварылася — у «кулэчку». Іншым з радні дарогі туды былі перакрыты. Але Сяргею і Лёньку, як адзіным сталічным прадстаўнікам новаспечанай родавай арыстакратыі, рабіліся частыя гжэчныя запрашэнні. Праўда, Лёнькі пасля яго здзеку над уласнай машынай стрыечная сястра асцерагалася — баялася падпалу.

Такіх «кулэчкаў» у райцэнтры было процьма — у выхадныя людзі не мелі занятку. Калі б можна было, яны і плошчу гарадскую ўзаралі б, і прызбай гарвыканком ці дом быту абсыпалі. Беглыя сяляне, як называў Сяргей перасяленцаў, групаваліся адпаведна вясковых адносін бацькоў. Нават вясковыя мянушкі гулялі па райцэнтраўскіх вуліцах, і не было вялікім дзівам, што нехта некага голасна абазваў Манькай Крывой ці Гіцалем.

Сяргею, які бязбожна хлусіў дзеля адчэпнага, самае крыўднае было, што ў гэтай кампаніі ён не адчуў і не ўбачыў ніякага феерверку фантазій. Толькі Настачка, знаёмячы яго з адным госцем — не то прарабам, не то майстрам,— шчыра пахваліла таго: «Ён добры чалавек: казённае пацягае, а ў суседа — ніколі». Госць сціпла заміргаў.

Яны, відаць, нават з попелу маглі зрабіць сертыфікаты. Сяргей адчуў, што з нудоцця магчымы толькі адзін рэальны выхад — напіцца. Гэта ён лёгка здзейсніў, скампанаваўшыся з тым прарабам.

Людзі вельмі хутка забываюцца ці не хочуць успамінаць таго, што тармозіць іх цягу да самаўзвышэння. Калі яны пайшлі, маці абыякава сказала:

— Ніхто, акром сястры, і не назаве цяпер яе дачушку Настачкай, а Кацярыну ўвесь век яе звалі ўсе Кацярынкай.

— Чаму?

— Прыветнай была. З-за сіроцтва да людзей гарнулася. Ды і замуж выйшла за няўдаліцу. Не пра тое, што ён калека, а ветраны нейкі, з бзікам.

Маці нявесела ўсміхнулася:

— Ты ведаеш, як гэта Настачка раз акруцілася? Прыязджае на вялікдзень, ну прыехала, то прыехала. Але выйшла з маткай на праходку і кажа бабам: «Гэтыя дзеравенскія ўсё падрад у магазінах сумкамі хапаюць, за імі да паўдня нічаво не астанецца». Тады і разанула старая Тэкля — хай яе, якая на язык: «А божа мой, ужо на рэчцы лёд крануўся, ідзі хоць смурод з пятаў абмый. Надта ж скора ўсе захалусты гарадскімі сталі». Крутанулася назад і сястра, і яе Настачка.

Маці расказвае спагадліва, без злосці. Сяргею верыцца і не хочацца верыць. Ён помніў куды большую за сябе Настульку, калі яна не то з мандалінай, не то з гітарай цешыць гасцей. На ўсю хату гудзе гулянка, госці танцуюць «пад язык», самі сабе выцілінькваючы. Грукат коціцца ад новай падлогі, перарастае ў гром, аж гайдаецца ві-

сячая лямпа. Сяргею страшна, і ён крычыць: «Ай! Падлогу праломіце!»

Усе смяюцца. А сур'ёзная Настулька, імпэтна перабіраючы струны, выспеўвае падслуханую прыпеўку: «Піце водку, ешце следзі і танцуйце як мядзведзі. Тра-та-та, тра-та-та!..»

За вокнамі калючая бура, мароз — аж неба зелена. Хата ля цёмнага хмызняку, і чуваць, як снег шугае па вербалоззі, а тут цёпла і столькі радасных вачэй. Цётка ахмялела шчасцем новай хаціны, якую збудавалі, акрэйбаўшыся пасля вайны. Манерна паводзячы ў такт рукамі, яна выспеўвае ў коле радні сваю, толькі ёй зразумелую прыпеўку: «Я агарачку задзьмухну і нагою растапчу».

Як ні дзіўна, кароткай бывае памяць і ў тых, каго вучыў самы суровы настаўнік — гора. «Кулэчка... Фантазія ў іх такая...» — дражніў Сяргей не то сам сябе, не то цётку з дзядзькам.

Назаўтра было пахаванне. Сяргей убачыў, што над хатай нябожчыцы кружляе вараннё. Васьмігадовым, ён даганяў тут падраненую варону, а потым успацелы бег у святочную хату. Жанчыны са смехам ставілі яго на покуці з варонай, якая яшчэ трапяталася. Чакалі вясельнага абозу, і жанчыны не маглі прамінуць, каб не пашуткаваць — падбіць маладую, Кацярынку, на выкуп за покуць.

Недзе ўсяго дваццаць год мінулася. І трэба ж так, што з варонай-пудзілам — тады несвядомага жарту — Сяргей сустракаў Кацярынку, а цяпер, праводзячы, варання процьма. Гэтыя птушкі, набрынялыя імжой прадвесня, сваёй грознасцю здаваліся несмяротнымі.

Людзей сабралася нямала, Лёнік з Сяргеем заціхлі на панадворку ля бярозы. Воддаль стаяла грамадка блізкай і далёкай радні, і да братоў даляталі абрыўкі іх ціхай, неўпапад, размовы. Толькі цётка, уся ў чорнай жалобе, ціха захоўвала сваю логіку:

— ...Харошая машына... выберам час — пад - едзем... а так жа добра, мякка...

З сяней пачала выплываць апавітая дзеразой труна.

Дзядзька пакуль яшчэ не заўважаў і паддакваў жонцы:

— Некалі пан у брычцы ехаў, і то на яго вецер дзьмуў, а ў машыне аніштo не шалохнецца.

Труна плыла.

Сяргей збялеў, халодны пот арасіў лоб, здаецца, ён нават пахіснуўся. Лёнька штурхануў яго пад бок і ўзяў за локаць.

Цяпер, гледзячы на брата, якому ў рэшце рэшт было напляваць на сваю рэпутацыю ў вёсцы, Сяргей без злосці падумаў: «Ну і зараза ты, Лёнька. Рашыў адыграцца і такім недазволеным прыёмам. Я сапраўды збялеў, але ты, відаць, так і не адчуў аднаго. Вясковыя могілкі якраз блізка ад школы, дзе мы вучыліся. Для нас даўно ўжо школьныя ўрокі заменены ўрокамі жыцця, сярод якіх самы жорсткі — урок свежых магіл. Але тут жорсткасць спраўджвае і мудры закон прыроды — перад зямлёй усе роўныя».

І наогул, можна быць перакананым, хаця шкада, што нас ужо не будзе тады на свеце — калі нарэшце закончыцца эра эгаізму, людзі павінны зразумець: чалавек — гэта не цар прыроды, як нам часта кажуць, а проста частка яе».

«Паклон табе, трава, паклон, бо як ні носімся з сабою — усе мы ляжам пад табою».

Шчымліва і крыўдна, ледзь не на плач, насоўвалася здалёку напаўзабытая трывога. Бязлітаснай стала адваротнасць зыходнага пункту яе. Гэта была трывога летняй перадвальнічнай ночы, такая незвычайная сярод сённяшняга вясновага дня.

Ранняя ноч... Дажджавеюць і кіпяць маладыя яблынькі за акном.

1980—1982

# ЗМЕСТ


*Дз. Бугаёў.* Зробленае застаецца . . . . . . . . . 3

ПАЭЗІЯ

Работнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Журавель . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Родныя назвы . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
*** На беразе рэчкі заціхлі бярозы... . . . . . . . 15
Людзі вітаюцца . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Дзівасіл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Леснічоўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
Дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
*** За ліўнямі, за аркамі вясёлак... . . . . . . . 21
*** Прынеслі вяскоўцы з Іспаніі... . . . . . . . . 22
Магіла лётчыкаў . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Сакавік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
*** Ажыўшых сосен чуцен звон . . . . . . . . . 25
Пачатак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
*** Людзі крадуцца па роднай зямлі крок за крокам... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
*** Ноч туманная вясной... . . . . . . . . . . . 28
Начлежныя вершы . . . . . . . . . . . . . . . 29
*** Сад вартую, і не спіцца мне... . . . . . . . . 31
*** Не наракаю на цябе, мой лёс... . . . . . . . . 32
*** Можа, ёсць дзе барана старая... . . . . . . . 33
Салдат . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
*** Хай будзе май пагодны і росны... . . . . . . . 35
*** Урокі малявання я любіў... . . . . . . . . . 36
*** Спакойныя далёкія дубы... . . . . . . . . . 38
*** Пыл з плячэй дарожны абтрасай... . . . . . . 38

*** Удар! — і мяч ля сонца ля высокага... . . . . 39
Май . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
*** Чырвонае лета!.. . . . . . . . . . . . . . 42
Кастусь Каліноўскі . . . . . . . . . . . . . 43
Вялікі расці . . . . . . . . . . . . . . . 45
*** І гэты вечар. Дождж і гром... . . . . . . . 46
Зязюля . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Каляровыя сны . . . . . . . . . . . . . . 49
*** Так, некалі на модны чамадан... . . . . . . . 51
Прыязджайце ў чацвер . . . . . . . . . . . 53
Пра зямлю . . . . . . . . . . . . . . . . 54
*** Не! не з нас пачалося... . . . . . . . . . 55
*** Мые вадой дажджавой валасы... . . . . . . . 57
*** Вар'яцелі цёплыя дажджы... . . . . . . . . 58
*** Ты яшчэ не хмеліш галавы... . . . . . . . . 59
Золата саломы . . . . . . . . . . . . . . 60
Маёнтак . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Апошняя ноч Каліноўскага . . . . . . . . . 63
*** Бывала, святам поўны дом гасцей... . . . . . 64
Элегія без хлусні . . . . . . . . . . . . . 65
Зялёны клён і сіні лён . . . . . . . . . . . 67
*** Нявольнік розуму свайго... . . . . . . . . . 71
*** Ніколі не любіў рашаць задачкі!.. . . . . . . 72
*** Як закаціўся ў стагоддзі гул Залатой Арды... 73
Іранічная восень . . . . . . . . . . . . . 74
Гімн руцэ . . . . . . . . . . . . . . . . 75
*** Такія харошыя ночы!.. . . . . . . . . . . . 77
*** Ходзяць, цалуюцца аж да ранку... . . . . . 78
Жнівеньскія зоры . . . . . . . . . . . . . 78
*** Сонца зайшло. Туман клубіцца. Сціхла дарога... 79
*** Недзе на Свірскім возеры... . . . . . . . . . 80
*** Прыгажуня, добры вечар!.. . . . . . . . . . 81
Вясновы вецер . . . . . . . . . . . . . . 82
*** Лёгкім крокам ідзеш да мяне між дрэў... . . . 83
Францішак Багушэвіч . . . . . . . . . . . . 84
Субота . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85

Чатырохрадкоўі . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Верш, напісаны ў архіве . . . . . . . . . . . . 88
*** Вось ён узняўся, мужык-крутадух... . . . . . . 90
*** Ноччу абложная бура была... . . . . . . . . 91
*** То быў разумны хлопчык... . . . . . . . . . 92
*** О раскрылле белых рук!.. . . . . . . . . . . 94
*** І раптам сыдуцца дарогі... . . . . . . . . . 95
*** З захмялёнаю галавой... . . . . . . . . . . 96
Вярба . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Мой родны дом . . . . . . . . . . . . . . 98
Аўтабіяграфія . . . . . . . . . . . . . . 100
Белыя ростані . . . . . . . . . . . . . . 103
*** Сум ціхай поўні над пустою пожняй... . . . . 106
*** Прысніўся сон, дзіцячы сон... . . . . . . . . 107
Бэз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
*** Гестапаўцы гулялі ў баскетбол... . . . . . . . 110
Ноч пасля Хатыні . . . . . . . . . . . . . 112
*** Вось пішу табе ліст... . . . . . . . . . . . 114
Развітанне з садам . . . . . . . . . . . . 115
Свята буслоў . . . . . . . . . . . . . . . 116
*** Наіўная вясна... . . . . . . . . . . . . . 117
*** Трэба было б прайсці навальніцай... . . . . . 118
*** Паўстанцкія берагі... . . . . . . . . . . . 119
*** Пад сонных ліўняў галасы... . . . . . . . . . 120
*** Спытай не тое, ці багаты... . . . . . . . . . 121
Полька ў вёсцы Пяціхатка . . . . . . . . . . 123
*** Не ад'язджай, прашу цябе, ў Капыль... . . . 126
*** Лепш бязбожна адхрысціся... . . . . . . . . 128
Інтэрнат . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Вяртанне кніг . . . . . . . . . . . . . . . 131
Бабуля . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Зімовае . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Паляванне . . . . . . . . . . . . . . . . 136
*** Дзесьці ў полі ляскоча падвода... . . . . . . 137
*** Здзівіся, друг мой... . . . . . . . . . . . 138
Трыпціх . . . . . . . . . . . . . . . . . 140

Шкляр . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
Ліпа . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Летнія малюнкі . . . . . . . . . . . . . 148
Лебядзёўскай пошце . . . . . . . . . . . 150
*** Любіце на вокладках даты... . . . . . . . . 152
Бяроза . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
*** Вайсковыя могілкі Мінска... . . . . . . . . 157
*** Ашчаднае сярэднявечча... . . . . . . . . . 158
*** А як біліся паны... . . . . . . . . . . . . 160
Пясок . . . . . . . . . . . . . . . . . 162
*** А можа, зноў прайсці ля інтэрната... . . . . . 165
З восеньскага дзённіка . . . . . . . . . . . 166
Таполі Максіма Багдановіча . . . . . . . . . 168
*** І гэткі ўжо роўны шум соснаў... . . . . . . 168

ПРОЗА

Лічыла дні зязюля... . . . . . . . . . . . . . 170
Бацька ў калаўроце . . . . . . . . . . . . . 213
Світка Буйніцкага (*эсэ*) . . . . . . . . . . 410
Ясень . . . . . . . . . . . . . . . . . 441

Семашкевіч Р.

С 30 Лічыла дні зязюля: Вершы, аповесці, эсэ /Прадм. Дзм. Я. Бугаёва.— Мн.: Маст. літ., 1987.— 508 с.

Заўчасна адышоўшы ад нас паэт, празаік, даследчык роднай літаратуры Рыгор Семашкевіч (1945—1982) пакінуў пасля сябе таленавітую спадчыну. Лепшыя творы Рыгора Семашкевіча і склалі зборнік «Лічыла дні зязюля».

С $\frac{4702120200—011}{М 302(05)—87}$ 132—86

ББК 84 Бел 7

ГРИГОРИЙ МИХАЙЛОВИЧ
СЕМАШКЕВИЧ

# Считала дни кукушка

Стихи, повести, эссе

*

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактары *Р. І. Барадулін, В. М. Хлебавец.* Мастак *С. А. Філіпаў.* Мастацкі рэдактар *А. І. Цароў.* Тэхнічны рэдактар *А. Б. Барадзіна.* Карэктар *Л. П. Бялова.*

ІБ № 2386

Здадзена ў набор 11.02.86. Падп. да друку 12.11.86. АТ 01520. Фармат $70\times100^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 20,64+0,56 укл. Ум. фарб.-адб. 21,52. Ул.-выд. арк. 19,71. Тыраж 2000 экз. Зак. 2194.
Цана 1 р. 70 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1986

*Уладзімір Жылка*

ПОЖНІ

*Вершы, пераклады,
крытычныя артыкулы*

*Сяргей Палуян*

ПІСЬМЫ Ў БУДУЧЫНЮ

*Проза, публіцыстыка, крытыка*

*Мікола Сурначоў*

АКОПНЫ СПЕЎ

*Вершы, лісты, успаміны*

*Уладзімір Хадыка*

НА ЎЗВЕЯХ ДЗЁН

*Вершы*

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1987

*Сяргей Дзяргай*

ЧАТЫРЫ СТЫХІІ

*Вершы і паэмы*

*Алесь Жаўрук*

КРЫВЁЮ СЭРЦА

*Вершы, успаміны пра паэта*

*Янка Лучына*

ТВОРЫ

*Ісак Платнер*

ПЕСНІ ПРА ХЛЕБ

*Вершы і паэма*